Przegląd Środkowo-Wschodni

Przegląd Środkowo-Wschodni

4/2019

numer specjalny

SZKICE OFIAROWANE

JERZEMU TURONKOWI

Z OKAZJI 90. ROCZNICY URODZIN

Uniwersytet Warszawski
Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej

Warszawa 2019

Rada Naukowa

prof. dr hab. Viachaslau Shved (*Uniwersytet Warszawski*) – przewodniczący,
CSc. Madina Alekseeva (*Российская академия наук*),
prof. dr hab. Mikałaj Chaustowicz (*Uniwersytet Warszawski*),
dr hab. Jerzy Gordziejew (*Uniwersytet Jagielloński*),
CSc. Alexander Grishchenko (*Московский педагогический государственный университет, Российская академия наук*),
PhD Magnus Ilmjärv (*Tallinna Ülikool*),
prof. dr hist. Ēriks Jēkabsons (*Latvijas Universitāte*),
prof. PhD Peter Káša (*Prešovská univerzita v Prešove*),
dr hab. Jadwiga Kozłowska-Doda (*Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej*),
dr hab. Iwona Krycka-Michnowska (*Uniwersytet Warszawski*),
CSc. Roman Kyselov (*Національна академія наук України*),
CSc. Andrei Liuby (*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*),
dr Dangiras Mačiulis (*Lietuvos istorijos institutas*),
dr hab. Irena Mytnik (*Uniwersytet Warszawski*),
doc. dr Nataliya Nyagolova (*Великотърновски университет „Св. св. Кирил и Методий”*),
doc. CSc. Oksana Ostapchuk (*Московский государственный университет имени М.В. Ломоносова, Российская академия наук*),
PhD Marek Příhoda (*Univerzita Karlova*),
dr Roman Smolorz (*Universität Regensburg*),
doc. CSc. Andrii Smyrnov (*Національний університет «Острозька академія»*),
prof. dr hab. Aleksander Wirpsza (*Uniwersytet Warszawski*)

Recenzenci tomu

dr Tomasz Gajownik (*Uniwersytet Warmińsko-Mazurski*),
dr Joanna Kozłowska (*Uniwersytet Warszawski*),
CSc. Aliaksandr Pashkevich (*„Arche”*),
prof. dr hab. Viachaslau Shved (*Uniwersytet Warszawski*)

Redakcja naukowa

Joanna Getka – redaktor naczelna
Marta Brzezińska-Pająk – z-ca redaktor naczelnej
Jerzy Grzybowski – z-ca redaktor naczelnej
Kamil Dwornik – sekretarz redakcji
Grzegorz Gąsior
Monika Grącka
Katarzyna Karwowska
Rościsław Kramar
Iwona Krycka-Michnowska
Marcin Niemojewski

Redaktor tomu

Viktar Korbut

Spis treści

Jerzy Grzybowski, *Przedmowa* 9
Юры Грыбоўскі, *Прадмова* 13

ARTYKUŁY I ROZPRAWY

BIAŁORUSKI RUCH NARODOWY

Аляксандр Смалянчук, *Беларуская дэлегацыя ў Петраградзе: першая спроба «арганізаваць Беларусь» (красавік 1917 года)* 19

Уладзімір Ляхоўскі, Андрэй Чарнякевіч, *Інфармацыйна-выдавецкая дзейнасць Рады і ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918–1925 гадах* 37

Ніна Стужынская, *Гісторыя Атамана Грача* 77

ZACHODNIA BIAŁORUŚ

Аляксандр Горны, *«Беларуская санацыя» ў Польшчы (1928–1937): паміж канфрантацыяй і лаяльнасцю* 91

Аляксандр Пагарэлы, *Праблема дысцыпліны часу ў дыскурсе друку БХД-БНА міжваеннага перыяду* 117

Юрый Бачышча, Андрэй Унучак, *Пратэстанцкая царква і беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі (1918–1939)* 159

WOJNA I OKUPACJA

Юры Грыбоўскі, *Стварэнне і дзейнасць Беларускага аб'яднання ў Генеральнай акрузе «Латвія» (1941–1944)* 185

Андрей Зинкевич, *Языковая идентичность фольксдойче в оккупированных Польше, Белоруссии и на Украине* 241

Віктар Корбут, *Менск 23 чэрвеня 1941 – 23 ліпеня 1944 года* 263

Hubert Kuberski, *SS-Sonderkommando Dirlewanger na okupowanych terenach Białorusi (marzec–grudzień 1942)* 319

Андрій Смирнов, *Роль Митрополита Варшавського Діонісія Валединського в конституюванні УАПЦ формації 1942 року* 389

Dangiras Mačiulis, *Jak kino białoruskie w okresie sowieckim opowiadało historię II wojny światowej* 407

DIASPORA BIAŁORUSKA

Наталля Гардзіенка, *Дакументы Юрыя Туронка ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва* 431

Андрэй Буча, *Дзейнасць беларускіх прасавецкіх арганізацый у Чэхаславакіі ў 1920-я гады* 449

Marzena Grzybowska, *Białoruska prasa religijna w Niemczech Zachodnich w latach 1945–1951* 479

VARIA

Jerzy Turonek, *Zmienne barwy Lipska* 509

Андрэй Вашкевіч, *«Зменлівыя колеры Ліпска» Юрыя Туронка* 518

RECENZJE

Сяргей Новікаў, *Праблематыка нацысцкага генацыду ў раёне вёскі Малы Трасцянец у 1942–1944 гадах у святле найноўшых і ранейшых даследаванняў* 523



Jerzy Turonek

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.9-12

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190401

Data przesłania: 30.11.2017
Data akceptacji: 23.05.2018

Jerzy Grzybowski
Uniwersytet Warszawski
jgrzybowski@uw.edu.pl
ORCiD: 0000-0002-7359-487X

Przedmowa

Imię Jerzego Turonka, wybitnego badacza dziejów białoruskich, jest dziś znane wśród historyków zarówno w Polsce, jak i za granicą. Życie solenizanta upłynęło poza granicami Białorusi, lecz mimo to zawsze czuł się Białorusinem. Przypomnijmy, że ojcem pana Jerzego był Bronisław Turonek, absolwent Uniwersytetu Stefana Batorego w Wilnie, znany działacz Białoruskiego Związku Studenckiego, członek chadecji białoruskiej w II Rzeczypospolitej. To właśnie ojciec zaszczepił mu pasję i zamiłowanie do kultury i języka białoruskiego. Młodość Jerzego Turonka przypadła na trudne lata wojny i okupacji. Wówczas rodzina Turonków mieszkała w miejscowości Dukszty (obecnie Dūkštas, Ignalinos rajonas, Litwa). Następnie była przeprowadzka do Polski i adaptacja do nowej powojennej rzeczywistości w warunkach komunizmu. Po ukończeniu studiów w Akademii Handlowej w Szczecinie Jerzy Turonek przenosi się do Warszawy, gdzie zatrudnia się w branży handlowej. Jednocześnie wykładał w Szkole Głównej Handlu i Planowania. W 1956 r. podjął pracę w Polskiej Izbie Handlu Zagranicznego, gdzie pracował do przejścia na emeryturę. Okres studiowania zbiegł się w czasie z początkami działalności organizacyjnej polskich Białorusinów. Wówczas utworzono Białoruskie Towarzystwo Społeczno-Kulturalne. Jerzy Turonek nie pozostał na uboczu tej działalności. Z tego okresu znamy go przede wszystkim jako wieloletniego kierownika Oddziału

BTSK w Warszawie. Był inicjatorem i pomysłodawcą licznych przedsięwzięć, m.in. utworzenia sekcji naukowej towarzystwa. Ponadto za jego sprawą utworzono Katedrę Filologii Białoruskiej na Uniwersytecie Warszawskim.

Pierwotnie los Jerzego Turonka nie był związany z działalnością naukową. Jednak już na początku lat sześćdziesiątych pojawiły się pierwsze jego opracowania dotyczące Białorusinów w Polsce. Zainteresowanie historią było wynikiem podjęcia własnej i w pełni świadomej decyzji wynikającej ze zrozumienia korzyści, jakie mogła przynieść ta praca społeczeństwu. Pan Jerzy prowadził badania na własną rękę i z własnej inicjatywy, nie korzystając z żadnego wsparcia finansowego. Czynił to w chwilach wolnych od pracy. Wolno sądzić, iż zainteresowanie historią białoruskiego ruchu wynikało z osobistego doświadczenia z tymże ruchem i jego przedstawicielami. Na kartach historiografii polskiej Jerzy Turonek zapisał się przede wszystkim jako autor pierwszych gruntownych opracowań dotyczących okupacji niemieckiej Białorusi, kolaboracji, stosunków polsko-białoruskich podczas II wojny światowej. Inspiracją do badań nad tą problematyką było zainteresowanie postacią Wacława Iwanowskiego, jednego z prekursorów białoruskiego ruchu narodowego w XX wieku. W ten sposób zrodziło się zainteresowanie problematyką związaną z okupacją niemiecką Białorusi. Pokłosiem badań była obrona rozprawy doktorskiej w 1986 r. Monografie Jerzego Turonka *Białoruś pod okupacją niemiecką* (Wrocław 1989) i *Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi* (Warszawa 1992) stanowiły przełom w dotychczasowych badaniach nad historią Białorusi w pierwszej połowie XX wieku. Przyniosły one badaczowi uznanie w środowisku historyków. Prace Turonka przyczyniły się do wzrostu wśród badaczy polskich zainteresowania problematyką białoruską. Za sprawą wspomnianych opracowań wielu badaczy w Polsce odkryło dla siebie nowe, zupełnie nieznane, „niesowieckie" oblicze historii białoruskiej. Tym samym badacz stał się budowniczym mostów pomiędzy historiografią polską i białoruską. Jego dorobek słusznie zalicza się zarówno do osiągnięć nauki historycznej w obu krajach. Niekiedy jest nazywany też historykiem polsko-białoruskim.

Na początku lat dziewięćdziesiątych imię Jerzego Turonka zaczyna być znane również na Białorusi. Jego prace weszły do kanonu historiografii białoruskiej. Dzięki nim wielu czytelników przejrzało na oczy, odkryło dla siebie nieznane dotąd karty z dramatycznej historii swojego kraju, przewartościowało własne podejście do przeszłości. Siarhei Novikau słusznie uważa, że monografia *Беларусь пад нямецкай акупацыяй* (Mińsk 1993) była do tego stopnia pracą nowatorską i pionierską, że badacze białoruscy nie byli gotowi do podjęcia merytorycznej dyskusji z jej autorem. Nawet ci, którzy nie podzielali poglądów autora, nie byli w stanie w sposób rzeczowy podważyć jego ustaleń. Musiało upłynąć wiele czasu, żeby środowisko naukowców w pełni oswoiło się z nową narracją. Jerzy Turonek należy do grona tych badaczy, którzy do końca dochowali wierności problematyce wojennej i okupacyjnej. Historyk dał się poznać jako autor wielu bardzo ważnych opracowań naukowych z tego zakresu (m.in. *Беларуская кніга пад нямецкім кантролем. 1939–1944 гады*, *Людзі СБМ*). Prace te odegrały niebagatelną rolę w burzeniu stereotypów i mitów sowieckich. Autor odważnie i przekonująco przełamywał przestarzałe i sztuczne schematy. Przy czym sam nigdy nie unikał podejmowania wątków trudnych i kontrowersyjnych. W związku z tym można stwierdzić, iż mamy do czynienia z klasykiem współczesnej historiografii białoruskiej. Prace Jerzego Turonka odznaczają się bardzo wysokim poziomem merytorycznym i bezstronnością. W dążeniu do poznania prawdy historycznej, niezależnie od tego, jaka gorzka by nie była, dawał wyraz nieskazitelnego profesjonalizmu i rzetelności naukowej, które, niestety, nie zawsze właściwe są historykom. Tym samym autor zapoczątkował nową jakość badań wśród historyków białoruskich, zachęcił ich do pochylenia się nad szeregiem ważnych i niezbadanych dotąd epizodów i wątków. Jego wkład w historiografię białoruską jest bezsprzeczny, prace zaś są prawdziwym kompendium wiedzy. Bez zbytniej przesady można powiedzieć, iż dziś żaden solidny badacz zajmujący się historią białoruskiego ruchu narodowego, stosunków polsko-białoruskich lub okupacji niemieckiej Białorusi, nie będzie mógł pominąć prac Jerzego Turonka. Mimo upływu lat jego prace nie

przestały być aktualne i stanowią punkt wyjścia dla innych badaczy dramatycznej historii Białorusi XX wieku.

Oprócz niekwestionowanego autorytetu naukowego o solenizancie można również mówić jako niezwykle życzliwym i ciepłym człowieku. Piszący te słowa nie zna przypadku, gdy badacz odmówiłby pomocy innym kolegom po fachu. Rozmowy z nim prowadzone w jego przytulnym warszawskim mieszkaniu zawsze były prawdziwą ucztą naukową. Gospodarz zachwyca rozmówców swoją wyjątkową otwartością, życzliwością i chęcią pomocy w poszukiwaniach naukowych. Pan Jerzy nigdy nie szczędził swoich rad i uwag oraz dzielił się własnym doświadczeniem, a doświadczenie posiada wyjątkowo duże.

Ale wróćmy jeszcze do dorobku solenizanta. Wielu historyków, w tym autorów tego tomu, wychowało się na pracach Jerzego Turonka. Wielu zawdzięcza im wybór własnego pola badawczego. Patrząc z perspektywy czasu, możemy stwierdzić, iż badania historyka znalazły swoją kontynuację zarówno w Polsce, jak i na Białorusi. A zatem można by rzec, że Jerzy Turonek doczekał się własnej szkoły historycznej. To skromne wydanie jest wyrazem szacunku młodej generacji historyków, które nisko chyli czoło przed autorytetem klasyka. Niechże niniejszy tom zostanie także wyrazem wdzięczności za wieloletni i owocny trud na rzecz nauki historycznej. Z całego serca składamy szczere podziękowania badaczowi, którego imię na zawsze zostało zapisane w annałach historycznej białorutenistyki i już zajęło poczesne miejsce obok innych wybitnych postaci nauki historycznej.

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.13-16

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190402

Data przesłania: 30.11.2017
Data akceptacji: 23.05.2018

Юры Грыбоўскі
Uniwersytet Warszawski
jgrzybowski@uw.edu.pl
ORCiD: 0000-0002-7359-487X

Прадмова

Імя Юрыя Туронка, выдатнага даследчыка беларускай гісторыі, цяпер вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Нягледзячы на тое, што свядомае жыццё юбіляра прайшло не ў Беларусі, ён захаваў адданасць беларускасці.

Варта прыгадаць, што юбіляр з'яўляецца сынам Браніслава Туронка, студэнта віленскага Універсітэта Стэфана Баторыя, дзеяча Беларускага студэнцкага саюза ва УСБ, удзельніка беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху, г. зв. хадэцыі, у міжваеннай Польшчы.

Юнацтва Ю. Туронка прыпала на час вялікіх выпрабаванняў, якімі былі гады Другой сусветнай вайны. Сям'я Туронкаў тады жыла на беларуска-літоўскім памежжы – у Дукштах (цяпер Dūkštas, Ignalinos rajonas, Літва*)*. Потым была адаптацыя ў новай пасляваеннай рэчаіснасці, якая адбывалася ўжо ва ўмовах камуністычнай Польшчы.

Пасля заканчэння Гандлёвай акадэміі ў Шчэціне Ю. Туронак пераехаў у Варшаву, дзе атрымаў працу ў імпартна-экспартнай фірме хімічных вырабаў і адначасова выкладаў у Галоўнай школе планавання і статыстыкі. З 1956 годзе ажно да выхаду на пенсію працаваў у Польскай знешнегандлёвай палаце. Ён не застаўся ў баку ад тагачаснага культурнага жыцця польскіх беларусаў. Прозвішча юбіляра было вядома перш за ўсё ў сувязі з яго дзейнасцю ў Бе-

ларускім грамадска-культурным таварыстве. Працяглы час ён быў кіраўніком Варшаўскага аддзела БГКТ. Дзякуючы яго намаганням пры аддзеле ў Варшаве быў створаны навуковы гурток. Больш за тое, Варшаўскі аддзел БГКТ прычыніўся да стварэння кафедры беларускай філалогіі ў Варшаўскім універсітэце.

Першапачаткова лёс Ю. Туронка не быў звязаны з гістарычнай навукай. Аднак ужо ў пачатку 1960-х гадоў пачалі з'яўляцца яго першыя даследаванні. Як сам юбіляр згадваў, яго экскурс у гісторыю быў вынікам асабістага выбару, разумення грамадскай карысці ад навукі. Спадар Юры займаўся навукай без маральнай і матэрыяльнай падтрымкі, у вольны ад працы час. Можна меркаваць, што цікавасць менавіта да гісторыі беларускага нацыянальнага руху была абумоўлена радаводам і асабістым жыццёвым вопытам.

Першыя крокі як даследчык гісторыі Ю. Туронак пачаў рабіць у 1960-я гады, калі выйшлі яго працы, прысвечаныя беларусам у пасляваеннай Польшчы. Аднак юбіляр увайшоў у польскую гістарыяграфію перш за ўсё як аўтар першых грунтоўных прац па гісторыі нямецкай акупацыі, калабарацыі, беларуска-польскіх адносін у Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны. Штуршком да вывучэння менавіта гэтага перыяду стала цікавасць да постаці Вацлава Іваноўскага, аднаго з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага руху пачатку XX стагоддзя. Праз прызму дзейнасці гэтага чалавека ў Менску ў 1941-1943 гадах Ю. Туронак пачаў вывучэнне праблематыкі, звязанай з нямецкай акупацыяй Беларусі. Плёнам гэтага стала абарона ў 1986 годзе кандыдацкай дысертацыі. Сапраўдны розгалас у навуковым асяроддзі выклікалі яго працы „Białoruś pod okupacją niemiecką" (Вроцлаў, 1989) і „Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi" (Варшава, 1992). Публікацыі Ю. Туронка выклікалі сярод польскіх даследчыкаў яшчэ большую цікавасць да беларускай праблематыкі. Пры дапамозе гэтых прац многія даследчыкі здолелі адкрыць для сябе новыя, «несавецкія» старонкі беларускай гісторыі. Ю. Туронак па сутнасці ўзяў на сябе місію будаўніка мастоў паміж польскім і беларускім народамі. Ён

увайшоў у гістарыяграфію як даследчык польскі і беларускі адначасова, а вынік яго працы належыць гістарычнай навуцы па абодва бакі Буга. Невыпадкова, што часам яго называюць польска-беларускім гісторыкам.

У пачатку 1990-х гадоў, калі імя даследчыка стала вядома таксама беларускім гісторыкам і аматарам гісторыі, яно хутка і трывала ўвайшло ў канон беларускай гістрыяграфіі. Дзякуючы яго працам многія чытачы ўпершыню пазнаёміліся з невядомымі старонкамі гісторыі беларускага нацыянальнага руху першай паловы XX стагоддзя і, у выніку, інакш пачалі ставіцца да мінулага.

Сяргей Новікаў слушна адзначыў, што кніга «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» (Мінск, 1993) была настолькі піянерскай працай, што беларускае навуковае асяроддзе проста не было гатова да сур'ёзнай навуковай дыскусіі з яе аўтарам. Нават тыя, хто не пагаджаўся з Ю. Туронкам, не былі ў стане на належным узроўні аспрэчыць яго вывады.

Патрэбен быў час, каб беларуская гістарыяграфія асэнсавала змест і сутнасць піянерскай працы Ю. Туронка. Варта адзначыць, што ён на працягу ўсёй навуковай дзейнасці не пакідаў «ваеннай» і «акупацыйнай» праблематыкі. Дзякуючы гэтаму беларуская гістарыяграфія атрымала шэраг чарговых каштоўных прац: «Беларуская кніга пад нямецкім кантролем. 1939-1944 гады», «Людзі СБМ» і інш. Належыць таксама падкрэсліць, што працы даследчыка дапамаглі многім маладым навукоўцам пераадолець савецкія стэрэатыпы і міфы. Адважна і пераканаўча аўтар знішчаў ранейшыя штучныя схемы гісторыі, пры гэтым не абыходзячы маўчаннем вострых і супярэчлівых момантаў мінуўшчыны.

Такім чынам, Ю. Туронак можа быць далучаны да класікаў сучаснай беларускай гістарычнай навукі.

Працы юбіляра вылучаюцца вельмі высокім навуковым узроўнем і імкненнем да аб'ектывізму. Ю. Туронак ставіць за мэту раскрыць сапраўдныя акалічнасці тых або іншых падзей, нягледзячы на тое, якімі яны былі, ён можа быць прыкладам прафесіяналізму

і сумленнасці, якія, на жаль, уласцівы далёка не ўсім тым, хто займаецца вывучэннем гісторыі.

Ю. Туронак адкрыў цэлы пласт цікавых і адначасова сур'ёзных праблем у гісторыі Беларусі і яе суседзяў. Выдатны ўклад даследчыка ў развіццё гістарычнай беларусістыкі бясспрэчны, а яго працы сталі сапраўднымі энцыклапедыямі ведаў. Не будзе перабольшаннем, калі сказаць, што цяпер аніводнаму саліднаму вучонаму, які займаецца гісторыяй беларускага нацыянальнага руху, польска-беларускіх узаемаадносін або нямецкай акупацыі Беларусі, цяжка абмінуць працы спадара Юрыя. Яго працы, нават тыя, якія выйшлі даўно, дасюль не страцілі сваёй актуальнасці і працягваюць выконваць ролю своеасаблівых праваднікоў для тых, хто даследуе складаную гісторыю Беларусі XX стагоддзя.

Акрамя прафесійных якасцей належыць таксама звярнуць увагу на добразычлівасць і чалавечую дабрыню юбіляра. Аўтар гэтых радкоў не ведае выпадку, калі б даследчык адмовіў у дапамозе іншым гісторыкам. Размовы з ім у яго ўтульнай варшаўскай кватэры заўсёды былі сапраўдным творчым святам і асалодай. Гаспадар захапляў сваіх суразмоўцаў адкрытасцю і шчырым жаданнем дапамагчы ў творчых пошуках. Ён ніколі не шкадуе парад і ахвотна дзеліцца ўласным вопытам, а вопыт мае велізарны.

Але яшчэ раз варта звярнуцца да навуковага набытку юбіляра. Многія з аўтараў гэтага выдання выхаваліся на працах Ю. Туронка, ім таксама абавязаны выбарам уласнага даследчыцкага шляху. У сувязі з гэтым не будзе перабольшаннем адзначыць, што Ю. Туронку ўдалося стварыць уласную гістарычную школу.

Гэта сціплая кніга з'яўляецца своеасаблівай данінай павагі цяперашняга пакалення даследчыкаў, якія нізка схіляюцца перад аўтарытэтам класіка. Няхай гэтае выданне будзе таксама формай удзячнасці за шматгадовую і плённую працу на гістарычнай ніве, шчырай падзякай даследчыку, імя якога назаўсёды запісана ў аналы беларусістыкі і заняло пачэснае месца побач з іншымі выдатнымі постацямі гістарычнай навукі.

ARTYKUŁY I ROZPRAWY

Białoruski ruch narodowy

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.19-36

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2018
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190403

Data przesłania: 03.02.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

Аляксандр Смалянчук
Instytut Slawistyki Polskiej Akademii Nauk
aleksander.smalianchuk@ispan.waw.pl
ORCiD: 0000-0002-1827-5083

Беларуская дэлегацыя ў Петраградзе: першая спроба «арганізаваць Беларусь» (красавік 1917 года)

Delegacja białoruska w Piotrogrodzie: pierwsza próba „zorganizować Białoruś" (kwiecień 1917 roku)

Rewolucja rosyjska i upadek dynastii Romanowów przyczyniły się do ożywienia ruchów narodowych w byłym imperium. 25–27 marca 1917 roku w Mińsku odbył się Kongres Białoruskich Partii i Organizacji, na którym powołano Białoruski Komitet Narodowy pod przewodnictwem Romana Skirmunta (1868–1939). Jego głównym zadaniem było zorganizowanie białoruskiego ruchu narodowego i uzyskanie autonomii Białorusi w ramach federacyjnej i demokratycznej Rosji. Wszakże wizyta delegacji białoruskiej w Piotrogrodzie w kwietniu 1917 roku i negocjacje z Rządem Tymczasowym zakończyły się niepowodzeniem. Rząd Tymczasowy nadal uważał Białoruś za „Kraj Północno-Zachodni" Rosji. Jedynym sposobem, by zmienić sytuację Białorusinów, był masowy ruch narodowy i utworzenie własnych sił zbrojnych. Jednak wiosną 1917 roku Białorusini nie posiadali ani jednego, ani drugiego.
Słowa kluczowe: rewolucja rosyjska, Białoruski Komitet Narodowy, Roman Skirmunt, Rząd Tymczasowy w Rosji, autonomia Białorusi

Пачатак рэвалюцыі 1917 года ў Расіі і крах дынастыі Раманавых паспрыялі актывізацыі беларускага нацыянальнага руху. На нейкі час Расія нават ва ўмовах вайны стала адной з найбольш свабодных

краін Еўропы. Здавалася, зніклі ўсе перашкоды для развіцця нацыянальных культур і нацыянальнага самавызначэння народаў былой імперыі. Хваля рэвалюцыі ператварыла мінскі аддзел Беларускага таварыства помачы ахвярам вайны ў кіруючы цэнтр нацыянальнага руху. Гэтаму моцна паспрыяла тое, што ў студзені 1917 года арганізацыю ўзначаліў Раман Аляксандравіч Скірмунт (1868–1918), землеўласнік і прадпрымальнік, ідэолаг краёвага руху, былы дэпутат Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі і фактычны ўпаўнаважаны Асобай нарады па харчовай справе, які адказваў за харчовае забеспячэнне Мінска і Мінскай губерні.

Менавіта па ініцыятыве Р. Скірмунта беларуская дабрачынная арганізацыя ператварылася ў «Беларускі камітэт», які першым выказаў ідэю аўтаноміі Беларусі ў межах дэмакратычнай федэратыўнай Расіі і пачаў падрыхтоўку з'езда беларускіх партый і арганізацый. Р. Скірмунт адразу паказаў сябе прыхільнікам кансалідацыі ўсіх беларускіх палітычных сіл. Менавіта дзеля гэтага і задумваўся з'езд.

З'езд адбыўся ў Мінску 25–26 сакавіка 1917 года і засведчыў рэдкае для беларускага руху яднанне розных палітычных сіл вакол ідэі аўтаноміі Беларусі. Таксама з'езд сфарміраваў Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), асноўнымі задачамі якога абвяшчаліся «арганізацыя Беларусі» ў кантакце з Часовым урадам, падрыхтоўка выбараў у Беларускую краёвую раду і прапаганда выбараў ва Устаноўчы сход на прынцыпах федэратыўнай і дэмакратычнай Расійскай Рэспублікі. Дзеля вырашэння гэтых задач планавалася стварэнне губернскіх, павятовых і нават валасных аддзелаў БНК.

У склад БНК былі абраны Раман Скірмунт, Аркадзь Смоліч, Павел Аляксюк, Лявон Заяц, Эдвард Будзька, Усевалад Фальскі, Браніслаў Тарашкевіч, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, Яўсей Канчар, Іван Краскоўскі, Алесь Бурбіс, Казімір Кастравіцкі, Бабарыкін, Фабіян Шантыр, Міхаіл Кахановіч, Вацлаў Іваноўскі, Лявон Дубейкаўскі і Зміцер Жылуновіч. Большасць сяброў БНК належала да Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ). Аднак старшынёю БНК пасля доўгіх і вострых спрэчак быў абраны Р. Скірмунт.

Ксёндз В. Гадлеўскі пазней тлумачыў, што ў той момант ніхто з сяброў БНК, а магчыма і ўдзельнікаў з'езда не думаў пра далейшае хуткае развіццё рэвалюцыі аж «да камунізму». Урад князя Г. Львова выглядаў даволі трывалым, і перамагло меркаванне, што з кадэтамі лягчэй будзе весці размову якраз Р. Скірмунту, а не беларускім сацыялістам[1].

У прэзідыум БНК апрача Р. Скірмунта абралі П. Алексюка і У. Фальскага як «таварышаў» старшыні, а таксама Л. Зайца (скарбнік) і Б. Тарашкевіча (пісар). Таксама з'езд вызначыў склад беларускай дэлегацыі ў Петраград. Апрача Р. Скірмунта, у яе былі абраны І. Краскоўскі, Э. Будзька, Я. Канчар, П. Аляксюк, М. Каханоўіч і І. Касяк. Таксама з'езд выказаўся за «прылучэньне» да дэлегацыі прадстаўнікоў праваслаўнага і каталіцкага духавенства[2].

Пад канец работы з'езда па прапанове П. Алексюка была прынята дэкларацыя, якую дэлегацыя павінна была ўручыць Часоваму ўраду: «З'езд прэдстаўнікоў беларускіх палітычных партый і клясоў, сабраўшыся ў Мінску 25–27 марца гэтаго году, вітаючы вялікую расейскую рэвалюцыю, прынесшую нам свабоду і блізкасьць аўтономіі Беларусі, выражаючы сваю гатоўнасьць падтрымаць Часовы Урад у яго барацьбе з унешнімі ворагамі за свабоду Расеі і яе народаў і з прыслужнікамі старога ўраду – перэдае споўніцельную ўладу Беларускаму Нацыянальному Камітэту, каторы павінен у кантакце з Часовым Расейскім Урадам арганізаваць Беларусь. Беларускі Нацыянальны з'езд, умацаваны ў шчырым жаданьні нясьці часьць вялікай працы на карысьць вольных народаў Расеі, моцна перэконаны, што яго Нацыянальны Камітэт, кіруючыся да паляпшэньня жыцьця ў родным краю, прынясе карысьць агульна-гасударственнаму будаваньню на фундамэнце фэдэратыўнаго строю дэмокра-

[1] В. Гадлеўскі, *Зь беларускага палітычнага жыцьця ў Менску*, «Спадчына» 1997, № 5, с. 21–22.

[2] *Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г.*, «Спадчына» 1990, № 4, с. 33.

тычно-рэспубліканскай Расеі, аб чым з'езд даручае сваёй дэлегацыі данясьці да ведама Часовага Ураду»[3].

Такім чынам, у канцы сакавіка 1917 года з'езд беларускіх арганізацый і БНК заявілі пра гатоўнасць забяспечыць утварэнне Беларусі як аўтаномнай палітычнай адзінкі ў складзе расійскай федэрацыі. Ва ўмовах рэвалюцыйнай эйфарыі і веры ў добрую волю новых кіраўнікоў «свабоднай Расіі» гэтая задача здавалася цалкам вырашальнай. Аднак красавіцкі візіт дэлегацыі БНК у Петраград і перагаворы з прадстаўнікамі Часовага ўрада паказалі эфемернасць беларускіх спадзяванняў.

Як заўважыў гісторык Станіслаў Рудовіч, у тагачасных умовах БНК было надзвычай складана стаць зародкам агульнакраёвай улады ў Беларусі. Ён мог быць толькі грамадскай установай, каардынацыйным цэнтрам, вакол якога адбывалася палітычная і нацыянальна-культурная кансалідацыя той часткі беларусаў, што заставаліся пад юрысдыкцыяй Расіі[4].

Гэтаму цэнтру трэба было як мага хутчэй зразумець рэальную сітуацыю новай расійскай дзяржавы, дзе выразна дамінавалі цэнтралісцкія тэндэнцыі, якія мелі моцных саюзнікаў у Беларусі. Апрача таго, у Беларусі і побач з ёй разгортваліся нацыянальныя рухі суседніх народаў, інтарэсы якіх таксама трэба было ўлічваць у справе «арганізацыі Беларусі». А яшчэ важна было дакладна акрэсліць тыя сілы, якія гатовы былі з'яднацца вакол праграмы БНК, каб зразумець рэальнасць уласных палітычных і нацыянальных прэтэнзій.

Відавочна, што першасны склад БНК на чале з Р. Скірмунтам быў арыентаваны на кансалідацыю ўсіх наяўных беларускіх сіл, а таксама на пошук і прыцягненне патэнцыяльных саюзнікаў сярод

---

[3] *Ibidem*; «Новое варшавское утро» 1917, № 2189, 29 марта; «Речь» 1917, № 74, 29 марта, с. 4.

[4] С. Рудовіч, *Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г.*, Мінск 2001, с. 92–93.

іншых нацыянальнасцей Беларусі. Менавіта такой была пазіцыя арганізатараў з'езда і самога Р. Скірмунта. Яшчэ да сакавіцкага з'езда ён імкнуўся далучыць да беларускага руху буйных землеўласнікаў. Прыгадваючы фінансавую дапамогу з боку Марыі Магдалены Радзівіл, Станіслава Радзівіла і Эдварда Вайніловіча, удзел у пасяджэннях БНК князя Г. Друцкага-Любецкага, можна сцвярджаць, што гэтыя намаганні далі пэўны пазітыўны вынік.

Выконваючы рашэнне сакавіцкага з'езда, дэлегацыя БНК у сярэдзіне красавіка адправілася ў Петраград на перагаворы з Часовым урадам па найбольш актуальных пытаннях існавання беларускай нацыі.

Напярэдадні гэтага візіту, 8 красавіка, у Петраградзе адбыўся мітынг мясцовых беларусаў. Беларусы віталі Часовы ўрад і заявілі, што апрача дэмакратычных перамен выступаюць за федэратыўны лад Расіі як неабходную ўмову яе свабоднага развіцця. Беларусь яны бачылі адным са «штатаў свабоднай федэратыўнай Расіі»[5]. Была прынята адпаведная дэкларацыя ў адрас Часовага ўрада. Яе падпісаў «старшыня мітынгу» Вацлаў Іваноўскі, які праз некалькі дзён далучыўся да дэлегацыі БНК.

Перад ад'ездам у Петраград БНК прыняў удзел у масавай маніфестацыі ў Мінску, што адбылася пасля заканчэння I з'езда салдацкіх і рабочых дэпутатаў Заходняга фронту, які падтрымаў палітыку Часовага ўрада. У прысутнасці такіх вядомых членаў Дзяржаўнай думы Расіі, як М. Радзянка, Ф. Родзічаў, М. Скобелеў, М. Чхеідзэ, І. Цэрэтэлі па вуліцах Мінска пад гукі «Марсельезы» прайшла калона маніфестантаў на чале з генералам А. Эвертам і яго штабам. Сярод розных нацыянальных і палітычных арганізацый ішлі таксама прадстаўнікі БНК пад белым сцягам з надпісам «Вольная Беларусь»[6]. Але гэтае рэвалюцыйнае яднанне ўжо было ілюзорным.

---

[5] Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ), ф. 1778 «Канцелярия министра-председателя Временного правительства», оп. 1, д. 244, л. 31.

[6] «Новое варшавское утро» 1917, № 2199, 11 апреля.

Па прыездзе ў Петраград, яшчэ да перагавораў з Часовым урадам, беларусы сустрэліся з сябрамі Літоўскай нацыянальнай рады. Р. Скірмунт, нягледзячы на антылітоўскую пазіцыю прадстаўнікоў «заходнерускай плыні» ў беларускім руху, якую выказаў падчас сакавіцкага з'езда М. Кахановіч, усё ж не губляў надзеі на паразуменне з літоўцамі. Магчыма, што яго пазіцыя набліжалася да курсу, які ў адносінах да Літвы займалі ў той час лідары віленскіх беларусаў браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі. Так, у сакавіку 1917 года А. Луцкевіч у спецыяльным мемарандуме, дасланым канцлеру Германіі, сфармуляваў галоўную мэту беларускага руху: *«стварэнне з трох аб'яднаных абласцей Беларусі, Літвы і Курляндыі, занятых нямецкімі войскамі, незалежнай дзяржаўнай арганізацыі»*[7]. Сталіцай гэтай канфедэрацыі бачылася Вільня.

Для беларусаў і часткі літоўскіх і беларускіх палякаў краёвая ідэя яшчэ захоўвала сваю актуальнасць, адпаведна, прывабным выглядаў палітычны саюз з літоўскім рухам.

У Петраградзе адбылася свайго роду беларуска-літоўская канферэнцыя, дзе беларускі бок быў прадстаўлены дэлегацыяй БНК і прадстаўнікамі Беларускага камітэта ў Петраградзе. Паводле інфармацыі М. Кахановіча[8], літоўцам прапанавалі саюз дзеля «лепшай будучыні для абодвух народаў». На думку беларускага боку, гэтая сувязь павінна была грунтавацца на «даўнейшай супольнай лучнасці ў форме дзяржавы – гістарычнай Літвы» а таксама на існуючай «адміністрацыйнай супольнасці» ў форме г. зв. Паўночна-Заходняга краю і адзінстве эканамічных і палітычных інтарэсаў Літвы і Беларусі[9]. З гэтымі прапановамі выступіў якраз Р. Скірмунт.

Сябар дэлегацыі ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі пазней прыгадваў, што беларусы, апрача факта гістарычнага адзінства, казалі пра магчымасці супольнай абароны ад мацнейшых суседзяў і адзначалі

[7] Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, f. 21, vnt. 277, p. 12.
[8] «Могилевский вестник» 1917, № 89, 20 апреля.
[9] Slawucič W., *Biełarusy i litoŭcy ŭ 1917 hodzie*, „Krynica" 1925, 18 studzienia.

агульнасць палітычных і сацыяльных інтарэсаў. Між іншым, ішла гаворка пра важнасць для беларусаў выхаду да Балтыйскага мора, а для літоўцаў з'яўлення вялікага «заплечча» (Hinterland)[10].

Аднак гэтая прапанова не была прынята. Літоўскія прадстаўнікі заявілі, што «літоўская справа» ўжо мае міжнародны характар, а «беларускае пытанне» застаецца толькі ўнутрырасійскай праблемай. Аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага ў форме беларуска-літоўскай федэрацыі не ўваходзіла ў іх планы.

Літоўскі рух мэтанакіравана імкнуўся да дзяржаўнасці ў межах «этнаграфічнай Літвы з прылеглымі тэрыторыямі», і краёвая ідэя ўжо не знаходзіла падтрымкі. Сябры Літоўскай нацыянальнай рады настойвалі на аўтаноміі Літвы з літоўскай адміністрацыяй у межах Ковенскай, Сувалкаўскай і Віленскай губерань. Этнаграфічныя аргументы беларусаў яны адкідалі на карысць існуючага адміністрацыйнага падзелу. «Яблыкам нязгоды» таксама стала Вільня. У адказ на літоўскія прэтэнзіі беларусы заявілі, што Вільня – не беларускі і не літоўскі горад, але паколькі ён знаходзіцца на беларускай тэрыторыі і абкружаны беларускім насельніцтвам, то павінен належаць беларусам[11].

Палітычная пазіцыя кіраўнікоў літоўскага руху не пакідала ніякіх шансаў на поспех краёвай ідэі. Менавіта «сепаратысцкія імкненні Літвы» Р. Скірмунт пазней назаве галоўнай прычынай маргіналізацыі краёвага руху[12].

Відавочна, што вялікай цікавасці прыезд беларускай дэлегацыі не выклікаў. Многія тагачасныя петраградскія газеты («Вестник Временного правительства», «Петербургский листок», «Новое время» і інш.) наогул не заўважылі гэтай падзеі, хоць іх старонкі

---

[10] В. Гадлеўскі, *Беларускае літвафільства,* «Беларускі фронт» 1938, № 7 (паводле: «Спадчына» 1993, № 2, с. 47).

[11] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 60п «Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ», воп. 3, спр. 171, арк. 19–21.

[12] R. Skirmunt, *Rysy odrębności Polesia* [w:] *Polesie ilustrowane,* red. O. Nelarda, Brześć 1923, s. 28.

былі перапоўнены інфармацыяй пра дзейнасць і патрабаванні польскіх, украінскіх і іншых нацыянальных арганізацый. Знайшлося нават месца, каб паведаміць аб прыездзе ў Петраград дэлегацыі чукчаў, якія якраз у гэты час імкнуліся прывітаць Часовы ўрад.

Пра візіт беларускай дэлегацыі паведаміла толькі газета кадэтаў «Речь» і «Русская воля», якую выдаваў былы царскі міністр унутраных спраў А. Пратапопаў. З заметкі на старонках «Русской воли» чытачы маглі даведацца, што 11 красавіка ў Петраград прыбыла дэлегацыя беларусаў у складзе «былога дэпутата Дзяржаўнай думы Рамана Скірмунта, інжынера Іваноўскага, народнага настаўніка Касяка, публіцыста Будзяка» (на самай справе Э. Будзькі) і інш. Адзначалася, што дэлегаты наведаюць Часовы ўрад і выканкам Савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў, каб прывітаць іх ад імя беларускага з'езда[13].

На старонках «Речи» фігуравалі таксама іншыя сябры дэлегацыі: ксёндз Гадлеўскі, свяшчэннік Разумовіч, рэдактар «Могилевского вестника» М. Кахановіч і ўпаўнаважаны Усерасійскага саюза гарадоў І. Краскоўскі. Адзначалася, што дэлегаты ўручаць пастановы беларускага з'езда Часоваму ўраду і выканкаму Савета[14].

Цікава, што менавіта «Речь» у канцы сакавіка 1917 года паведаміла сваім чытачам пра з'езд беларускіх партый і арганізацый у Мінску і яго рашэнні. Ужо ў той інфармацыі падкрэслівалася імкненне БНК спрыяць «развитию России на принципах федеративного, демократически-республиканского строя»[15].

Гэтыя сціплыя газетныя паведамленні дазваляюць удакладніць склад беларускай дэлегацыі. Можна меркаваць, што згодна з пажаданнямі ўдзельнікаў з'езда яна была дапоўнена прадстаўнікамі каталіцкага (В. Гадлеўскі) і праваслаўнага (Разумовіч) духавенства.

---

[13] «Русская воля» 1917, № 58, 12 апреля; НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 175, арк. 16.

[14] «Речь» 1917, № 84, 12 апреля; НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 175, арк. 17.

[15] «Речь» 1917, № 74, 29 марта.

Таксама фігуруе імя В. Іваноўскага, які, магчыма, замяніў Я. Канчара.

Я. Канчар на старонках мінскай газеты «Новое варшавское утро» пасля публікацыі заметкі пра вяртанне беларускай дэлегацыі з Петраграда, заявіў, што выйшаў з яе складу, бо не падтрымлівае ідэю аўтаноміі Беларусі: «Як сацыяліст-народнік, я выступаю за дэмакратычную рэспубліку з мясцовым самакіраваннем на падставе нацыянальнага самавызначэння і гістарычных умоў мясцовасці. Толькі так я і разумею самакіраванне Беларусі. Федэратыўны лад у Расіі і федэратыўнае ўладкаванне Беларусі лічу непрымальным, зыходзячы з гісторыі стварэння рускай дзяржавы, а таксама амерыканскай і швейцарскай практыкі»[16].

Яшчэ двое сяброў дэлегацыі не былі заўважаны петраградскім друкам. Між тым, імя ўрача Аляксандра Ярэміча прысутнічае ў «Дакладной запісцы», перададзенай міністру-старшыні Часовага ўрада 14 красавіка. А Павел Аляксюк расказаў аб працы дэлегацыі падчас з'езда беларускіх арганізацый у Мінску ў ліпені 1917 года.

Першы візіт дэлегацыя нанесла кіраўніку Часовага ўрада і адначасова міністру ўнутраных спраў князю Львову. Яму была ўручана падрыхтаваная загадзя «Дакладная запіска». Адпаведна, падчас размовы падкрэслівалася неабходнасць абвяшчэння Расіі федэратыўнай рэспублікай, дэмакратызацыі гарадскога і земскага самакіравання, беларусізацыі адукацыі (увядзення беларускамоўнага навучання ў сістэме народных школ, вывучэння беларускай мовы і гісторыі Беларусі, а таксама беларускай літаратуры і краязнаўства ў настаўніцкіх і духоўных семінарыях і інш.). Таксама закраналася пытанне кампенсацыі тых страт, якія панесла беларускае насельніцтва падчас ваенных дзеянняў.

П. Аляксюк, успамінаючы пра гэты візіт, адзначыў, што князь Львоў «выслухаў усё гэта ўважна, але сказаў, што ўсе гэтыя

[16] «Новое варшавское утро» 1917, № 3009, 23 апреля.

дамаганьні належуцца да розных міністраў»[17]. Паводле В. Гадлеўскага, кіраўнік урада заявіў, што пажаданні беларусаў можа здаволіць толькі Устаноўчы сход[18].

М. Кахановіч таксама адзначыў, што дэлегацыя звярнула ўвагу міністра-старшыні на беспадстаўнасць літоўскіх прэтэнзій на беларускія тэрыторыі ў межах Ковенскай, Сувалкаўскай і Віленскай губерань, а таксама на Вільню[19]. Князь Львоў заявіў, што прымае да ведама беларускі пратэст і прызнаў, што ўжо атрымаў дэкларацыю літоўцаў, у якой згадваюцца тэрыторыі трох губерань. Беларуская дэлегацыя яшчэ раз заявіла пра адсутнасць падстаў для падобных прэтэнзій[20].

На экзэмпляры «Дакладной запіскі», які захаваўся ў фондзе Міністэрства ўнутраных спраў Часовага ўрада ў Нацыянальным архіве Расійскай Федэрацыі, прысутнічае рэзалюцыя князя Львова, які накіраваў гэты дакумент свайму намесніку Сяргею Лявонцьеву. Змест гэтага дакумента варта прывесці цалкам[21]:

Докладная записка съезда белорусских общественных организаций

25, 26 и 27 марта 1917 года в Минске состоялся Съезд Бел[орусских] Общ[ественных] Деятелей, который избрал из своей среды для проведения в жизнь постановлений съезда «Бел[орусский] Нац[иональный] Комитет».

По вопросам общеполитическим съезд высказался следующим образом: «Признавая, что основные взаимоотношения между Белоруссией и Рос[сийской] Державою должны быть определены Всероссийским Уч-

[17] «Вольная Беларусь» 1917, № 8, 21 ліпеня.

[18] *З жыцьця і дзейнасьці кс. В. Гадлеўскага. Аўтабіяграфічны нарыс,* «Беларуская крыніца» 1928, 12, 16 лютага.

[19] «Могилевский вестник» 1917, № 89, 20 апреля.

[20] НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 171, арк. 22.

[21] ГАРФ, ф. 1800 «Департамент общих дел Министерства внутренних дел Временного правительства», оп. 1, д. 44, л. 1–1 об. Тэкст «Дакладной запіскі» выклікае здзіўленне, бо больш нагадвае чарнавік, аўтар якога ўжываў скарачэнні слоў. Аднак менавіта на гэтым тэксце змешчана рэзалюцыя князя Львова.

р[едительным] Собр[анием], съезд Б[елорусских] О[бщественных] Деятелей считает, что единственной возможной формой государственного устройства Р[оссийской] Д[ержавы] является федеративная республика. Ядром Б[елоруссии] являются губернии: Минская, Могилевская, Витебская, Гродненская и Виленская.

Ввиду отсутствия в некоторых губ[ерниях] земских организаций, а в других наличия лишь „столыпинских" упрощенных организаций самоуправления, необходимо ускорить введение в Крае учреждений городского и земского самоуправления на демократических началах».

По вопросам народного образования съезд высказался следующим образом: «Необходимо назначение в местные органы Центральных управлений по Мин[истерству] Н[ародного] П[росвещения] людей Края, предложенных местными национальными организациями. Преподавание в низших народных школах Белоруссии должно вестись на родном бел[орусском] языке. В учительские и духовные семинарии вводится изучение Белорусского языка, истории Белоруссии, Белорусской литературы и краеведения. Те же предметы вводятся факультативно и в средние школы Бел[оруссии]. Необходимо немедленное учреждение в Б[елоруссии] университета и высшего спец[иального] уч[ебного] заведения. В университете необходимо учредить кафедры белорусского языка, литературы, истории и краеведения Б[елоруссии]».

По вопросу о возмещении населению убытков, причиненных военными действиями, съезд высказался за необходимость немедленного изменения закона от 6 окт. 1916 г. для действительного обеспечения разоренному населению возможности получить возмещение убытков, причиненных военными действиями.

14 апреля 1917 г.

Председатель съезда Р. А. Скирмунт [подпіс]

Члены делегации:
крестьянин Виленской губ. Будславской вол. Э. Будзько, народный учитель Виленской губ. И. Косяк, доктор медицины А. П. Еремич, уроженец Минской губ., инженер, техник, доктор технических наук В. Л. Ивановский, Виленская губ., преподаватель Могилевского ремесленного училища М. С. Каханович, юрист П. П. Алексюк, Гродненская губ.

Минск, Захарьевская, 31, Белорусский национальный комитет

Дэлегацыя таксама наведала С. Лявонцьева, які пачаў размову з пытання: «Якая рэальная сіла стаіць за дэлегацыяй?» П. Аляксюк сказаў пра вялікую маральную сілу. Згадаўшы пра гэта падчас з'езда, ён прызнаў, што на чыноўніка гэтае прызнанне не зрабіла ніякага ўражання. С. Лявонцьеву таксама паскардзіліся на губернскіх камісараў з ліку гласных былога «сталыпінскага» земства, якія працягвалі «абрусіцельную палітыку». Той у адказ заявіў, што «спагадае гэтай бядзе, але памагчы нічым ні можа, ня можа ісьці проціў выбарной уласьці».

Міністр народнай асветы А. Мануйлаў таксама ўважліва выслухаў пажаданні адкрыцця ў Беларусі ўніверсітэта і сельскагаспадарчага інстытута, прыстасавання школьных праграм да асаблівасцей краю і перадачы кіравання сістэмай адукацыі ў рукі мясцовых ураджэнцаў. Міністр пагадзіўся з выказанымі прапановамі, але заявіў, што ён нічога не можа зрабіць і параіў накіраваць беларускіх прадстаўнікоў у камітэт пры Міністэрстве народнай асветы.

Паводле ўспамінаў П. Алексюка, найбольш канкрэтнай была размова з обер-пракурорам Сінода Уладзімірам Львовым. Той, дарэчы, падтрымліваў дэмакратычна і па-рэфарматарску настроеную частку духавенства і канфліктаў з іерархамі праваслаўнай царквы. Сябры дэлегацыі звярнулі ўвагу на палітычныя выступленні асобных высокіх прадстаўнікоў царквы ў Беларусі, якія, на іх думку, распальвалі міжнацыянальную і міжрэлігійную варожасць. Львову перадалі экзэмпляр адозвы аднаго з такіх іерархаў, і пракурор пагадзіўся, што такіх людзей нельга трымаць на пасадзе. Таксама абмяркоўвалася кандыдатура епіскапа-беларуса. Але ніякіх вынікаў гэта не мела.

Важнай падзеяй для дэлегацыі быў візіт да адміністратара Магілёўскай архідыяцэзіі і кіраўніка каталіцкага касцёла ў Расіі біскупа Яна Цепляка. 12 красавіка Р. Скірмунт, В. Гадлеўскі, Э. Будзька і П. Аляксюк уручылі біскупу заяву аб неабходнасці ўвядзення беларускай мовы ў касцёле. У заяве сцвярджалася ненармальнасць раздвоенасці беларусаў, якія ў хаце гавораць па-бе-

ларуску, а ў касцёле па-польску. Таксама прыводзіліся прыклады ранейшых спроб увядзення беларускай мовы ў касцёле, пачынаючы з айцоў езуітаў у Хвашчоўцы. Беларускія дзеячы падкрэслівалі асаблівую патрэбу беларусізацыі касцельнага жыцця ў тагачаснай сітуацыі, „bo aproč narodnaha biełaruskaha ruchu, katory žadaje swaje mowy ŭ kaścieli, a także aprača karyści, jakuju prynosić nawučeńnie wiery ŭ rodnaj mowi, siudy jašče dałučajecca patrebnaść niaści światło wiery katalickaj tym, katoryja ciapier nawaročywajucca da katalickaha Kaściołu i da katorych ciažka zwaročywacca papolsku, bo jany jaje zusim nie razumiejuć, inšymi sławami, palščyna u ciapierašnich warunkach moža pryniaści tolki škodu katalickamu kaściołu na Biełarusi, a nie karyść”[22].

У заяве выказваліся пажаданні ўвядзення лекцый беларускай мовы, літаратуры і гісторыі ў Магілёўскай духоўнай семінарыі ў Петраградзе; чытання ў касцёлах зваротаў вышэйшага духавенства ў тым ліку па-беларуску; перадачы беларускаму духавенству касцёлаў, якія будуць вернуты новым урадам і ў якіх можна будзе адразу ўвесці беларускую мову; выдання беларускамоўных кніг для касцёла і школы, а таксама часопіса; прызначэння ў Беларусь ксяндзоў-беларусаў або тых, хто валодае беларускай мовай; і, нарэшце, прызначэння біскупа-беларуса або таго, „katory umieje pa-biełarusku hawaryć, znaje biełaruski narod i jaho patreby”. Таксама біскупа прасілі нагадаць духавенству ў Беларусі пра яго абавязак „nakolki chopić sił i mahčymaści pramaulać pa-biełarusku da ludziej u nawučańni wiery ŭ kaścieli i školi”.

Каталіцкі іерарх спагадліва паставіўся да беларускай дэлегацыі, але нейкіх практычных вынікаў візіт і заява не мелі.

П. Аляксюк нічога не сказаў пра наведванне выканкама Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, але, відавочна, што і той візіт меў аналагічны вынік. Усе ўважліва слухалі, спагадалі і... нічога не рабілі. Агульны вынік працы дэлегацыі, па-

[22] *Ab biełaruskaj mowi u kaścieli,* «Homan» 1918, nr 39.

водле П. Алексюка, можна перадаць адным словам рускай мовы: «вообще»[23].

Ацэньваючы гэты візіт, варта адкінуць эмоцыі, характэрныя для маладых беларускіх палітыкаў, якія з цяжкасцю пазбываліся рэвалюцыйнай эйфарыі. Магчыма, галоўным вынікам дзейнасці беларускай дэлегацыі на чале з Р. Скірмунтам было давядзенне да ведама новага расійскага ўрада рашучага імкнення дзеячаў беларускага руху да аўтаноміі Беларусі і федэралізацыі Расіі, адстойванне нацыянальных інтарэсаў у спрэчках з Літоўскай нацыянальнай радай. Таксама важным момантам было наладжванне пастаяннага кантакту паміж Часовым урадам і БНК праз упаўнаважаных апошняга. Такімі паўнамоцтвамі Р. Скірмунт надзяліў Эдварда Будзьку і Аляксандра Ярэміча, пра што паведаміў намесніку міністра ўнутраных спраў Дзмітрыю Шчэпкіну[24].

Фактычна, галоўным вынікам візіту беларускай дэлегацыі стала з'яўленне «беларускага пытання» ў парадку дня ўнутрырасійскай палітыкі.

Але адначасова гэты візіт паспрыяў актывізацыі сіл, варожых беларускаму руху. Дарэчы, водгукі змагання адчуваліся нават у сталіцы Расіі. Так, газета «Речь» 13 красавіка змясціла пратэст БНК супраць тых заяў, якія рабіліся арганізатарамі І з'езда сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерань[25].

Ад імя БНК было заяўлена наступнае: «На белорусском национальном съездзе присутствовало до 150 человек, представители политических партий Белоруссии: Белорусской социалистической грамады, Народно-демократической беспартийной группы, Демократической католической партии и других различных групп, которые в своих декларациях и своим единогласным принятием резолюций определили характер съезда. Таким образом, это был

[23] «Вольная Беларусь» 1917, № 8, 21 ліпеня.
[24] ГАРФ, ф. 1800, оп 1, д. 44, л. 2.
[25] «Речь» 1917, № 85, 13 апреля.

не „так называемый съезд", а действительно съезд белорусских общественных деятелей, работающих уже много лет над делом возрождения Белоруссии, среди которых было немало представителей старой краевой политической партии, имеющей свою историю и заслуги, Белорусской социалистической грамады. Правильно организованного представительства крестьян и рабочих на этом съезде, как и на съездах других организаций быть не могло, но заявление, что „белорусский народ в лице своих трудовых классов – крестьян и рабочих" в работах национального съезда никакого участия не принимал – совершенно неверно»[26].

Між тым, 20–23 красавіка 1917 года ў Мінску адбыўся І з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерань. Ён сабраў больш за 800 дэлегатаў і праходзіў пад старшынствам М. Фрунзэ. Як сведчыць дакладная запіска яго намесніка Піліпа Караткевіча ад 1 снежня 1917 года, галоўнай задачай арганізатараў было супрацьдзейнічаць беларускаму руху і рашэнням сакавіцкага з'езда[27]. На з'ездзе панавалі антыбеларускія настроі. БНК называлі «інтрыгай памешчыкаў». Дэлегаты прагаласавалі за рэзалюцыю, якая асуджала ідэю палітычнай аўтаноміі Беларусі і выказвалася за абласное самакіраванне ў межах Расійскай Рэспублікі.

Няўдача ў Петраградзе значна ўскладніла становішча Р. Скірмунта ў беларускім руху. Ужо ў другой палове красавіка 1917 года ў БНК пачала фарміравацца свайго роду «антыскірмунтаўская апазіцыя». Атмасфера на пасяджэннях пачала абвастрацца. Беларускія сацыялісты пачалі думаць пра замену кіраўніцтва. Важную ролю адыгрывала і тое, што большасць беларускіх арганізацый на месцах арыентавалася на БСГ. Адным з ініцыятараў стварэння гэтай апазіцыі быў кіраўнік Мінскага бюро БСГ і рэдактар газеты «Грамада» Аркадзь Смоліч[28].

---

[26] НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 175, арк. 18.

[27] *Ibidem*, ф. 4 «Беларускі нацыянальны камісарыят», воп. 1, спр. 98, арк. 188.

[28] А. Ліс, *Аркадзь Смоліч* [у:] А. Ліс, *Выбранае,* Мінск 2014, с. 156.

Беларускі даследчык Арсень Ліс трапна заўважыў: «Як на прадстаўнічую дэлегацыю ў Петраград да Часовага ўрада з беларускімі пастулатамі, то былы член Думы, імпазантны Скірмунт, пэўна, падыходзіў. Але штось іншае было [патрэбна, каб] дзейсна весці беларускую работу ў свеце, які імкліва радыкалізаваўся, ды ўнутры БНК, у асяроддзі маладых сацыялістаў. […] Аб поглядах яго не пыталіся: якая каму была патрэба ведаць, што гэты памешчык даў слова безаглядна падпарадкавацца ў будучым рашэнню Установаўчага сходу – перадаць сваю зямлю сялянам»[29].

Спадзяванні кіраўніцтва БНК на магчымае яднанне беларусаў на глебе нацыянальнай ідэі паступова слабелі і разбураліся. Сітуацыю, сапраўды, магла палепшыць спроба пэўнага спалучэння беларускай ідэі з папулярнай сацыяльнай-эканамічнай праграмай або нават падпарадкаванне гэтай ідэі вырашэнню першачарговых сацыяльных праблем, але ў тагачаснай сітуацыі гэта магло прывесці да «растварэння» беларускіх арганізацый у агульнарасійскім сацыялістычным руху, дзе дамінавалі прадстаўнікі рэвалюцыйнага цэнтралізму, і ў рэшце рэшт да фактычнай адмовы ад барацьбы за нацыянальныя каштоўнасці і дзяржаўнае самавызначэнне.

Аднак амаль ніхто ў беларускім руху ўжо не ставіў пад сумненне ідэю аўтаноміі Беларусі. Вялікая заслуга ў гэтым належала Р. Скірмунту і яго прыхільнікам з ліку сяброў мінскага аддзела Беларускага таварыства помачы ахвярам вайны. На аснове пастулата аб аўтаноміі паступова ўмацоўвалася ідэя незалежнасці Беларусі, якая на ўвесь голас заявіла пра сябе 25 сакавіка 1918 года.

Архіўныя крыніцы

Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, f. 21, vnt. 277, p. 12.

Государственный архив Российской Федерации, ф. 1778 «Канцелярия министра-председателя Временного правительства», оп. 1, д. 244, л. 31; ф. 1800 «Департамент общих дел Министерства внутренних дел Временного правительства», оп 1, д. 44, л. 1–2.

[29] А. Ліс, *Gloria victis! Збор твораў,* Мінск 2010, с. 89.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4 «Беларускі нацыянальны камісарыят», воп. 1, спр. 98, арк. 188; ф. 60п «Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ», воп. 3, спр. 171, арк. 19–22; спр. 175, арк. 16–18.

Літаратура

Ab biełaruskaj mowi u kaścieli, „Homan" 1918, nr 39.

Skirmunt R., *Rysy odrębności Polesia* [w:] *Polesie ilustrowane,* red. O. Nelarda, Brześć 1923.

Slawucič W., *Biełarusy i litoŭcy ŭ 1917 hodzie*, „Krynica" 1925, 18 studzienia.

«Вольная Беларусь» 1917, № 8, 21 ліпеня.

Гадлеўскі В., *Беларускае літвафільства,* «Беларускі фронт» 1938, № 7 (паводле: «Спадчына» 1993, № 2).

Гадлеўскі В., *Зь беларускага палітычнага жыцьця ў Менску*, «Спадчына» 1997, № 5.

З жыцьця і дзейнасьці кс. В. Гадлеўскага. Аўтабіяграфічны нарыс, «Беларуская крыніца» 1928, 12, 16 лютага.

Ліс А., *Gloria victis! Збор твораў,* Мінск 2010.

Ліс А., *Аркадзь Смоліч* [у:] Ліс А., *Выбранае,* Мінск 2014.

«Могилевский вестник» 1917, № 89, 20 апреля.

«Новое варшавское утро» 1917, № 2189, 29 марта; № 2199, 11 апреля; № 3009, 23 апреля.

«Речь» 1917, № 74, 29 марта; № 84, 12 апреля; № 85, 13 апреля.

Пратакол з'езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марца 1917 г., «Спадчына» 1990, № 4.

Рудовіч С., *Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г.*, Мінск 2001.

«Русская воля» 1917, № 58, 12 апреля.

Belarusian delegation to the Petrograd: The first attempt to "organize Belarus" (April, 1917)

The Russian Revolution and the fall of the Romanov dynasty contributed to the revitalization of the national movements in the former empire. In the March 25-27, 1917 in Minsk the Belarusian Congress of Parties and Organizations on which the Belarusian National Committee, headed by Roman Skirmunt (1868–1939) was created. Its main

task was to organize the mass of the Belarusian national movement and to achieve the autonomy of the Belarus within the framework of a federal and democratic Russia. However, the visit of the Belarusian delegation to Petrograd in April, 1917 and the negotiations with the Provisional Government was failed. The interim government is still regarded Belarus as the "North-West territory" of the Russia. The only argument that could change its position, was massive national movement in Belarus and the creation of its own military forces. However, in the spring of 1917 Belarusians had no such an argument.

K e y w o r d s : Revolution in Russia, the Belarusian National Committee, Roman Skirmunt, the Provisional Government in Russia, Belarus autonomy

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.37-75

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190404

Data przesłania: 23.03.2018
Data akceptacji: 23.25.2018

Уладзімір Ляхоўскі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
prysynak@gmail.com
ORCiD: 0000-0002-5821-8040

Андрэй Чарнякевіч
Uniwersytet Warszawski
jendrus@tut.by
ORCiD: 0000-0003-1889-2820

Інфармацыйна-выдавецкая дзейнасць Рады і ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918–1925 гадах

Aktywność informacyjno-wydawnicza Rady i rządu Białoruskiej Republiki Ludowej w latach 1918–1925

W artykule poruszone są zagadnienia związane z informacyjno-wydawniczą aktywnością oficjalnych instytucji Białoruskiej Republiki Ludowej – Rady i rządu, oraz innych organizacji politycznych i kulturalnych powiązanych z BRL w latach 1918–1925. Badanie obejmuje okres działalności instytucji BRL zarówno na terytorium Białorusi, jak i na emigracji.
Słowa kluczowe: Białoruska Republika Ludowa, wydawnictwa, prasa, ulotki, propaganda

Беларуская Народная Рэспубліка, як гістарычная з'ява, пакінула па сабе багатую архіўную спадчыну і яшчэ больш пытанняў па яе інтэрпрэтацыі. Па сутнасці, мы маем дачыненне са складаным працэсам стварэння дзяржавы ў 1918–1920 гадах, які так і не быў завершаны. Разам з тым, БНР стала першай рэальнай спробай стварэння беларускай дзяржаўнасці.

Не валодаючы дастатковымі рэсурсамі для рэалізацыі ўласнай палітыкі па абароне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі, Рада і ўрад БНР адным з галоўных кірункаў сваёй дзейнасці абралі сферу палітычнага прадстаўніцтва, чым заслужылі ад сучасных ангажыраваных крытыкаў зневажальныя ярлыкі, як, напрыклад, «віртуальная» ці «папяровая» рэспубліка[1]. Падобныя ідэалагічныя спекуляцыі пры характарыстыцы БНР не з'яўляюцца навацыяй, працягваючы традыцыю савецкай гістарыяграфіі[2].

Інфармацыйна-выдавецкая дзейнасць розных беларускіх устаноў, звязаных з БНР, з'яўляецца важнай крыніцай па вывучэнні грамадска-палітычных кірункаў і плыняў, якія існавалі ў беларускім нацыянальным руху ў 1918–1925 гадах.

Да сённяшняга дня інфармацыйна-выдавецкая дзейнасць устаноў БНР не вылучалася як асобны аб'ект даследавання як у беларускай, так і ў замежнай гістарычнай літаратуры. Гэтая тэма ўскосна прадстаўлена ў навуковых даследаваннях пры разглядзе іншых праблем, звязаных з беларускім рухам першай чвэрці XX стагоддзя. Гэта найперш працы А. Калубовіча, Ю. Туронка, Ю. Гарбінскага, А. Глагоўскай, А. Ліса, С. Рудовіча, В. Мазеца, В. Талкачова і інш.[3] Яны даюць даволі шырокі спектр інтэрпрэтацый, дзе разгля-

---

[1] В. Гигин, *Бумажная республика. Из истории БНР 1918 года*, «Нёман» 2005, № 2, с. 141–154; А. Ліцкевіч, *Беларуская віртуальная рэспубліка*, «Беларуская думка» 2008, № 3, с. 68–73.

[2] И. Ковкель, Н. Сташкевич, *Почему не состоялась БНР? Из истории политического банкротства националистической контрреволюции в Белоруссии. 1918–1925 гг.*, Минск 1980.

[3] А. Калубовіч, *Крокі гісторыі. Дасьледваньні, артыкулы, успаміны*, Białystok, Vilnius, Мінск 1993; H. Głogowska, *Białoruś 1914–1929. Kultura pod presją polityki*, Białystok 1996; J. Garbiński, J. Turonek, *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny*, Warszawa, 2003, s. 221–223; Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Vilnius 2006; А. Ліс, *Gloria victis*, Мінск 2010; В. Мазец, *Гістарычны вопыт БНР па культурна-нацыянальнаму адраджэнню беларускага народа* [у:] *Беларусіка = Albaruthenica.* Кн. 2. *Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі «Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў», Маладзечна, 19–20 жніўня 1992 г.*,

даюцца розныя аспекты гісторыі развіцця беларускага кнігадрукавання і прэсы ў адзначаны перыяд, але непасрэдна не асвятляюць дзейнасць устаноў БНР. У шэрагу даследаванняў сувязь паміж БНР і беларускай выдавецкай справай прысутнічае, але ў іх адзначаны толькі яе асобныя эпізоды[4]. У гэтым артыкуле зроблена спроба прааналізаваць галоўныя кірункі інфармацыйна-выдавецкай дзейнасці ўстаноў БНР у 1918–1925 гадах, яе ідэалагічныя і фінансавыя складальнікі і іншыя аспекты.

У лютым 1918 года першы склад Народнага Сакратарыята Беларусі (НСБ) на чале з Я. Варонкам паставіў перад сабой задачу шырокага інфармавання насельніцтва аб сваёй дзейнасці. Пры адсутнасці рэальных магчымасцей стаць легітымнай уладай у «зоне новай акупацыі» (у межах Менскай і заходніх паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерань) і фактычнага байкоту ініцыятыў НСБ органамі мясцовага самакіравання стваральнікі БНР маглі трансліраваць свае намеры толькі выкарыстоўваючы вулічную агітацыю праз аб'явы і лістоўкі, а таксама дзякуючы сродкам масавай інфармацыі, якія падтрымлівалі ідэю беларускай незалежнасці ці стараліся змяшчаць аб'ектыўную інфармацыю аб намерах і дзеяннях урада БНР.

Яшчэ ў лютым 1918 года пры НСБ было ўтворана арганізацыйнае бюро, якое паставіла на мэце рэгістрацыю ўсіх прыхільнікаў

Мінск 1993, с. 150–153; В. Мазец, *Асветніцкая дзейнасць Урада Беларускай Народнай Рэспублікі* [у:] *Беларуская асвета: вопыт тысячагоддзя. Матэрыялы II Міжнароднага кангрэса 17–19 мая 2000 г. У 3 кн.* Кн. 1, Мінск 2000, с. 148–152; С. Рудовіч, *Рух за беларускую дзяржаўнасць і праблема грамадзянскага статусу беларускай мовы ў 1915–1918 гг.*, «Край = Kraj» 2001, № 1–2, с. 159–170; В. Талкачоў, *Беларускі друк і фарміраванне самасвядомасці беларускага народа*, «Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія» 2003, № 4, с. 3–6.

[4] У. Сакалоўскі, *Надзвычайная дыпламатычная місія БНР у Нямеччыне (1918–1925)*, «Arche» 2009, № 3, с. 7–328; Д. Міхалюк, *Беларуская Народная Рэспубліка. 1918–1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смоленск 2015; T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940. Rozprawa doktorska*, Toruń 2012; Idem, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940*, Białystok 2017.

беларускага нацыянальнага руху, каб з іх скласці кадравы рэсурс і пачаць рэальную дзяржаўную работу. 25 лютага 1918 года гэтае бюро выдала ў менскай друкарні Я. Грынблата і распаўсюдзіла па рэгіянальных беларускіх арганізацыях сваю адозву «Да усіх сьвядомых і асьвечоных сыноў Беларусі!». У ёй гучаў заклік да інтэлігенцыі «прыйсьці к народу і ахвяраваць яму свае сілы […], як свой сыноўні дар, злажыць усю суму навукі і дасьвядчэньня, якую назбірала ў часы безпраўя». Але адгукнуліся на заклік нямногія. Нават тыя сімпатыкі беларускай справы, якія жадалі працаваць у нацыянальных арганізацыях, асабліва ў правінцыі, на голым патрыятызме, без матэрыяльнай і прававой падтрымкі мала чым маглі зварухнуць тутэйшае грамадства, якое знаходзілася ў складаных эканамічных умовах.

Выдавецкая база БНР была слабая. Справа ў тым, што фактычна ўсе друкарні, дзе выдаваліся беларускамоўныя кнігі і газеты, да Першай сусветнай вайны былі сканцэнтраваны ў Вільні. Пасля таго, як Вільня апынулася пад нямецкай акупацыяй і ўвайшла ў склад ваеннай квазідзяржавы Обер Ост[5], Менск аказаўся адрэзаным ад галоўнага беларускага выдавецкага асяродка. Рада і ўрад БНР ва ўмовах, калі нешматлікія казённыя друкарні ў Менску былі рэквізаваны нямецкімі вайсковымі ўладамі, маглі разлічваць толькі на прыватныя друкарні. Найбольш прыдатная для выдання масавым тыражом беларускай літаратуры менская губернская казённая друкарня была рэквізавана на патрэбы штаба нямецкай 10-й арміі. Усё, што ўдалося выратаваць ад рэквізіцыі – гэта друкарская папера, што зберагалася на кватэры А. Прушынскага[6].

Пытанне, дзе друкаваць свае агітацыйныя і прапагандысцкія выданні, было настолькі вострым для Рады і ўрада БНР, што абвестку

[5] З прыходам кайзераўскіх войск на ўсход Беларусі немцы максімальна абмежавалі кантакты і сувязі паміж «старой» і «новай» зонамі акупацыі.

[6] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі.* Т. 1. Кн. 1. *Фонд № 582 Дзяржаўнага Архіву Літвы («Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі»)*, укл. С. Шупа, Vilnius, New York, Мінск, Praha 1998, с. 60.

пра першы склад НСБ у пачатку красавіка 1918 года прыйшлося друкаваць у Бабруйску. У далейшым, як і ў 1917 годзе, беларускія дзеячы ў Менску для выдання сваіх лістовак і аб'яў, у тым ліку ўстаўных грамат БНР, карысталіся паслугамі прыватнай друкарні Я. Грынблата.

Лепей сітуацыя выглядала з выданнем перыёдыкі. У Менску працягвала выходзіць газета «Вольная Беларусь», якую фінансавала Таварыства беларускай культуры[7]. 21 лютага 1918 года выйшаў адзіны менскі нумар беларускай каталіцкай газеты «Крыніца», рэдакцыя якой раней знаходзілася ў Петраградзе[8]. 24 лютага 1918 года ўзнікла Менскае беларускае прадстаўніцтва, якое спрабавала сфарміраваць правацэнтрысцкае крыло ва ўстановах БНР[9]. Прадстаўніцтва пачало выдаваць газету «Беларускі шлях», якая стала ідэалагічным канкурэнтам «Вольнай Беларусі», арыентаванай на «сацыялістычны блок» БНР. Афіцыйным выдаўцом «Беларускага шляху» стала выдавецкае таварыства «Заранка», якое было ўтворана 19 сакавіка 1918 года на чале з А. Прушынскім (Алесем Гаруном), якога 2 лістапада змяніў В. Іваноўскі[10]. Адначасова Я. Варонка пачаў выданне рускамоўнай газеты «Белорусская земля», якая павінна была стаць афіцыйным органам НСБ. Яе першы нумар убачыў свет 1 сакавіка 1918 года: былі надрукаваны дакументы выканкама Рады Усебеларускага з'езда, першыя пастановы, загады і аб'явы НСБ, мемарандум беларускага ўрада да прадстаўнікоў нямецкай акупацыйнай адміністрацыі і інш.[11]

---

[7] У. Конан, *«Вольная Беларусь»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994, с. 353–355.

[8] M. Moroz, *„Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001, s. 67.

[9] *Минское белорусское представительство*, «Минский голос» 1918, 27 февраля.

[10] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 368, воп. 1, спр. 27, арк. 41–42; У. Конан, *«Беларускі шлях»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 1, Мінск 1993, с. 459.

[11] *Архівы Беларускай…,* с. 159; П. Башко, *«Белорусская земля»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994, с. 6.

Гэтыя факты адлюстроўваюць даволі сціплыя магчымасці Рады і ўрада БНР ў інфармацыйна-выдавецкай сферы. Народны сакратар асветы БНР А. Смоліч у сваім лісце да А. Луцкевіча ў Вільню вясной 1918 года канстатаваў: «Дарагі браток! […] Выдавецтва ў нас слабае. Найбольш – газэты»[12].

У Вільні ў той час дзейнічалі два выдавецтвы: першае, аднoўленае ў 1916 годзе В. Ластоўскім, – Беларускае выдавецкае таварыства – займалася пераважна выданнем школьнай літаратуры для беларускіх школ, а другое, якая фінансавалася нямецкай адміністрацыяй, было адказнае ў першую чаргу за выданне газеты «Гоман» і гадавых календароў[13].

25 сакавіка 1918 года Рада БНР прыняла трэцюю Устаўную грамату – дэкларацыю аб незалежнасці Беларусі[14]. «Лёсы кінутыя! – пісаў з гэтай нагоды М. Доўнар-Запольскі. – Вялікі акт у жыцьці нашага народу зьдзейсьніўся: Беларусь абвешчана сваім часовым урадам незалежнай рэспублікай. У кожнага беларуса пры гэтай вестцы радасна заб'ецца сэрца. Безьліч трывожных і сьветлых пытаньняў прамільгне ў галаве кожнага з нас: ці маем мы права на гэтакі крок, ці ў час гэты крок зроблены й – галоўнае – што чакае нашую Бацькаўшчыну наперадзе?»[15].

3 красавіка 1918 года А. Луцкевіч змясціў у «Гомане» свой артыкул «Будаваньне дзяржаўнага жыцьця», у якім разважаў: «Апавяшчэньне незалежнасьці Беларусі Актам 25 сакавіка стаўляе на чэрадзі пытаньне: чы маюць беларусы даволі сіл, патрэбных дзеля арганізацыі сваёй асобнай гасударственнасьці?»[16].

---

[12] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ), ф. 3, воп. 1, спр. 261, арк. 30-30 адв.

[13] У. Конан, *«Гоман»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996, с. 60–61.

[14] А. Луцкевіч, *Да гісторыі беларускага руху. Выбраныя творы*, укл., прадм., камент. А. Сідарэвіча, Мінск 2003, с. 104–105.

[15] «Вольная Беларусь» 1918, №15, 28 красавіка.

[16] І. Мялешка [А. Луцкевіч], *Будаваньне дзяржаўнага жыцьця*, «Гоман» 1918, № 28, 3 красавіка.

На хвалі гэтых настрояў з'явілася неабходнасць наладжвання сувязі паміж двума нацыянальнымі цэнтрамі. Да палітычных і адміністрацыйных перашкод у камунікацыі віленскіх і менскіх дзеячаў, якія чынілі нямецкія вайсковыя ўлады, дадавалася яшчэ і ваенная цэнзура. Так, у пачатку красавіка 1918 года НСБ вымушаны быў прасіць дазвол у нямецкага штатгаўптмана аб публікацыі дастатковым тыражом асобных адбіткаў трэцяй Устаўнай граматы БНР[17]. Таксама прыходзілася прасіць дазвол на выданне брашуры А. Луцкевіча «Аб палітычным палажэньні Ўсходняе Беларусі», якую ён скончыў пісаць 3 красавіка 1918 года і пераслаў для публікацыі ў Менск (брашура была выдадзена ў друкарні Я. Грынблата пад грыфам Народнага сакратарыята міжнародных спраў БНР)[18]. Адначасова беларускі ўрад дамагаўся ад немцаў дазволіць выданне па-беларуску яшчэ адной газеты[19]. У сярэдзіне красавіка 1918 года НСБ звярнуўся да менскага каменданта палкоўніка Франкенберга з просьбай аб выданні на беларускай мове газеты «Менскі вечар»[20]. У сваім звароце НСБ падкрэсліваў, што ў той самы час, як у горадзе выходзяць два штодзённікі па-руску, а на польскай мове адзін штодзённік і два штотыднёвікі, беларусы вымушаны абмяжоўвацца толькі дзвюма газетамі, якія да таго ж выдае не НСБ, а прыватныя асобы[21]. Пазней, 17 чэрвеня 1918 года, Я. Варонка зноў звярнуўся да нямецкіх улад ад імя Рады БНР, каб усё ж атрымаць дазвол на выданне «ўрадавай» газеты: «Апошні пэрыяд беларускага руху, – пісаў ён, – паставіў беларускіх дзеячаў у неабходнасьць як мага поўна і зьмястоўна асьвяшчаць усе падзеі беларускага жыцьця, знаёміць з гістарычным мінулым беларускага руху не толькі беларускую інтэлігенцыю, але і інтэлігенцыю апалячаную ды

[17] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 10, арк. 228.

[18] А. І. [А. Луцкевіч], *Усходняя Беларусь. Статыстычныя і гістарычныя матэрыялы*, Менск 1918.

[19] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 10, арк. 228а.

[20] *Ibidem*, спр. 22, арк. 58–60.

[21] *Ibidem*, спр. 10, арк. 206.

абруселую, якая зараз імкнецца да нацыянальнага аб'яднаньня, як ніколі раней. Гэтая неабходнасьць зараз узрасла тым больш, што шырокі попыт на беларускую кнігу зусім вычарпаў усе існуючыя запасы з ранейшых часоў, тады як выходзячыя беларускія газэты па характару свайго выданьня не могуць даваць вялікіх гістарычных асьветніцкіх ды эканамічных артыкулаў». Далей Я. Варонка прасіў дазволіць яму выпуск часопіса «Белорусское дело», які планаваў выдаваць на чатырох мовах – па-беларуску, па-руску, па-польску і па-нямецку агульным тыражом тры тысячы экзэмпляраў[22].

Трохі пазней з ідэяй выдаваць штотыднёвік «Варта» і тым самым «будзіць нацыянальную сьвядомасьць у стварэнні незалежнай Беларусі» выказаўся В. Захарка[23]. Але ўсе гэтыя звароты нямецкія вайсковыя чыноўнікі адхілялі, адзначаючы, што ў Менску ўжо друкуюцца «Беларускі шлях» і «Вольная Беларусь», і рэкамендавалі абмежавацца імі[24].

У Я. Варонкі было шмат выдавецкіх праектаў. Прынамсі, ён планаваў выданне ілюстраванага «Беларускага нацыянальнага слоўніка», прымеркаванага да выстаўкі імя Ф. Скарыны. З гэтай мэтай ён заклікаў усіх свядомых беларусаў – вучоных, грамадскіх працаўнікоў, палітыкаў, публіцыстаў, паэтаў, фальклярыстаў, тэатралаў, музыкантаў, мастакоў і іншых прадставіць яму свае фотакарткі з кароткай біяграфіяй[25]. Быў таксама праект выдання «Белай кнігі» – дакументальнага зборніка, які датычыў папярэдняга «пэрыяду барацьбы з народнымі камісарамі Заходняе вобласьці» і «прадстаўнікамі польскіх сілаў у Менску»[26]. Задумваўся і мастацкі альбом, прысвечаны беларускаму нацыянальнаму руху 1917–1918 гадоў, куды павінен быў увайсці цэлы шэраг партрэтаў беларускіх дзеячаў, віды гарадоў, якія маюць гістарычнае значэнне, тыпы на-

[22] *Ibidem*, спр. 21, арк. 158.
[23] *Ibidem*, спр. 19, арк. 50.
[24] *Ibidem*, спр. 10, арк. 219.
[25] *Ibidem*, спр. 19, арк. 54.
[26] *Ibidem*, спр. 8, арк. 72, 119–119 адв.

сельніцтва, здымкі гістарычных будынкаў розных гістарычных перыядаў. Рэдакцыя часопіса «Варта» планавала выданне карты БНР у двух фарматах – «у вялікім „насценным" памеры і ў выглядзе паштоўкі» – «з адпаведнымі праўкамі і дапаўненнямі ў тых месцах, дзе „тапографы" расійскай Акадэміі [Генеральнага штаба Узброеных Сіл. – *У. Л., А. Ч.*] зрабілі прыкрыя памылкі па заходняй ды паўднёвай межах» Беларусі[27].

Каб пашырыць інфармацыйную базу аператыўных навін і аналітычных матэрыялаў пры адлюстраванні падзей не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Украіне, Германіі, Польшчы, Літве і ў цэлым у Еўропе, пры НСБ было арганізавана бюро «вырезок по хранению и классификации материалов заимствованных из белорусских, немецких, польских, еврейских, русских, литовских, украинских, французских и др. газет, журналов и книг»[28].

Падчас нямецкай акупацыі геаграфія рынку прэсы ў Менску і іншых беларускіх гарадах істотна пашырылася. Распаўсюджванне савецкай прэсы з усходу было забаронена (яна дастаўлялася падпольна), затое можна было чытаць навіны з газет і часопісаў, якія траплялі сюды з Германіі, а таксама рускія «белыя» (антысавецкія), польскія, літоўскія, украінскія, яўрэйскія (на ідыш і іўрыце) перыядычныя выданні. Паводле даных Беларускага прэс-бюро, нямецкія, польскія і рускія газеты траплялі сюды на другі дзень пасля выхаду дзякуючы г. зв. «кніжным палявым лаўкам». У Менску з'явілася магчымасць набываць і беларускія выданні з Вільні[29].

З сярэдзіны 1918 года дзякуючы фінансавай падтрымцы з боку Беларускай гандлёвай палаты ва Украіне становішча беларускага ўрада змянілася ў лепшы бок[30]. Гэта паўплывала на развіццё беларускага друку не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Так, у Кіеве ад

---

[27] *Ibidem*, спр. 19, арк. 181–184.

[28] *Ibidem*, спр. 8, арк. 73, 75.

[29] *Ibidem*, арк. 27–27 адв.

[30] Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA), f. 582, ap. 2, b. 69, l. 66–66v.

імя мясцовай беларускай дыяспары па-руску выходзіла газета «Белорусское слово». Газета друкавала публіцыстыку М. Доўнар-Запольскага і Я. Хлябцэвіча, Устаўныя граматы БНР, зварот беларусаў-вайскоўцаў, якія знаходзіліся ва Украіне, пратэст Віленскай беларускай рады супраць польскіх прэтэнзій на беларускія землі[31].

Пераемнікам газеты «Белорусское слово» стала «Белорусское эхо» пад рэдакцыяй А. Мадзалеўскага, якое ставіла на мэце друкаваць «весткі аб будаўніцтве беларускае дзяржавы» і аб дзейнасці беларускіх арганізацый ва Украіне. Газета змясціла паведамленне пра абвяшчэнне незалежнасці БНР, ноту беларускай дэлегацыі аб непрызнанні падпісанага бальшавікамі Брэсцкага міру, афіцыйныя пастановы НСБ, інфармацыю пра дзейнасць Беларускай гандлёвай палаты ў Кіеве і інш. На яе старонках друкаваліся артыкулы М. Доўнар-Запольскага, Я. Хлябцэвіча, А. Цвікевіча, І. Краскоўскага і інш. Быў у газеце і «літаратурны куток». Да лістапада 1918 года выйшлі дзевяць нумароў[32].

«Яшчэ адна дзяржава ўзнікла на развалінах былой імператарскай Расіі, – пісаў А. Цвікевіч у выдадзенай у Кіеве брашуры «Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики». – Яшчэ адзін народ сам, без чужой падказкі ці насілля звонку бярэцца за будаўніцтва сваёй гістарычнай будучыні. Параўноўваючы з іншымі суседзямі, сённяшняе становішча Беларусі адрозніваецца толькі тым, што перад новай дзяржавай ляжаць нашмат большыя цяжкасці, чым перад нейкай іншай новаўтворанай дзяржавай»[33].

Пачын кіеўскіх беларусаў падтрымалі прыхільнікі палітычнай самастойнасці Беларусі, якія падчас Першай сусветнай вайны апынуліся ў Адэсе. Утвораныя там Беларуская нацыянальная рада

---

[31] А. Ліс, *«Белорусское слово»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 6. Кн. 2, Мінск 2003, с. 342.

[32] А. Ліс, А. Шорахаў, *«Белорусское эхо»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994, с. 8.

[33] А. Цвикевич, *Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики*, Киев 1918, с. 16.

і культурна-асветная арганізацыя «Беларускі гай», маючы сціплыя фінансавыя магчымасці, здолелі арганізаваць у Адэсе адно сярэдняе вучылішча-камуну, чатыры пачатковыя школы з беларускай мовай навучання, аматарскі тэатр-студыю, а таксама наладзілі выданне ўласнай газеты[34].

Рэальна не ацаніўшы ступень сваёй легітымнасці і палітычнага ўплыву, Рада БНР 24 мая 1918 года прыняла нічым не падмацаваны закон аб дзяржаўным статусе беларускай мовы на тэрыторыі Беларусі. Беларускі нацыянальны камітэт у Магілёве ў сваім лісце за 5 чэрвеня 1918 года ў Менск так выказаўся пра гэтае рашэнне: «Вітаючы адраджэнне беларускай народнай мовы і росквіт беларускай літаратуры, паэзіі і мастацтва, камітэт лічыць, што ўвядзенне ў дзяржаўнае справаводства беларускай мовы як абавязковай [з'яўляецца] нясвоечасовым крокам»[35].

Тым часам у Менску Народны Сакратарыят БНР паспеў выдаць зборнік вершаў «Матчын дар» Алеся Гаруна, «Песні жальбы» Якуба Коласа, «Бярозку» Ядвігіна Ш., паэму «Тарас на Парнасе», брашуру «Усходняя Беларусь» А. Луцкевіча, зборнік літаратурных твораў з газеты «Вольная Беларусь», «Дзіцячую чытанку» для пачатковых класаў беларускіх школ і інш.[36]

Вельмі востра адчувалася патрэба ў беларускамоўных школьных падручніках. Прыходзілася выкарыстоўваць даваенныя школьныя чытанкі Цёткі і Якуба Коласа, а таксама школьную літаратуру выдадзеную ў Обер Осце, што паўлегальна дастаўлялася з Вільні. Сітуацыя палепшылася ўвосень 1918 года, калі немцы скасавалі абмежаванні на эканамічныя і культурныя сувязі паміж Менскам і Вільняй. Пры ўрадзе БНР быў нават створаны маленькі аддзел па падрыхтоўцы школьных падручнікаў, як арыгінальных, так і перакладных.

---

[34] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 21, арк. 169–199.
[35] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 138, арк. 74.
[36] *Ibidem*, спр. 19, арк. 177–178.

Але для выдання падручнікаў у Менску адсутнічала належная выдавецкая база. К. Езавітаў пісаў Я. Варонку ў верасні 1918 года аб прамаруджванні ў выданні часопіса «Варта»: «У горадзе часопіс даўна чакаюць і пачынаюць сумнявацца ў тым, што ён выйдзе»[37]. Адзін нумар часопіса ўсё ж выйшаў у кастрычніку. Фактычна гэта было адзінае перыядычнае выданне на беларускай мове, якое ўбачыла свет пад грыфам БНР. У нумары былі надрукаваны артыкулы Я. Варонкі, А. Луцкевіча, К. Езавітава, П. Крачэўскага, прысвечаныя пытанням дзяржаўнага будаўніцтва, гаспадарчаму і культурнаму развіццю Беларусі. Тут жа ўпершыню быў змешчаны фотаздымак першага складу НСБ[38].

У пачатку снежня 1918 года Чырвоная Армія заняла Менск, і ўрад БНР на чале з А. Луцкевічам пераехаў спачатку ў Вільню, а затым у Гродна. Адначасова Рада БНР вяла перагаворы з Дзяржаўнай радай Літвы (Тарыбай) аб палітычнай падтрымцы і дзяржаўнай прыналежнасці Гродзеншчыны і Беласточчыны. У выніку, ужо ў пачатку снежня 1918 года было створана беларускае прадстаўніцтва ў Тарыбе на чале з В. Ластоўскім, а Я. Варонка стаў міністрам беларускіх спраў у літоўскім урадзе[39].

1 снежня 1919 года была абвешчана беларуская савецкая рэспубліка. У гэты ж час у Вільні пачала выходзіць новая беларуская газета «Грамадзянін», орган «левай фракцыі Беларускай сацыялістычнай грамады» (першы нумар выйшаў 14 студзеня 1919 года, пры бальшавіках)[40]. Рэдактарам «Грамадзяніна» з'яўляўся кіраўнік партыі беларускіх эсэраў Т. Грыб, які з аптымізмам сустрэў абвяшчэнне

[37] *Ibidem*, арк. 64.

[38] А. Каўка, *«Варта»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994, с. 224.

[39] T. Błaszczak, *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940. Rozprawa doktorska…,* s. 87–91; Э. Гімжаўскас, *Беларускі фактар пры фармаванні літоўскай дзяржавы ў 1915–1923 гг.*, Białystok, Vilnius 2012, с. 92–102; Д. Міхалюк, *op. cit.*, с. 301–310.

[40] А. Ліс, *«Грамадзянін»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996, с. 98.

савецкай Беларусі. «Я не за грошы стараўся адваяваць незалежную Беларускую Рэспубліку, – пісаў ён у той час з Вільні невядомаму адрасату, – цяпер яна адваявана, існуе рэальны ўрад, рамкі зроблены, трэба гатаваць партрэт, а партрэтам можа быць толькі культурнага ўзроўню агульнае развіццё нашага народа. […] Справа палітычная наладжана, незалежнасць Беларусі ў прынцыпе абаронена»[41].

Тым часам, апынуўшыся ў Гродне, што яшчэ заставалася пад немцамі, старшыня Рады Міністраў БНР А. Луцкевіч вырашыў зрабіць стаўку на ўдзел у Парыжскай мірнай канферэнцыі, дзе спадзяваўся дамагчыся прызнання БНР. У гэты час ён займаўся складаннем дыпламатычных мемарандумаў і нот у абарону незалежнасці Беларусі і адначасова рыхтаваў да друку брашуру М. Доўнар-Запольскага «Асновы дзяржаўнасці Беларусі»[42]. Неўзабаве яна выйшла праз аддзел друку Міністэрства беларускіх спраў урада Літвы (МБС). 5 лютага 1919 года Я. Варонка даслаў ліст А. Луцкевічу з падзякай за дапамогу ў выданні брашуры і 10 першых экзэмпляраў. Гэтая кніга выклікала вострую крытыку з боку літоўскага ўрада, калі беларуская дэлегацыя пачала яе распаўсюджваць сярод удзельнікаў мірнай канферэнцыі ў Парыжы[43].

Увесну 1919 года ўрад БНР спрабаваў аднавіць сваю інфармацыйна-выдавецкую дзейнасць за кошт сродкаў, атрыманых ад урада Украінскай Народнай Рэспублікі. 1 мая 1919 года ўбачыў свет першы нумар газеты «Зорка» пад рэдакцыяй Аўгенні Аляксюк, а з 30 сакавіка да 18 мая 1919 года ў Гродне выйшла 11 нумароў газеты «Беларусь». «Зорку» фармальна выдаваў гродзенскі Беларускі нацыянальны камітэт, тады як «Беларусь» – Цэнтральная беларуская рада Гродзеншчыны на чале з П. Алексюком, зацверджаным камісарам БНР па Гродзенскай губерні[44].

---

[41] Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka (LMAVB), f. 21, vnt. 166, l. 3av.

[42] М. Доунар-Запольскі, *Асновы Дзяржаунасьці Беларусі*, Городно 1919.

[43] LMAVB, f. 21, vnt. 287, l. 25; T. Błaszczak, *op. cit.,* s. 117.

[44] А. Пяткевіч, *«Беларусь»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996, с. 486.

Тагачасны міністр унутраных спраў БНР Кузьма Цярэшчанка пісаў у справаздачы: «Нягледзячы на недахват газэтных працаўнікоў першыя дзевяць нумароў „Беларусі" былі добрыя, але апошнія нумары зьявіліся ніжэй уселякай крытыкі – гэта ўжо абмылка пана камісара Алексюка, які замест сваёй працы пачаў працу ў зносінах с польскім урадам без майго ведама і згоды. Газэты „Зорка" выйшла ўсяго 2 нумары, пасля чаго была зачынена за бязвінную саўсім стаццю аб паляках…»[45].

У сярэдзіне чэрвеня 1919 года ў Гродна прыехаў Т. Грыб, які разам з М. Маркевічам, Я. Чарапуком і П. Мядзёлкай пачаў выдаваць ад імя Цэнтральнай беларускай рады Гродзеншчыны газету «Родны край». Але фактычна яна з'яўлялася выданнем партыі беларускіх эсэраў. «У Горадзеншчыне ўзьняўся сільны антыпольскі рух, – паведамляў У. Крынскі, – які ўзначальвала партыя беларускіх рэвалюцыйных сацыялістаў. Сюды пераехаў адзін зь лідэраў гэтае партыі Тамаш Грыб і тут пачала выдавацца іхняя газэта „Родны Край". Эсэраўская ідэалёгія […] знайшла тут шмат прыхільнікаў, і ад гэтага часу Горадня сталася адным з мацнейшых цэнтраў гэтага руху»[46].

Рэдакцыя газеты знаходзілася ў памяшканні Цэнтральнай беларускай рады Гродзеншчыны, якую эсэры выкарыстоўвалі ў якасці прыкрыцця сваёй палітычнай агітацыі. «Кожны вечар [...], – згадвала П. Мядзёлка, – народу, асабліва моладзі, збіралася шмат. Хто прыходзіў пачытаць газеты і часопісы, хто на рэпетыцыі, а хто проста спаткацца з людзьмі, пагутарыць. Амаль кожную нядзелю ў кніжнай зале наладжваліся танцы...»[47].

Газета «Родны край» змяшчала інфармацыю пра культурна-асветнае жыццё Гродна, гісторыю краю, карэспандэнцыі з месцаў. Канфлікт з польскімі ўладамі выклікаў надрукаваны ў пятым ну-

[45] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 22, арк. 58–60.

[46] У. Крынскі, *Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне*, «Новая дарога» 1942, № 28, 4 кастрычніка, с. 4.

[47] П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця*, «Полымя» 1993, № 5, с. 190.

мары «Роднага краю» артыкул Я. Чарапука пад назвай «Правам ці мячом» з заклікам «руйнаваць гнёзда двухглавых і адноглавых арлоў» на беларускай зямлі[48]. У адказ мясцовыя польскія арганізацыі выдалі адозву з пратэстам, а адна з польскіх газет, перадрукаваўшы гэты артыкул, звярнулася да пракуратуры з патрабаваннем закрыць «Родны край». У выніку, 20 ліпеня 1919 года былі арыштаваны сябры рэдакцыі П. Мядзёлка, К. Салошык, А. Фохт і Я. Натусевіч. Адначасова ў Вільні быў зняволены Т. Грыб, пазней пераведзены ў гродзенскую турму[49].

Пазней М. Краўцоў у менскай газеце «Звон» выступіў з вострай крытыкай беларускіх эсэраў. «Адна з палітычных групіровак, – пісаў ён у артыкуле «Палітычная нясьпеласьць», – выдаючы ў Горадні беларускую газэту «Родны край», зьмясьціла ў ёй артыкул, які праўдзівей было б назваць бунтарскаю адозваю, разлічаную на пэўны палітычны шумок ды толькі таго. Але вышла куды горш, як думалі [...] палітычныя камэдыянты. Улада, прыкрыўшы газэту, прыкрыла разам [...] і ўсю работу зарганізаваных у Горадні беларусаў... Чаму за імпэт двох юнакоў павінны адказ трымаці ўсе нашые арганізацыі Горадзеншчыны?.. Майце грамадзянскую адвагу і палітычны такт рызыкаваць толькі працаю сваёй партыі і яе імем, а ўсяго беларускага руху пад рэпрэсіі не падстаўляйце»[50].

Тым часам урад БНР спрабаваў наладзіць выданне беларускай літаратуры на беларускай тэрыторыі, занятай улетку 1919 года польскімі войскамі. Паводле К. Цярэшчанкі, у пачатку 1919 года ўрад БНР стаў галоўным спонсарам Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні (увесну таго ж года БВТ атрымлівала фінансавыя субсідыі ад мясцовай савецкай улады). «Выдавецкае таварыство ў гэты час, – пісаў К. Цярэшчанка, – мае каля 50 000 марак грошэй

[48] «Родны край» 1919, № 5, 7 кастрычніка, с. 1; А. Ліс, *«Родны край»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 6. Кн. 1, Мінск 2001, с. 118–119.

[49] „Echo" 1919, № 150; П. Мядзёлка, *op. cit.*, с. 135–137, 190.

[50] «Звон» 1919, № 4, 1 верасня.

і больш чым на 150 000 марак паперы. Прамой грашовай падмогі Выдавецкаму таварыству не патрэбна, але ўкосвенная вельмі важна; яна павінна выражацца ў закупкі дзеля школ і бібліятэк кніг, выдаваемых таварыствам. Я лічыў бы важным, калі б Рада Міністраў асыгнавала не менш 15 000 мар. на штомесячную закупку кніг для школ і бібліятэк. Бібліятэкі патрэбны пры школах, коопэратывах, цэрквах, касцелах і ў нацыянальных гуртках»[51].

Адносна віленскай газеты «Беларуская думка» К. Цярэшчанка пісаў: «Лічучы з налічнасьцю пэрсаналю, здольнага працаваць у газэце і з патрэбнасцью сур'ёзнай газэты дзеля дзяржаўнай справы, – абавязкова, што яна зрабілася штодзённай. Гэта справа разглядалася у Вільні сярод адпаведных кругоў і там прыйшлі да такога ж перакананьня. Да таго часу, пакуль не будзе добра наладжэна добрая камунікацыя то вядома газэта будзе даваць дэфіцыт»[52].

Адначасова з тым, як з'яўляюцца чарговыя беларускія выданні, асаблівую вастрыню набывае пытанне іх распаўсюджвання. У сярэдзіне студзеня 1919 года А. Смоліч пісаў да А. Луцкевіча з Украіны: «Прышліце як мага больш сюды якаснай літаратуры – асабліва вучэбнікаў – усіх па 1 экзэмпляру і матэрыялы да друку і перадруку. Здаецца распачнём выдавецтва»[53]. Віленскае выдавецтва «Веда» ў верасні 1919 года планавала даслаць у Менск 3000 экзэмпляраў лемантара «Зорка», 1000 – «Роднага краю», 400 – «Геаграфіі Беларусі», 500 – «Расейска-беларускага слоўніка» і інш.[54] Ужо ў канцы 1919 года на станцыі Вежбалова (цяпер Virbalis, Vilkaviškio rajonas, Літва) літоўцы арыштавалі беларускіх кур'ераў, у якіх канфіскавалі некалькі карт БНР і беларускую літаратуру. Частка карт была адрасавана міністру беларускіх спраў урада

[51] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 22, арк. 58–60.
[52] *Ibidem*.
[53] LMAVB, f. 21, vnt. 287, l. 24v.
[54] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 34, арк. 11.

Літвы Я. Варонку, што выклікала скандал і абвінавачванне апошняга ў здрадзе літоўскай дзяржаве[55].

Разам з тым, МБС працягвала актыўную інфармацыйна-выдавецкую дзейнасць. Яшчэ ў кастрычніку 1919 года пачаў выходзіць «Часопісь Міністэрства Беларускіх Спраў». Тады ж было закладзена Таварыства імя Ф. Скарыны, кіраўніком і галоўным арганізатарам якога выступаў Я. Варонка. Адным з вынікаў працы таварыства стала публікацыя кнігі К. Езавітава на рускай мове «Белорусы и поляки: документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 гг.». Галоўнай мэтай кнігі было паказаць сутнасць акупацыйнай палітыкі Польшчы на тэрыторыі Беларусі. Першапачаткова ў прапагандысцкіх мэтах яе планавалася выдаць на рускай, польскай, беларускай, літоўскай, французскай, нямецкай і англійскай мовах агульным тыражом 10 тысяч экзэмпляраў. Аднак у выніку фінансавых праблем было надрукавана толькі тры тысячы экзэмпляраў па-руску[56]. Яшчэ адной важнай падзеяй стаў выхад брашур Я. Варонкі «Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции» і «Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: кароткі агляд». Праўда, калі другую працу можна далучыць да беларускай прапаганды, дык у першай Я. Варонка выступаў з пазіцый літоўскай дзяржаўнасці, выразна адзначаючы, што тэрыторыя заходняй Беларусі належыць Літве[57].

Тым часам урад БНР не пераставаў шукаць новыя магчымасці для разгортвання беларускай выдавецкай справы. Ужо 15 ліпеня

---

[55] T. Błaszczak, *op. cit.,* s. 122.

[56] К. Езовитов, *Белорусы и поляки. Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 гг.*, Ковна 1919; T. Błaszczak, *op. cit.,* s. 120–121.

[57] И. Воронко, *Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции*, Ковно 1919; Я. Варонка, *Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: кароткі агляд*, Коўна 1920. «Выключэннем на фоне ўсёй палітычна-прапагандысцкай літаратуры, што выдавалася ў Каўнасе Таварыствам Францыска Скарыны, – піша Т. Блашчак, – з'яўляецца ананімная паэма «Тарас Паляшук» (больш вядомая пад арыгінальнай назвай «Тарас на Парнасе»)» (T. Błaszczak, *op. cit.,* s. 120–121).

1919 года ў Вільні адбылося арганізацыйнае пасяджэнне новага выдавецкага таварыства «Крыніца». У склад заснавальнікаў увайшлі А. Смоліч, Б. Тарашкевіч, В. Ластоўскі, Я. Станкевіч і М. Гарэцкі. У часовы прэзідыум таварыства ўвайшлі К. Дуж-Душэўскі, Б. Тарашкевіч і М. Гарэцкі. Перад новай установай стаяла задача выдаваць беларускія падручнікі. Рэдакцыя набыла рукапісы «Расейска-беларускага слоўніка» М. Гарэцкага, «Дзіцячых гульняў» і «Роднага краю» Л. Чарняўскай (жонкі М. Гарэцкага). Акрамя таго, было запланавана другое выданне «Беларускай граматыкі для школ» Б. Тарашкевіча[58].

У сярэдзіне верасня 1919 года таварыства «Крыніца» змяніла назву на «Веда». Яго ўзначаліў Я. Станкевіч, які ахвяраваў на яго развіццё ўласныя 7,5 тысяч польскіх марак. Былі выдадзены «Геаграфія Беларусі» А. Смоліча, другая частка матэматычнага «Задачніка» Р. Юрэвіча, «Зорка» Аляксандры Смоліч, «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча і карта Беларусі[59]. 21 верасня 1919 года адбылася сустрэча кіраўніцтва выдавецтва са старшынёй урада БНР А. Луцкевічам, які прыехаў у Вільню. Вынікам сустрэчы стала рашэнне аб'яднаць разам Беларускае выдавецкае таварыства і «Веду» ў адно кааператыўнае Беларускае выдавецкае таварыства[60].

Заняцце палякамі Менска ў жніўні 1919 года стала паваротным момантам у беларускай выдавецкай справе. 10 жніўня 1919 года на агульным сходзе менскага беларускага актыву быў утвораны Часовы Беларускі нацыянальны камітэт (ЧБНК)[61]. Яго першым старшынёй быў абраны А. Прушынскі (Алесь Гарун), аднак ужо неўзабаве яго змяніў міністр унутраных спраў БНР К. Цярэшчанка[62].

Шмат намаганняў кіраўніцтва ЧБНК скіроўвала на беларусізацыю навучальных устаноў, заснаванне культурна-асветных і ма-

[58] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 34, арк. 7, 9, 10.
[59] *Ibidem*, арк. 11.
[60] *Ibidem*, арк. 15.
[61] НАРБ, ф. 368, воп. 1, спр. 24, арк. 1–1 адв.
[62] *Ibidem*, арк. 7.

ладзёжных гурткоў, развіццё кааператываў і сельскагаспадарчых таварыстваў, пашырэнне беларускай прэсы ў правінцыі. Дзякуючы ЧБНК у Менску былі заснаваны новыя газеты і часопісы: «Звон», «Беларусь», «Беларускае жыцьцё» (Вільня, Менск), «Рунь», а таксама выйшлі два нумары слуцкай «Нашай каляіны». Да камітэта перайшла менская земская друкарня.

У пачатку 1920 года А. Луцкевіч пад псеўданімам Веслаў Калиноўскі выдаў па-польску брашуру «Усходняе пытанне і Беларусь»[63]. У самой кнізе разглядалася ўсяго адно пытанне: «Якую пазіцыю павінна заняць вольная Польшча да дзяржаватворнай працы беларускага народа?»[64]. А. Луцкевіч лічыў, што «Польская дзяржава, як дзяржава, безумоўна зацікаўлена ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці і аддзяленні Беларусі ад Расіі. Ніякі кампраміс з Расіяй коштам Беларусі не ратуе ад небяспечнай сітуацыі, якая ўзнікае ў выніку падзелу гэтага краю». Прэм'ер-міністр БНР разлічваў на тое, што яму ўдасца сыграць на амбіцыях кіраўніка Польшчы Ю. Пілсудскага: «Цяжкасць, якая тут з'яўляецца, гэта ўзгадненне беларускага дзяржаўнага будаўніцтва з падобным будаўніцтвам літоўскім. З гэтага пункту гледжання беларусы вельмі ясна і неаднаразова заяўлялі пра сваё жаданне супрацоўнічаць з літоўскім народам у кірунку адраджэння дуалістычнага Вялікага Княства Літоўскага. І саюз з Польшчай пры падтрымцы аднолькава зацікаўленых у рэалізацыі гэтай канцэпцыі мясцовых палякаў і жыдоў у значнай меры паскорыў бы вырашэнне праблемы „Вялікай Літвы". А далей, праз Беларусь, Польшча ўстанавіла б шчыльны кантакт з Латвіяй і Эстоніяй. А далей, пад уплывам беларускай акцыі, паскорыўся б паварот да Польшчы, які ўжо выразна адзначаецца ва Украіне, што дало б сур'ёзныя вынікі ў кірунку вырашэння Польшчай усходняга пытання. Вядома, што палітыка Украіны і палітыка Беларусі заўсёды мелі шмат супольных пунктаў і ўзаемна адна на адну

[63] А. Сідарэвіч, *Прадказаньні Антона Луцкевіча*, „Arche" 2009, № 3, с. 439–442.
[64] А. Луцкевіч, *Усходняе пытаньне і Беларусь*, „Arche" 2009, № 3, с. 448.

ўплывалі і ўплываюць». Заставалася толькі высветліць, што на гэта ўсё скажа Масква. Тут А. Луцкевіч быў катэгарычны: «Незадаволенасць Расіі?! Польская дзяржава павінна баяцца Расіі, адноўленай у граніцах 1914 г. – без кангрэсовай Польшчы. Расія без Балтыкі, без Беларусі, без Украіны не запалохае нікога – тым больш, калі з гэтых адасобленых зямель узнікне моцны, звязаны супольнасцю інтарэсаў комплекс дзяржаў». Вывад, да якога прыходзіў аўтар, гучаў як дыпламатычная прапанова: «Трэба дзейсна падтрымаць беларускае дзяржаўнае будаўніцтва і нацыянальна-культурную працу з тым слушным перакананнем, што Беларусь пойдзе плячо ў плячо з тым, хто ў вырашальны момант дасць ёй дапамогу»[65]. Аднак праблема была якраз у тым, што далёка не ўсё ва ўнутранай палітыцы Польшчы адносна беларусаў залежала ад Ю. Пілсудскага. І сам кіраўнік польскай дзяржавы быў далёкі ад шчырасці ў беларускім пытанні.

Далейшая рэарганізацыя і пашырэнне беларускай выдавецкай справы спынілася ў сувязі з расколам Рады БНР, які адбыўся ў снежні 1919 года. Тым не менш, у гэтым годзе беларускімі выдавецтвамі былі выпушчаны 11 выданняў: «Дзядзька Якуб» Ф. Аляхновіча, праграма і статут Беларускай народнай партыі, кніжка для чытання «Родны край» Л. Гарэцкай, «Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнік» М. Гарэцкага, «Зорка» Аляксандры Смоліч, новае выданне «Беларускай граматыкі для школ» Б. Тарашкевіча, два календары – «Крыніца» і «Наша хата»[66]. 20 сакавіка 1920 года ў Менску быў падпісаны беларуска-польскі дагавор, які сярод іншага прадугледжваў фінансаванне польскім бокам выдання падручнікаў для беларускіх школ[67].

---

[65] *Ibidem*, c. 448–450.

[66] LMAVB, f. 79, vnt. 868, l. 3–3v.

[67] *Документы и материалы по истории советско-польских отношений.* T. II (ноябрь 1918 г. – апрель 1920 г.), Москва 1964, с. 610–612; K. Gomółka, *Rozmowy polsko-białoruskie,* „Dzieje Najnowsze. Kwartalnik poświęcony historii XX wieku" 1988, r. 20, z. 1, s. 8–9.

2 кастрычніка 1920 года ў Гродне пачала выходзіць газета «Беларускае слова», рэдактарам якой быў В. Адамовіч-малодшы, больш вядомы як атаман Дзяргач[68]. «Наша мэта ясная, – абвяшчала «Беларускае слова» ў сваім першым нумары, – нашыя шляхі – простыя. Мы будзем змагацца, як ужо з даўніх часоў змагаецца лепшая частка беларускай інтэлігенцыі, за незалежнасьць Беларусі... Мы ведаем, што ўжо хутка Беларусь станецца запраўды незалежнай... Дэмакратычная Польшча, напісаўшы на штандары сваім імя і ідэю Пілсудскага, чынна паможа Беларусі здабыць незалежнасьць»[69].

У гэты самы час Беларускі палітычны камітэт (БПК) выдаваў газету «Зьвястун», якая павінна была стаць ідэалагічным рупарам войска генерала С. Булак-Балаховіча падчас палескага паходу. На старонках газеты з'явіўся шэраг публічных заяў, як, напрыклад, адозва камітэта «Да жыхароў краю»[70]. Іншая адозва, да яўрэйскага насельніцтва, заклікала да агульнай працы ў імя Беларусі і абяцала прыцягнуць да адказнасці ўсіх вінаватых у пагромах[71]. А ўжо 16 лістапада 1920 года ў Мазыры БПК абвясціў генерала С. Булак-Балаховіча «начальнікам» беларускай дзяржавы. У сваю чаргу, генерал выступіў з заявай аб непрызнанні існуючых органаў БНР і абвясціў аб стварэнні новага ўрада на чале з В. Адамовічам-старэйшым. Галоўныя пастулаты новага палітычнага ўтварэння зводзіліся да барацьбы за незалежнасць Беларусі, склікання ўстаноўчага сходу і стварэння беларускай дзяржавы ў цесным саюзе з Польшчай, пры апоры на краіны Антанты[72].

---

[68] Больш падрабязна гл.: А. Пашкевіч, А. Чарнякевіч, *Невядомыя старонкі біяграфіі В. Адамовіча, ці Да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху* [у:] *Берасцейскі храніограф. Зборнік навуковых прац.* Вып. 4, Брэст 2004, с. 314–334;

[69] «Беларускае слова» 1920, № 1, с. 1.

[70] Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN), TSK, t. 99, k. 8.

[71] *Ibidem*, k. 9.

[72] LCVA, f. 22, ap. 1, b. 56, l. 41v.

Кіраўніцтва БНР сустрэла гэтыя навіны негатыўна. Тым не менш, навіны з фронту, дзе вёў баі С. Булак-Балаховіч, перадрукоўвалі ў беларускіх выданнях амаль без каментарыяў[73]. Неўзабаве, аднак, сітуацыя змянілася, і віленская газета «Наша ніва», якая перад гэтым размяшчала паведамленні пра наступ «народнай арміі», выступіла з нататкай зусім супрацьлеглага зместу: «У Вільні атрымана жменя адозваў і улётак арміі С. Булак-Балаховіча па-беларуску. Усё гэта робіць даволі мізэрнае ўражаньне. „Зьвястун" – „Білютэнь Беларускага палітычнага камітэту пры Народнае арміі генерала Булак-Балаховіча" – гэта лісток на адной старонцы, напісаны даволі падазрыцельнай з боку беларускасьці мовай. І ўсюды – адно толькі ўвасхваленьне „Вялікага Правадыра Бацькі Булак-Балаховіча" ў форме ня зусім прыстойнай. Да штабу Балаховіча езьдзілі некалькі маладых беларускіх афіцэраў, але вельмі хутка вярнуліся адтуль. „Беларускасьць арміі Балаховіча, – кажуць, – гэта толькі форма, пад якой хаваецца чыстая маскоўшчына". Дый склад палітычнага камітэта з панам Аляксюком на чале ня можа вызваць даверыя беларускага грамадзянства. Паводле тых жа афіцэраў, спробы палітычнага камітэту зьдзержываць „балахоўцаў" ад рабункаў спакойнага насяленьня даюць мала карысьці: „балахоўцаў" вельмі трудна перарабіць, – і дзе яны пяройдуць, там, як кажуць, і „трава не расьце". Наагул, прыглядзеўшыся да ўсяе „балахоўшчыны", беларускія афіцэры расчараваліся ўва ўсім гэтым прадпрыемстве і ня суляць яму ўдачы на даўжэйшы час…»[74]. Яшчэ больш востpай аказалася заява Беларускага прэс-бюро ў Каўнасе, у якой адзначалася, што дзейнасць самазваных «прадстаўнікоў незалежнай Беларусі», якія запрашаюць ад імя народа «доблесныя расейскія войскі», не мае нічога агульнага з беларускім грамадствам[75].

[73] «Наша ніва» 1920, № 5, 22 лістапада, с. 2.
[74] «Наша ніва» 1920, № 6, 29 лістапада, с. 1.
[75] „Przymierze" 1920, № 14, 14 listopada, s. 16.

Тым часам у Вільні з'явіўся цэлы шэраг беларускамоўных перыядычных выданняў, заснавальнікі якіх пачалі паміж сабой вострую палітычную барацьбу. У канцы 1920 года быў зменены статут Беларускага выдавецкага таварыства, а яго праўленнне пераабрана. 13 кастрычніка старшынёй БВТ стаў В. Іваноўскі, у склад праўлення ўвайшлі М. Какановіч (віцэ-старшыня), А. Станкевіч, М. Гарэцкі, Б. Тарашкевіч, Ф. Умястоўскі і Г. Багдановіч[76]. Аднак ужо на агульным сходзе 17 кастрычніка кіраўніцтва арганізацыі зноў змянілася. На гэты раз старшынёй выдавецтва стаў М. Гарэцкі, яго намеснікам А. Луцкевіч, а скарбнікам А. Станкевіч. В. Іваноўскі і Б. Тарашкевіч былі абраны ў рэвізійную камісію. Загадчыкам рэдакцыйна-выдавецкай часткі быў прызначаны Я. Станкевіч. Пры гэтым было выказана пажаданне, каб «рукапісы з прынцыповага боку, а таксама і важнейшую тэрміналёгію разглядала адмысловая камісія», а пасля зацвярджаў старшыня. Адначасова было вырашана кнігарню таварыства здаць у арэнду Э. Будзьку[77]. 19 кастрычніка 1920 года было прынята рашэнне аб юрыдычным скасаванні выдавецтва «Веда» («Крыніца»), якое ўжо не дзейнічала, і аб перадачы яго маёмасці рэарганізаванаму БВТ[78].

Старой праблемай беларускай выдавецкай справы заставаўся брак новых высакаякасных рукапісаў, што прымушала выдаўцоў перавыдаваць ранейшую літаратуру. У пачатку верасня 1921 года Аляксандра Смоліч пісала, звяртаючыся да БВТ: «Напісаныя мною кніжкі – лемантар „Зорка" і чытаньне да яго ўжо некалькі разоў перавыданы рознымі выдавецкімі фірмамі, пры чым ні адна з іх нават не патурбавалася паведаміць мяне аб гэтым. З гэтай прычыны апошняе выданьне лемантара мае ў сабе тыя ж памылкі, што былі і ў першым выданьні і той самы правапіс, якім друкаваліся кніжкі да выхаду ў сьвет граматыкі Тарашкевіча. Уважаючы, што ў такім

[76] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 34, арк. 5.
[77] *Ibidem*, арк. 17.
[78] *Ibidem*, арк. 12.

відзе лемантар не павінен быць ужываны ў школах, катэгарычна прашу спыніць далейшае выдаваньне кніжкі з старых матрыц. Разам з гэтым паведамляю, што лемантар мною перагледжаны нанова і папраўлены згодна з досьледамі маей школьнай практыкі. Выдаўцу новых выданьняў лемантара я маю паставіць пэўныя варункі, аб якіх, калі зацікавіцеся, магу паведаміць асобна»[79].

Тым часам урад БНР ужо больш за год функцыянаваў на эміграцыі і быў вымушаны шукаць новыя фінансавыя сродкі для працягу сваёй дзейнасці. Яшчэ ў сярэдзіне 1919 года пры дыпламатычнай місіі БНР у Берліне была заснавана Беларуская служба друку і тэлеграфнай інфармацыі, якая двойчы на тыдзень выпускала інфармацыйныя бюлетэні з адлюстраваннем праблем Беларусі (першы інфармацыйны бюлетэнь убачыў свет у чэрвені 1919 года). Паводле Л. Зайца, нямецкая афіцыйная і неафіцыйная прэса выяўляла цікавасць да праблем Беларусі, беларусаў ахвотна запрашалі чытаць лекцыі і даклады, у якіх закраналася адпаведная праблематыка. Прэс-бюро пры дыпламатычнай місіі БНР у Берліне падтрымлівала кантакты з афіцыйным выдавецтвам Вольфа, забяспечвала інфармацыяй МЗС Германіі і афіцыйнае агенцтва «Прэсэ-Вартэ». А. Луцкевіч асабіста накіроўваў артыкулы і нататкі пра Беларусь у нямецкія газеты і часопісы, садзейнічаў выпуску на нямецкай мове кніг, якія змяшчалі інфармацыю пра Беларусь, яе гісторыю, культуру, эканамічнае развіццё. Першая кніга падобнага роду была выпушчана ў Берліне пад рэдакцыяй В. Егера ў выдавецтве Karl Curtius[80]. Неўзабаве ў Германіі былі выдадзены палітычны нарыс А. Цвікевіча «Беларусь», паштоўкі з гербамі беларускіх ваяводстваў і карта з абазначэннем этнаграфічных граніц Беларусі[81]. Акрамя таго, у берлінскай друкарні

[79] LMAVB, f. 21, vnt. 554, l. 1.

[80] W. Jäger, *Weissruthenien*, Berlin 1919.

[81] А. Тихомиров, *Проблема белорусско-германских отношений в 1914–1922 гг.*, «Белорусский журнал международного права и международных отношений» 2002, № 4, с. 41–42.

Ю. Галеўскага былі надрукаваны ў значнай колькасці дыпламатычныя пашпарты БНР[82].

На 1920 г. шэфам Беларускага прэс-бюро ў Берліне з'яўляўся Л. Заяц, а дарадчыкам па пытаннях прэсы Валянцін фон Дытман. Прэс-бюро адзін-два разы на тыдзень выпускала свае інфармацыйныя бюлетэні па-нямецку, у якіх змяшчала галоўныя навіны пра Беларусь. Таксама ўдалося наладзіць сувязь з некаторымі тэлеграфнымі агенцтвамі: нямецкім – Вольфа, літоўскім – Elta і іншымі. Прэс-служба берлінскай місіі БНР рыхтавала для беларускага ўрада ў Каўнасе агляды замежнай прэсы, якая дасылалася з Берліна, Капенгагена і іншых еўрапейскіх гарадоў, дзе знаходзіліся беларускія замежныя прадстаўніцтвы. У верасні 1921 года было адкрыта Беларускае прэс-бюро ў Данцыгу, якое ўзначаліў Ісак Лур'е. Прыкладна тады ж Я. Варонка і Я. Чарапук заснавалі Беларускае прэс-бюро ў Чыкага (ЗША).

Былі зроблены спробы і беларусамі Латвіі наладзіць выдавецкую дзейнасць. У сакавіку 1920 года выйшаў адзіны нумар літаратурна-грамадскага часопіса «На чужыне» рыжскага аддзела Беларускага культурна-асветнага таварыства «Бацькаўшчына», рэдактарам якога быў Р. Казячы. Галоўнай мэтай новага выдання з'яўлялася *«згуртаваць усе беларускія сілы, працуючыя за мяжой»*. У выданні былі змешчаны партрэты беларускіх дзеячаў, вершы, некаторыя з якіх прыпісваліся С. Булак-Балаховічу. Быў таксама змешчаны тэкст з нотамі беларускай марсельезы «Адвеку мы спалі». Праўда, неўзабаве на загад міністра ўнутраных спраў Латвіі часопіс быў забаронены. Нагодай стала карта Беларусі, надрукаваная на вокладцы, якая ўключала і частку тэрыторыі Латвійскай Рэспублікі[83].

Яшчэ адным выдавецкім праектам урада БНР стаў выпуск паштовых марак г. зв. Асобнага атрада БНР. Яшчэ ў канцы жніўня

---

[82] Д. Міхалюк, *op. cit.*, с. 246.

[83] *Архівы Беларускай…,* с. 500; Д. Міхалюк, *op. cit.*, с. 406; В. Герасімаў, *«На чужыне»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 5, Мінск 1999, с. 253.

1919 года Рада Народных Міністраў БНР зацвердзіла прапанову міністра беларускіх спраў урада Літвы Я. Варонкі аб выпуску «дзержаўных беларускіх пачтовых і гэрбавых марак». За права выпуску марак ён павінен быў заплаціць дзяржаўнаму скарбу «50% нарыцацельнай цаны праданых марак». Фактычна, гэта азначала перадачу канцэсіі прыватнай асобе, аднак беларускі бок пакідаў за сабою магчымасць выкупіць пазней гэта права[84]. Пагаршэнне беларуска-літоўскіх адносін, аднак, не дазволіла рэалізаваць гэты праект. Замест гэтага беларускія маркі выдаў К. Езавітаў, плануючы такім чынам атрымаць сродкі на фарміраванне беларускіх вайсковых часцей. Яму нават удалося правесці гашэнне значнай часткі гэтых марак у паштовай канторы ў Марыенбургу (Алукснэ), і яны пэўны час знаходзіліся ў паштовым абароце на тэрыторыі Латвіі. Пазней К. Езавітаў здолеў зацікавіць беларускімі маркамі еўрапейскіх філатэлістаў і нават выслаў пробную партыю ў Берлін[85].

Пасля падпісання ў канцы 1920 года пагаднення паміж урадамі БНР і Літвы беларуская інфармацыйна-выдавецкая дзейнасць у Каўнасе актывізавалася. Тут з'явілася Беларускае прэс-бюро, якое пачало выдаваць «Бюлетэнь Беларускага Прэс-Бюро ў Коўне». На чале бюро ў розны час стаялі К. Дуж-Душэўскі, А. Аўсянік, І. Лур'е і А. Валковіч. Толькі ў 1921 годзе выйшла 160 нумароў бюлетэня, які высылаўся ў розныя краіны (налічвалася да 70 карэспандэнтаў і падпісчыкаў, сярод якіх выдавецтвы, тэлеграфныя агенцтвы, прыватныя асобы). Аднак пазней колькасць нумароў, як і колькасць атрымальнікаў бюлетэня значна скарацілася. Апошнія яго шэсць выпускаў пабачылі свет у 1924 годзе[86].

---

[84] *Архівы Беларускай…,* с. 418.

[85] Л. Карповіч, *Беларуская паштовая марка: ад вытокаў да эміграцыі*, «Запісы Беларускага інстытуту навукі й мастацтва» 2013, № 36, с. 90–99; В. Батиевский, *Марки и полевая почта «Асобнага атрада БНР»* [online], http://mirmarok.ru/prim/view_article/732 [доступ: 14.11.2016].

[86] T. Błaszczak, *op. cit.,* s. 194–196.

Асеўшы ў Каўнасе, загранічны камітэт Беларускай партыі эсэраў з канца 1920 года пры дапамозе літоўскіх сацыял-дэмакратаў хутка наладзіў выданне антыпольскай літаратуры для перапраўкі яе ў падкантрольную палякам Сярэднюю Літву. Паўліна Мядзёлка, у той час жонка лідара беларускіх эсэраў Т. Грыба, пазней успамінала: «У Каўнасе хутка знайшлася праца для мяне. Тамаш ужо завязаў зносіны з сацыял-дэмакратычнымі коламі літоўскіх дзеячаў. Пры матэрыяльнай дапамозе, арганізаванай прафесарам Жэмайцісам, мы з Тамашам заняліся выданнем агітацыйна-прапагандысцкай літаратуры, накіраванай супраць польска-панскіх акупантаў у Заходняй Беларусі. Друкаваліся невялікія брашуры з самымі бязвіннымі загалоўкамі, якія зусім не адпавядалі зместу гэтых брашур. А каб яшчэ больш замыліць вока польскіх жандараў, на адваротным баку вокладкі друкавалі на польскай мове: „Za pozwoleniem cenzury wojskowej”».

Напярэдадні выбараў у Сейм Сярэдняй Літвы ў 1921 годзе МБС выдала шэраг антыпольскіх прапагандысцкіх брашур: «Народны прыгавор», «Вышэй галаву беларускія сяляне», «Расейска-польскі баль і беларускае пахмельле», «Чаму-ж усыхаюць кветачкі польскія на гною беларуска-літоўскім?», «Ад мора да мора», «Зямлі беларускаму сялянству», «Чаму-ж ты маўчыш, кабета сялянская?», «Хто вінаваты?», «Стыдна маўчаць», «Прэч рукі ад нашай зямлі», «Спэкулянты беларускай душой», «Наша крыўда» і адозву «Да лепшых сыноў польскай нацыі». Аднак у 1922 годзе фінансаванне з боку літоўцаў значна скарацілася: МБС выдала ўсяго чатыры кнігі, не звязаныя з палітычнай кан’юнктурай: «Неба і зоры», «Закон жыцьця сярод жывёлаў», «Дудка беларуская» і «Сьпевак Бландэль». У 1925 – апошнім – годзе існавання МБС выйшла толькі адна кніга – пераклад на беларускую мову казак Г. Х. Андэрсэна[87].

[87] LMAVB, f. 21, vnt. 2212, l. 15–15v.; T. Błaszczak, *Białorusini w Republice*..., s. 120–121.

У канцы 1920 года ў Берліне сіламі беларускай эміграцыі было арганізавана беларускае выдавецкае таварыства «Вызваленьне» і Хаўрус дапамогі беларускім пісьменнікам імя Алеся Гаруна. Адным з першых выданняў новага выдавецтва стала кніга А. Цвікевіча «Адраджэньне Беларусі і Польшча», якая пабачыла свет напярэдадні І Беларускай агульнанацыянальнай канферэнцыі ў Празе ў верасні 1921 года. У сваёй працы аўтар паспрабаваў развесці два паняцці – польская культура і польская дзяржава, усяляк падкрэсліваючы небяспеку для беларускага руху з боку апошняй. «…Спрачацца з тым, што старая беларуская культура шла з Заходу і была з ім арганічна звязана – нельга […], – пісаў ён. – Так сама нельга спрэчацца з тым, што лепшая частка польскага грамадзянства за часоў рэвалюцыйнае барацьбы за свае вызваленьне, уплывала на беларускае адраджэньне і нават у апошнія гады царызму ідэйна дапамагала беларускаму руху. Але гэтыя факты надта мала, а мо' і зусім нічога не гавораць на карысьць палітычнага аб'яднаньня Беларусі з Польшчай. Гісторыя сьведчыць хутчэй наадварот, што культурнаму беларускаму адраджэньню трэба унікаць палітычнай сувязі з польскай дзяржавай»[88].

Далей А. Цвікевіч тлумачыў сваё бачанне галоўных прыярытэтаў у вырашэнні «беларускага пытання»: «Адраджэньне нацыянальнае культуры, разумеемай вузка, у форме адраджэньня мовы, літаратуры і навукі, становіць аднак толькі адну з мэт беларускага вызвольчага руху. Нагэтулькі ж працоўным заданьнем яго зьяўляюцца – соцыяльнае вызваленьне працоўных мас Беларусі, эканомічнае адраджэньне краю і, як вышэйшая праява нацыянальнай свабоды, – узмацненьне самаістнае нацыянальнае дзяржаўнасьці. […] Ніводная з гэтых мэт ня будзе на Беларусі дасягнута ў выпадку палітычнай залежнасьці яе ад сучаснай Польшчы»[89].

[88] А. Цьвікевіч, *Адраджэне Беларусі і Польшча*, Менск, Вільня, Berlin 1921, с. 146.

[89] *Ibidem*, с. 154.

Аўтар кнігі «Адраджэньне Беларусі і Польшча» зрабіў вывад аб сацыяльнай абумоўленасці беларуска-польскага канфлікту, які немагчыма вырашыць у межах сучаснай Польшчы: «Тэорыя беларуска-польскага збліжэньня занадта вялікае значэньне ў міжнацыянальных адносінах прыдае канстытуцыйным гарантыям. […] Нават пры найлепшых пісаных гарантыях, нават пры найспагадаючых настроях Варшавы, становішча беларускага Менску у хаўрусе с сучаснай Польшчай будзе заўсёды загроджана, калі ўспомніць аб ролі польскага „крэсовага элемэнту". Гэты „крэсовы элемэнт", гэтая зямельная арыстакратыя, шляхоцка-эксплюатуючы стан пры усіх добрых плянах цэнтра, абярне Беларусь у „крэсы", і пытаньне аб беларускім культурным адраджэньні абярне ў пытаньне „окраинной", „крэсовай" палітыкі»[90].

«Першае, – рэзюмуе А. Цвікевіч, – што вымагае адраджэньне Беларусі ад сучаснай Польшчы, – гэта пагадзіцца з фактам існаваньня беларускага народу, як адзінага цэлага, кінуць дзяліць яго па рэлігійнай азнацэ і не распаўсюджваць сваіх дзяржаўных прэтэнзій далей сваіх этнаграфічных граніц… Другая вымога, якую можна зазначыць у стасунку адраджаючайся Беларусі да польскай дзяржавы, гэта поўнае няўмешваньне Польшчы ў справу беларускага адраджэньня. Яму ня трэба апякунаў. Яно здолее здзейсьніць свае мэты ўласнымі сіламі»[91].

Увосень 1921 года, з-за поўнага развалу выдавецкай базы ў ССРБ, рашэннем СНК рэспублікі прымаецца рашэнне за савецкія залатыя чырвонцы друкаваць беларускамоўную школьную і мастацкую літаратуру ў Берліне. Адказным за арганізацыю беларускай выдавецкай базы ў Германіі быў прызначаны З. Жылуновіч (Цішка Гартны). Да гэтай працы ён далучыў П. Мядзёлку і роднага брата А. Цвікевіча – Івана. Чытаем ва ўспамінах П. Мядзёлкі: «Праездам з Мінска, затрымаўся на адзін дзень у Каўнасе Цішка

[90] *Ibidem*, с. 152–153.
[91] *Ibidem*, с. 181–182.

Гартны. Ён накіроўваўся ў Берлін па справе выдання беларускіх падручнікаў для школ. Спаткаўшы мяне на вуліцы, ён запрасіў супрацоўнічаць пад яго кіраўніцтвам у якасці стыль-рэдактара і карэктара. Разбураная ў часе войн паліграфічная прамысловасць Краіны Саветаў яшчэ не магла задаволіць шырокіх патрабаванняў на кнігі грамадска-палітычнай, мастацкай літаратуры і падручнікаў. А таму ў Замежгандлі пры Савецкім пасольстве ў Берліне быў арганізаваны выдавецкі аддзел, а ў ім секцыя беларускіх выданняў, у якой, апрача загадчыка Ц. Гартнага, працавалі Іван Цвікевіч і я. Кнігі друкаваліся ў Лейпцыгу, а карэктуру прысылалі ў выдавецкі аддзел Замежгандлю. У партфелі беларускай секцыі знаходзіліся 6–8 падручнікаў, зборнік беларускіх народных песень для хору ў апрацоўцы Тэраўскага і „Сокі цаліны" Цішкі Гартнага»[92].

Трэба сказаць, што беларускае савецкае выдавецтва ў Берліне актыўна кантактавала з мясцовым прадстаўніцтвам БНР, выкарыстоўваючы яго вопыт у арганізацыі выдання беларускамоўных падручнікаў, спеўнікаў і мастацкай літаратуры. Гэтае супрацоўніцтва тычылася не толькі тэхнічных аспектаў. Яно датычыла і арганізацыйных і творчых пытанняў, што адлюстравана ў архіўных дакументах. І. Цвікевіч, як адказны за выдавецкую справу ССРБ у Германіі, актыўна карыстаўся кур'ерскімі паслугамі дыпламатычнага прадстаўніцтва БНР па перасылцы карэспандэнцыі. Аб будучыні Беларусі прадстаўнікі БНР і ССРБ думалі ва ўнісон. І. Цвікевіч у лісце ад 8 лістапада 1921 года ў Каўнас, да прэм'ер-міністра БНР Вацлава Ластоўскага, пісаў: «Многапаважаны п. Ластоўскі! Выбачайце, што дакучаю вам з гэтымі тэрмінамі, але ніхто ня можа мне памагчы ў гэтым. Надзёўбваецца магчымасьць друкаваць рожныя табліцы для школ нашых і трэба будзе зрабіць надпісы на нашай мове. Апрача гэтага трэба ўсеж-ткі перакласьць для сярэдніх школ зоологію й яшчэ якія-небудзь кніжкі. Калі ласка, прышліце праз Бароўскага [кіраўнік берлінскай місіі БНР. – *У. Л.*, *А. Ч.*] мой пераклад

[92] П. Мядзёлка, *Сцежкамі жыцця. Успаміны*, Мінск 1974, с. 206.

– якой я рабіў у Коўне, разам з кніжкай. Так сама прышлеце тую кніжачку „Природоведение", што я зьбіраўся пералажыць. [...]

Любячае сэрца ўсюды знойдзець сваё роднае, йзноў выцягне на сьвет Божы, каб ведалі людзі, што ня мы, сучасьнікі, – першыя й апошнія. Жылі й будзем жыць. Хоць часам душа чарнее ад страху за свой народ, ад страху – колькі працы яшчэ на дзесяткі гадоў нам – маленькай горстачке інтэлігентаў, але вочы глядзяць у сьветлую даль, рукі самі цягнуцца да працы, каб адагнаць, каб супакоіцца ад чорных думак. Гэта нашая маленькая горстачка эмігрантскай беларускай інтэллігенцыі, якая яна слабая ў параўнаньні з усімі іншымі нацыянальнымі групамі! У гісторыі нацыянальных рухаў, бадай ня было нацыяналістаў-эмігрантаў бяднейшых за нас, бадай нікому так мала спачувалі як нам. Усе ж такі мы ня ўмёрлі дый ня хочэм уміраць. Як краты мы сочым пад зямлей пакуль свае ходы, мы робім паціху свае падкопы пад расейска-маскоўскую ідэалёгію, пад гоноровую шляхецкую ідэалёгію й прыйдзе час калі мы ўзарвем гэтыя распухшыя на чужой працы й крыві гмахі, мы выйдзем на волю, на сонцэ й пакажам, што мы здольны да усясьветнай культуры, што мы пад брудныміі сапагамі пензенскіх самахвалаў і пад лякераванымі боцікамі варшаўскіх франтаў усе ж такі выкулі непахібную волю, што мы падкапаліс пад самыя сэрцы іхняга самахвальства й маем сілу скінуць к чортавай мацеры напіханую ў нас гвалтам чужацкую культуру і адначасна сарваць з іх бліскучыя адзежы „культурнасьці", пад якімі схаваліся штык і зубы. Ах, толькі б сілы ў душы хапіла, толькі б не памерці раней чымся прыйдзе лепшы наш час!»[93].

Адным з апошніх выдавецкіх праектаў БНР у Каўнасе быў штомесячнік «Беларускі сьцяг» пад рэдакцыяй К. Дуж-Душэўскага, які выходзіў з красавіка да верасня 1922 года. Фактычна гэта было адзінае выданне, якое афіцыйна з'яўлялася органам беларускага ўрада. Апрача некалькіх зваротаў урада БНР і матэрыялаў грамад-

[93] LCVA, f. 582, ap. 1, b. 25, l. 022v–023v.

ска-палітычнага зместу, часопіс змяшчаў артыкулы А. Цвікевіча, якія насілі праграмны характар: «Чатыры гады», «Беларусь перад Генуэзскай канферэнцыяй» і інш.[94]

У артыкуле з нагоды адкрыцця міжнароднай канферэнцыі ў Генуі А. Цвікевіч адзначаў, якія задачы стаяць у сувязі з гэтым перад урадам БНР: «Кожная магчымасьць абароны інтарэсаў беларускага народу павінна быць выкарыстана. Аб Беларусі і аб беларускім пытаньні Эўропа ведае яшчэ надзвычайна мала. Нагэтулькі мала, што, прыкладам, завярэньне палякаў, маючых добрую зьвязь са ўсімі эўропэйскімі ўрадамі, аб „польскасьці" Гарадзеншчыны не сустракаюць адпору; наадварот, у спрэчцы аб некаторых беларускіх землях Эўропа становіцца на бок Польшчы, што відаць хоць бы з апошняга літоўска-польскага канфлікту за Віленшчыну і Сувальшчыну. Кождую магчымасьць пашырыць агітацыю за нашу справу, кожны выпадак, дзе беларускае пытаньне можа быць закранута – мы павінны выкарыстаць. Мы павінны знайсці ў Эўропе сваіх прыяцеляў, сваіх прыхільнікаў, якія падтрымалі і ўзялі бы свой голас у нашу абарону разам з намі. […] Мы павінны як мага шырэй папулярызаваць нашы дамаганьні, знаёміць Эўропу аб становішчы і ідэалах беларускага народу»[95].

У сваёй публіцыстыцы А. Цвікевіч ёміста і проста сфармуляваў сутнасць і значэнне абвяшчэння незалежнасці БНР: «Права на незалежнасьць разумеецца само сабой… Акт 25 Сакавіка не шукае для сябе апраўданьня. […] Ён сваім зместам зацьверджае прадвечнае права народаў Беларусі на волю. […] Дзякуючы Акту 25 Сакавіка Беларусь не стала незалежнай дзяржавай. Але гэта ня зьмяншае надзвычайнай, гістарычнай вартасьці гэтага акту, як галоўнейшага закону беларускага вызваленчага руху, усяго белару-

[94] Г. Зелянова, *«Беларускі сцяг»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 1, Мінск 1993, с. 453–454.

[95] *Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991). Зборнік дакументаў і матэрыялаў. У 4 т.* Т. 2, Мінск 2012, с. 87–88.

скага адраджэньня. Ён стаў не законам, праведзеным у жыцьцё, але стаў законам беларускага жыцьця»[96]. Сам часопіс, аднак, сустрэў даволі вострую крытыку з боку розных беларускіх груп. Сярод іншага, яго крытыкавалі за празмерную палітызацыю[97].

Апошнім месцам знаходжання беларускага ўрада стала Прага. Т. Грыб у канцы лістапада 1923 года ў адным з лістоў да паэта У. Жылкі пісаў: «Думаў аб выдаўніцтве. Падумаць толькі, гэтымі днямі толькі даведаўся – аб тым-жа, што вясной была гутарка – расейцы атрымалі крэдыт на выдавецтва […], а мы дулю з макам. Чаму? Ды ўсё таму-ж: няма каму працаваць, няма сіл»[98]. Гэтак, у снежні 1925 года Беларускай грамадой у Празе было арганізавана ўрачыстае пасяджэнне («акадэмія») з нагоды 500-й гадавіны пачатку кнігадрукавання ў Беларусі. Пры непасрэдным удзеле сяброў беларускіх нацыянальных арганізацый у Чэха-Славакіі неаднаразова арганізоўваліся беларускія кніжныя выстаўкі: летам 1925 года – беларускі стэнд на выстаўцы «Руская кніга», у красавіку 1926 года – самастойная выстаўка, у чэрвені-ліпені 1926 года – беларускі аддзел у рамках Міжнароднай славянскай кніжнай выстаўкі[99].

Падзеі кастрычніка 1925 года, калі падчас канферэнцыі ў Берліне значная частка міністраў БНР перадала свае мандаты ўраду БССР, а таксама актыўнае нацыянальнае будаўніцтва ў БССР прывялі да таго, што сярод заходнебеларускай інтэлігенцыі пачала пашырацца думка аб тым, што ідэя БНР вычарпала сябе, цэнтрам «збірання беларускіх зямель» стаў савецкі Менск, а Заходняя Беларусь у перспектыве павінна стаць часткай БССР. Да гэтага ў першую чаргу схіляліся лідары Беларускай сялянска-работніцкай грамады[100].

---

[96] А. Галынец [А. Цвікевіч], *Чатыры гады (25.III.1918–25.III.1922)*, «Спадчына» 1996, № 3, с. 148.

[97] T. Błaszczak, *op. cit.*, s. 194–196.

[98] Т. Грыб, *Выбранае*, Мінск 2017, с. 365.

[99] У. Ляхоўскі, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г.*, Białystok, Vilnius 2012, с. 402–405.

[100] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 195, арк. 22.

Ужо пасля Берлінскай канферэнцыі, у канцы лютага 1926 года, адбылася канферэнцыя беларускіх дзеячаў у Данцыгу, на якой было вырашана стварыць рэдакцыйную камісію для замежнай беларускай прэсы. Інфармацыя пра гэта дайшла да польскіх спецслужб[101]. Нічога дзіўнага, што абвінавачванне ў захоўванні і распаўсюджванні беларускай літаратуры праходзіла па справе беларускіх партызан у Польшчы ў 1923 і 1925 гадах, па справе беларускіх настаўнікаў у Латвіі ў канцы 1924 года. Сярод іншага, сакратару даўгаўпілскага таварыства «Бацькаўшчына» ставілася ў віну тое, што ён атрымаў ад К. Езавітава для захоўвання і распаўсюджвання кнігу «Беларусы і палякі», часопіс «Бацькаўшчына», шмат газет, карты і паштоўкі БНР. Праўда, у сваіх паказаннях К. Езавітаў засведчыў, што атрымаў карту БНР з кніжных складоў беларускага аддзела Міністэрства асветы Латвіі. А адным з галоўных доказаў «антыдзяржаўнай» дзейнасці мясцовых беларусаў стаў падручнік А. Смоліча «Геаграфія Беларусі»[102].

Бадай, апошнімі крокамі Рады БНР у выдавецкай справе стала публікацыя зборніка «Замежная Беларусь» пад рэдакцыяй П. Крачэўскага і надрукаваны на гектографе «Бюлецень Рады Беларускай Народнай Рэспублікі». Яны выйшлі ў той час, калі на тэрыторыі самой Беларусі – як Савецкай, гэтак і Заходняй, падпарадкаванай Польшчы, адбываўся заўважны выдавецкі бум і адчуваўся рост попыту на беларускую кнігу і прэсу. З'яўляліся новыя падручнікі і навуковыя часопісы, друкаваліся дзясяткі газет. На гэтым фоне пражскія выданні саступалі ім па тыражах, якасці друку дый па змесце. Але галоўнай задачай пражскага беларускага асяродка было аспрэчванне легітымнасці ліквідацыі ўрада БНР. У першую чаргу П. Крачэўскі і В. Захарка імкнуліся даказаць, што прадстаўніцтва

[101] J. Januszewska-Jurkiewicz, *Przyczynek do losów przywódców „Zielonego Dębu" w świetle sprawozdań policji politycznej w Wilnie z lat 1923–1926*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne" 2001, t. 15, s. 227–228.

[102] LMAVB, f. 155, vnt. 484, l. 3ap.

БНР працягвае сваё існаванне[103]. Абмежаваныя ў фінансавых і арганізацыйных рэсурсах апошнія абаронцы БНР вымушаны былі значна скараціць сваю выдавецкую і прапагандысцкую дзейнасць[104].

У 1921 годзе К. Дуж-Душэўскі па-прарочы напісаў: «Палітыка гэта дзень, а кніжка вечнасць. Трэба было б уцяміць усім што на грунці культуры німа ні партый, ні груп, ні арыентацый. Ёсьць адна вялікая, магутная і вечная „культура", перад якой усе на сьвеце пахіляе сваю галаву. Над усім можна ўзяць перавагу, а над ёй ніхто і ніколі. Яна дыктуе правы і абавязкі. Яна заўседы пабеждае. Той выходзіць пабядзіцелем, хто найбольш блізкі да культуры, бо яна і розум, і адзежа, па ей і спатыкаюць, і праводзяць»[105]. Нягледзячы на ўсе аб'ектыўныя і суб'ектыўныя цяжкасці, якія давялося пераадольваць стваральнікам БНР, іх самаахвярная дзейнасць на ніве выдавецкай справы здолела захаваць арыентаваную на дэмакратычныя каштоўнасці ідэю беларускай дзяржаўнасці.

Архіўныя крыніцы

Archiwum Akt Nowych w Warszawie, TSK, t. 99, k. 8–9.

Lietuvos centrinis valstybės archyvas, f. 22, ap. 1, b. 56, l. 41v; f. 281, ap. 2, b. 32, l. 63–63ap.; f. 361, ap. 3, b. 5, l. 25–26; f. 582, ap. 1, b. 25, l. 022v–023v; ap. 2, b. 69, l. 66–66v.

Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, f. 21, vnt. 166, l. 3v.; vnt. 287, l. 24v–25; vnt. 554, l. 1; vnt. 2212, l. 15–15v.; f. 79, vnt. 868, l. 3–3v; f. 155, vnt. 484, l. 3ap.

Беларускі дзяржаўны архіў–музей літаратуры і мастацтва, ф. 3, воп. 1, спр. 19, арк. 64, 177–178; спр. 34, арк. 5, 7, 9–12, 15, 17; спр. 138, арк. 74; спр. 195, арк. 22; спр. 261, арк. 30–30 адв.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 325, воп. 1, спр. 8, арк. 27–27 адв., 72, 73, 75, 119–119 адв.; спр. 10, арк. 206, 219, 228–228а; спр. 19,

[103] *Замежная Беларусь. Зборнік гісторыі, культуры і эканоміі*, кн. 1, рэд. П. Крэчэўскі, Praha 1926; В. Мазец, *«Замежная Беларусь»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996, с. 402.

[104] LCVA, f. 361, ap. 3, b. 5, l. 25–26.

[105] *Ibidem*, f. 281, ap. 2, b. 32, l. 63–63ap.

арк. 50, 54, 181–184; спр. 21, арк. 158, 169–199; спр. 22, арк. 58–60; ф. 368, воп. 1, спр. 24, арк. 1–1 адв., 7; ф. 368, воп. 1, спр. 27, арк. 41–42.

Літаратура

Błaszczak T., *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940*, Białystok 2017.

Błaszczak T., *Białorusini w Republice Litewskiej 1918–1940. Rozprawa doktorska*, Toruń 2012.

„Echo" 1919, № 150.

Garbiński J., Turonek J., *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny*, Warszawa, 2003.

Głogowska H., *Białoruś 1914–1929. Kultura pod presją polityki*, Białystok 1996.

Gomółka K., *Rozmowy polsko-białoruskie,* „Dzieje Najnowsze. Kwartalnik poświęcony historii XX wieku" 1988, r. 20, z. 1.

Jäger W., *Weissruthenien*, Berlin 1919.

Januszewska-Jurkiewicz J., *Przyczynek do losów przywódców „Zielonego Dębu" w świetle sprawozdań policji politycznej w Wilnie z lat 1923–1926*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne" 2001, t. 15.

Moroz M., *„Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001.

„Przymierze" 1920, № 14, 14 listopada.

Мялешка І. [Луцкевіч А.], *Будаваньне дзяржаўнага жыцьця*, «Гоман» 1918, № 28, 3 красавіка.

А. І. [Луцкевіч А.], *Усходняя Беларусь. Статыстычныя і гістарычныя матэрыялы*, Менск 1918.

Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. *Фонд № 582 Дзяржаўнага Архіву Літвы («Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі»)*, укл. С. Шупа, Vilnius, New York, Мінск, Praha 1998.

Башко П., *«Белорусская земля»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994.

«Беларускае слова» 1920, № 1.

Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914-1991). Зборнік дакументаў і матэрыялаў. У 4 т. Т. 2, Мінск 2012.

Варонка Я., *Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: кароткі агляд*, Коўна 1920.

«Вольная Беларусь» 1918, №15, 28 красавіка.

Воронко И., *Белорусский вопрос к моменту Версальской мирной конференции*, Ковно 1919.

Галынец А. [Цвікевіч А.], *Чатыры гады (25.III.1918 – 25.III.1922)*, «Спадчына» 1996, № 3.

Герасімаў В., *«На чужыне»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 5, Мінск 1999.

Гигин В., *Бумажная республика. Из истории БНР 1918 года*, «Нёман» 2005, № 2.

Гімжаўскас Э., *Беларускі фактар пры фармаванні літоўскай дзяржавы ў 1915–1923 гг.*, Białystok, Vilnius 2012.

Грыб Т., *Выбранае*, Мінск 2017.

Документы и материалы по истории советско-польских отношений. Т. II (ноябрь 1918 г. – апрель 1920 г.), Москва 1964.

Доунар-Запольскі М., *Асновы Дзяржаунасьці Беларусі*, Городно 1919.

Езовитов К., *Белорусы и поляки. Документы и факты из истории оккупации Белоруссии поляками в 1918 и 1919 гг.*, Ковна 1919.

Замежная Беларусь. Зборнік гісторыі, культуры і эканоміі, кн. 1, рэд. П. Крэчэўскі, Praha 1926.

Зелянова Г., *«Беларускі сцяг»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 1, Мінск 1993.

«Звон» 1919, № 4, 1 верасня.

Калубовіч А., *Крокі гісторыі. Дасьледваньні, артыкулы, успаміны*, Białystok, Vilnius, Мінск 1993.

Карповіч Л., *Беларуская паштовая марка: ад вытокаў да эміграцыі*, «Запісы Беларускага інстытуту навукі й мастацтва» 2013, № 36.

Батиевский В., *Марки и полевая почта «Асобнага атрада БНР»* [online], http://mirmarok.ru/prim/view_article/732 [доступ: 14.11.2016].

Каўка А., *«Варта»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994.

Ковкель И., Сташкевич Н., *Почему не состоялась БНР? Из истории политического банкротства националистической контрреволюции в Белоруссии. 1918–1925 гг.*, Минск 1980.

Конан У., *«Беларускі шлях»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 1, Мінск 1993.

Конан У., *«Вольная Беларусь»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994.

Конан У., *«Гоман»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996.

Крынскі У., *Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне*, «Новая дарога» 1942, № 28, 4 кастрычніка.

Ліс А., *«Белорусское слово»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 6. Кн. 2, Мінск 2003.

Ліс А., *«Грамадзянін»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996.

Ліс А., *«Родны край»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 6. Кн. 1, Мінск 2001.

Ліс А., *Gloria victis*, Мінск 2010.

Ліс А., Шорахаў А., *«Белорусское эхо»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 2, Мінск 1994.

Ліцкевіч А., *Беларуская віртуальная рэспубліка*, «Беларуская думка» 2008, № 3.

Луцкевіч А., *Да гісторыі беларускага руху. Выбраныя творы*, укл., прадм., камент. А. Сідарэвіча, Мінск 2003.

Луцкевіч А., *Усходняе пытаньне і Беларусь*, „Arche" 2009, № 3.

Ляхоўскі У., *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г.*, Białystok, Vilnius 2012.

Мазец В., *«Замежная Беларусь»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996.

Мазец В., *Асветніцкая дзейнасць Урада Беларускай Народнай Рэспублікі* [у:] *Беларуская асвета: вопыт тысячагоддзя. Матэрыялы II Міжнароднага кангрэса 17–19 мая 2000 г. У 3 кн.* Кн. 1, Мінск 2000.

Мазец В., *Гістарычны вопыт БНР па культурна-нацыянальнаму адраджэнню беларускага народа* [у:] *Беларусіка = Albaruthenica.* Кн. 2. *Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі «Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў», Маладзечна, 19–20 жніўня 1992 г.*, Мінск 1993.

Минское белорусское представительство, «Минский голос» 1918, 27 февраля.

Міхалюк Д., *Беларуская Народная Рэспубліка. 1918–1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці*, Смоленск 2015.

Мядзёлка П., *Сцежкамі жыцця*, «Полымя» 1993, № 5.

Мядзёлка П., *Сцежкамі жыцця. Успаміны*, Мінск 1974.

«Наша ніва» 1920, № 5, 22 лістапада; № 6, 29 лістапада.

Пашкевіч А., Чарнякевіч А., *Невядомыя старонкі біяграфіі В. Адамовіча, ці Да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху* [у:] *Берасцейскі храналаграф. Зборнік навуковых прац.* Вып. 4, Брэст 2004.

Пяткевіч А., *«Беларусь»* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т.* Т. 3, Мінск 1996.

«Родны край» 1919, № 5, 7 кастрычніка.

Рудовіч С., *Рух за беларускую дзяржаўнасць і праблема грамадзянскага статусу беларускай мовы ў 1915–1918 гг.*, «Край = Kraj» 2001, № 1–2.

Сакалоўскі У., *Надзвычайная дыпламатычная місія БНР у Нямеччыне (1918–1925)*, «Arche» 2009, № 3.

Сідарэвіч А., *Прадказаньні Антона Луцкевіча*, „Arche" 2009, № 3.

Талкачоў В., *Беларускі друк і фарміраванне самасвядомасці беларускага народа*, «Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія» 2003, № 4.

Тихомиров А., *Проблема белорусско-германских отношений в 1914–1922 гг.*, «Белорусский журнал международного права и международных отношений» 2002, № 4.

Туронак Ю., *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Vilnius 2006.

Цвикевич А., *Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики*, Киев 1918.

Цьвікевіч А., *Адраджэньне Беларусі і Польшча*, Менск, Вільня, Berlin 1921.

The information and public information activity of the Council and the government of the Belarusian People's Republic in the years 1918–1925

The article discusses issues related to information and publishing activity of official institutions of the Belarusian People's Republic – the Council and government and other political and cultural organizations associated with BPR in 1918–1925. The survey covers the period of activity of the BPR institutions both on the territory of Belarus and on emigration.

Keywords: Belarusian People's Republic, publishing houses, press, leaflets, propaganda

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.77-87

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190405

Data przesłania: 02.02.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

Ніна Стужынская
nina.stuzh@wp.pl
ORCiD: 0000-0002-6184-1650

Гісторыя Атамана Грача

Historia Atamana Hracza

Artykuł opowiada o losach uczestnika antybolszewickiego ruchu partyzanckiego Włodzimierza Ksieniewicza (pseudonim Ataman Hracz). Jest to postać mało dotąd znana i nieobecna w historiografii. W 1924 roku Ataman Hracz przekroczył granicę polsko-sowiecką i przedostał się na Białoruś Sowiecką, gdzie wkrótce został aresztowany i skazany. Akta dotyczące śledztwa są przechowywane w Archiwum Komitetu Bezpieczeństwa Państwowego Republiki Białoruś. Na podstawie akt sądowych autorka odtwarza kolejne etapy działalności partyzanta. Tragiczne losy tego działacza zostały ukazane na tle wydarzeń politycznych, które rozgrywały się wówczas w regionie.

Słowa kluczowe: walka antybolszewicka, partyzantka, Białoruś, niepodległość

Кіраўнік галоўнага штаба Беларускай сялянскай партыі «Зялёны дуб» (ЗД) Уладзімір Францавіч Ксяневіч падчас дыверсійнай і разведвальнай дзейнасці карыстаўся партыйным псеўданімам Грач і зрэдку, пасля 1922 года, Гансоўскі.

Найбагацейшая паводле матэрыялаў крыніца па гісторыі ЗД – справа У. Ксяневіча, што датуецца кастрычнікам 1924 – чэрвенем 1927 года і захоўваецца ў Цэнтральны архіве Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (ЦА КДБ РБ). Гэта пратаколы допытаў, уласнаручныя паказанні, агентурныя данясенні, перапіска асоб,

звязаных са справай, фотаздымкі, якія датуюцца 1922–1925 гадамі. Крымінальная справа была заведзена 12 чэрвеня 1925 года і за два тыдні падрыхтавана да суда. З кастрычніка 1924 года У. Ксяневіч знаходзіўся, можна меркаваць, у падвалах ДПУ БССР. У папцы, падрыхтаванай да суда, былі сабраны матэрыялы пра антысавецкую тэрарыстычную дзейнасць Грача з моманту ўступлення ў ЗБ (восень 1920 года) і да яго пераходу ў Савецкую Беларусь у кастрычніку 1924 года. Прысутнічаюць і дакументы асабістага характару – лісты да жонкі. На падставе гэтай справы Грача былі падрыхтаваны першыя публікацыі па гісторыі ЗД[1].

З дапамогай інтэрнэта знайшоўся ўнук У. Ксяневіча – Юрый Каюкоў, які жыве ў Екацерынбургу (Расія).

Такім чынам, да першай часткі жыццяпісу атамана, які склалі ў Менску чэкісты Пятроў, Дамберг, Генкін і Апанскі, далучылася другая – з Далёкага Усходу. Ю. Каюкоў даслаў копію следчай справы № 10613 па абвінавачванні У. Ф. Ксяневіча па арт. 58–6 КК РСФСР (захоўваецца ў асабістым архіве аўтара). Гэта быў вынік плённай працы супрацоўнікаў Балейскага раённага аддзела УНКУС па Чыцінскай вобласці. Такім чынам, знайшлася крыніца з адлюстраваннем фінальнай часткі жыццёвага шляху кіраўніка галоўнага штаба ЗД.

Чыцінскія матэрыялы маюць крайнія даты: 25 студзеня 1938 і 4 ліпеня 1939 года. У іх змешчаны пратаколы допытаў Грача, яго жонкі Ксеніі Максімаўны, прыгавор, апеляцыя і адмова ў памілаванні, а таксама даведка аб выкананні рашэння суда.

Абедзве справы заканчваюцца аднолькавым прыгаворам: да вышэйшай меры пакарання – расстрэлу. Але ў 1925 годзе Грач змог яго пазбегнуць, адклаўшы непазбежнае на 14 гадоў і заплаціўшы вельмі дарагую цану за памілаванне. Грач пагадзіўся на супрацоўніцтва з АДПУ БССР, яго ўратаваў І. Апанскі, які выкарыстоўваў тактыку перавярбоўкі палітычных апанентаў, якую практыкавала

[1] Н. Стужынская, *Зялёнадубцы і іншыя*, «Літаратура і мастацтва» 1994, 16 снежня; Idem, *Трагедыя зялёнадубцаў*, «Беларускі гістарычны часопіс» 1996, № 1.

кіраўніцтва АДПУ ў Маскве, і выступаў супраць іх знішчэння без спробы з выгадай выкарыстаць чалавека, які, трапіўшы ў чэкісцкую пастку, не меў альтэрнатывы.

Другая частка крыніц – публікацыі ў савецкай прэсе. Намаганнямі тагачасных партыйных ідэолагаў і журналістаў ход судовага разбіральніцтва меў характар гучнага і шматлюднага шоў. Паралельна разглядаліся справы польскіх шпіёнаў і ўдзельнікаў нападу на мястэчка Койданава. На некаторых пасяджэннях Грач выступаў як сведка. У гэтай якасці ён выступаў па прапанове пракурора А. Вышынскага, будучай «зоркі» расстрэльных працэсаў у СССР[2]. Гісторыя Грача была тэмай шэрагу публікацый у афіцыйных выданнях БССР «Звезда» і «Савецкая Беларусь» на працягу 1925–1926 гадоў.

У 2017 годзе праўнукі атамана даслалі копію працоўнай кніжкі У. Ксяневіча (захоўваецца ў асабістым архіве аўтара), якая сведчыць пра пакуты сям'і на чужыне, праблемы з працаўладкаваннем і жыллём. Дыялог з нашчадкамі атамана Грача працягваецца. Адгукнулася праўнучка з ЗША, доктар Вольга Джэймс, якая дадала факты з жыцця прапрабабкі, жонкі У. Ксяневіча – Ксеніі Максімаўны, яе дачок.

Дакументы 1924–1925 гадоў сведчаць пра трагічную памылку атамана Грача – пераход на савецкі бок, адлюстроўваюць сумную карціну наступстваў гэтага кроку, адносіны са следчымі ДПУ і спробы захаваць жыццё. З Грачом працавалі кіраўнікі ДПУ БССР.

Следчыя матэрыялы маюць подпісы Афрыкана Пятрова, чэкіста, які меў багаты вопыт распрацоўкі спраў зялёнадубаўцаў і іншых беларускіх палітыкаў. Усевалад Фальскі, першы камісар па замежных справах Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, пасля допытаў следчага Пятрова спрабаваў скончыць жыццё самагубствам[3].

---

[2] «Звезда» 1925, 25 февраля.

[3] Н. Стужинская, *Роли Всеволода Фальского: судьба наркома иностранных дел в первом советском правительстве Беларуси* [online], https://m.nn.by/ru/articles/169974/ [доступ: 16.04.2018].

Адзін з прыхільнікаў Б. Савінкава, атаман з Ігуменскага павета Уладзімір Гаркавенка-Багнавец скардзіўся на следчага ў вышэйшыя інстанцыі: «Ён [Пятроў. – *Н. С.*] ужо з раніцы не можа без нянавісці глядзець на падследных і іх сваякоў, пакутуючы ад жадання апахмяліцца»[4]. Зялёнадубаўцы адзначалі неаб'ектыўнасць і нічым не апраўданую жорсткасць следчага.

Аднак на старонках літаратурных твораў пра чэкістаў і «бандытаў» паўстаюць зусім іншыя вобразы. Ілья Барысаў, які пісаў пра «падрыўную дзейнасць антысавецкай нацыялістычнай арганізацыі „Зялёны дуб"», апісвае Пятрова як «стрыманага інтэлігентнага» чалавека, а Генкіна як імпульсіўнага, але разумнага (яму была перададзена крымінальная справа Грача)[5].

Дакументы 1924–1927 гадоў захавалі інфармацыю пра розныя бакі існавання і дзейнасці ЗБ. У іх змешчаны звесткі пра добры тузін імён тагачасных беларускіх, польскіх, расійскіх палітыкаў, пра ўзаемаадносіны паміж імі. Чэкісты крок за крокам выцягвалі з У. Ксяневіча падрабязнасці пра яго сувязі з польскай разведкай, адносіны з афіцэрамі *dwójki*: Блонскім, Зацвіліхоўскім, Маерам і іншымі.

На падставе згаданых крыніц ёсць магчымасць скласці даволі падрабязную біяграфію У. Ксяневіча.

Крыніцы багатыя таксама на мянушкі і партыйныя псеўданімы лідараў антысавецкага партызанскага руху. Гэта стварае для даследчыка дадатковыя цяжкасці ў справе ідэнтыфікацыі асоб. З ЗБ кардынавалі сваю дзейнасць атаманы Мяфодзій і Іван Караткевічы, Цімох Хведашчэня, Георгій Моніч і іншыя.

База ЗД першапачаткова размяшчалася ў Лунінцы. Гэты гарадок са старонак справы Грача выглядае цэнтрам антысавецкага партызанскага руху, лагерам падрыхтоўкі дыверсійных акцый. У раёне вакзала знаходзіўся бронецягнік «Балаховец», на якім служыў

[4] Цэнтральны архіў Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (ЦА КДБ РБ), крымінальная справа У. Гаркавенкі-Багнаўца.

[5] І. Барысаў, *Крах «Зялёнага дуба»*, «Звязда» 1991, 15 сакавіка.

У. Ксяневіч да пераходу ў ЗД. Пасля няўдалага Палескага паходу генерала С. Булак-Балаховіча, падчас інтэрніравання яго арміі зялёнадубаўцы здымалі з цягніка зброю і выбуховыя матэрыялы і перадавалі слуцкім паўстанцам. Грач эмацыянальна і з падрабязнасцямі намаляваў карціну «рабунку» цягніка. Польскі бок, заплюшчваючы вочы на «крадзеж» зброі, такім чынам дапамагаў паўстанцам, фармальна не парушаючы Рыжскага дагавора.

Кавярня Маліноўскага на вакзале Лунінца была месцам, дзе пасля баявых паходаў адпачывала моладзь. Партызаны М. Караткевіча парушалі спакой і сон мясцовых жыхароў, спяваючы баявы марш «Адвеку мы спалі». У рэстаране высвятлялі адносіны зялёнадубаўцы і савінкаўцы. Выпадковыя саюзнікі нярэдка вырашалі пытанні з дапамогаю зброі. Лунінец быў «цесны» для расійскіх баевікоў і беларускіх партызан. Грач апісвае выпадак, як аднойчы кіраўнік ЗД атаман Дзяргач цяжка параніў савінкаўскага палкоўніка Вайцяхоўскага ля дзвярэй кавярні. Але канфлікт быў не патрэбен палітыкам, і справу спынілі[6].

Вельмі красамоўна дакументы сведчаць пра фарміраванне беларускай ідэнтычнасці У. Ксяневіча, які паходзіў з польскай сям'і, але стаў перакананым беларусам. Як гэта адбывалася, якія фактары паўплывалі на свядомасць маладога афіцэра, чаму ён зрабіў выбар на карысць беларускай ідэі? З заканчэннем Першай сусветнай вайны і развалам царскай арміі маладыя вайскоўцы беларускага паходжання шукалі апірышча на бацькаўшчыне. У. Ксяневіч вярнуўся дамоў з Румынскага фронту, дзе знаходзілася многа беларусаў. У акупіраваным палякамі Менску У. Ксяневіч даведаўся аб дзейнасці Беларускай вайсковай камісіі, якая камплектавала афіцэрскі рэзерв. «Я, як беларус, з чыста нацыяналістычных пачуццяў добраахвотна ўступіў у БВК», – патлумачыў следчаму ДПУ матывацыю свайго выбару У. Ксяневіч[7]. Але ўжо праз месяц «навaспечаны»

[6] ЦА КДБ РБ, крымінальная справа У. Ксяневіча.
[7] *Ibidem*.

беларускі афіцэр зразумеў, што дзейнасць БВК не прынясе плёну. Паўтара месяца У. Ксяневіч служыў у сапёрнай роце № 219 Войска Польскага. Але назіраючы, як польскія салдаты рабавалі беларускае насельніцтва, адчуў сябе пакрыўджаным беларусам. Крыўда выросла ў памерах, калі ён стаў сведкам, як афіцэр, сквапны да дабра беларускага селяніна, пакараў галоднага жаўнера за спробу злавіць курыцу на польскай тэрыторыі. «Браць можна толькі ў беларусаў», – патлумачыў афіцэр. Пра гэты выпадак, які падштурхнуў пакінуць Войска Польскае, нягледзячы на тое, што там служыў бацька, Грач расказаў на сваім першым судовым працэсе ў Менску[8].

Незважаючы на пераважна варожую аўдыторыю, на судзе У. Ксяневіч пранікнёна ўспамінаў, як аднойчы, чытаючы беларускі каляндар, адчуў, што беларушчына – гэта яго мова, а Беларусь – яго зямля, краіна. Натоўп, які чэрвеньскім днём 1924 года набіўся ў залу суда менскага Дома культуры, каб паглядзець на «польскага шпіёна», наўрад ці зразумеў пафас прамовы падсуднага: «Калі вучыўся ў Варшаве, мяне прымалі за рускага, у Разані супрацоўнікі лічылі палякам [там У. Ксяневіч у 1919 годзе працаваў у ваенным камісарыяце. – *Н. С.*], але ні тым, ні другім я не быў»[9]. У. Ксяневіч спадзяваўся, што адданасць беларускай ідэі яго ўратуе. Нацыянальная рыторыка, якую пачалі выкарыстоўваць савецкія ўлады, наяўнасць наверсе палітычнай піраміды ССРБ нацыянал-камуністаў шмат каго з яго акружэння дэзарыентавала.

Грач ва ўласнаручных паказаннях напісаў: «Я – нацыяналіст-беларус». Зялёнадубавец атаман Міхаіл Крук, які перайшоў на савецкі бок у 1922 годзе, стараўся ўсіх былых паплечнікаў на допытах у ДПУ выставіць «панскімі паслугачамі», аднак пра Грача сказаў: «Не церпіць нічога польскага, марыць аб незалежнай Беларусі»[10].

---

[8] «Звезда» 1925, 27, 29 июня.

[9] ЦА КДБ РБ, крымінальная справа М. Крука.

[10] І. Барысаў, *op. cit.*

У. Ксяневіч памыліўся ў сваіх разліках на аднадумцаў сярод беларускіх бальшавікоў.

Атаман Грач шчыра жадаў палепшыць жыццё простых людзей, таму партыя Адамовічаў прывабіла яго сваёй назвай «сялянская». «Мяне заўсёды цягнула да майго цёмнага народа», – пісаў вязень у паказаннях у ДПУ. Ён лічыў, што «толькі школа на роднай мове выратуе нацыю»[11]. Паказальна, што У. Ксяневіч не адмовіўся ад сваіх «нацыяналістычных» поглядаў і падчас допытаў забайкальскімі чэкістамі ў 1938 годзе.

Крыніцы сведчаць, што ў гродзенскай турме, дзе У. Ксяневіч адсядзеў пяць месяцаў, ён глыбока вывучаў Евангелле. У маі 1923 года прыняў хрышчэнне ад Лукаша Дзекуць-Малея, вядомага беларускага пастыра евангельскай царквы хрысціян-баптыстаў, які паходзіў са Слонімшчыны і вучыўся ў Слоніме – родным горадзе У. Ксяневіча. Будучы духоўны настаўнік быў на шэсць год старэйшы за У. Ксяневіча, але, магчыма, іх знаёмства пачалося з дзяцінства. Можна меркаваць, што супрацоўніцтва беларускіх патрыётаў наладзілася ў Гродне. Атаман Грач паведамляў, што ў 1923 годзе Л. Дзекуць-Малей разгарнуў працу ў Брэсце. Вернікі знайшлі памяшканне для сходаў – падвал пад адной з гасцініц (цяпер гэта будынак на вул.Савецкай, 13) і заснавалі там культурна-асветную арганізацыю «Беларуская хатка»[12].

Л. Дзекуць-Малей мог паўплываць на істотныя змены ў свядомасці былога баевіка. Як успамінаў У. Ксяневіч на допыце ў ДПУ, «стары Адамовіч, жартуючы, пачаў называць мяне святым. Я кінуў курыць, выпіваць». Далейшыя духоўныя пошукі прывялі У. Ксяневіча ў Варшаўскую біблейскую школу, дзе ён вучыўся, вёў гаспадарку і выкладаў арыфметыку. Большасць слухачоў школы была малапісьменная. У лісце У. Ксяневіча да жонкі адчуваецца ўзнёсласць яго рэлігійнага настрою. У. Ксяневіч прымаў удзел у з’ездах

[11] «Звезда» 1924, 5 сентября.
[12] *Ibidem.*

баптыстаў. Якія абставіны спынілі яго на гэтым шляху, невядома, але, як ён сам засведчыў, у баптызме задавальнення не знайшоў. У анкетах пра веравызнанне пісаў «евангеліст»[13].

З мэтай пранікнення ў антысавецкія арганізацыі за межамі СССР савецкімі спецслужбамі была распрацавана аперацыя «Трэст». Сцэнай для яе ажыццяўлення стала тэрыторыя БССР. Ствараліся арганізацыі-легенды, якія імітавалі вядомыя ў эміграцыі структуры. Так узніклі Манархічная арганізацыя цэнтральнай Расіі, Ліберальныя дэмакраты (ЛД). Праз гэтыя структуры чэкісты на працягу шасці гадоў шукалі кантакты з антысавецкімі цэнтрамі за мяжой і, пранікаючы ў іх, затым іх ліквідавалі. Актыўнымі ўдзельнікамі аперацыі «Трэст» былі чэкісты ССРБ І. Апанскі, П. Мядзведзь, Н. Эйтынгон і іншыя. З РСФСР былі накіраваны Віктар Банга, Станіслаў Глінскі, Ян Крыкман і іншыя.

Выдаючы сябе за члена ЛД С. Глінскі, напрыклад, інспектаваў паўстанцкія атрады. Даверaная асоба Б. Савінкава, свой сярод зялёнадубаўцаў, ён адыграў злавесную ролю арганізатара іх гібелі. С. Глінскі, адзін з актыўных выканаўцаў аперацыі «Сіндыкат-2», персанальна адказваў за пераход Б. Савінкава і яго паплечнікаў на давераным яму ўчастку дзяржаўнай граніцы ў СССР. У мэтах дасягнення паспяховага фіналу ігры з Б. Савінкавым 16 чэрвеня 1922 года С. Глінскі быў прызначаны начальнікам Заслаўскага пагранічнага асобага аддзялення ДПУ. Тут жа працаваў заканспіраваны чэкіст Батаў (Крыкман). Яны забяспечвалі «калідор» для пераходу Б. Савінкава[14]. Глінскі «дапамог» перайсці граніцу і У. Ксяневічу. Пад якім прозвішчам Грач ведаў С. Глінскага застаецца таямніцай, але, безумоўна, яны былі добра знаёмыя.

У. Ксяневіч падчас першага арышту ўтаіў, што меў у Менску яўку, якую атрымаў у Вільні ад Радаслава Астроўскага, – у П. Мядзведя, старшыні ДПУ Беларусі. Прызнанне У. Ксяневіча, зробленае ў 1938

[13] Успаміны Соф'і Апанасаўны Грыц, навучэнкі Віленскай беларускай гімназіі ў 1920-я гады, запісаныя аўтарам у 1998 годзе, калі С. Грыц было 94 гады.

[14] І. Барысаў, *op. cit.*

годзе, ужо не ўплывала на лёс П. Мядзведзя, які быў растраляны ў лістападзе 1937 года. Піліп Дзям'янавіч Мядзведзь быў адной з ключавых фігур аперацыі «Сіндыкат-2». Мяркуючы па ўсім, Атаман Грач глыбока ўлез у павуцінне «Трэста». Кіраўніцтва ЗД само часцяком удала блефавала. Але ў выпадку з У. Ксяневічам шмат людзей, свядома ці не, удзельнічала ў падрыхтаваных чэкісцкімі выназходнікамі падзеях. Угаворвалі, падштурхоўвалі, стваралі праўдападобную легенду, накіроўвалі і суправаджалі... у пастку.

Б. Савінкаў, хаўруснік зялёнадубаўцаў і знаёмы У. Ксяневіча, быў арыштаваны ў жніўні 1924 года. Смяротнае пакаранне яму замянілі на дзесяцігадовы турэмны тэрмін. Пакаянныя прамовы Б. Савінкава мелі каласальны рэзананс: «З беларускіх ускраін Польшчы паведамляецца, што сярод прыхільнікаў Савінкава пануе поўная разгубленасць. Можна меркаваць, што частка з іх пойдзе па яго слядах і перамеціць свае адносіны да савецкай улады»[15].

Ігра працягвалася. Памілаванне Б. Савінкава было выдатным палітычным крокам. Адтэрміноўка пакарання спарадзіла ў часткі стомленых баевікоў хісткія надзеі на паразуменне з бальшавікамі. Атаман Грач, які паўтарыў шлях Б. Савінкава літаральна па свежых слядах, мог трапіць у палон такіх ілюзій.

Увогуле, меркаванняў пра прычыны пераходу Грача на савецкі бок шмат. Ціск палітычных фактараў на яго лёс быў каласальны. Знаходжанне сям'і на савецкай тэрыторыі рабіла яго заложнікам вымушаных небяспечных крокаў. Савецкія спецслужбы намагаліся пераканаць антысавецкія «элементы» ў адсутнасці перспектыў барацьбы, паспяхова карыстаючыся негатыўным уплывам на людзей розных жыццёвых фактараў. Незапатрабаванасць прафесіяналаў, палітычны ціск улад, якія далі прытулак, а самае галоўнае – страта бацькаўшчыны, сям'і, пра што сведчаць крыніцы, – рабілі з эмігранцкіх дзеячаў лёгкую здабычу для чэкістаў – спрактыкаваных «паляўнічых».

[15] «Звезда» 1924, 5 сентября.

Пасля заключэння Рыжскага дагавора дзейнасць антысавецкай узброенай апазіцыі знаходзілася пад пільнай увагай як савецкіх, так і польскіх улад. Для абедзвюх прыхільнікі незалежнасці Беларусі былі перашкодай у іх імперыялістычных планах. Увосень 1921 года амаль усе лідары беларускага партызанскага руху ў Заходняй Беларусі былі арыштаваны і размеркаваны па польскіх турмах і лагерах, дзе знаходзіліся дастаткова працяглы час. На думку польскіх палітыкаў, факт наяўнасці вайсковых баз і баявой дзейнасці, якая практычна не магла быць заканспіравана цалкам, пагражала канфліктам з Савецкай Расіяй.

Відавочным было глыбокае расчараванне беларускіх палітыкаў вынікамі супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. Позіркі пакрыўджаных накіроўваліся ў бок імаверных саюзнікаў: Германіі, Літвы, СССР. Беларускія левыя палітыкі ўсё больш упэўнена заяўлялі, што «па той бок граніцы савецкі ўрад будуе новы дом для беларускага народа»[16]. Савецкі Менск не шкадаваў грошай на падтрымку лаяльных да камуністаў палітычных партый і сродкаў масавай інфармацыі ў Заходняй Беларусі. Яны сеялі ілюзіі «беларускага адраджэння» ў БССР.

Асяродкам выхавання левых, радыкальных «чырвоных» поглядаў стала Віленская беларуская гімназія на чале з дырэктарам Радаславам Астроўскім. Не было вялікім сакрэтам, што гэта навучальная ўстанова атрымлівала грашовую дапамогу з Менска[17]. Менавіта Р. Астроўскі выступіў гарантам бяспекі У. Ксяневіча пры падрыхтоўцы і ажыццяўленні аперацыі «Пералёт» па яго пераходзе ў БССР. Дзяргач пераконваў, што дзеячы ў Менску і група Астроўскага ў Вільні – гэта адна «кампанія» («Трэст»?). Падчас асабістай сустрэчы напярадэдні адпраўкі ў БССР Дзяргач даў Грачу адрасы кантактных асоб: У. Ігнатоўскага, П. Мядзведзя і іншых, параіў У. Ксяневічу, якім маршрутам лепш трапіць у Менск. Халодным душам для У. Ксяневіча сталі словы У. Ігнатоўскага, якога

[16] *Ibidem.*

[17] Успаміны С. А. Грыц.

выклікалі ў ДПУ ў якасці сведкі, што *«справа пахне нейкай правакацыяй»*. Але потым У. Ігнатоўскі ўспомніў пра шчыльныя адносіны Р. Астроўскага з віленскімі камуністамі і палічыў, што менавіта яны маглі садзейнічаць у справе У. Ксяневіча. Паказанні У. Ксяневіча 1938 года пераканаўча сведчаць пра дачыненне Р. Астроўскага да аперацыі «Трэст». Лінія паводзін І. Апанскага ў дачыненні да Грача, прапанова захаваць жыццё ў абмен на супрацоўніцтва таксама сведчаць аб рэалізацыі загадзя спланаванай аперацыі.

Архіўныя крыніцы

Цэнтральны архіў Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, крымінальныя справы У. Гаркавенкі-Багнаўца, У. Ксяневіча, М. Крука.

Літаратура

Барысаў І., *Крах «Зялёнага дуба»*, «Звязда» 1991, 15 сакавіка.

«Звезда» 1924, 5 сентября; 1925, 25 февраля, 27, 29 июня.

Стужинская Н., *Роли Всеволода Фальского: судьба наркома иностранных дел в первом советском правительстве Беларуси* [online], https://m.nn.by/ru/articles/169974/ [доступ: 16.04.2018].

Стужынская Н., *Зялёнадубцы і іншыя*, «Літаратура і мастацтва» 1994, 16 снежня.

Стужынская Н., *Трагедыя зялёнадубцаў*, «Беларускі гістарычны часопіс» 1996, № 1.

History of the Ataman Hrač

The article tells the story of a participant in the anti-Bolshevik guerrilla movement of Uladzimir Ksianievič (pseudonym Ataman Hrač). He is a man not known and known until recently in historiography. In 1924, Ataman Hrač crossed the Polish-Soviet border and made it to Soviet Belarus, where he was soon arrested and convicted. Files regarding the investigation are kept in the Archive of the State Security Committee of the Republic of Belarus. Based on court files, the author of a given publication reproduces the subsequent stages of the fate of the guerrilla. The tragic fate of this activist was shown against the background of political events that took place in the region at that time.

K e y w o r d s : anti-Bolshevik struggle, partisans, Belarus, independence

Zachodnia Białoruś

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.91-115

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190406

Keywords: Belarusian national movement, Western Belarus, interwar Poland, "Belarusian sanation", Luckievič-Astroŭski group

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors



doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.117-158

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190407

Data przesłania: 15.03.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

Аляксандр Пагарэлы
Instytut Slawistyki Polskiej Akademii Nauk
mbv.mancunian@gmail.com
ORCiD: 0000-0003-2182-6656

Праблема дысцыпліны часу ў дыскурсе друку БХД-БНА міжваеннага перыяду

Problem dyscypliny czasu w dyskursie druku BChD-BZL w okresie międzywojennym

Artykuł jest próbą zbadania problematyki dyscypliny czasu w dyskursie prasy międzywojennej Białoruskiej Chrześcijańskiej Demokracji. Ten dyskurs był ważnym elementem w budowaniu wizji moralnej wspólnoty politycznie, społecznie i gospodarczo aktywnych Białorusinów. Jednak tło społeczno-kulturowe, a nie tylko czynniki natury politycznej w znacznym stopniu wpływały na to, że ten dyskurs miał ograniczony wpływ na wieś białoruską. Artykuł proponuje typologię czasu społecznego, która cechuje postawy wobec czasu BChD oraz innych ruchów politycznych Białorusi Zachodniej.

Słowa kluczowe: czas społeczny, prasa, Zachodnia Białoruś, okres międzywojenny, Białoruska Chrześcijańska Demokracja

Англічанін, кажуць, пакуль возьмецца да работы насамперш падумае, патом парадзіцца, а патом ужо робіць; Немец падумае моцна спачатку і зараз бярэцца за работу, а наш Беларус падумае крыху, пачухаецца, пералічыць перашкоды і на печ палезе.

Газета „Biełarus", 1913 г.

Хто разважае пра будучыню, той круцель: важная толькі сучаснасць.

Луі Фердынанд Сэлін, «Падарожжа на край ночы», 1932 г.

Уступ

Перыяды бурлівых палітычных, сацыяльных і культурных перамен вызначаюцца дэзарыентацыяй, бо папярэднія катэгорыі, якія дазвалялі б успрымаць рэчаіснасць і сувязі паміж яе элементамі як упарадкаваныя, перастаюць дзейнічаць. Сітуацыі, якія называюць «пераходным перыядам», цяжка ўкладваюцца ў звыклыя тлумачальныя схемы, і розныя сацыяльныя і палітычныя актары, што маюць інтарэсы і шансы прайграць або выйграць (з іх перспектывы), могуць палярна альбо нейтральна ацэньваць такія сітуацыі і мець свае погляды на канцавы вынік такіх перыядаў. Такі часовы адрэзак можна назваць «часам цудаў», калі могуць здарацца рэчы, якія супярэчаць папярэднім правілам і традыцыям. Гэта лімінальныя сітуацыі[1].

Ваенна-рэвалюцыйная віхура, што пранеслася па беларускіх землях у 1914–1921 гадах (канцавую дату можна паставіць і пазнейшую), можа быць аднесена якраз да такіх «пераходных перыядаў», якія адкрываюць магчымасці і перспектывы з пункту гледжання адных актараў або, наадварот, закрываюць, з пункту гледжання іншых. Для вызначэння такога становішча, калі ўсё грамадства ці пэўная яго частка папярэдне не гатова да прыняцця новых для сябе роляў і ідэнтычнасцей, вымушана гэта рабіць пад ціскам знешніх акалічнасцей, перуанскі гісторык Нельсан Манрыке назваў «паскарэннем гістарычнага часу»[2].

Перад грамадствам могуць стаяць альтэрнатывы і раздарожжы, якія пры пэўных умовах могуць стаць шансамі для пашырэння яго магчымасцей, павелічэння рэсурсаў, узмацнення пазіцый. Але сітуацыя пераходу можа пакінуць след не меншы, чым увесь папярэдні вопыт гэтага грамадства.

---

[1] А. ван Геннеп, *Обряды перехода,* Москва 2002; V. Turner, *Drams, Fields and Metaphors. Symbolic Action in Human Society*, Ithaca, London 1974, p. 231–271.

[2] F. E. Mallon, *Peasant and Nation. The Making of Postcolonial Mexico and Peru*, Berkeley, Los Angeles, London 1995, p. 2.

Менавіта з такімі выклікамі сутыкнулася палітычная арганізацыя, якая была адным з самых значных палітычных актараў, а ў пэўныя перыяды прадстаўляла інтарэсы беларускага грамадства ў Польшчы ў цэлым – Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) (пазней Беларускае народнае аб'яднанне (БНА)). Гэта ўвасобілася ў дыскурсе выданняў гэтай партыі (групоўкі, якія адгалінаваліся ад яе ў канцы 1930-х гадоў, інакш канцэптуалізавалі свае светапогляды)[3], якая пачала разглядаць вектар развіцця заходнебеларускага грамадства (калі не ўсяго беларускага грамадства ў цэлым) як эвалюцыйны, скіраваны ў будучыню, звязаны з прагрэсам. Час атрымаў маральнае вымярэнне, стаў разглядацца як рэсурс і быў падпарадкаваны канцэпцыі эвалюцыі[4], на якую глядзелі як на шлях да сацыяльнай трансфармацыі. З гэтага вынікала неабходнасць правільна распараджацца часам, патрабавалася адказнае і дысцыплінаванае стаўленне да яго. Як разуменне часу ўвасаблялася ў дыскурсе друку БХД, а таксама фактары, што абумовілі такое яго разуменне, мы будзем разглядаць у гэтым артыкуле.

Канцэпцыя дысцыпліны часу паводле БХД не адлюстравана ў яе палітычных праграмах. Хоць праграмныя дакументы нельга цалкам ігнараваць, але яны ўяўляць толькі частку масіву матэрыялу неабходнага для разумення праблематыкі. Паводле Фларэнсіі Малон, дыскурс з'яўляецца адкрытым працэсам у рамках культурнага, палітычнага і ідэалагічнага ўзаемадзеяння[5]. Гэта не азначае аднак, што гэта працэс, які не мае пэўных канкрэтных вынікаў, і разглядаць яго трэба толькі ў рамках міжваеннага перыяду, які скончыўся выбухам Другой сусветнай вайны. Гэта азначае, што трэба прыцягнуць большае кола матэрыялаў, якія дазволяць атрымаць больш

[3] M. Moroz, *„Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001.

[4] А-č, *Duch času i biełarusy*, „Krynica" 1918, № 2, 14 studnia, s. 1; А. Вашкевіч, *Эвалюцыя Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў святле яе палітычных праграм* [у:] «Спадчына» 2006, № 1, с. 30, 32.

[5] F. E. Mallon, *op. cit.,* p. 90.

разнастайную карціну таго, што ўяўляў з сябе дыскурс друку БХД (перш за ўсё газета «Крыніца», а ў 1925–1937 гадах «Беларуская крыніца», часопісы «Хрысьціянская думка», «Шлях моладзі», «Самапомач», «Беларускі фронт») па праблеме часу.

Апрача самой прэсы, некаторых архіўных матэрыялаў, зборнікаў публіцыстыкі, выдадзеных у міжваенны перыяд і сёння, успамінаў, таксама цікава паглядзець на тое, якое стаўленне да дысцыпліны часу было ў дыскурсе беларускіх камуністаў з КПЗБ, а таксама БСРГ. Элемент параўнання будзе вельмі карысны для ўдакладнення розніц і падабенстваў паміж рознымі беларускімі палітычнымі групамі і партыямі па пытанні развіцця заходнебеларускага грамадства ў міжваеннай Польшчы.

Неабходна таксама паглядзець на даследаванні сялянскіх супольнасцей, якія праводзіліся сацыёлагамі, этнолагамі, антраполагамі, географамі і палітолагамі ў Польшчы ў 1920–1930-я гады, у тым ліку манаграфічнага плана[6]. Асабліва цікавымі з'яўляюцца матэрыялы конкурсаў аўтабіяграфій і ўспамінаў сялян і вясковых дзеячаў, якія праводзіліся ў 1930-я гады Інстытутам грамадскай гаспадаркі ў Варшаве, а таксама Дзяржаўным інстытутам культуры вёскі там жа[7]. Яны дазваляюць паглядзець на тое, як ідыёмы прагрэсу разумеліся і выкарыстоўваліся на лакальным узроўні на беларускіх землях міжваеннай Польшчы. Пры ўсёй дыстанцыі, якая аддзяляе нас ад міжваеннага перыяду, трэба прызнаць вартасць гэтых матэрыялаў.

Пры тым, што матэрыялы антрапалагічных даследаванняў з'яўляюцца крыніцамі, разглядаць метадалагічна гэтую праблематыку мы будзем праз прызму прац па сімвалічнай антрапалогіі

[6] J. Obrębski, *Studia etnosocjologiczne.* T. I. *Polesie*, red. A. Engelking, Warszawa 2007; W. Staniewicz, *Matujzy Bołondziszki, wieś powiatu lidzkiego*, Warszawa 1923; S. Wysłouch, *Świadomość narodowa ludności prawosławnej zamieszkującej wschodnie i północno-wschodnie powiaty Wileńszczyzny*, Warszawa 1939.

[7] *Pamiętniki emigrantów.* T. I. *Francja*, Warszawa 1939; *Wiejscy działacze społeczni.* T. I. *Życiorysy włościan*, Warszawa 1937.

і *peasant studies* (даследаванні сялянскіх грамадстваў). У прыватнасці, важныя для нас працы Мэры Дуглас, Віктара Цёрнера, Джэймса Скота і інш.[8] Інтэрдысцыплінарная перспектыва дапаможа лепш раскрыць праблему часу і яго рацыянальнага выкарыстання.

Для лепшага разумення таго, чым быў падыход да грамадскага часу, нам неабходна супаставіць у дыскурсе друку пастулаты і тэзісы ідэалагічнай «тэорыі» з вопытам тых, каму быў адрасаваны друк БХД: беларускіх сялян. Нам трэба паглядзець, як яны апісвалі сваё стаўленне да катэгорый мінулага і будучыні, як апісвалі свой вопыт. Нарматыўны дыскурс часу павінен быць параўнаны з тым, якім чынам час *пражываецца* і ў якіх *катэгорыях* гэта апісваецца[9]. Менавіта такі кантэкстуалізаваны антрапалагічны падыход дасць больш рэльефную карціну таго, чым з'яўляўся час на пэўным этапе для гэтага грамадства.

Тыпалогіі грамадскага часу

Час не з'яўляецца абстрактным і залежыць ад сацыяльнага рытму данага грамадства, паводле Эміля Дзюркгайма[10]. Эканамічныя адносіны ў грамадстве і ўзровень яго развіцця таксама адыгрываюць вызначальную ролю ў тым, як яно, яго палітычныя, эканамічныя і інтэлектуальныя эліты фармулююць і падтрымліваюць дыскурс адносна часу.

У чалавечых супольнасцях могуць суіснаваць шмат розных тыпаў часу. На гэта звярталі ўвагу спецыялісты ў галіне антрапалогіі, якія прысвячалі свае працы розным аспектам часу ў жыцці як заходніх, так і незаходніх грамадстваў. Пры гэтым існуюць як лінеарныя, так і цыклічныя мадэлі часу, якія ў тых або іншых формах

[8] M. Douglas, *Implicit Meanings: Essays in Anthropology*, Boston 1975; V. Turner, *op. cit.*; J. C. Scott, *Domination and the Arts of Resistance: Hidden Transcripts*, New Haven, London 1990.

[9] К. Гирц, *Интерпретация культур*, Москва 2004, с. 415–472.

[10] S. Kern, *The Culture of Time and Space 1880–1918*, Cambridge 1983, p. 19.

могуць альбо суіснаваць, альбо быць у канфлікце ўнутры розных культур і рэлігій[11]. Пры гэтым не прырода, а культура вызначае характар календара, летазлічэння і вымярэння часу[12].

Норберт Эліяс прапанаваў глядзець на час як частку «працэсу цывілізацыі», у выніку якога чалавечае грамадства набывае механізмы самадысцыпліны, стрымлівання паводзін членаў грамадства, якія функцыянуюць унутры іх саміх, праз складаную сетку сацыяльных сувязей[13]. Э. Дзюркгайм вылучаў «час прыватны» і «час увогуле»[14]. Апошні тып часу з'яўляецца грамадскім часам, рытмам, паводле якога жыве грамадства. Аднак сучаснае лінеарнае разуменне часу з'явілася менавіта ў іўдзейска-хрысціянскай традыцыі. Ідэя сакральнага часу, мэтай руху якога з'яўляецца збаўленне, прыход збавіцеля-месіі, быў дакладна акрэслены ў хрысціянстве і іўдаізме. Аднак спатрэбілася Рэфармацыя, каб з'явілася ідэя часу як *каштоўнага*, у тым ліку і на ўзроўні штодзённага жыцця. Рэфармацыя і капіталістычная індустрыялізацыя прывялі да фарміравання дысцыпліны часу. Менавіта сярод пратэстантаў і ў пратэстанцкіх краінах паўночна-заходняй Еўропы (а таксама ў Паўночнай Амерыцы) гэтая дысцыпліна ўмацавалася[15]. Аднак гэтая ідэя, ужо ў адрыве ад свайго пратэстанцкага месца паходжання, атрымала глабальнае распаўсюджанне, хоць і не без лакальнага супраціўлення і спрэчак у выглядзе ўвядзення сусветнага стандартнага

[11] M. Bloch, *The Past and the Present in the Present,* "Man, New Series" 1977, Vol. 12, № 2, August, p. 278–292; К. Гирц, *op. cit.*; S. Hanson, *Time and Revolution. Marxism and the Design of Soviet Institutions*, Chapel Hill, London 1997; E. T. Hall, *The Dance of Life: The Other Dimension of Time,* Garden City, New York 1983; E. Zerubavel, *Hidden Rythms. Schedules and Calendars in Social Life*, Berkeley, Los Angeles 1985.

[12] E. Zerubavel, *op. cit.*

[13] N. Elias, *The Civillizing Process*, Oxford, Cambridge 2000; idem, *Time. An Essay*, Oxford, Cambridge 1992, p. 32–34, 146–148.

[14] S. Kern, *op. cit.,* p. 19.

[15] S. Hanson, *op. cit.*, p. 17–18.

часу[16]. Нават незаходнія грамадствы мусілі суадносіць сябе з рытмам часу заходніх[17].

Аднак зацвярджэнне гэтай новай сістэмы тэмпаральных каардынат і звязанага з ёй паняцця прадуктыўнасці нават ў заходніх грамадствах не адбывалася без канфліктаў. Мелі месца ўспышкі сацыяльных і палітычных канфліктаў. Сялянскія традыцыйныя ўзоры працы з іх недакладным вымярэннем часу згодна са штодзённым праходжаннем сонца па небе і яго сезоннымі адхіленнямі жорстка сутыкнуліся з вымярэннем часу паводле гадзінніка[18].

Брытанскі гісторык-марксіст Эдвард Палмер Томпсан у 1970-х гадах указваў на палітычна канфліктную прыроду часу ў кантэксце замацавання новай капіталістычнай дысцыпліны часу на фабрыках. Мелі месца як адкрытыя сутыкненні, так і скрытыя тэхнікі супраціўлення ў тых асяроддзях індустрыяльных і аграрных рабочых, якія станавіліся аб'ектамі ўздзеяння новых дысцыплінарных практык[19].

Але дысцыпліна часу і дыскурс звязаны з ёй у канкрэтных гістарычных абставінах неабавязкова адкідае ці ігнаруе множнасць мадэлей часу, акцэнтуючы толькі адну і перакрэсліваючы ўсе іншыя. Хутчэй, ён уключае пэўныя элементы некаторых з гэтых тыпаў часу. Нават дыяметральна розныя паміж сабой тыпы могуць сумяшчацца ў нарматыўным дыскурсе тэмпаральнай дысцыпліны, калі лінеарныя і нелінеарныя мадэлі часу выкарыстоўваюцца паралельна, служачы мэтам прыстасавання да выклікаў мадэрнасці.

---

[16] S. Kern, *op. cit.,* p. 11–16; Ф. Б. Шенк, *Универсальное время versus локальное время: железные дороги и споры о времяисчислении в России (1870–1910-е годы)* [в:] *Изобретение века. Проблемы и модели времени в России и Европе XIX столетия*, под ред. Е. Вишленковой, Д. Сдвижкова, Москва 2013, с. 131–147.

[17] P. Duara, *Historicizing National Identity, or Who Imagines What and When* [in:] *Becoming National. A Reader*, eds. G. Eley, R. G. Suny, New York, Oxford 1996, p. 150–177; V. Tikhonov, *Social Darwinism and Nationalism in Korea: the Beginnings (1880s–1910s). "Survival" as the Ideology of Korean Modernity*, Leiden, Boston 2010.

[18] S. Hanson, *op. cit.,* p. 17; J. Frykman, O. Löfgren, *Narodziny człowieka kulturalnego. Kształtowanie się klasy średniej w Szwecji XIX i XX w.*, Kęty 2007, s. 25–49.

[19] E. P. Thompson, *Customs in Common*, Harmondsworth 1993, p. 352–403.

Абапіраючыся на спадчыну нямецкага сацыёлага Макса Вебера, амерыканскі даследчык Стывен Хэнсан сцвярджаў, што патрэбны змены ў ідэях грамадства, каб наступілі нейкія значныя тэхналагічныя і матэрыяльныя змены[20]. У абставінах сацыяльных крызісаў і жорсткага разрыву з практыкамі і ідэямі мінулага патрэбна надзвычайная мова, новыя ідэі, дыскурсы[21]. Друк беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў актыўна распаўсюджваў такія новыя ідэі пра час, дысцыпліну часу, яе мэтазгоднасць у рамках праекта мадэрнасці як выратавання і руху ў эвалюцыйным кірунку. Парадаксальным чынам БХД, якая з'явілася ў беларускім рымска-каталіцкім асяроддзі і сярод прыхільнікаў якой былі праваслаўныя беларусы, распаўсюджвала дысцыпліну часу, звязаную з пратэстантызмам, беларускіх прадстаўнікоў якога (метадыстаў, баптыстаў і інш.) хрысціянска-дэмакратычны друк кляймiў як «сектантаў»[22], і капіталізмам, які лічыўся злом і адмаўляўся як у друку, так і ў праграмных дакументах хрысціянскіх дэмакратаў[23].

Найбольш адпаведнай для разгляду перыяду сацыяльных і палітычных змен, на наш погляд, з'яўляецца тыпалогія грамадскага часу, прапанаваная палітолагам і сацыёлагам С. Хэнсанам. Яго тыпалогія ўяўляе сабой веберыянскую класіфікацыю грамадскага часу. Элементы тут адпавядаюць вылучаным М. Веберам тыпам правадырства. Гэта *традыцыйны час*, які рэгіструецца

[20] S. Hanson, *op. cit.,* p. 13.

[21] P. Bourdieu, *Structures, Habitus, Power: Basis for a Theory of Symbolic Power* [in:] *Culture. Power. History. A Reader in Contemporary Social Theory*, eds. N. B. Dirks, G. Eley, S. B. Ortner, Princeton, New Jersey 1994, p. 165–166; Л. Хант, *Французская революция: нулевой градус времени* [в:] *Изобретение века…*, с. 52.

[22] Sluchoŭski, *Metadyskaja „sprawiadliwaść"*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 38, 16 wieraśnia, s. 4; *Metodyzm u Zachodniaj Biełarusi i prychilnaść da jaho Ŭłasawa, Łuckiewiča i Janki Stankiewiča*, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 18, 12 traŭnia, s. 2; *Sektanstwa šyrycca*, „Biełaruskaja Krynica" 1931, № 26, 25 žniŭnia, s. 4; J. P., *Sektanstwa ŭ biełaruskich masach i jaho pryčyny*, „Biełaruskaja Krynica" 1932, № 31, 10 wieraśnia, s. 1–2; M-st, *Sektanstwa – hrob narodu*, „Biełaruskaja Krynica" 1932, № 37, 30 kastryčnika, s. 4.

[23] А. Вашкевіч, *op. cit.*, с. 30, 32, 34.

і вымяраецца пры адсутнасці абстрактнай тэмпаральнай сістэмы каардынат. Пераважае ў ім цыклічнасць, абумоўленая традыцыйнымі сельскагаспадарчымі заняткамі. Далей, гэта *мадэрны*, або *рацыянальны час*, які рэгіструецца з дапамогай абстрактнай сістэмы каардынат незалежных ад канкрэтных падзей, заснаваны на пэўным комплексе неперсанальных правіл і дысцыпліне. Трэці, і апошні, тып – гэта *харызматычны час*, які грунтуецца на поглядзе, што звычайны час можа быць пераадолены ці перасягнуты тымі, хто прыняў харызматычны тып правадырства. З усёй інтэнсіўнасцю ён праяўляецца ў перыяды вострых сацыяльных крызісаў[24]. Гэтыя тры тыпы грамадскага часу дапамогуць нам вызначыць характар рыторыкі дысцыпліны часу ў друку БХД-БНА.

Палітызацыя грамадскага часу

Час звязаны з палітыкай не толькі праз стварэнне палітычных арганізацый, дзяржаўных структур ці нацыянальных сімвалаў. Час на ўзроўні практычнай дзейнасці і на ўзроўні дыскурсу знітаваны з вялікай колькасцю аспектаў жыцця данага грамадства. Ён не зводзіцца да календароў, гадзіннікаў, рытмаў, раскладаў і інш. Дысцыпліна часу хоць і мае непасрэдныя адносіны з гэтымі матэрыяльнымі і сімвалічнымі элементамі[25], але існуе ў сувязі з іншымі сацыяльнымі і культурнымі аспектамі данага грамадства. Іх трэба ўлічваць пры вывучэнні палітычнага кантэксту з'яўлення дыскурсу дысцыпліны часу. З іншага боку, сацыяльнае канструяванне часу павінна разглядацца як палітычны працэс. Сацыяльны парадак данага грамадства прасякнуты пэўнай культурнай канструкцыяй часу. Календары, расклады і рытмы з'яўляюцца падставамі штодзённага жыцця, таму эліты і маніпулююць імі[26].

---

[24] S. Hanson, *op. cit.,* p. 1–21.

[25] N. Elias, *Time*..., p. 14–15, 29–30.

[26] K. Verdery, *What Was Socialism and What Comes Next?,* Princeton, New Jersey 1996, p. 39, 35.

У міжваенны час заходнебеларускае грамадства ў Польшчы, а ў першую чаргу вёска, перажывала бурлівы працэс палітызацыі[27]. Ён непасрэдна закрануў і праблематыку часу. На самым павярхоўным узроўні гэта датычыла праграм разнастайных партый і аб'яднанняў, якія ў 1920-я гг. актыўна дзейнічалі на вёсцы. Барацьба за ўплыў на вяскоўцаў вялася ў тым ліку і з перспектывы часу. Цяжкасці з аднаўленнем гаспадаркі пасля Першай сусветнай вайны маглі станавіцца крыніцай жадання як мага хутчэйшага выратавання ад пакут штодзённасці. Сяляне не маглі доўга чакаць. Выбары ў Сенат і Сейм Польшчы, любыя змены ў палітычным жыцці, чуткі прымушалі спадзявацца на хуткія перамены, а не чакаць цэлыя гады ці дзесяцігоддзі[28].

Палітызацыя датычыла, вядома ж, і вобразу будучыні, бо кожны палітычны рух стварае свой «вобраз будучыні». Гэта вядзе да барацьбы за яе палітычны гарызонт[29]. Гэта ў сваю чаргу тэлеалагічна падпарадкоўвае ўсю дзейнасць прыхільнікаў данага палітычнага руху пэўнай мэце, кожны крок, кожная перамога і здабыванне прыхільнікаў адначасова набліжаюць надыход гэтай будучыні і паскараюць сам ход падзей, што стварае эфект паскарэння часу ў патрэбным палітычным кірунку, паскарае рух да палітычнага «тысячагадовага царства»[30]. Калі беларускія хрысціянскія дэмакраты, прыхільнікі больш памяркоўных беларускіх палітычных груп («Цэнтрасаюз»), прыхільнікі партыі «Вызваленне» не абяцалі імгненнага збаўлення ад пакут цяжкай сацыяльнай, эканамічнай і палітычнай сітуацыі,

[27] С. Токць, *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX – першая траціна XX ст*., Мінск 2007, с. 149–164.

[28] Rusticanus, *Z nastrojów wsi białoruskiej*, „Przegląd Wileński" 1926, № 13, 18 lipca, s. 4–5; J. Januszewska-Jurkiewicz, *Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939*, Katowice 2011, s. 108.

[29] B. A. Porter, *The Social Nation and its Futures: English Liberalism and Polish Nationalism in Late Nineteenth-Century Warsaw*, "The American Historical Review" 1996, Vol. 101, № 5, December, p. 1470–1492.

[30] J. F. Rinehart, *Revolution and the Millennium: China, Mexico, and Iran*, Westport, Connecticut 1997.

то іх больш радыкальныя канкурэнты з КПЗБ ці БСРГ зусім такога не выключалі[31]. Хуткі надыход будучыні і магчымасць пераадолець час указваюць на харызматычны тып грамадскага часу характэрны для гэтых рухаў.

Такім чынам, у міжваеннай Заходняй Беларусі пытанне часу стала звязвацца з палітыкай і ідэалогіяй. Час разглядаўся як рэсурс, на яго сталі глядзець як на нешта, чым можна авалодаць пры выкананні пэўных умоў. Умовай такой было перш за ўсё прыняцце вызначанай палітычнай праграмы данага руху ці партыі. На ўзроўні ж дыскурсу друкаваных выданняў час стаў фактарам стварэння супольнасці. Менавіта да будаўніцтва маральнай палітычнай супольнасці, заснаванай на маральных прынцыпах, імкнуўся друк беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў. Дыскурс дысцыпліны часу паводле вызначэння быў нарматыўны.

Прыватны час закранаўся нарматыўным дыскурсам часу ў той жа ступені, што і час увогуле, г. зн. грамадскі час у больш вузкім сэнсе. Нарматыўны дыскурс дысцыпліны часу закранаў як прыватную, так і публічную сферу. Пытанні палітыкі ў дыскурсе друку БХД разглядаліся як элементы публічнай сферы[32], а пытанні часу таксама можна разглядаць у гэтым ключы. Але артыкуляцыя дысцыпліны часу ў друку БХД сігналізавала, што існавалі альтэрнатывы прапанаваным мадэлям, а таксама імпліцытна прызнаваліся супраціўленне і неразуменне, калі не поўнае адмаўленне іх у заходнебеларускім грамадстве.

Тое, што адбывалася з беларускімі друкаванымі календарамі, з'яўляецца важным сімптомам палітызацыі часу. Календары сталі прасторай палітызацыі. Адначасова яны мелі важнае сімвалічнае значэнне. Яны былі інструментам распаўсюджвання беларускай на-

[31] С. Токць, *op. cit.,* с. 157, 163; W. Mędrzecki, *KPZB i KPZU a wieś ukraińska i białoruska*, niepublikowany referat, 2008.

[32] А. Пагарэлы, *Прэса і публічная сфера ў заходнебеларускай вёсцы ў 1920–30-я гады*, «Беларускі гістарычны агляд» 2016, т. 23, сш. 1–2, снежань, с. 18–40.

цыянальнай ідэнтычнасці[33]. Адбывалася своеасаблівая нацыяналізацыя часу, якая адкрывала дзверы і іншаму працэсу.

Тэндэнцыя да палітызацыі календароў вызначылася яшчэ напярэдадні Першай сусветнай вайны і падчас яе[34]. Палітызацыю менавіта календароў не абавязкова разглядаць толькі як нешта негатыўнае. Гэта быў у нечым непазбежны працэс. Скарэй, можна казаць пра празмерную ідэалагізацыю і перавагу палітычнай рыторыкі, публіцыстыкі ў змесце і непрыхаваныя формы індактрынацыі, як гэта магло быць у календарах для вёскі ў БССР[35].

Сам каляндар мог і не займаць большасці аб'ёму выдання. У календарах магла друкавацца інфармацыя аб палітычных партыях і рухах, абмяркоўваліся палітычныя пытанні, давалася разнастайная інфармацыя сельскагаспадарчага, культурнага, медыцынскага плана[36]. Літаратурныя творы там змяшчаліся рэгулярна яшчэ ў часы «Нашай нівы»[37]. Календары не былі толькі крыніцай інфармацыі пра даты, сезонныя асаблівасці вясковай гаспадаркі ці рэлігійныя святы і юбілеі. Яны былі адлюстраваннем працэсаў сацыяльных і культурных змен, што адбываліся ў грамадстве. Тое, што яны сталі адлюстроўваць і палітычны расклад сіл у ім ці рэтранслераваць пэўную ідэалогію, можна разглядаць таксама як крайнасць працэсаў палітычнай дыферэнцыяцыі і сацыялізацыі.

Перыядычны друк сам па сабе быў прыкметай і носьбітам палітызацыі часу, свайго роду календаром і хронікай падзей сучаснасці. Французскі пісьменнік Поль Кладэль пісаў, што «ранішнія

---

[33] С. Цыпрыяновіч (Я. Найдзюк), *Беларуская Друкарня імя Францішка Скарыны ў Вільні (1926–1940),* London 1991, с. 12; Г. Сагановіч, *Беларускі каляндар у гістарычнай асвеце ў 1910–1939 г.*, «Беларускі гістарычны агляд» 2015, т. 22, сш. 1–2, снежань, с. 214.

[34] *Biełaruski kalandar na 1914 hod*, Wilnia 1914; *Biełaruski kalandar na 1917 hod*, Wilnia 1916.

[35] Г. Сагановіч, *op. cit.*, с. 216.

[36] Я. Багдановіч, *На жыццёвым шляху*, Мінск 1992, с. 94–95; С. Цыпрыяновіч (Я. Найдзюк), *op. cit.*, с. 11.

[37] *Biełaruski kalandar. 1915 hod*, Wilnia 1914, s. 32–48.

газеты даюць нам пачуццё сучаснасці ў яе татальнасці»[38]. Рэгулярнасць перыядычнага друку была прыкметай упэўненасці ў надыходзе будучыні, пэўнай стабільнасці. З такой перспектывы, напрыклад, частыя канфіскацыі і закрыццё «Беларускай крыніцы» ў 1936–1937 гадах былі свайго роду разбурэннем такой рэгулярнасці, стабільнасці, пагрозай для адчування вясковымі чытачамі сучаснасці і страты «праекта будучыні».

Час як абмежаваны рэсурс і яго рацыянальнае выкарыстанне

Палітызацыя часу не азначала татальнага падпарадкавання ўсіх відаў дзейнасці грамадства пэўнай ідэалагеме. Тое, што палітычным і эканамічным пытанням адводзілася цэнтральнае месца, не азначала, што дыскурс быў напоўнены толькі абстрактнымі заклікамі. Гаворка ішла пра пытанні культуры, адукацыі (самаадукацыі) і сельскай гаспадаркі. Чытачы беларускіх хрысціянска-дэмакратычных перыядычных выданняў павінны былі засяродзіцца, планаваць і выкарыстоўваць свой час на акрэсленыя віды дзейнасці, што набліжалі б іх да рэалізацыі мэт БХД.

Як мы бачылі, фактар календара быў у гэтым сэнсе вельмі важны. Каляндар на рубяжы XIX–XX стагоддзяў працягваў дамінаваць у масавых уяўленнях аб грамадскім часе[39]. Аднак календары ў Заходняй Беларусі маглі адыгрываць свае традыцыйныя функцыі. Напрыклад, імёны ў вёсцы ў міжваенны перыяд маглі даваць паводле календара[40].

Календары для вяскоўцаў маглі пазіцыянавацца як нейтральныя паводле назваў і змяшчалі ў іх слова «беларускі». Гэта нейтральнасць не павінна ўводзіць у зман, бо гэтыя календары выдаваліся

[38] S. Kern, *op. cit.,* p. 70.
[39] *Ibidem*, p. 34.
[40] *У новай айчыне*, Беласток 2001, с. 136.

рознымі беларускімі палітычнымі групамі і партыямі, якія змагаліся паміж сабой за сімпатыі вяскоўцаў. У якасці выдаўца выступалі розныя групоўкі, якія прасоўвалі свае палітыка-ідэалагічныя і рэлігійныя парадкі дня[41]. Календары набылі палітычнае значэнне яшчэ і дзякуючы таму, што польскія ўлады таксама па-свойму ўспрымалі іх «падрыўны», палітычны характар[42]. Пытанне календара і выкліканыя ім канфлікты з польскай адміністрацыяй маглі прыводзіць да яго канфіскацыі. Гэта было свайго роду замахам на нацыянальны час[43].

Прывучэнне да змен, што беларускі хрысціянска-дэмакратычны друк выразна падкрэсліваў[44], было неабходна для авалодання сітуацыяй, кантролю свайго жыцця і свайго часу. Календары маглі быць арыенцірам, компасам, які мог дапамагчы не згубіцца ў зменлівым свеце і прытрымлівацца агульных палітычных і эканамічных мэт.

Абвесткі аб календарах на наступны год даваліся ў хрысціянска-дэмакратычным друку рэгулярна. Рэклама календароў давалася як у канцы года, так і ў пачатку[45]. Давалася інфармацыя аб магчымасці набыць календары. Як правіла, гаворка ішла аб беларускіх віленскіх кнігарнях. Пры канцы 1936 года «Беларуская крыніца» змясціла рэкламу двух календароў: «Беларускага адрыўнога календара на 1937 год» (кірыліцай і лацінкай) і «Беларускага сялянскага календара на 1937 год». Пры набыцці календароў оптам абяцаліся скідкі[46]. «Хрысьціянская думка» рэкламавала «Беларускі адрыўны

---

[41] *Беларускі каляндар на 1927 год*, Вільня [б. г.]; *Беларускі каляндар на 1932 год*, Вільня [б. г.].

[42] Я. Багдановіч, *op. cit.,* с. 94.

[43] *Kanfiskata biełar. kalendara,* „Biełaruskaja Krynica" 1925, № 5, 25 kastryčnika, s. 5; *Kanfiskata biełaruskaha kalendara*, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 35, 6 śnieżnia, s. 2.

[44] Ad. St-ič, *Z aposznich dzion*, „Krynica" 1923, № 3, 31 sakawika, s. 2; Sumny, *Zadańni našaj moladzi*, „Krynica" 1925, № 20, 17 traŭnia, s. 4.

[45] „Chryścijanskaja Dumka" 1939, № 1, 2 studzienia, s. 8.

[46] „Biełaruskaja Krynica" 1936, № 50, 6 śnieżnia, s. 4; № 51, 13 śnieżnia, s. 4; № 52, 20 śnieżnia, s. 4.

календар на 1938 год»[47], а ў «Шляху моладзі» беларускія кніжныя і адрыўныя календары служылі таксама мэтам рэкламы кнігарні «Надзея»[48].

Для сялян былі свае крытэрыі. Календары апрача каталіцкіх і праваслаўных імён павінны былі змяшчаць у першую чаргу звесткі аб метэаралагічных умовах, важных для вясковых гаспадароў[49]. Барацьба за беларускі каляндар і яго частыя канфіскацыі з боку польскіх адміністрацыйных улад мелі рысы няроўнай рыначнай барацьбы і спроб пазбавіць канкурэнта яго часткі рынку. Гэта магло рабіцца з мэтай распаўсюджвання календароў на польскай мове, бо беларускія адрыўныя календары і календары-кніжкі маглі разыходзіцца, як сцвярджалася, тыражом некалькі дзясяткаў тысяч экзэмпляраў і прыносіць фінансавы прыбытак выдаўцам[50]. Сукупны тыраж беларускіх календароў, паводле аднаго з удзельнікаў беларускай выдавецкай справы ў міжваеннай Вільні, мог дасягаць нават і ста тысяч экзэмпляраў[51].

Патрэба ў беларускіх календарах выразна выказвалася карэспандэнтамі хрысціянска-дэмакратычных выданняў. Былі просьбы з боку карэспандэнтаў аб календары на лацінцы замест кірыліцы, але рэдакцыя запэўнівала, што календары змяшчаюць усе каталіцкія імёны і святы[52]. Распаўсюджваліся беларускія календары на вёсцы праз розныя каналы. Сяляне маглі іх прывозіць з Вільні купляючы ў беларускіх кнігарнях, іх маглі раздаваць ці прадаваць сялянам беларускія нацыянальныя актывісты[53]. Вясковыя карэспандэнты

[47] „Chryścijanskaja Dumka" 1937, № 22, 20 śnieżnia, s. 8.

[48] «Шлях Моладзі» 1938, № 26, 30 сьнежня, с. 8.

[49] Я. Багдановіч, *op. cit.,* с. 94.

[50] *Ibidem*, с. 94–95; С. Цыпрыяновіч (Я. Найдзюк), *op. cit.*, с. 11–12.

[51] Я. Багдановіч, *op. cit.,* с. 94

[52] „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 51, 16 śnieżnia, s. 4.

[53] М. Танк, *Лісткі календара* [у:] М. Танк*, Збор твораў у 4 т.* Т. 4. *Вершы, дзённікі, пераклады,* Мінск 1967, с. 393; Ю. Пракаповіч, *Жыццёвыя сцежкі* [у:] *Лёс аднаго пакалення (успаміны),* Беласток 1996, с. 22; Я. Жамойцін, *З перажытога* [у:] *Лёс аднаго…*, с. 60.

адзначалі важнасць арганізацыі продажу календароў. Аўтар ліста са Слонімшчыны, які падпісаўся як «Селянін», менавіта гэтую праблему вынес у загаловак свайго ліста (хаця рэдакцыя сама магла даваць назвы карэспандэнцыям)[54]. У рэшце рэшт, у канцы 1930-х гадоў высветлілася, што продаж беларускіх календароў і кніг не патрабуе спецыяльнага дазволу з боку польскіх адміністрацыйных улад[55].

Стварэнне палітычна актыўнай маральнай супольнасці і пераадоленне адсталасці, дыстанцыі ў развіцці былі ў перыядычным друку БХД-БНА ўзаемазвязанымі задачамі. Яны патрабавалі падпарадкавання беларускіх вяскоўцаў своеасабліваму патэрналізму з боку інтэлектуалаў і палітыкаў БХД-БНА. Сяляне павінны былі пераняць рыторыку выданняў беларускіх хадэкаў і кіравацца тымі прынцыпамі і поглядамі, якія яны распаўсюджвалі. Пытанні дысцыпліны часу і рацыянальнага выкарыстання яго былі часткай гэтай рыторыкі і яны не абмяжоўваліся толькі падкрэсліваннем важнасці беларускіх календароў.

Неабходнасць задумацца аб часе, пачаць мысліць з пункту гледжання будучыні[56] і перспектывы сталі яшчэ ў першай палове 1920-х гадоў прадметам абмеркавання на старонках «Крыніцы» яе аўтарамі. Спачатку гаворка ішла аб плённым выкарыстанні зімовага перыяду, калі гаспадарчыя працы засяроджваліся непасрэдна ў сялянскай хаце[57]. Сярод прапанаваных замест пасіўнага правядзення часу відаў дзейнасці, апрача чытання кніг і газет, былі размовы («бяседы») аб заснаванні пажарных каманд, пераходзе на хутары, кааперацыі, сельскай гаспадарцы, лепшых спосабах гаспадарання,

[54] Селянін, *Трэба сарганізаваць прадажу беларускіх календароў*, „Biełaruskaja Krynica" 1934, № 39, 29 kastryčnika, s. 4.

[55] *Kalendary i knižki možna pradavać biez dazvołu*, „Chryścijanskaja Dumka" 1939, № 8, 1 sakavika, s. 3.

[56] Sławianin, *Našaje žyćcio*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 21, 20 traŭnia, s. 4.

[57] *Što rabić zimoj*, pierakład M. H., „Krynica" 1924, № 5, 1 sakavika, s. 4–5; Matusewič, *Jak prawieści zimowuju paru?*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 2, 18 studnia, s. 4.

першых захадах па прадухіленні інфекцыйных хвароб. Згадваліся таксама канцэрты, зімовыя віды спорту. Тады ж з'явіліся матэрыялы, якія выразна падкрэслівалі як карыснае выкарыстанне часу на гаспадарчую дзейнасць і чытанне кніг[58]. Пытанне рацыянальнага выкарыстання часу стала прадметам публічнага абмеркавання, станавілася на парадку дня ў публічнай сферы.

Лепшае выкарыстанне часу на старонках хрысціянска-дэмакратычнага друку вызначалася як чытанне кніг, газет, удзел у дзейнасці культурных і палітычных арганізацый[59]. Сярод апошніх перавага, аднак, аддавалася тым з іх, якія былі або непасрэдна звязаны з БХД, або іх дзейнасць не супярэчыла пастулатам і прыярытэтам яе ідэалогіі[60]. Гэта агучвалася ў такіх пасажах: «...Трэба нам больш чытаць свае [вылучана аўтарам. – *А. П.*] газеты, кніжкі на тэмы гаспадарскія, арганізаваць свае гурткі прасветна-культурна-гаспадарскія, прыкладам, „Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры", арганізаваць кааператывы, касы, бібліятэкі, чытальні, ладзіць курсы і інш.». Тое ж, што не адпавядала такому выкарыстанню часу, вызначалася як яго «марнаванне»[61]. Менавіта распаўсюджванне нацыянальнай і класавай свядомасці сярод вяскоўцаў лічылася адпаведным выкарыстаннем часу[62].

Дысцыпліна часу ў версіі БХД не прадугледжвала нейкага абавязковага для ўсіх беларусаў раскладу ці графіку працы накшталт працы нейкіх устаноў ці транспарту. Яна не мела татальнага характару, не была жорсткай у сэнсе нейкіх знешніх санкцый за

---

[58] H. Kłakoŭski, *Nowy Pahost, Dzisienski paw*., „Krynica" 1924, № 10, 29 krasawika, s. 5–6.

[59] Pranuk Lebiadzki, *Čas da pracy bracca!*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 37, 22 kastryčnika, s. 6.

[60] J. P., *Naša chwaroba i leki ad jaje*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 46, 12 kastryčnika, s. 1.

[61] Małady Dub*, Dawoli čas marnawać, biaremsia za pracu!*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 35, 17 čerwienia, s. 4; Р., *Не марнуйма дарма часу!*, «Беларуская Крыніца» 1931, № 14, 23 красавіка, с. 4.

[62] „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 44, 28 kastryčnika, s. 6.

яе парушэнне. Гэта дысцыпліна таксама не была прывязана да гадзінніка. Калі казаць пра яе сувязь з нейкім інструментам адліку часу, то гэта хутчэй былі календары, бо патрэба ў календарах была значна большай сярод заходнебеларускіх вяскоўцаў, чым патрэба ў гадзінніках, якіх, зрэшты, на вёсцы было мала[63].

Нават само паняцце «дысцыпліна» не азначала нейкага гвалтоўнага прымусу з боку хрысціянска-дэмакратычных актывістаў, зрэшты, у іх не было не толькі магчымасці, але і жадання ажыццяўляць сваю праграму гвалтоўным шляхам. Фактычна на індывідуальным узроўні пакідалася значная свабода ў тым, на што менавіта рацыянальна выкарыстаць свой час і калі канкрэтна гэта зрабіць. Пазней гэта знайшло сваё адлюстраванне і ў друку БХД. Пры ўсім загадным ладзе і імператыўнасці тону прысвечаных часу матэрыялаў і карэспандэнцый выданняў БХД, перш за ўсё акцэнтавалася менавіта патрэба і карысць, якую прынясе адпаведнае, адэкватнае, паводле версіі друку БХД, гістарычнаму моманту выкарыстанне часу.

Роздум аб праблематыцы часу не абмяжоўваўся толькі беларускімі выданнямі ці прэсай БХД. Аб ім задумваліся і ў міжваеннай Польшчы ў цэлым. Гэта таксама знаходзіла адлюстраванне ў польскім друку. Напрыклад, гродзенская газета „Straż nad Niemnem" змясціла знакамітую прыпісаную Бенджаміну Франкліну (1705–1790) максіму "Time is money" («Час – гэта грошы») у загаловак артыкула. У артыкуле адсутнасць звычкі ў жыхароў Гродна не спазняцца, рабіць усё ў свой час і прытрымлівацца графіка прыпісвалася спадчыне царскай Расіі, на якую ўскладалася адказнасць за такі стан рэчаў. Яна таксама характарызавалася як адсталая краіна[64].

У лютым 1928 года ўжо карэспандэнт «Беларускай крыніцы» з Пружаншчыны пад псеўданімам Янка Гром заклікаў з эмацыянальным націскам: «...Не трацьце час, бо час – гэта грошы!»[65].

---

[63] Skarha, *Halilejskija paradki*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 5, 28 studnia, s. 3.

[64] *Time is money*, „Straż nad Niemnem" 1923, № 20, 14 maja, s. 5.

[65] Janka Hrom, *Dawoli spać!*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 9, 3 lutaha, s. 4.

Франклінаўская формула стала выразна гучаць ужо і на беларускай мове. Аднак спачатку менавіта гаспадарчы аспект эканоміі часу, яго рацыянальнага выкарыстання выразна не гучаў.

Ашчаднасць адносна часу і ўменне планаваць сваю дзейнасць набывалі сэнс у сувязі са своеасаблівай тэмпаральнай (часавай) *маральнай эканоміяй*, якая не проста зводзілася да ашчаднасці, але яшчэ вызначала прыярытэт таго ці іншага віду дзейнасці альбо адносін да яго, прадметаў, з'яў культуры ў штодзённасці і г. д. Сама ж такая эканомія у рамках патэрналізму інтэлектуалаў і палітыкаў БХД-БНА з'яўляецца інструментам *гегемоніі супольнасці*[66]. Апошняя заснавана на сімвалічным кантролі інтэлектуалаў і палітыкаў, якія выступаюць ад імя вёскі і вяскоўцаў, і надаюць адным формам культуры перавагу над другімі ці адкідаюць пэўныя праявы і элементы культуры як неадпаведныя сапраўднай прыродзе супольнасці, якую яны спрабуюць пабудаваць. Час тут выступаў у якасці абмежаванага дабра, абмежаванага рэсурсу[67], які трэба было ашчаджаць, берагчы і выкарыстоўваць.

Павышэнне ўзроўню адукацыі было супрацьлеглым марнаванню часу на дробязі. Менавіта так выказаў гэта карэспандэнт «Беларускай крыніцы» з Пастаўшчыны. Картачныя гульні, якія адбываліся ў адной вясковай хаце і збіралі вельмі шмат удзельнікаў, маглі заканчвацца спрэчкамі, а нават і бойкамі. Падпіска на «Беларускую крыніцу», чытанне кніг на роднай мове і размовы аб «карысных справах» супрацьпастаўляліся такому падыходу ў правядзенні вольнага часу. Аўтар карэспандэнцыі згадвае смех як санкцыю ў адносінах да тых, хто неадпаведна паводзіць сябе і марнуе час[68].

---

[66] F. E. Mallon, *op. cit.,* p. 11; K. Stauter-Halsted, *The Nation in the Village. The Genesis of Peasant National Identity in Austrian Poland 1848–1914*, Ithaca, London 2001, p.185–186.

[67] G. M. Foster, *Peasant Society and the Image of Limited Good*, "American Anthropologist. New Series" 1965, Vol. 67, № 2, April, p. 293–315.

[68] Sielanin*, Ci nia lepš wolny čas wykarystać dla praświety čym marnawać na puściačynu?*, „Biełaruskaja Krynica" 1931, № 7, 20 lutaha, s. 4.

Сувязь эканоміі часу з непасрэднымі эканамічнымі выгадамі таксама падкрэслівалася ў друку БХД, нягледзячы на негатыўнае стаўленне хрысціянскіх дэмакратаў да капіталістычнай эканомікі. З канца 1920-х гадоў з'яўляецца матыў ашчаднасці ў эканамічным кантэксце. Свята ашчаднасці, якое з'явілася ў 1924 годзе ў Італіі і адзначаецца 31 кастрычніка, было беларускім друкам запазычана ва ўкраінцаў[69]. Пачынаючы з 1929 года ў хрысціянска-дэмакратычных выданнях амаль штогод змяшчаліся публікацыі прысвечаныя Дню ашчаднасці. Значэнне гэтага матыву павялічвалася не толькі ў сувязі з разгортваннем крызісу эканомікі, які асабліва балюча ўдарыў па сельскай гаспадарцы аграрных рэгіёнаў міжваеннай Польшчы. Як мы бачылі, узмацняўся гаспадарчы складальнік эканоміі часу. Гэта асабліва праявілася са з'яўленнем спецыяльнага кааператыўнага сельскагаспадарчага часопіса БХД «Самапомач» у 1932 годзе. Сялян заклікалі пакінуць традыцыйныя экстэнсіўныя формы гаспадаркі і прыняць інтэнсіўныя, перайсці да якасна іншай ацэнкі вынікаў працы праз прадуктыўнасць[70]. Ашчаднасць у адносінах да рэсурсаў, ашчаднасць у адносінах да часу, у тым ліку і вольнага ад працы, ставіла пытанне аб мэтазгоднасці расходавання грашовых сродкаў: «Ашчаднасць праяўляцца можа нават з вялікшым значэннем і ў умелым імі абароце... Вялікай ашчаднасцяй будзе такжа ўмелае выкарыстыванне вольнага часу». У тым жа артыкуле прапаноўвалася рабіць уклады ў банках, каб грашовыя сродкі выкарыстаць больш эфектыўна. Да таго ж самага заклікала змешчанае на форзацы «Беларускага сялянскага календара» на 1939 год паведамленне з заклікам не захоўваць грошы ў хаце ў сенніку, пад печкай, за абразом, пры сабе ці пазычаць іх людзям. Гэта ўсё прыводзіць да страт. Ашчадныя касы і банкі былі лепшым выхадам. Далей ішла адкрытая рэклама кас Стэфчыка, куды сяляне маглі прынесці

[69] *Сьвята ашчаднасьці*, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 30, 26 кастрычніка, с. 2.

[70] Паз., *Ашчаджайма пашу*, „Samapomač" 1937, № 13, 13 жніўня, с. 3.

грошы і атрымаць вялікую выгаду для сябе. Такім чынам, час павінен быў стаць крыніцай прыбыткаў. Антыкапіталістычная рыторыка саступала тут на карысць эканамічнай мэтазгоднасці і росту дабрабыту[71].

У артыкуле ў часопісе «Самапомач», апублікаваным у канцы кастрычніка 1937 года ў сувязі з надыходам свята ашчаднасці, чытачам прапаноўвалася ацэнка таго, што вясковыя гаспадары губляюць, калі марнуюць час і не выкарыстоўваюць яго рацыянальна. Чытачам прапаноўвалася пераацаніць свае падыходы да часу і да вядзення гаспадаркі ў цэлым[72].

Дысцыпліна часу магла быць скіравана супраць ляноты. Гэта было звязана ў тым ліку з традыцыйнымі ўяўленнямі аб тым, што для сялян (калі не для ўсіх, то прынамсі для часткі) характэрна марнатраўства, нерацыянальнасць. Для традыцыйных эліт, а таксама і для свяшчэннікаў былі характэрныя такія ўяўленні[73]. Таму чытачы «Беларускай крыніцы» папярэджваліся і ўшчуваліся за гультайства[74].

Ашчаднасць магла мець характар заахвочвання аўтаркіі, як у выпадку, калі часопіс «Шлях моладзі» заклікаў сваіх чытачоў не купляць тавары ў крамах у крызісны перыяд. Набыццё тавараў у крамах часопіс прыраўноўваў да марнатраўства[75]. Час і тут быў тым, што можна было ашчаджаць, правільна выкарыстоўваць: «Ня маем мы грашэй ашчаджаць, то кіруймася ў сваіх выдатках прынамся так, каб яны толькі карысць нам прыносілі. І тут мусім

---

[71] Z. B., *Ci majem my što aščadžać?*, «Шлях Моладзі» 1938, № 22, 25 кастрычніка, с. 4; *Беларускі сялянскі календар на 1939 год*, Вільня 1939.

[72] *Kolki tracim marnujučy čas? (na Dzień Aščadnaści),* «Самапомач» 1937, № 17, 25 кастрычніка, с. 2–3.

[73] O. Kolberg, *Dzieła wszystkie.* T. 52. *Białoruś–Polesie*, Wrocław, Poznań 1968, s. 80; J. P. Himka, *Galician Villagers and the Ukrainian National Movement in the Nineteenth Century*, Houndmills 1988, p. 135.

[74] W. D-a, *Hultajski paniadziełak*, „Biełaruskaja Krynica" 1936, № 48, 29 listapada, s. 4.

[75] Я-к, *Ашчаджайма!*, «Шлях Моладзі» 1932, № 10, кастрычнік, с. 5–6.

сабе адразу сказаць: – Прэч з гарэлкай і тытунём. Таксама не марнаваць часу, а выкарыстываць яго ў як найлепшы спосаб – трэба чытаць, вучыцца, усведамляцца і г. д»[76]. Такім чынам, можна казаць пра свайго роду аўтаркію часу ў дыскурсе друку хрысціянска-дэмакратычных выданняў.

Праблема рацыянальнага выкарыстання часу магла адносіцца да псіхалагічнага і забаўляльнага аспектаў. Не толькі арганізацыя беларускіх паказаў было з гэтым звязана. Гэта азначала не толькі карыснае, але і цікавае правядзенне доўгіх зімовых вечароў, што, зрэшты, адзначалася яшчэ ў 1920-я гады. Чытанне ўголас газет магло быць адным са спосабаў не толькі падзяліцца інфармацыяй, але і змагання з нудой у перыяд, калі светлавы дзень быў кароткі[77].

Дыскурс хрысціянска-дэмакратычных выданняў меў уплыў не толькі непасрэдна на тых, хто прымаў ідэалогію БХД-БНА як адзіную дапушчальную для беларускага грамадства. Калі звярнуцца да дзённікаў міжваеннай эпохі, то можна заўважыць, што і прадстаўнікі іншых ідэалагічных плыней маглі выкарыстоўваць рыторыку рацыянальнага выкарыстання часу. Так было ў выпадку паэта, сябра КПЗБ Максіма Танка (Яўгена Скурко), які рэгулярна чытаў хрысціянска-дэмакратычныя газеты і часопісы. Таму няма нічога дзіўнага, што ў канцы 1930-х гадоў ён вырашыў навучыцца больш правільна распараджацца часам, каб яго не губляць[78].

Час усё больш прызнаваўся каштоўным і абмежаваным рэсурсам, якім трэба было ўмець правільна распарадзіцца. «Марнаванне» часу на гульні ў карты ці вечарыны з алкаголем адразала чалавека ад супольнасці, бо ён не ўмеў правільна, паводле вызначаных прыярытэтаў выкарыстаць час. Важна было не толькі на індывідуальным, прыватным узроўні правільна распараджацца часам,

[76] J-k, *10-ty Mižnarodny Dzień Aščadnaści*, «Шлях Моладзі» 1933, № 10, кастрычнік, с. 7.

[77] *Hutarki dziadźki Haŭryły*, „Biełaruskaja Krynica" 1933, № 7, 12 lutaha, s. 3.

[78] М. Танк, *op. cit.,* с. 403, 417.

але і на ўзроўні ўсяго беларускага народа. Адсутнасць адзінства і салідарнасці сярод беларусаў пагражала самому іх існаванню[79]. Авалоданне часам павінна было стаць надзённай задачай беларусаў, рацыянальны або мадэрны час замацоўваў свае пазіцыі ў дыскурсе як фактар стварэння маральнай супольнасці. Адзінства мэт, прыняцце агульных каштоўнасцей павінна было спрыяць стварэнню палітычна актыўнай супольнасці. Пры гэтым дзеянне на ўзроўні публічнай сферы было істотным, але быў важны і індывідуальны ўзровень асобных сяброў, якія мусілі самі прыняць ідэалогію БХД[80]. Гэта было сугучна з пратэстанцкай ідэяй аб хрысціянстве, якое мела трансфармацыйную сілу, што ўздзейнічала праз прыватную сферу[81]. Гэта быў калектыўны праект мадэрнасці сфармуляваны інтэлектуаламі і палітыкамі БХД. Тут быў важны прынцып актыўнага жыцця, або *vita activa*[82].

Пры ўсёй рэдкасці і адначасовай другаснасці для часткі вяскоўцаў гадзіннікаў, у хрысціянска-дэмакратычных выданнях можна было сустрэць іх рэкламу[83]. Аднак часам гадзіннікі выступалі як прадмет бартэру[84]. Гадзіннік хоць і не выступаў так выразна ў якасці сімвала і інструмента як каляндар, але прысутнічаў на старонках друку. Напрыклад, магла давацца інфармацыя пра тое, што

---

[79] A. K., *Nia nożam, dyk čaranami*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 43, 12 wieraśnia, s. 1; *Этнаграфічная маса – рэгіёналізм – свабода адзінак*, «Беларуская Крыніца» 1932, № 12, 20 сакавіка, с. 1.

[80] Zaściankowy Padpiečnik, *„Krynica" pramywaje woču*, „Krynica" 1925, № 13, 29 sakawika, s. 4.

[81] P. van Rooden, *Nineteenth-Century Representations of Missionary Conversion and the Transformation of Western Christianity* [in:] *Conversion to Modernities. The Globalization of Christianity*, eds. P. van der Veer, New York, London 1996, p. 66.

[82] M. Berman, *All that is Solid Melts Into Air. The Experience of Modernity*, New York 1988, p. 92.

[83] *Raspradaža 500 hadzinnikaŭ*, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 18, 12 traŭnia, s. 4.

[84] P. D., *Za karowu – hadzinnik*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 36, 2 wieraśnia, s. 6.

адбываецца па ўсёй Зямлі на працягу адной гадзіны[85]. Так беларускае грамадства сімвалічна параўноўвала сябе з глабальнымі сацыяльнымі і прыроднымі рытмамі, гэта рыхтавала глебу для культурных, эканамічных і грамадскіх адносін заснаваных не толькі на календары, але і на гадзінніку. Праўда, у міжваенны час, як можна меркаваць з матэрыялу аднаго з аўтараў «Беларускай крыніцы», гадзіннікі скарэй былі атрыбутам гарадскога жыцця. Беспрацоўныя гараджане, якіх накіроўвалі на працу ў вёску, адчувалі патрэбу даведацца, які час паводле гадзінніка, а вяскоўцы – не[86].

Планаванне ўжо ў большым маштабе ў рамках усяго грамадства пачынала таксама набываць значэнне. Планаванне эканамічнай дзейнасці павінна было стаць сродкам змагання з крызіснымі з'явамі ў эканоміцы і дапамагчы ў пераадоленні беспрацоўя[87]. А прынцып прадуктыўнасці станавіўся крытэрыем ацэнкі вынікаў дзейнасці не толькі ў сферы сельскай гаспадаркі, але і грамадскай і культурнай дзейнасці[88].

Канцэпцыю часу БХД і звязаную з ёй дысцыпліну можна ахарактарызаваць як рацыянальныя або мадэрныя паводле веберыянскай класіфікацыі С. Хэнсана. Але гэта зусім не азначае, што пэўныя элементы іншых тыпаў з гэтай класіфікацыі адсутнічалі ў канцэпцыі часу БХД. Ужо ў самой рыторыцы з заклікамі не марнаваць час, дзейнічаць сумесна для стварэння беларускіх структур у вёсцы можна ўбачыць элемент харызматычнасці. Сам друк БХД-БНА быў носьбітам пэўных харызматычных прыкмет, якія ў вачах некаторых яго чытачоў вылучалі яго ў параўнанні з іншымі выданнямі,

---

[85] *Što robicca na ziamli ŭ praciahu 1 hadziny*, «Шлях Моладзі» 1934, № 4, красавік, с. 25.

[86] Ул. К., *З над Нарачы*, „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 36, 6 kastryčnika, s. 3–4.

[87] Т. Л., *Аб прычынах безпрацоўя і эканамічным крызысе (да справы «плянаваньня ў народнай гаспадарцы»)*, «Шлях Моладзі» 1937, № 7, ліпень, с. 6–8.

[88] J. Malecki, *Za praduktyŭnuju pracu*, «Шлях Моладзі» 1937, № 5, май, с. 15–16.

крыніцамі інфармацыі і ўлады[89]. Як гэта ні дзіўна, але каб выдаваць тыя ж календары, віленскай Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны даводзілася працаваць і ўначы, што было адначасова і элементам капіталістычнай рацыянальнай максімізацыі вынікаў і харызматычнага пераадолення абмежаванняў часу[90].

Увогуле, у міжваенны перыяд для назіральнікаў дысцыпліна часу, тэмп працы і яе якасць былі звязанымі паміж сабой катэгорыямі. Адзін з вясковых актывістаў, селянін з Брэсцкага павета, адзначаў, што самакіраванне гміны ў яго мясцовасці жадала, каб «у маланкавым савецка-амерыканскім тэмпе ператварыць гмінную вёску ў павятовы горад з двухпавярховымі будынкамі, пакідаючы жыхароў у адных толькі нагавіцах»[91]. Аўтар не ведаў, што такое харызматычны ці рацыянальны час, але разумеў характар дзеянняў, якія апісвае гэтае паняцце, а таксама цану, якую грамадства вымушана за гэта плаціць.

З 1928 года часопіс «Хрысціянская думка» падкрэсліваў значэнне рэлігійных дат. Гэта датычыла дзён, калі адбываліся фэсты ў гонар пэўных святых. Святы Божага Нараджэння і Вялікадня таксама адыгрывалі значную ролю. Рэлігійны каляндар, сакральнае разуменне часу суіснавала са свецкім і перапляталася з ім. Дысцыпліна часу і рацыянальная арганізацыя працоўнага дня былі звязаны з рэлігійным фактарам. У артыкуле ксяндза Віктара Шутовіча адзначалася, што дзень павінен быць арганізаваны так, каб гаспадару ставала сіл на працу ў наступны дзень. Дзень павінен быў пачынацца з малітвы. Поруч з тэмпаральнай арганізацыяй павінна было быць прадумана пытанне падзелу абавязкаў у сям'і гаспадара. Аўтар закранае праблему падзелу працы паміж мужчынамі і жанчынамі менавіта ў вясковым кантэксце і разважае аб прыкладзе, які

[89] Zaściankowy Padpiečnik, *op. cit.*, s. 4; A. W., *Sekret adhadali*, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 10, 8 sakawika, s. 4.

[90] Я. Багдановіч, *op. cit.,* с. 97.

[91] *Wiejscy działacze*..., s. 403.

ведае з уласнага вопыту[92]. Традыцыйныя нехрысціянскія паводле паходжання святы аграрнага цыклу, такія як Купалле і Дажынкі, набывалі новы нацыянальны сэнс, хоць яны былі звязаны з традыцыйным, цыклічным разуменнем часу[93].

Асаблівае месца займала дата 25 сакавіка – дзень абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтай даце надавалася вялікае значэнне. Праграмнай палітычнай мэтай БХД была поўная незалежнасць Беларусі, таму кожны год хрысціянска-дэмакратычны друк прысвячаў матэрыялы гэтай лёсавызначальнай падзеі. Аднак варта адзначыць, што гэта дата была не толькі элементам гістарычнага мінулага. Яна фактычна была, як бы гэта парадаксальна не гучала, арыенцірам для будучыні, тым, што яшчэ павінна было адбыцца. Гэта дата вызначала для беларусаў будучыню, якая ўжо ў тыя часы была рэалізавана іншымі народамі «ўсходу Еўропы»[94]. Такім чынам, гэта дата апраўдвала ашчаднасць і дысцыпліну часу, эвалюцыйную канцэпцыю развіцця, якую прапаноўвала БХД. Зрэшты, у гістарычнай частцы заходнебеларускіх календароў свята 25 Сакавіка з'явілася ўжо ў 1920-я гады[95].

У канцы 1930-х гадоў тэма рацыянальнага выкарыстання часу набыла характар псіхалагічнай глыбіні. Адзначалася, што кожны можа выкарыстоўваць час для працы і адпачынку адпаведна са сваім характарам. Звярталася ўвага на тое, што выпрацоўка звычкі адыгрывае важную ролю пры гэтым. Гнуткасць чалавечых адносін у сэнсе выбару канкрэтнага часу, які можа быць найбольш прадук-

[92] Ks. W. Š., *Jak wykarystać dzień*, „Chryścijanskaja Dumka" 1937, № 3, 5 lutaha, s. 2.

[93] W. D-a, *Biełaruskaje Kupalle*, „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 27, 30 čerwienia, s. 3; Весялуха, *Дажынкі*, „Biełaruskaja Krynica" 1934, № 36, 14 kastryčnika, s. 4; P. Tatarynowič, *Światy Izydar Chliebarob*, „Chryścijanskaja Dumka" 1929, № 3, 10 lutaha, s. 2–9.

[94] W. D-a, *25 sakawik – narodnaje świata Biełarusaŭ,* „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 14, 24 sakawika, s. 1.

[95] Г. Сагановіч, *op. cit.*, с. 220–221; *Беларускі календар на 1929 год*, Вільня 1928, с. 44; *Беларускі календар на 1923 год*, Вільня [1922], с. 27.

тыўны для дзейнасці, не азначае, што не павінна быць планавання дня. Апошняе павінна мець месца незалежна ад таго, хочацца гэта чалавеку ці не. Такім чынам, дзеяннямі індывідуума павінна была кіраваць вышэйшая за штодзённыя моманты рацыянальнасць. Важна было «разумна кіраваць нашай штодзённай працай». Аўтар матэрыялу на гэту тэму разважаў аб рацыянальнасці звязанай са здароўем, з патрэбай працаваць удзень, а спаць уначы. Раніцу аўтар традыцыйна лічыць самым лепшым часам для прадуктыўнай працы. Ацэньвае ён і значэнне разумовай, інтэлектуальнай працы, а таксама сацыяльнае становішча чалавека і яго ўплыў на прадуктыўнасць працы[96]. Былі аднак і іншыя практыкі і дыскурсы, якія ўяўлялі канкурэнцыю для хрысціянска-дэмакратычнай мадэлі часу.

«Рэпрэсіўны» і «чужы» час

Харызматычны тып часу быў непрымальны, «чужы» для беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху. Менавіта да такога тыпу часу можна аднесці яго мадальнасць, якая выплывала з ідэалогіі КПЗБ і з практык савецкага рэжыму. С. Хэнсан падкрэслівае, што харызматычны тып часу характэрны для ленінісцкіх рэжымаў увогуле. У рамках такой мадэлі час можна было паскорыць, пераадолець. Адмаўленне гэтага тыпу часу хадэцкімі выданнямі рабілася як адкрыта, праз непрыманне камуністычнай ідэалогіі, так і ўскосна, праз сцвярджэнне неабходнасці не паскараць развіццё беларускага грамадства, а ісці шляхам паэтапнага эвалюцыйнага развіцця[97]. Камуністаў мала цікавіла традыцыйная культура вяскоўцаў і яе патэнцыял для будавання супольнасці, таму Дажынкі або Купалле не адыгрывалі ў іх планах вялікай ролі. Зрэшты, культурныя

[96] W. D-a, *Najlepšaja hadzina dnia*, „Biełaruskaja Krynica" 1936, № 50, 6 śnieżnia, s. 4.

[97] *Nacyjanalizm, jaho hranicy i značeńnie,* „Biełaruskaja Krynica" 1933, № 9, 26 lutaha, s. 1; *Radykalizm na vioscy i biełaruskaść*, „Chryścijanskaja Dumka" 1939, № 8, 1 sakawika, s. 1.

аспекты ў іх дзейнасці мелі другараднае значэнне. Нігілізм у нацыянальным пытанні захоўваўся да II з'езда КПЗБ у 1935 годзе. Але і пасля яго істотных змен ці пералому не наступіла[98].

Аналіз лістовак КПЗБ, а таксама камуністычнага дыскурсу ў цэлым дае ўяўленне аб тым, што камуністы разглядалі бег часу як паскораны, як такі, што імкнецца да хуткай рэвалюцыі, да хуткай гвалтоўнай змены сацыяльнага, культурнага і эканамічнага ладу, што прадстаўлялася ў якасці адзінага магчымага сцэнарыя развіцця грамадства. Як правіла, камуністычныя публікацыі выкарыстоўвалі вельмі шмат сказаў з заклікамі і клічнікамі. Яны стваралі эмацыянальнае напружанне, што магло, паводле тэкстаў камуністычных перыядычных выданняў і лістовак, быць знята толькі шляхам рэвалюцыі[99]. Камуністычны погляд на грамадскі час, яго харызматычны варыянт супярэчылі падыходу БХД-БНА, для якой хуткі надыход камуністычнай версіі «тысячагадовага царства» ўяўляў сабой фальшывы погляд на развіццё грамадства, які абапіраўся на памылковыя аксіёмы марксісцкай парадыгмы. У гэтым быў і матыў рэвалюцыйнага «паскарэння эвалюцыі», што было квінтэсэнцыяй бальшавіцкага падыходу да грамадскага часу[100].

Савецкія эксперыменты з часам разглядаліся негатыўна. Даследчыкі ахарактарызавалі савецкую мадэль грамадскага часу як харызматычна-рацыянальную. Бальшавікі ўмешваліся ў рэлігійныя традыцыі вяскоўцаў у БССР, знішчалі іх. «Беларуская крыніца» прыводзіла прыклад таго, як час мог быць прасторай культурнага канфлікту на рэлігійнай глебе ў БССР. Паводле апублікаваных у выданні навін з Савецкай Беларусі, сяляне, якім камуністычнае кіраўніцтва загадала з'явіцца на сход а 10 гадзіне, замест гэтага

[98] A. Bergman, *Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej*, Warszawa 1984, s. 92. Праўда, былі і пэўныя выключэнні з гэтага правіла, параўн.: W. H., *Ab patrebach našaj wioski*, „Narodny Zwon" 1926, № 1, 7 śnieżnia, s. 5–7.

[99] W. Mędrzecki, *op. cit*.

[100] S. Hanson, *op. cit.,* p. 12–13.

пайшлі ў касцёл, а на сход прыйшлі толькі а другой гадзіне дня[101]. Пры гэтым увядзенне ў СССР пяцідзённага працоўнага тыдня, што было яркай праявай савецкай мадэлі харызматычна-рацыянальнага часу, не выклікала спачатку нейкіх адназначна негатыўных каментарыяў. Пазней, праўда, «Беларуская крыніца» асвятляла наступствы пераходу да пяцідзённага тыдня і звярнула ўвагу на яго неэфектыўнасць[102].

Таксама не ўсе версіі рацыянальнага часу маглі здавальняць беларусаў, якія былі прыхільнікамі БХД-БНА, зрэшты, і тых, хто не падтрымліваў яе. Гаворка ідзе пра час выплаты падаткаў і запазычанасці, адбыванне павіннасцей і розных работ. Свята Канстытуцыі – 3 Мая – улады маглі, каб падмануць вяскоўцаў, інтэрпрэтаваць як касцельнае. Гэта маглі быць і захады з боку прапольскіх ксяндзоў[103]. Падаткі, якія трэба было сплачваць рэгулярна, маглі быць, асабліва ва ўмовах эканамічнага крызісу і дэфіцыту гатоўкі, значным цяжарам для заходнебеларускіх сялян. Секвестратары маглі патрабаваць нават продажу абразоў, каб спагнаць з сялян запазычанасць за нявыплачаныя падаткі. Гэта выклікала моцнае абурэнне[104]. Польская дзяржава таксама магла груба ўмешвацца ў працоўныя рытмы сялян праз забарону працаваць на палях у Свята Канстытуцыі 3 мая. Такім чынам спрабавалі этатызаваць час сялянства, якое мела свой погляд на тое, як яго аптымальна выкарыстаць у сезон сяўбы[105]. Такі час можна было б назваць «рэпрэсіўным».

Таксама рэпрэсіўным быў час у адносінах да прыходу дзяцей вяскоўцаў у польскія школы на ўрокі. Польскія настаўнікі прызна-

---

[101] *Уплыў рэлігіі сярод беларускіх сялян у Б.С.С.Р.*, «Беларуская Крыніца» 1929, № 30, 26 кастрычніка, с. 2.

[102] *Piacidniowy raboču tydzień*, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 31, 10 listapada, s. 4.

[103] Świrski, *Padatki i „kaścielnaje" świata*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 17, 23 traŭnia, s. 6.

[104] Susied, *Užo i abrazy na padatki*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 26, s. 6.

[105] Al. S., *„Kanstytucyja 3 maja",* „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 19, 6 traŭnia, s. 2–3; K. Verdery, *op. cit.*, p. 39–58.

чалі канкрэтны час пачатку заняткаў. Дэфіцыт гадзіннікаў у вёсцы, звязаны з галечай, не дазваляў у некаторых выпадках дзецям сялян прыходзіць на заняткі своечасова. Гэта прыводзіла да штрафных санкцый[106].

Наўрад ці трэба здзіўляцца таму, што менавіта вопыт ваенна-рэвалюцыйных падзей 1914-1921 гадоў таксама паўплываў на адносіны вяскоўцаў да часу. Рэпрэсіўны аспект гэтага часу мог мець досыць нечаканыя наступствы для тых, хто трапіў пад яго ўздзеянне. Патрэба працаваць паводле графіка ці раскладу прамысловага прадпрыемства магла прымаць прымусовы характар. Знаходжанне ў германскім палоне магло быць крыніцай такога вопыту. Так здарылася з выхадцам з вёскі на Віленшчыне, якому давялося працаваць на сталеліцейным прадпрыемстве ў Германіі. Нават пра свае ўцёкі адтуль ён разважаў у катэгорыях планавання і выбару адпаведнага часу[107]. Такім чынам, навязаныя чужыя культурныя катэгорыі даводзілася засвойваць, бо ад гэтага залежала адаптацыя да новых умоў і выхад з цяжкай сітуацыі.

Адносіны да часу ў міжваеннай Заходняй Беларусі

Не будзе чымсьці дзіўным сцвердзіць, што, нягледзячы на намаганні інтэлектуалаў і палітыкаў з кола БХД, адносіны да часу ў міжваеннай Заходняй Беларусі значна адрозніваліся ад тых, якія прапагандаваў хадэцкі друк. Вёска ўсё ж не была ўпісана ў рытмы індустрыяльнага капіталізму, заходнебеларускія землі не былі закрануты маштабнай урбанізацыяй, і таму ведаць, каторая канкрэтна гадзіна і колькі хвілін, з некаторымі выключэннямі, вяскоўцы не мелі патрэбы, а вось змены дзён і месяцаў іх цікавілі больш. Нельга сказаць, што надыход новых відаў камунікацыі і нясмелыя крокі мадэрнізацыі не закрануў практыкі вяскоўцаў па вымярэнні часу.

[106] Skarha, *op. cit.,* s. 3.
[107] *Pamiętniki emigrantów*..., s. 332–333.

Напрыклад, курсіраванне цягнікоў магло быць арыенцірам для іх: «Яго [вёскі Курган. – *А. П.*] дрымоту парушалі штодня толькі два цягнікі: адзін ранішні, а восьмай гадзіне, у Вільню, а другі вячэрні, таксама а восьмай, у Варшаву. Абодва цягнікі для навакольных сялянаў і пастушкоў служылі паказальнікамі часу»[108]. Сяляне, асабліва старэйшага пакалення, увогуле маглі без карыстання календарамі і гадзіннікамі вызначаць даты пачатку тых ці іншых прац у гаспадарцы, змены ў рытмах прыроды, што выклікала здзіўленне назіральнікаў, якія самі ўжо карысталіся мадэрнай сістэмай тэмпаральных каардынат не паводле фаз Месяца: «Бацька мой заўсёды кажа, што пад трэцюю квадру і пад маладзік ніколі не трэба сеяць жыта. Праверу сёння, якая квадра, каб не пачынаць і мне сваёй сяўбы ў нешчаслівы час»[109]. Добрую характарыстыку таго, як ставіліся да часу прадстаўнікі старэйшага пакалення ў міжваенны перыяд, даў пісьменнік Аляксей Карпюк: «Час для бабак вымяраўся ад касьбы да жніва, ад жніва да пасеваў, хваробы, смерці знаёмых, хрэсьбін. Календарамі ці гадзіннікамі карыстацца яны не ўмелі»[110].

У перыяд асабліва востpай галечы на вёсцы ў сялян проста не магло быць сродкаў на набыццё календароў, якія ў пачатку 1920-х гадоў былі рэдкай з'явай[111]. Матэрыяльны фактар уплываў на тое, ці жылі вяскоўцы «ў часе», ці сапраўды апыналіся «па-за» ім. Нават большы ў параўнанні з даваеннай эпохай кантакт з перыядычным друкам меў свае асаблівасці. Самі паняцці «штотыднёвая газета» ці «штомесячны часопіс» задавалі пэўны рэгулярны тэмпаральны рэжым, былі ўзорам дысцыпліны. Але беларускі і нават польскі друк трапляў на вёску спарадычна[112].

У поглядах і дзейнасці сялян панавала не ашчаднасць у адносінах да часу, не стаўленне да яго як рэсурсу, але абыякавасць

[108] Я. Жамойцін, *op. cit.*, с. 63.
[109] М. Танк, *op. cit.,* с. 257–258, 403.
[110] А. Карпюк, *Вершалінскі рай*, Мінск 1974, с. 242.
[111] W. Staniewicz, *op. cit.*, s. 121.
[112] *У новай айчыне,* с. 242.

і пасіўнасць. Гарызонт будучыні не перавышаў самай бліжэйшай часавай перспектывы. Паводле аднаго назіральніка «Беларускай крыніцы», сярод сялянства нестабільнасць ваенна-рэвалюцыйнага перыяду 1914–1921 гадоў стварыла адчуванне «нясталасці жыцця» і раўнадушнасці да самастойнай дзейнасці, разлічанай на далёкую перспектыву. Яны толькі чакалі[113]. Наўрад ці большасць беларускіх сялян мела гарызонт планавання на 50 год. Ён ва ўмовах натуральнай гаспадаркі быў значна вузейшы. Зрэшты, нельга сказаць, каб такі тэрмін моцна акцэнтаваўся ці нават падкрэсліваўся ў праграмных дакументах БХД, тым не менш, ён быў свайго роду прагнозам таго, які час можа спатрэбіцца на ажыццяўленне такой праграмы.

У 1920-я гады чаканне хуткіх перамен было рысай мыслення сялянства, якое хацела тэрмінова пазбыцца вынікаў разбурэння, голаду і галечы, якія прынесла Першая сусветная вайна. Гэтыя настроі праявіліся падчас выбарчай кампаніі 1922 года. Іх усплёск можна бачыць і ў перыяд пасля Майскага пераварота 1926 года, у выніку якога да ўлады прыйшоў маршал Юзаф Пілсудскі[114]. Гэтыя настроі нікуды не зніклі, а толькі ўзмацніліся ў канцы 1930-х гадоў[115].

У вёсках, якія былі пад моцным уплывам камуністычнай прапаганды, чаканне прымала формы нават поўнага культурнага і гаспадарчага квіетызму. Гаворка магла ісці не проста пра адсутнасць якіх-небудзь праяў жыцця грамадзянскай супольнасці. Чаканне выражалася ў тым, што сяляне проста перастаралі займацца нават сельскагаспадарчай дзейнасцю і чакалі прыходу саветаў. Само існаванне польскай дзяржавы разглядалася якраз як «часовае»[116].

---

[113] Баранаўскі, *Дэмаралізацыя беларускай вёскі (ад нашага баранавіцкага карэспандэнта)*, „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 6, 3 lutaha, s. 1.

[114] J. Januszewska-Jurkiewicz, *op. cit.,* s. 108; A. Bergman, *op. cit.,* s. 94; Rusticanus, *op. cit.*, s. 4–5; Sielanin, *Staraja pieśnia*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 22, 11 lipnia, s. 6.

[115] S. Wysłouch, *op. cit.,* s. 22, 24.

[116] *Ibidem*, s. 32.

Апрача чакання праяўлялася яшчэ і настальгія па даваенным перыядзе, якая набыла мудрагелісты характар. Польскі антраполаг Юзаф Абрэмбскі ўказваў на ўяўленні аб «слабодзе» як на важныя для разумення погляду палешукоў на сучаснасць[117]. Гэта быў ідэалізаваны погляд на эпоху перад вайной, калі сяляне жылі больш заможна і бяспечна, які кантраставаў з перыядам змен, нестабільнасці, няпэўнасці і нясталасці ваеннай эпохі[118]. Настальгію па даваеннай эпосе як па часе, у якім было прасцей жыць з матэрыяльнага пункту гледжання, можна сустрэць нават у карэспандэнцыях у «Беларускую крыніцу»[119].

Думкі аб хуткім паляпшэнні ўласнай сітуацыі, пасіўнае чаканне вельмі слаба спалучаюцца з эвалюцыйнай канцэпцыяй развіцця грамадства, рацыянальнай канцэпцыяй грамадскага часу і яго дысцыплінай, якія ўсё ж патрабавалі актыўнага жадання змен і мэтанакіраваных індывідуальных і калектыўных намаганняў. Вяскоўцы ў сваім чаканні вельмі своеасабліва ўспрынялі пасланне хрысціянска-дэмакратычных выданняў канца 1930-х гадоў – ашчаджаць час: яны не жадалі ўдзельнічаць у культурных і гаспадарчых арганізацыях – ні польскіх, ні беларускіх, матывуючы гэта ў тым ліку «марнаваннем часу і сродкаў»[120]. Сяляне, міма ўвагі якіх не прайшла рыторыка хрысціянска-дэмакратычнага друку, але не толькі яна, выкарыстоўвалі гэты матыў з тым, каб аднолькава дыстанцыравацца па магчымасці і ад польскай дзяржавы, і ад актывістаў былой КПЗБ, і ад больш цэнтрысцкіх сіл нацыянальнага руху.

---

[117] J. Obrębski, *Studia etnosocjologiczne*..., s. 546.

[118] *Ibidem*, s. 463–471.

[119] Śloznawoki, *Ni ŭzad, ni ŭpierad*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 23, 18 lipnia, s. 6.

[120] S. Wysłouch, *op. cit.,* s. 41–42, 81, 93; J. C. Scott*, op. cit*.

Вывады

Канцэпцыя часу БХД была гнуткая, што суадносілася з яе большай увагай да культурнай спецыфікі беларускага грамадства, адмаўленнем рэвалюцыі, таталітарных і аўтарытарных падыходаў да палітыкі і эканомікі. Таму мадэль грамадскага часу БХД, калі прыняць веберыянскую класіфікацыю, спалучала ў сабе рацыянальны, або мадэрны і традыцыйны часы. Для больш радыкальнай камуністычнай плыні было характэрнае харызматычнае разуменне часу, што ў пэўнай ступені адрознівалася ад бальшавіцкай савецкай мадэлі[121].

Прапанаваная беларускімі хрысціянска-дэмакратычнымі выданнямі дысцыпліна часу існавала ў прывязцы да праекта эвалюцыйнага развіцця заходнебеларускага грамадства, падкрэслівала важнасць інтэнсіўных метадаў вядзення сельскай гаспадаркі, развіцця сеткі культурных і эканамічных арганізацый. Час павінен быў ашчаджацца і рацыянальна выкарыстоўвацца як на ўзроўні асобных беларусаў, так і на калектыўным, групавым узроўні, закранаючы як сферу прыватнага, так і публічнага, утвараючы супольнасць, дзе час належаў мэтам будучыні, якая дыктавала мадэлі паводзін, звязаныя з часам. Дыскурс дысцыпліны часу пераплятаўся не толькі з эканамічнай і культурнай дзейнасцю, але быў звязаны з чытаннем беларускай перыёдыкі і літаратуры і інш., утвараючы свайго роду сінтэз усіх гэтых элементаў, знітаваных праектам пабудовы мадэрнага беларускага грамадства паводле прынцыпаў, якія БХД-БНА лічыла адпаведнымі для беларусаў. Гэты дыскурс, аднак, ва ўмовах адсутнасці значных мадэрнізацыйных і ўрбанізацыйных зрухаў, заставаўся рыторыкай, якая толькі стварала тое, што само па сабе было «індустрыялізацыйнымі» сацыяльнымі чаканнямі[122], але не дзейнічала ў рэчышчы поўнамаштабных змен.

---

[121] S. Hanson, *op. cit.*

[122] A. Valantiejus, *Early Lithuanian Nationalism: Sources of its Legitimate Meanings in an Environment of Shifting Boundaries,* „Nations and Nationalism" 2002, Vol. 8, № 3, p. 327.

Працягласць часу, якую палітычныя рухі дэкларатыўна і ацэначна прадстаўляюць для рэалізацыі сваіх праграм, можа, на нашу думку, кінуць святло на тое, ці яны больш выкарыстоўвалі рытарычнае маніпуляванне, ці больш стараліся пераканаць сваіх патэнцыяльных прыхільнікаў[123]. Камуністычны рух абяцаў нерэальна хуткае збаўленне ад пакут, а хрысціянска-дэмакратычны ўсё ж больш цвяроза бачыў, што для гэтага спатрэбіцца больш часу.

У дыскурсе дысцыпліны часу таксама можна ўбачыць «мяккую» форму каланізацыі штодзённасці з дапамогай дысцыпліны часу[124]. Каляндар, пры ўсёй абмежаванасці гэтага дыскурсу, заставаўся поспехам беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, увасабленнем такога мяккага ўмяшання ў штодзённасць з боку інтэлектуалаў і палітыкаў гэтага палітычнага кірунку. Каляндар не быў інструментам арыентацыі будучыні, ён быў элементам штодзённасці. Вяскоўцы самі не схільныя былі думаць аб будучыні, іх фактычна здавальняў сённяшні дзень. Аднак у міжваенны перыяд не толькі вяскоўцы былі ў разгубленасці адносна будучыні. Еўрапейцы ў выніку Першай сусветнай, або Вялікай вайны самі былі дэзарыентаваныя. Пачуццё будучыні было страчана, жыццё цяперашнім момантам дамінавала ў настроях[125]. Вакуум жа, які ўтварылі такія настроі, імкліва запаўнялі фашысцкія і камуністычныя рухі і рэжымы. Яны давалі вялікай колькасці людзей пачуццё пачатку новай эпохі, пачуццё будучыні і перспектывы[126].

---

[123] R. Harre, *Persuasion and Manipulation* [in:] *Discourse and Communication: New Approaches to the Analysis of Mass Media Discourse and Communication*, ed. T. A. van Dijk, Berlin, New York 1985, p. 126–142.

[124] K. Verdery, *The Production and Defense of "the Romanian Nation", 1900 to World War II* [in:] *Nationalist Ideology and the Production of National Culture*, ed. R. C. Fox, Washington DC 1990, p. 81–111; Idem, *National Ideology Under Socialism. Identity and Cultural Politics in Ceauşescu Romania*, Berkeley, Los Angeles, Oxford 1991.

[125] Л. Ф. Селин, *Путешествие на край ночи*, Харьков, Ростов-на-Дону 1999, с. 49; M. Eksteins, *Rites of Spring. The Great War and the Birth of the Modern Age*, Boston, New York 1989, p. 256.

[126] R. Griffin, *Modernism and Fascism: The Sense of a Beginning under Mussolini and Hitler*, Basingstoke 2007.

У праблематыцы часу таксама ўвасабляецца сутыкненне культурных і палітычных парадыгм. Камуністычны кірунак з яго квазірэлігійнай верай у месіянскую ролю рэвалюцыйнага рабочага класа быў схільны пагарджаць штодзённасцю, якая была дробяззю ў планах татальнага пераўладкавання культуры і грамадства праз іх фактычнае разбурэнне. Фактычна камуністы не дыферэнцыравалі рэлігію і палітыку, якія гістарычна і так моцна паміж сабой знітаваны[127]. Але менавіта беларускія хрысціянскія дэмакраты па-сапраўднаму глыбока і сур'ёзна разумелі сувязь рэлігіі і палітыкі, якія спрабавалі адасобіць адну ад другой. Таму яны вызнавалі больш адкрыты і больш нюансаваны падыход да сацыяльнай і культурнай рэчаіснасці Заходняй Беларусі, з якой мелі справу. Тэрмін у 50 год[128], які польскія палітыкі, паводле ацэнкі беларускіх, лічылі дастатковым, каб беларусы зніклі як асобны этнас, быў выкарыстаны для пазітыўных мэт. Гэта быў тэрмін патрэбны для выратавання беларусаў праз знаходжанне імі свайго шляху ў мадэрнасць, праз пабудову сучаснага грамадства, праз павелічэнне матэрыяльнага дабрабыту і павышэнне культурнага і адукацыйнага ўзроўню вяскоўцаў. Аднак гэтыя «50 год» не сталі часткай свядомасці большасці жыхароў Заходняй Беларусі так, як гэта артыкулявалі дзеячы БХД. Зрэшты, як аказалася ў 1939 годзе, гэтага часу яны і не мелі.

Літаратура

A. K., *Nia nożam, dyk čaranami*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 43, 12 wieraśnia.

A. W., *Sekret adhadali*, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 10, 8 sakawika.

[127] I. Strenski, *Why Politics Can't Be Freed From Religion*, Oxford, Cambridge 2010; M. Burleigh, *Sacred Causes: the Clash of Religion and Politics, from the Great War to the War on Terror*, New York, London 2006.

[128] Žuk, *Kudy iści i za kim?*, „Narodny Zwon" 1926, № 1, 7 śnieżnia, s. 3–4; *Крыху спозьненае прызнаньне*, «Грамадзкі Голас» 1924, № 17, 28 жніўня, с. 1; Al. S., *Ślady niawolnictwa*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 23, 3 čerwienia, s. 1; М. Танк, *op. cit.,* с. 364–365.

A-č, *Duch času i biełarusy,* „Krynica" 1918, № 2, 14 studnia.

Ad. St-ič, *Z aposznich dzion*, „Krynica" 1923, № 3, 31 sakawika.

Al. S., *„Kanstytucyja 3 maja",* „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 19, 6 traŭnia.

Al. S., *Ślady niawolnictwa*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 23, 3 čerwienia.

Bergman A., *Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej*, Warszawa 1984.

Berman M., *All that is Solid Melts Into Air. The Experience of Modernity*, New York 1988.

„Biełaruskaja Krynica" 1927, № 44, 28 kastryčnika; № 51, 16 śnieżnia; 1936, № 50, 6 śnieżnia; № 51, 13 śnieżnia; № 52, 20 śnieżnia; 1937, № 22, 20 śnieżnia; 1939, № 1, 2 studzienia.

Biełaruski kalandar na 1914 hod, Wilnia 1914.

Biełaruski kalandar na 1917 hod, Wilnia 1916.

Biełaruski kalandar. 1915 hod, Wilnia 1914.

Bloch M., *The Past and the Present in the Present,* "Man, New Series" 1977, Vol. 12, № 2, August.

Bourdieu P., *Structures, Habitus, Power: Basis for a Theory of Symbolic Power* [in:] *Culture. Power. History. A Reader in Contemporary Social Theory*, eds. N. B. Dirks, G. Eley, S. B. Ortner, Princeton, New Jersey 1994.

Burleigh M., *Sacred Causes: the Clash of Religion and Politics, from the Great War to the War on Terror*, New York, London 2006.

„Chryścijanskaja Dumka" 1937, nr 22, 20 śnieżnia.

Douglas M., *Implicit Meanings: Essays in Anthropology*, Boston 1975.

Duara P., *Historicizing National Identity, or Who Imagines What and When* [in:] *Becoming National. A Reader*, eds. G. Eley, R. G. Suny, New York, Oxford 1996.

Eksteins M., *Rites of Spring. The Great War and the Birth of the Modern Age*, Boston, New York 1989.

Elias N., *The Civillizing Process*, Oxford, Cambridge 2000.

Elias N., *Time. An Essay*, Oxford, Cambridge 1992.

Foster G. M., *Peasant Society and the Image of Limited Good*, "American Anthropologist. New Series" 1965, Vol. 67, № 2, April.

Frykman J., Löfgren O., *Narodziny człowieka kulturalnego. Kształtowanie się klasy średniej w Szwecji XIX i XX w.*, Kęty 2007.

Griffin R., *Modernism and Fascism: The Sense of a Beginning under Mussolini and Hitler*, Basingstoke 2007.

Hall E. T., *The Dance of Life: The Other Dimension of Time,* Garden City, New York 1983.

Hanson S., *Time and Revolution. Marxism and the Design of Soviet Institutions*, Chapel Hill, London 1997.

Harre R., *Persuasion and Manipulation* [in:] *Discourse and Communication: New Approaches to the Analysis of Mass Media Discourse and Communication*, ed. T. A. van Dijk, Berlin, New York 1985.

Himka J. P., *Galician Villagers and the Ukrainian National Movement in the Nineteenth Century*, Houndmills 1988.

Hutarki dziadźki Haŭryły, „Biełaruskaja Krynica" 1933, № 7, 12 lutaha.

J. P., *Naša chwaroba i leki ad jaje*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 46, 12 kastryčnika.

J. P., *Sektanstwa ŭ biełaruskich masach i jaho pryčyny*, „Biełaruskaja Krynica" 1932, № 31, 10 wieraśnia.

Janka Hrom, *Dawoli spać!*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 9, 3 lutaha.

Januszewska-Jurkiewicz J., *Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939*, Katowice 2011.

J-k, *10-ty Mižnarodny Dzień Aščadnaści*, «Шлях Моладзі» 1933, № 10, кастрычнік.

Kalendary i knižki možna pradavać biez dazvołu, „Chryścijanskaja Dumka" 1939, № 8, 1 sakavika.

Kanfiskata biełar. kalendara, „Biełaruskaja Krynica" 1925, № 5, 25 kastryčnika.

Kanfiskata biełaruskaha kalendara, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 35, 6 śniežnia.

Kern S., *The Culture of Time and Space 1880–1918*, Cambridge 1983.

Kłakoŭski H., *Nowy Pahost, Dzisienski paw*., „Krynica" 1924, № 10, 29 krasawika.

Kolberg O., *Dzieła wszystkie.* T. 52. *Białoruś–Polesie*, Wrocław, Poznań 1968.

Kolki tracim marnujučy čas? (na Dzień Aščadnaści), «Самапомач» 1937, № 17, 25 кастрычніка.

Ks. W. Š., *Jak wykarystać dzień*, „Chryścijanskaja Dumka" 1937, № 3, 5 lutaha.

Małady Dub*, Dawoli čas marnawać, biaremsia za pracu!*, „Biełaruskaja Krynica" 1928, № 35, 17 čerwienia.

Malecki J., *Za praduktyŭnuju pracu*, «Шлях Моладзі» 1937, № 5, май.

Mallon F. E., *Peasant and Nation. The Making of Postcolonial Mexico and Peru*, Berkeley, Los Angeles, London 1995.

Matusewič, *Jak prawieści zimowuju paru?*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 2, 18 studnia.

Mędrzecki W., *KPZB i KPZU a wieś ukraińska i białoruska*, niepublikowany referat, 2008.

Metodyzm u Zachodniaj Biełarusi i prychilnaść da jaho Ŭłasawa, Łuckiewiča i Janki Stankiewiča, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 18, 12 traŭnia.

Moroz M., *„Krynica". Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu*, Białystok 2001.

M-st, *Sektanstwa – hrob narodu*, „Biełaruskaja Krynica" 1932, № 37, 30 kastryčnika.

Nacyjanalizm, jaho hranicy i značeńnie, „Biełaruskaja Krynica" 1933, № 9, 26 lutaha.

Obrębski J., *Studia etnosocjologiczne.* T. I. *Polesie*, red. A. Engelking, Warszawa 2007.

P. D., *Za karowu – hadzinnik*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 36, 2 wieraśnia.

Pamiętniki emigrantów. T. I. *Francja*, Warszawa 1939.

Piacidniowy rabočy tydzień, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 31, 10 listapada.

Porter B. A., *The Social Nation and its Futures: English Liberalism and Polish Nationalism in Late Nineteenth-Century Warsaw*, "The American Historical Review" 1996, Vol. 101, № 5, December.

Pranuk Lebiadzki, *Čas da pracy bracca!*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 37, 22 kastryčnika.

Radykalizm na vioscy i biełaruskaść, „Chryścijanskaja Dumka" 1939, № 8, 1 sakawika.

Raspradaža 500 hadzinnikaŭ, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 18, 12 traŭnia.

Rinehart J. F., *Revolution and the Millennium: China, Mexico, and Iran*, Westport, Connecticut 1997.

Rusticanus, *Z nastrojów wsi białoruskiej*, „Przegląd Wileński" 1926, № 13, 18 lipca.

Scott J. C., *Domination and the Arts of Resistance: Hidden Transcripts*, New Haven, London 1990.

Sektanstwa šyrycca, „Biełaruskaja Krynica" 1931, № 26, 25 žniŭnia.

Sielanin*, Ci nia lepš wolny čas wykarystać dla praświety čym marnawać na puściačynu?*, „Biełaruskaja Krynica" 1931, № 7, 20 lutaha.

Sielanin, *Staraja pieśnia*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 22, 11 lipnia.

Skarha, *Halilejskija paradki*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 5, 28 studnia.

Sławianin, *Našaje žyćcio*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 21, 20 traŭnia.

Śloznawoki, *Ni ŭzad, ni ŭpierad*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 23, 18 lipnia.

Sluchoŭski, *Metadyskaja „sprawiadliwaść"*, „Biełaruskaja Krynica" 1927, № 38, 16 wieraśnia.

Staniewicz W., *Matujzy Bołondziszki, wieś powiatu lidzkiego*, Warszawa 1923.

Stauter-Halsted K., *The Nation in the Village. The Genesis of Peasant National Identity in Austrian Poland 1848–1914*, Ithaca, London 2001.

Što rabić zimoj, pierakład M. H., „Krynica" 1924, № 5, 1 sakawika.

Što robicca na ziamli ŭ praciahu 1 hadziny, «Шлях Моладзі» 1934, № 4, красавік.

Strenski I., *Why Politics Can't Be Freed From Religion*, Oxford, Cambridge 2010.

Sumny, *Zadańni našaj moladzi*, „Krynica" 1925, № 20, 17 traŭnia.

Susied, *Užo i abrazy na padatki*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 26.

Świrski, *Padatki i „kaścielnaje" świata*, „Biełaruskaja Krynica" 1926, № 17, 23 traŭnia.

Tatarynowič P., *Światy Izydar Chliebarob*, „Chryścijanskaja Dumka" 1929, № 3, 10 lutaha.

Thompson E. P., *Customs in Common*, Harmondsworth 1993.

Tikhonov V., *Social Darwinism and Nationalism in Korea: the Beginnings (1880s–1910s). "Survival" as the Ideology of Korean Modernity*, Leiden, Boston 2010.

Time is money, „Straż nad Niemnem" 1923, № 20, 14 maja.

Turner V., *Drams, Fields and Metaphors. Symbolic Action in Human Society*, Ithaca, London 1974.

Valantiejus A., *Early Lithuanian Nationalism: Sources of its Legitimate Meanings in an Environment of Shifting Boundaries,* "Nations and Nationalism" 2002, Vol. 8, № 3.

Van Rooden P., *Nineteenth-Century Representations of Missionary Conversion and the Transformation of Western Christianity* [in:] *Conversion to Modernities. The Globalization of Christianity*, eds. P. van der Veer, New York, London 1996.

Verdery K., *National Ideology Under Socialism. Identity and Cultural Politics in Ceauşescu Romania*, Berkeley, Los Angeles, Oxford 1991.

Verdery K., *The Production and Defense of "the Romanian Nation", 1900 to World War II* [in:] *Nationalist Ideology and the Production of National Culture*, ed. R. C. Fox, Washington DC 1990.

Verdery K., *What Was Socialism and What Comes Next?,* Princeton, New Jersey 1996.

W. D-a, *25 sakawik – narodnaje świata Biełarusaŭ,* „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 14, 24 sakawika.

W. D-a, *Biełaruskaje Kupalle*, „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 27, 30 čerwienia.

W. D-a, *Hultajski paniadziełak*, „Biełaruskaja Krynica" 1936, № 48, 29 listapada.

W. D-a, *Najlepšaja hadzina dnia*, „Biełaruskaja Krynica" 1936, № 50, 6 śnieżnia.

W. H., *Ab patrebach našaj wioski*, „Narodny Zwon" 1926, № 1, 7 śnieżnia.

Wiejscy działacze społeczni. T. I. *Życiorysy włościan*, Warszawa 1937.

Wysłouch S., *Świadomość narodowa ludności prawosławnej zamieszkującej wschodnie i północno-wschodnie powiaty Wileńszczyzny*, Warszawa 1939.

Z. B., *Ci majem my što aščadžać?*, «Шлях Моладзі» 1938, № 22, 25 кастрычніка.

Zaściankowy Padpiečnik, *„Krynica" pramywaje woču*, „Krynica" 1925, № 13, 29 sakawika.

Zerubavel E., *Hidden Rythms. Schedules and Calendars in Social Life*, Berkeley, Los Angeles 1985.

Žuk, *Kudy iści i za kim?*, „Narodny Zwon" 1926, № 1, 7 śnieżnia.

Багдановіч Я., *На жыццёвым шляху*, Мінск 1992.

Баранаўскі, *Дэмаралізацыя беларускай вёскі (ад нашага баранавіцкага карэспандэнта)*, „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 6, 3 lutaha.

Беларускі календар на 1923 год, Вільня [1922].

Беларускі календар на 1929 год, Вільня 1928.

Беларускі каляндар на 1927 год, Вільня [б. г.].

Беларускі каляндар на 1932 год, Вільня [б. г.].

Беларускі сялянскі календар на 1939 год, Вільня 1939.

Ван Геннеп А., *Обряды перехода,* Москва 2002.

Вашкевіч А., *Эвалюцыя Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі ў святле яе палітычных праграм* [у:] «Спадчына» 2006, № 1.

Весялуха, *Дажынкі*, „Biełaruskaja Krynica" 1934, № 36, 14 kastryčnika.

Гирц К., *Интерпретация культур*, Москва 2004.

Жамойцін Я., *З перажытога* [у:] *Лёс аднаго пакалення (успаміны),* Беласток 1996.

Карпюк А., *Вершалінскі рай*, Мінск 1974.

Крыху спозьненае прызнаньне, «Грамадзкі Голас» 1924, № 17, 28 жніўня.

Пагарэлы А., *Прэса і публічная сфера ў заходнебеларускай вёсцы ў 1920–30-я гады*, «Беларускі гістарычны агляд» 2016, т. 23, сш. 1–2, снежань.

Паз., *Ашчаджайма пашу*, „Samapomač" 1937, № 13, 13 жніўня.

Пракаповіч Ю., *Жыццёвыя сцежкі* [у:] *Лёс аднаго пакалення (успаміны),* Беласток 1996.

Р., *Не марнуйма дарма часу!*, «Беларуская Крыніца» 1931, № 14, 23 красавіка.

Сагановіч Г., *Беларускі каляндар у гістарычнай асвеце ў 1910–1939 г.*, «Беларускі гістарычны агляд» 2015, т. 22, сш. 1–2, снежань.

Селин Л. Ф., *Путешествие на край ночи*, Харьков, Ростов-на-Дону 1999.

Селянін, *Трэба сарганізаваць прадажу беларускіх календароў*, „Biełaruskaja Krynica" 1934, № 39, 29 kastryčnika.

Сьвята ашчаднасьці, „Biełaruskaja Krynica" 1929, № 30, 26 кастрычніка.

Т. Л., *Аб прычынах безпрацоўя і эканамічным крызысе (да справы «пляна-ваньня ў народнай гаспадарцы»)*, «Шлях Моладзі» 1937, № 7, ліпень.

Танк М., *Лісткі календара* [у:] М. Танк*, Збор твораў у 4 т.* Т. 4. *Вершы, дзённікі, пераклады,* Мінск 1967.

Токць С., *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX – першая траціна XX ст*., Мінск 2007.

У новай айчыне, Беласток 2001.

Ул. К., *З над Нарачы*, „Biełaruskaja Krynica" 1935, № 36, 6 kastryčnika.

Уплыў рэлігіі сярод беларускіх сялян у Б.С.С.Р., «Беларуская Крыніца» 1929, № 30, 26 кастрычніка.

Хант Л., *Французская революция: нулевой градус времени* [в:] *Изобретение века. Проблемы и модели времени в России и Европе XIX столетия*, под ред. Е. Вишленковой, Д. Сдвижкова, Москва 2013.

Цыпрыяновіч С. (Найдзюк Я.), *Беларуская Друкарня імя Францішка Скарыны ў Вільні (1926–1940),* London 1991.

Шенк Ф. Б., *Универсальное время versus локальное время: железные дороги и споры о времяисчислении в России (1870–1910-е годы)* [в:] *Изобретение века. Проблемы и модели времени в России и Европе XIX столетия*, под ред. Е. Вишленковой, Д. Сдвижкова, Москва 2013.

«Шлях Моладзі» 1938, № 26, 30 сьнежня.

Этнаграфічная маса – рэгіёналізм – свабода адзінак, «Беларуская Крыніца» 1932, № 12, 20 сакавіка.

Я-к, *Ашчаджайма!*, «Шлях Моладзі» 1932, № 10, кастрычнік.

The problem of the time management in the BCD-BPU press discurses in the inter-war period

The article is an attempt to study the problem of time discipline in the periodical press discourse of interwar Belarusian Christian Democracy. This discourse was an important element in shaping of an image of moral community comprising politically, socially and economically active Belarusians. However, not only political but also sociocultural factors to a large extent determined that the effect of this discourse on Belarusian village was rather limited. The article proposes a typology of social time which characterizes the attitudes toward time of Belarusian Christian Democracy and other political movements in West Belarus.

Keywords: social time, press, West Belarus, interwar years, Belarusian Christian Democracy

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.159-182

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190408

Data przesłania: 07.02.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

Юрый Бачышча
Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва
baczyszcza@gmail.com
ORCiD: 0000-0001-9501-7400

Андрэй Унучак
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
unuchak@gmail.com
ORCiD: 0000-0001-7552-2450

Пратэстанцкая царква і беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі (1918–1939)

Kościół protestancki i białoruski ruch narodowy na Białorusi Zachodniej (1918–1939)

Wielu działaczy białoruskich w Polsce w okresie międzywojennym traktowało protestantyzm jako „białoruski kościół narodowy". W danej publikacji podjęto próbę przeanalizowania sytuacji językowej i narodowej wewnątrz Kościoła protestanckiego, poddano analizie wydawnictwa protestanckie w języku białoruskim. Autorzy poświęcają wiele miejsca niektórym ważnym postaciom białoruskiego ruchu ewangelickiego, które przyczyniły się do narodowego i duchowego odrodzenia Białorusinów. Byli nimi pasterze Łukasz Dziekuć-Malej i Jan Piotrowski. Autorzy doszli do wniosku, że w okresie międzywojennym na ziemiach zachodniobiałoruskich procesy narodotwórcze i ewangeliczne odbywały się jednocześnie. Niektórzy przedstawiciele ruchu ewangelickiego dążyli do uczynienia z protestantyzmu kościoła narodowego Białorusinów. Używano języka białoruskiego w działalności duszpasterskiej, utożsamiano działalność ewangeliczną z działalnością na rzecz kultury i języka białoruskiego. Część inteligencji białoruskiej traktowała protestantyzm jako Kościół, który nie będzie dzielił Białorusinów na „Polaków" i „Rosjan", jak to często miało miejsce w przypadku katolicyzmu i prawosławia. Wszakże plany te nie zostały zrealizowane. Wśród wiernych ruchu protestanckiego

zabrakło osób sympatyzujących z białoruskością. Ponadto znaczna część inteligencji białoruskiej ciążyła ku ateizmowi. Związki protestantyzmu z ruchem białoruskim do dziś są słabo zbadane.

Słowa kluczowe: Białoruś, protestantyzm, naród, ruch narodowy, Kościół

Гістарыяграфія

Пытанне пра сувязі беларускага руху з пратэстантызмам не новае для беларускай гістарыяграфіі. Толькі ў XXI стагоддзі шэраг аўтараў прысвяцілі гэтай тэме свае працы[1]. Юры Туронак таксама закранаў тэму ўзаемасувязей пратэстантызму і беларускага руху[2]. У асноўным ён пісаў пра пратэстанцкія выданні, якія з'яўляліся пачынаючы з 1920-х гадоў.

Адным з першых, хто звярнуў увагу на гэтую тэматыку, паказаў яе маштабы і абазначыў прадмет даследавання, быў А. Латышонак. У 2003 годзе ў спецыяльным нумары часопіса «Спадчына», прысвечаным 450-годдзю Рэфармацыі ў Беларусі, быў надрукаваны яго агляд «Беларускія палітыкі і пратэстанты. Ад „Гомона" да Грамады»[3]. Гісторык акрэсліў галоўную прычыну, па якой беларускія дзеячы звярнулі свае позіркі ў бок пратэстанцкай царквы, а менавіта на канфесійную раз'яднанасць беларусаў як перашкоду на шляху фарміравання сучаснай нацыі. Як адзначыў А. Латышонак,

[1] *Пратэстанцкая царква і беларускі нацыянальны рух на пачатку XX ст.: артыкулы і ўспаміны*, Мінск 2006; А. Пашкевіч, *Пратэстантызм і беларускі нацыяналізм у міжваеннай Польшчы,* „Arche" 2007, № 5, с. 42–56; *Лукаш Дзекуць-Малей і беларускія пераклады Бібліі: зборнік матэрыялаў, артыкулаў і дакументаў*, Брэст 2011; Ю. Бачышча, *Дзейнасьць царквы мэтадыстаў на ніве беларускага адраджэньня ў 20–30-я гг. XX ст.* [у:] *Евангельская Церква Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Зборнік матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі*, Мінск 2014, с. 186–205; У. Русецкі, *Пастар Станіслаў Нядзьвецкі і евангельскае прабуджэнне на паўночным захадзе Беларусі*, Мінск 2017.

[2] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Vilnius 2006, с. 296–297, 346–347.

[3] А. Латышонак, *Беларускія палітыкі і пратэстанты. Ад «Гомона» да Грамады,* «Спадчына» 2003, № 1, с. 69–71.

з моманту зараджэння беларускага нацыянальнага руху было відавочна, што праваслаўе і каталіцтва падзялілі беларусаў не толькі канфесіянальна, але і навязвалі рускую і польскую нацыянальныя ідэнтычнасці. Каб выйсці з гэтай тупіковай для нацыянальнага руху сітуацыі, беларуская інтэлігенцыя, у асноўным рэлігійна індыферэнтная, пачала шукаць «трэці шлях». Спачатку лідары беларускага руху звярнуліся да уніі, а калі гэта не прынесла жаданага выніку – да пратэстантызму.

Значная частка беларускай інтэлігенцыі першай паловы XX стагоддзя лічыла царкву «чужой» нацыянальнаму адраджэнню[4]. Прычына гэтага была ў тым, што хрысціянства ў Беларусі было «польскім» або «рускім». Як адзначаў адзін з аўтараў гэтага артыкула, «пры сваіх абмежаваных магчымасьцях, мэтадысты Заходняй Беларусі зрабілі даволі значны ўнёсак у разьвіцьцё беларускамоўнага пратэстанцкага друку і беларускай культуры ў цэлым». Былі знойдзены пацвярджэнні таго, што заходнебеларуская пратэстанцкая інтэлігенцыя ў 1930-я гады ставіла перад сабой задачу «ўтварыць пачатак Хрысьціянскае Беларускае Царквы, на асновах мэтадыстычных»[5].

У. Ляхоўскі і А. Чарнякевіч, пішучы пра гродзенскі эпізод у жыцці пастара Лукаша Дзекуць-Малея, канстатуюць, што ён «зьяўляўся адным зь першых пратэстанцкіх сьвятароў, які сьвядома далучыўся да нацыянальнай справы»[6]. На іх думку, гэта далучэнне адбылося ў 1918 годзе, калі баптысцкі пастар Л. Дзекуць-Малей стаў актыўным беларускім дзеячам на Гродзеншчыне.

У. Русецкі, біёграф радашковіцкага пастара царквы хрысціян веры евангельскай Станіслава Нядзвецкага, прыйшоў да вываду, што ў пачатку XX стагоддзя погляд кіраўнікоў беларускага нацы-

[4] Ю. Бачышча, *Царква і нацыя* [у:] *Лукаш Дзекуць-Малей…*, с. 36–45.

[5] Ю. Бачышча, *Дзейнасьць царквы…,* с. 204.

[6] У. Ляхоўскі, А. Чарнякевіч, *Гарадзенскі «эпізод» жыцьця пастара Лукаша Дзекуць-Малея* [у:] *Лукаш Дзекуць-Малей…*, с. 110–121.

янальнага руху быў звернуты ў бок пратэстантызму. Евангельскае хрысціянства, таксама як і беларуская дзяржаўнасць, у пачатку XX стагоддзя перажывала час адраджэння: узнікалі цэрквы баптыстаў, евангельскіх хрысціян, адвентыстаў і метадыстаў. У той жа час узнікла ідэя «беларускай нацыянальнай царквы, г. зн. царквы, для якой неабыякавы лёс беларусаў як народу. Патэнцыйна такой царквой маглі стаць пратэстанты»[7].

Такім чынам, як відаць з кароткага гістарыяграфічнага агляду, гісторыкі, якія займаюцца гісторыяй пратэстантызму ў Заходняй Беларусі, фактычна прыходзяць да аднаго агульнага вываду. Коратка сфармуляваць яго можна наступным чынам: у асяроддзі заходнебеларускай інтэлігенцыі міжваеннага перыяду было актуальным пытанне «беларускай нацыянальнай царквы», і многія яе прадстаўнікі бачылі пратэстантызм у гэтай ролі. Такая пазіцыя, сярод іншага, грунтавалася на тым, што заходнебеларускія пратэстанты міжваеннага часу бралі ўдзел у працэсах фарміравання беларускай нацыі, а многія прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі былі членамі пратэстанцкіх цэркваў або прынамсі наведвалі пратэстанцкія набажэнствы.

Моўнае і нацыянальнае пытанне ў пратэстанцкай царкве

Яшчэ ў часы Расійскай імперыі царскія ўлады праводзілі даследаванне моўнай сітуацыі ў пратэстанцкіх цэрквах, іх цікавіла не толькі мова набажэнства, але і мова «хатняга ўжытку»[8]. У выніку сабраных звестак высветлілася, што, напрыклад, у Віцебскай губерні лютэране і баптысты пераважна карысталіся нямецкай і латышскай мовамі[9].

Так, у полацкай евангельска-лютэранскай царкве ў адну нядзелю набажэнства было на нямецкай, а ў другую – на латышскай мове.

[7] У. Русецкі, *Пастар Станіслаў*..., с. 17.
[8] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 1430, воп. 1, спр. 47850, арк. 1.
[9] *Ibidem*, арк. 2–5.

У полацкім прыходзе было каля 300 немцаў, якія ў асноўным жылі ў горадзе, і 900 латышоў, якія жылі ў Полацкім і Лепельскім паветах. Таму набажэнствы адбываліся на дзвюх мовах[10].

Евангельска-лютэранскі пастар з Дзвінска (цяпер Даўгаўпілс (Латвія)) паведамляў віцебскаму губернатару, што яго духоўная ўлада распаўсюджвалася на Дзвінск і частку Дзвінскага павета, а таксама на Дрысенскі павет. Пісаў, што вернікі па мове і нацыянальнасці немцы і латышы. У Дзвінску роўна палова на палову немцы і латышы. У Дзвінскім павеце латышы складалі 85% вернікаў, а немцы – 15%. Набажэнствы ў Дзвінску і Краслаўцы Дзвінскага павета адбываліся на нямецкай і латышскай мовах, у Дзвінскім павеце – толькі па-латышску[11].

Падсумоўваючы інфармацыю па баптыстах віцебскі губернатар у другой палове 1910 года паведамляў у дэпартамент духоўных спраў Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі, што рэфарматаў у Віцебскай губерні не было. Што да баптыстаў, то ў Дзвінску іх налічвалася 28 чалавек, у Дзвінскім павеце – 110, у Люцынскім – 53, у Дрысенскім – 1. Усяго – 212 чалавек, усе латышы, набажэнствы праводзілі выключна на латышскай мове[12].

Такім чынам, у Віцебскай губерні, дзе пратэстантызм у пачатку XX стагоддзя перажываў час уздыму, ён стаў адным з падмуркаў латышскага нацыянальнага адраджэння, што магло паўплываць на канфесійную пазіцыю беларускай інтэлігенцыі міжваеннага перыяду.

У Заходняй Беларусі ў міжваенны час моўная сітуацыя ў пратэстанцкіх цэрквах была больш складаная. Як паказала Т. Лісоўская, заходнебеларускія лютэране карысталіся пераважна польскай мовай, рэфарматы – беларускай (у 1933 годзе канферэнцыяй віленскай евангельска-рэфармацкай царквы было прынята рашэнне праводзіць усе набажэнствы па-беларуску). Беларуская мова да

[10] *Ibidem*.
[11] *Ibidem*, арк. 6.
[12] *Ibidem*, арк. 18адв.

пачатку 1930-х гадоў відавочна заняла галоўнае месца ў жыцці рэфармацкай царквы. Пра гэта ўскосна сведчыць той факт, што віленскаму кальвінскаму пастару Курнатоўскаму з ваяводскай управы быў дасланы ліст, у якім забаранялася праводзіць набажэнствы на беларускай мове. Што да баптыстаў, хрысціян веры евангельскай, евангельскіх хрысціян, Цэркваў Хрыстовых, адвентыстаў сёмага дня, то мова, якой яны пераважна карысталіся, у дакументах называлася «тутэйшай». Таксама, як пісалі прадстаўнікі польскіх улад, у пратэстанцкіх цэрквах Заходняй Беларусі выкарыстоўвалася руская і ў пэўнай меры беларуская мова[13].

Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што фактычна ўсе пратэстанцкія дэнамінацыі ў той або іншай ступені ўжывалі беларускую мову. Так, напрыклад, сярод фармуляраў, пададзеных ва ўправу Палескага ваяводства заснавальнікам і кіраўніком Цэркваў Хрыстовых Канстанцінам Ярашэвічам, ёсць цікавы фармуляр царквы вёскі Талькава Антопальскай гміны Кобрынскага павета. Пастарам гэтай царквы быў Ян Саковіч, мясцовы чалавек, запісаны як беларус. У пункце пра дзейнасць царквы запісана: «збіраемся арганізаваць рэлігійную школу [пры царкве. – *Ю. Б., А. У.*] з польскай, беларускай і англійскай мовамі выкладання»[14].

У найбольшай ступені беларускай мовай карысталіся метадысты. Для прадстаўнікоў гэтай дэнамінацыі ўжыванне беларускай мовы было прынцыповым. Так, паводле ўспамінаў вучняў Радашковіцкай беларускай гімназіі, якая знаходзілася пад апекай метадысцкай царквы, нават місіянеры-амерыканцы, што прыязджалі ў Заходнюю Беларусь, вывучалі беларускую мову[15].

---

[13] Т. Лісоўская, *Пратэстантызм у кантэксце этнаканфесійных працэсаў у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)* [у:] *Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць*. Вып. 2. *Зборнік матэрыялаў II міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі*, Мінск 2016, с. 131–152.

[14] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ), ф. 1, воп. 2, спр. 2310, арк. 23адв.

[15] Ю. Бачышча, *Дзейнасьць царквы…,* с. 190.

Такім чынам, пратэстанты ў Беларусі карысталіся беларускай, рускай, нямецкай, польскай, латышскай і «тутэйшай» мовамі. У асноўным мова адпавядала нацыянальнасці вернікаў. Праблема была ў тым, што ў беларусаў не было выразнай сувязі нацыянальнасць-мова, як, напрыклад, у латышоў і немцаў. Гэта было адначасова і слабасцю беларускага пратэстантызму, і магчымасцю для беларускай інтэлігенцыі працаваць на моўным полі і нешта мяняць.

Пратэстанцкія беларускамоўныя выданні

Адным з вельмі ўплывовых сродкаў распаўсюджвання ідэй, а таксама фарміравання ідэнтычнасці быў пратэстанцкі друк. Фактычна ўсе пратэстанцкія дэнамінацыі займаліся выдавецкай справай, мелі ўласныя перыядычныя выданні.

Найбольшую колькасць беларускамоўных кніг, калі не лічыць біблейскіх выданняў Л. Дзекуць-Малея, у Заходняй Беларусі выпусцілі метадысты. Галоўнымі беларускамоўнымі аўтарамі гэтай дэнамінацыі былі Галляш Леўчык і Ян Пятроўскі. У 1925 годзе выйшла невялікая брашура Г. Леўчыка „Hałoŭnyja asnowy metadyzmu”[16]. Ва ўступе да кнігі паказваецца, як Евангелле змяніла жыццё мільёнаў людзей ва ўсім свеце, а царква медатыстаў актыўна працуе над распаўсюджваннем Евангелля і імкнецца, каб і ў Беларусі людзі змянялі сваё жыццё ў адпаведнасці са стандартамі слова Божага. У брашуры „Hałoŭnyja asnowy metadyzmu” ёсць адмысловы раздзел аб ужыванні падчас абрадаў мовы, зразумелай вернікам, у якім адзначаецца, што царква не павінна ўжываць незразумелую мову ў часе набажэнства[17].

У сярэдзіне 1927 годзе ў польскім рускамоўным баптысцкім часопісе «Маяк» Л. Дзекуць-Малей, які ў той час быў пастарам найбуйнейшай ва Усходняй Еўропе брэсцкай баптысцкай царквы, пачаў

[16] *Hałoŭnyja asnowy metadyzmu,* Waršawa, Wilnia 1925.
[17] *Ibidem*, s. 12.

уласны праект пад назвай «Беларуская балонка». «Маяк» быў разлічаны пераважна на цэрквы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны (Валынь), а таксама, мабыць, на цэрквы ў СССР. У «Маяку» існаваў таксама «Український відділ». Мэту стварэння «Беларускай балонкі» Л. Дзекуць-Малей выразна акрэсліў у сваім першым артыкуле: «Да цябе, родны Беларускі народзе, адважваюся загаварыць праз гэтую часопісь і зьвярнуць тваю ўвагу на цудоўныя словы твайго адзінага Абаронца і Павадыра. Ён – сама праўда; дык і словы Яго справядлівыя. Здаверся Яму, і Ён вызваліць цябе. Толькі Ён вышле табе зорку, што разалье над табою сьвятло волі і спакою, спыніць тваі мучэньні, і прыгорне цябе, змучанага гаротніка, да Свайго Божага сэрца. Гэта цябе Ён кліча: бо ж ты „працуючы і абцяжаны". Ён цябе ўжо „згледзіў", хоць ты яшчэ далёка. Пакуль час сьпяшайся да Яго, Ён жджэ цябе, заблуканы сыну, і прыйме»[18].

У сваіх публікацыях у «Маяку» Л. Дзекуць-Малей на біблейскіх прыкладах паказваў, што адказ на «беларускае пытанне» знаходзіцца ў слове Божым. Ён вельмі часта звяртаўся не да асобы, а да народа, бачачы адну з галоўных нацыянальных праблем у адсутнасці перакладу Бібліі і евангельскай літаратуры на беларускую мову. Але пастар не толькі канстатаваў пустку, ён імкнуўся яе запоўніць, робячы для гэтага пераклады з Бібліі, складаючы брашуры з тлумачэннем біблейскіх гісторый, змяшчаючы ў «Маяку» тэксты беларускіх евангельскіх песень. Фактычна кожны нумар «Маяка», пачынаючы з 1927 года, заканчваўся рэдакцыйнай аб'явай: «Сябры беларускага народу. Ёсьць для раздаваньня беларускія эвангельлі і брашуры. Распаўсюджвайце іх сярод вашых суседзяў, аднавяскоўцаў, суграмадзян. Выпісаць можна ў неабмежаваным ліку, толькі за вяртаньне паштовых выдаткаў»[19].

Відавочна, што Л. Дзекуць-Малей імкнуўся як мага шырэй распаўсюдзіць Біблію па-беларуску, выходзячы па-за межы сваёй

[18] *Беларуская балонка*, «Маяк» 1927, № 6, с. 8.
[19] *Друзья белорусского народа*, «Маяк» 1928, № 8, с. 8.

дэнамінацыі і канфесіі. Л. Дзекуць-Малей лічыў важным, каб усе хрысціянскія канфесіі карысталіся беларускай Бібліяй. Пра гэта ён пісаў Антону Луцкевічу: «Радуецца сэрца таксама і таму, што духавенства пачынае разумець моц Сьвятога Пісьма – Слова Божага ў роднай мові беларускай і што нават будуць даваць на то сваю згоду і што бяруцца пашыраць сярод народу. Дай Бог, каб яны былі ў гэтым шчырымі насіцелямі сьвятла Божага і раздавацелямі той солі дабрадаяньня, гдзе ёсьць у гэтым патрэба»[20]. Важна адзначыць, што Л. Дзекуць-Малей масава раздаваў беларускія выданні падчас евангелізацый, і некаторыя экзэмпляры да гэтага часу захоўваюцца ў пратэстанцкіх сем'ях на Брэстчыне.

Са студзеня 1927 года Г. Леўчык рыхтаваў у Варшаве беларускамоўны дадатак «Дух і Праўда» да штомесячнага польскага метадысцкага выдання „Pielgrzym Polski". Сама гэта газета таксама часам змяшчала матэрыялы на беларускую тэматыку па-польску. Напрыклад, у ліпені 1926 года яна перадрукавала ў польскім перакладзе артыкул „Ruch reformacki na Białorusi"[21] з беларускага выдання 1919 года[22].

Першы раз дадатак «Дух і Праўда» выйшаў кірыліцай і лацінкай. На першай старонцы змяшчаўся вольны пераклад на беларускую мову верша «Мы эвангелікі Хрыстовы!», зроблены Г. Леўчыкам з украінскага часопіса «Віра і наука». Імкнучыся давесці, што царква павінна карыстацца зразумелай народу мовай, Г. Леўчык друкуе нататкі «Хрыстос і родная бацькаўская мова»[23], дзе робіць падборку біблейскіх вершаў на тэмы: «Што сказана ў Сьв. Эвангельлі аб роднай мове?», «Што кажа праўда аб роднай мове?», публікуе падборку цытат «Аб прасьледаваньні народаў і бацькаўскай іх мовы».

---

[20] *Лукаш Дзекуць-Малей…*, с. 61.

[21] *Ruch reformacki na Białorusi,* „Pielgrzym Polski" 1926, № 6, s. 6.

[22] *Reformacki ruch na Biełarusi* [y:] *Biełaruski Kalendar „Swajak" na 1919 hod*, Wilnia 1919, s. 37–41.

[23] «Дух і Праўда» 1927, № 1, с. 4–7; № 2–3, с. 3–5.

Другі выпуск «Духу і Праўды» пачынаецца эпіграфам Г. Леўчыка: «І беларуская мова так сама міла Хрысту, як і мовы іншых народаў». У пачатку трэцяга выпуску складальнік сцвярджае: «Беларусь аджывае, дый будзе жыць векі на перакор ўсім варожым людзям! Ня здушаць у нас Праўды ні крыўда, ні зьдзекі, бо сонцэ Эвангельля сьвеціць і нам!». Закончыў Г. Леўчык гэтыя матэрыялы вядомымі словамі Францішка Багушэвіча: «Ня пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі! Бо яна нам ад Бога даная! Наша мова для нас сьвятая! Пазнаюць людзей ці па адзежы, хто якую носе; ато-ж мова – язык і ёсьць адзежа душы!». Трэба меркаваць, Г. Леўчык шчыра верыў у адраджэнне беларускага народа праз схіленне яго да веры ў Хрыста.

У 1928 годзе місія метадыстаў у Вільні надрукавала на беларускай мове кірыліцай «Катэхізм для сяброў Царквы Мэтадыстаў»[24]. У гэтым выданні на 120 старонках раскрыты асноўныя ісціны веры: пра адносіны чалавека і Бога, пра царкву, пра малітву «Ойча наш», пра смерць і апошні суд, запаведзі Божыя і інш.

Віленскі метадысцкі пастар Стэфан Барткевіч разам з Г. Леўчыкам і беларускім дзеячам Ігнатам Мятлой у 1929 годзе пачаў выданне беларускамоўнай метадысцкай газеты «Новы шлях»[25]. У яе выхадных даных пазначана, што гэта «незалежна-культурна-рэлігійная часопісь», якая выходзіць раз на месяц[26]. Першы і адзіны нумар пабачыў свет 1 лютага 1929 года. Газета мела восем старонак, абсалютная большасць артыкулаў, апрача перадрукаў з іншых выданняў, не падпісана.

Звяртае на сябе ўвагу матэрыял «Патрэба Новага Касьцёла-Царквы»[27]. Гэты тэкст быў падрыхтаваны на аснове публікацыі

[24] *Катэхізм для Сяброў Царквы Мэтадыстаў зьмяшчаючы збор хрысьцьянскіх доктрынаў і гісторыю Сьвятога Пісьма*, Вільня 1928.

[25] Ю. Бачышча, *Дзейнасьць царквы…,* с. 201.

[26] «Новы шлях. Незалежна-культурна-рэлігійная часопісь» 1929, № 1, с. 1.

[27] *Патрэба Новага Касьцёла-Царквы*, «Новы Шлях. Незалежна-культурна-рэлігійная часопісь» 1929, № 1, с. 5.

амерыканскіх пратэстантаў, аўтары якой пісалі, што ў 1920-я гады *«вучоныя людзі»* пачалі лічыць царкву «за арганізацыю зусім непатрэбную, неадпаведную да сяньняшніх патрэб, няздольную да вырашэньня сучасных квэстыяў і праблемаў». Аўтары артыкула бачылі праблему ў тым, што царква не працуе з «інтэлігентным грамадзтвам», як гэта ў свой час рабілі апостал Павел, Ян Гус, Марцін Лютэр і Джон Уэслі. Сама царква патрабавала абнаўлення і мусіла «ісьці ў грамадзянства», адказваць на пытанні «беднасьці і безрабоцьця», якія найбольш цікавілі людзей. Заканчваецца артыкул вельмі радыкальна: «Касьцёлы прошласьці ўжо споўнілі сваю задачу, і за гэта ім належыцца падзяка, але яны сталіся непатрэбнымі як сьвечка пры электрычнай лямпе».

У газеце «Новы шлях» была сфармулявана і абвешчана адна з галоўных мэт метадыстаў – працаваць з беларускай інтэлігенцыяй. На апошняй старонцы выдання была змешчана аб'ява: «Хто хоча пачаць новае жыцьцё, няхай адведвае навуку Слова Божага і набажэнствы ў Касьцёле Мэтадыстаў у Вільні, Троцкая вул. № 9, Слоніме, Шасовая 1, Радашковічах і ў інш. мясцох»[28].

У 1930 годзе метадысты выдалі брашуру «Курс нядзельнае школы»[29]. Гэта выданне складалася са 142 старонак, змяшчала 28 лекцый і з'яўлялася практычным дапаможнікам настаўнікам і дзецям. Розныя лекцыі падпісваліся рознымі крыптанімамі. Прынамсі частка матэрыялаў, відавочна, была перакладзена з англійскай мовы, бо ў іх фігуруюць героі з англійскімі імёнамі. Гэты была першая кніга, але наступных выданняў не выяўлена.

У 1930 годзе выйшла яшчэ адна брашура рэлігійна-практычнага зместу – «Хрысьціянскія мэтодыстычныя абходы»[30]. Магчыма, яе склаў Г. Леўчык. Выданне было ажыццёўлена пры

[28] «Новы Шлях. Незалежна-культурна-рэлігійная часопісь» 1929, № 1, с. 8.

[29] *Курс нядзельнае школы. Кн. 1 (абыймае 28 лекцыяў),* Вільня 1930.

[30] *Хрысьціянскія Мэтодыстычныя Абходы (абрадны парадак або рытуал),* Вільня 1930.

падтрымцы польска-амерыканскага акцыянернага таварыства Southern Trade[31].

У 1930 і 1936 гадах гэта ж таварыства прафінансавала выданне беларускіх зборнікаў хрысціянскіх духоўных спеваў «Божая ліра» з нотамі і без нот[32]. Зборнік прызначаўся для беларускіх метадысцкіх цэркваў. У прадмове гаворыцца, што прычынай яго выдання стала тое, што на пратэстанцкіх набажэнствах адчуваецца недахоп беларускіх спеваў. Таксама там сказана, што беларускі «духоўны сьпеўнік» выходзіў яшчэ ў 1925 годзе і змяшчаў 12 песень з нотамі, надрукаваных кірыліцай і лацінкай, а ў 1927 годзе выйшаў другі спеўнік на 20 песень без нот, надрукаваных кірыліцай. Але гэтыя спеўнікі не маглі здаволіць духоўных патрэб беларускіх пратэстанцкіх цэркваў. Там жа напісана, што паколькі чалавек перажывае ў жыцці перыяды радасці і журбы, то і спевы з мелодыямі павінны быць адпаведныя. У зборніку 1930 года было выкарыстана 145 мелодый: «англіцкіх, амэрыканскіх і старых каталіцкіх, некалькі нямецкіх, польскіх, расейскіх, пара беларускіх, украінскіх і агулам славянскіх супольнасьцяў»[33]. Дзеля дастасавання беларускіх перакладаў да музыкі была створана і працавала спецыяльная камісія. Пачынаўся зборнік патрыятычным вершам аўтарства, праўдападобна, Г. Леўчыка: «Недалёкая часіна – // Устане мілая Айчына: // Песьня пойдзе ўвыш на волю, // Прынясе нам шчасну долю!». Укладальнікі спеўніка сцвярджалі, што выдалі яго менавіта па патрыятычных меркаваннях. Адразу пасля ўступнага верша апублікаваны ўрывак з «Лірніка вясковага» Уладзіслава Сыракомлі[34].

У спеўніку змешчаны парадак метадысцкага набажэнства, характэрны і для іншых пратэстанцкіх дэнамінацый, нікейскі сімвал

[31] Ю. Бачышча, *Дзейнасьць царквы…,* с. 198.

[32] *Хрысьціянскія духоўныя песьні «Божая Ліра». Мэтадыстычны сьпеўнік беларускі з нотамі. Зборнік рэлігійных гымнаў і песьняў для мэтодыстычных эвангельлічных зграмаджэньняў на Беларусі,* Вільня 1930.

[33] *Прадмова* [у:] *Хрысьціянскія духоўныя…*, с. VI.

[34] *Ibidem*, с. VIII.

веры, «Малітва Гасподняя» і інш. Малітва «Ойча наш» даслоўна ўзята з беларускага перакладу евангелляў баптыста Л. Дзекуць-Малея. Праўдападобна, рыхтуючы метадысцкія брашуры, Г. Леўчык звяртаўся ў жніўні 1925 года да А. Луцкевіча, просячы яго даслаць пераклад „Haspodniaj Malitwy”[35].

Шэраг беларускамоўных пратэстанцкіх брашур, у якіх не пазначаны аўтар («Прыповесьць пра блуднага сына (Лукі, 15)», «Няйтральнага мейсца няма. Разважаньні рэлігійнага зьместу» (1927), «Загінуў ці спасёны» (1932)), з’явіліся ў выдавецтве Kompas у Лодзі. Найбольш імаверна, што іх аўтарам быў Л. Дзекуць-Малей. Разам з гэтым, магчыма, што да іх выдання далучыліся метадысты, якія таксама мелі кантакты як з названым выдавецтвам, так і з баптыстамі.

Лукаш Дзекуць-Малей

Адным з галоўных лідараў беларускага пратэстанцкага руху быў пастар Л. Дзекуць-Малей. З пачаткам Першай сусветнай вайны ў 1914 годзе і закрыццём у сувязі з гэтым Біблейскіх курсаў І. Праханава ў Санкт-Пецярбургу, дзе ён вучыўся, Л. Дзекуць-Малей вярнуўся ў родныя мясціны з мэтай арганізацыі беларускіх школ. Дзеля гэтага ён далучыўся да працы Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, і, як сведчаць запісы А. Луцкевіча, зробленыя ў сярэдзіне 1920-х гадоў, на мяжы 1915–1916 гадоў Л. Дзекуць-Малей пачаў займацца арганізацыяй беларускіх школ на Гродзеншчыне[36]. Такім чынам, можна сцвярджаць, што Л. Дзекуць-Малей на той момант ужо быў актыўным беларускім патрыётам, які імкнуўся займацца асветніцкай дзейнасцю.

Ці спалучаў ён гэта з рэлігійнай дзейнасцю, мы пакуль не ведаем, як невядомымі застаюцца і падрабязнасці яго працы ў 1916 – першай палове 1918 года.

---

[35] *Лукаш Дзекуць-Малей…*, с. 69.

[36] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, ф. 3, воп. 1, спр. 126, арк. 118–119.

У другой палове 1918 года Л. Дзекуць-Малей ужо з'яўляецца прадстаўніком урада Беларускай Народнай Рэспублікі на Гродзеншчыне. Л. Дзекуць-Малей, заручыўшыся падтрымкай немцаў, «пашыраў беларускую агітацыю» ў рэгіёне[37]. Тое, што Л. Дзекуць-Малею ўдалося знайсьці агульную мову з нямецкай уладай, сведчыць пра выкарыстанне ім вопыту пакаяння ў нямецкай царкве і, магчыма, асабістых знаёмстваў у нямецкім пратэстанцкім асяроддзі Беласточчыны і Гродзеншчыны.

Аднак немцы ў той час ужо адступалі на захад і іх месца займалі польскія войскі і польская ўлада. Л. Дзекуць-Малей, як відаць з ліста Станіслава Іваноўскага да Антона Луцкевіча ад 13 лютага 1919 года, быў гатовы бараніць родны край нават са зброяй у руках: «Дзекуць-Малей быў арыштаваны ў мясцовасці, якую заняла Польская самаабарона на падставе дамоўленасці з нямецкімі ўладамі, у сувязі з тым, што ў яго былі знойдзены карабін і рэвальвер без адпаведнага дазволу на права нашэння зброі. Акрамя гэтага, былі знойдзены каля дзясятка дазволаў на права нашэння зброі (Waffenschein), выдадзеных нямецкімі ўладамі на бланках. Гэта ўзбудзіла падазрэнні, што яны падробленыя. У арыштаванага была знойдзена таксама значная колькасць розных пячатак, а таксама адозваў і пракламацый, якія настройваюць насельніцтва супраць польскага народа і легіянераў»[38].

Тады Л. Дзекуць-Малею ўдалося вызваліцца з-пад арышту дзякуючы хадайніцтву А. Луцкевіча і заступніцтву С. Іваноўскага. Але ўжо ў сакавіку 1919 года на беларуска-польскіх перагаворах у Гродне ён заявіў: «Нам добра вядома, што нясуць нам бальшавікі, аднак нам невядома, што мяркуюць рабіць з Беларуссю палякі. Можа, польская ласка будзе горш для нас, чым бальшавіцкі суровы рэжым дыктатуры. Калі палякаў цікавіць наш погляд на Польшчу, то трэба, штоб польскі ўрад выявіў свой твар, выказаў

[37] У. Ляхоўскі, А. Чарнякевіч, *op. cit.,* с. 111.

[38] Lietuvos centrinis valstybės archyvas, f. 281, ap. 2, b. 32, l. 25.

тыя мэты і думкі, якія ён думае праводзіць у жыццё ў адносінах да беларусаў. Гэтага мы пакуль не бачым. Займаванне нашай зямлі мы разглядаем не як польскую акупацыю, а як месца барацьбы з бальшавікамі. Польскія войскі мы лічым авангардам Антанты. У тую ж хвіліну, калі мы адкажымся ад гэтага погляда, мы станем разглядаць вас, як армію нашых ворагаў і пачнем на кожнам кроку вясці з вамі барацьбу. Яшчэ раз гавару, што мы вельмі жадаем як найхутчэй аб'явы Польскім урадам становішча па беларускаму пытанню і чым хутчэй гэта будзе зроблена, тым лепш будзе для абоіх народаў»[39].

Не дзіўна, што ўжо ў красавіку 1919 года Л. Дзекуць-Малей быў зноў арыштаваны польскімі ўладамі, і ледзь не памёр у турме ад тыфу. Ад смерці яго ўратавала заступніцтва С. Іваноўскага, які ў другі раз дамогся вызвалення беларускага пастара.

Л. Дзекуць-Малей з'яўляўся сябрам гродзенскага клуба «Беларуская хатка», членам Беларускай павятовай рады Гродзеншчыны, Беларускага нацыянальнага камітэта ў Гродне, адным з ініцыятараў стварэння Грамады беларускай моладзі.

Л. Дзекуць-Малей выступаў на сцэне гродзенскага тэатра ў якасці акцёра, прымаў удзел разам з Паўлінай Мядзёлкай, Уладзімірам Курбскім, Кастусём Салошыкам і Мікалаем Карповічам у спектаклях «драматычнай дружыны» Грамады беларускай моладзі[40]. Але галоўны акцэнт ён рабіў усё ж на справе стварэння і захавання беларускай школьнай адукацыі.

З 26 сакавіка 1919 года Л. Дзекуць-Малей стаў сябрам Цэнтральнага беларускага вучыцельскага хаўрусу. Пастаянна інфармаваў урад БНР аб польскай палітыцы ў галіне адукацыі. Важным клопатам Л. Дзекуць-Малея была кадравая праблема: ён заахвочваў многіх прайсці навучанне на Віленскіх беларускіх настаўніцкіх курсах. Больш за тое, на гэту справу яму ўдалося атрымаць пэўныя грошы

[39] У. Ляхоўскі, А. Чарнякевіч, *op. cit.,* с. 112–113.
[40] *Ibidem*.

ад урада БНР. Адначасова Л. Дзекуць-Малей займаўся арганізацыяй баптысцкай царквы ў Гродне. Гродзенскі беларускі дзеяч Янка Антонаў нават абвінаваціў яго ў тым, што рэлігійныя справы Л. Дзекуць-Малей ставіць перад справамі нацыянальнымі. А польскі школьны інспектар па Гродзеншчыне Рафал Вазьнякоўскі назваў Л. Дзекуць-Малея «вельмі небяспечным чалавекам»[41]. Можна меркаваць, што Л. Дзекуць-Малей спрабаваў спалучыць асветную дзейнасць з рэлігійнай.

З пратаколаў Цэнтральнай беларускай вучыцельскай рады Гродзеншчыны добра відаць прынцыповая пазіцыя Л. Дзекуць-Малея ў змаганні за беларускую школу[42]. За гэта на працягу двух гадоў ён чатыры разы апынаўся ў турмах, і ўрэшце быў высланы з Гродна: у канцы 1921 года быў вымушаны перабрацца ў Брэст. Тут ён ажаніўся 11 чэрвеня 1922 года з Серафімай Кішкай, тут нарадзіліся іх дзеці, тут ён, разам з жонкай, ажыццявіў галоўную справу свайго жыцця – пераклаў і выдаў «Новы Запавет і Псальмы» на беларускай мове.

У Брэсце беларускі рух быў значна слабейшы, чым у Гродне. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца кароткая гісторыя культурна-асветнага таварыства «Беларуская хатка», створанага Л. Дзекуць-Малеем у 1922 годзе. Таварыства, праўдападобна, не праіснавала і года. Аднак менавіта ў Брэсце ў Л. Дзекуць-Малея з'явілася магчымасць сур'ёзна заняцца перакладам Бібліі, пачатым яшчэ ў Гродне ў 1920 годзе. У 1923 годзе да гэтай працы далучыўся А. Луцкевіч, а ў 1924–1925 гадах удалося наладзіць кантакт з кіраўніком лодзьскага выдавецкага таварыства Kompas Вальдэмарам Гутшэ і Брытанскім і замежным біблейскім таварыствам. Такім чынам, у пачатку 1920-х гадоў Л. Дзекуць-Малею ўдалося не толькі перакласці ўсе чатыры Евангеллі, але і прыцягнуць увагу беларускай і замежнай грамадскасці да патрэбы іх выдання. Першым было

[41] *Ibidem*, с. 117.
[42] *Лукаш Дзекуць-Малей…*, с. 124–139.

выдадзена Евангелле паводле Лукі, якое пабачыла свет у сярэдзіне 1926 года[43].

У сувязі з працэсам над Беларускай сялянска-работніцкай грамадой у кастрычніку 1927 года А. Луцкевіч трапіў за краты. У турме ён знаходзіўся да мая 1928 года. У гэты ж час адбывалася выданне евангелляў па-беларуску асобнымі кнігамі: апошняе, паводле Марка, выйшла ў 1928 годзе.

У 1929 годзе Л. Дзекуць-Малею ўдалося дасягнуць прарыву ў адносінах з Брытанскім і замежным біблейскім таварыствам, якое нарэшце прызнала мэтазгодным выданне Новага Запавету на беларускай мове і нават выдаткавала грошы на пераклад, карэктуру і друк[44]. Справа пайшла хутчэй, і ў 1931 годзе «Новы Запавет і Псальмы» ў перакладзе Л. Дзекуць-Малея і А. Луцкевіча выйшлі тыражом 25 тысяч экзэмпляраў.

Дзеля пашырэння кантэксту прывядзём фрагмент успамінаў яшчэ аднаго пратэстанцкага пастара з Заходняй Беларусі Яна Пятроўскага: «У годзе 1935 або крыху раней я першы раз спаткаўся з Гаспадаром Антонам Луцкевічам у ягонай кватэры на Піўнай вуліцы ў Вільні. Выняткавая культурная пастава Гаспадара дому, унутраны выгляд памешканьня, і перад усім ягоная эрудыцыя – тварылі ўражаньне і будзілі перакананьне, што каб быць беларусам, не абавязкова трэба ўтоесамлівацца з курнаю хатаю, паношаным кажухом ці батрацтвам […] нават і тады, калі нічога дрэннага няма ўва ўсёй гэтай характарыстыцы, якая гэтаксама можа будзіць і гонар для чалавека. Ягонае суадношаньне да наведвальніка, ягоны ветлівы позірк з тонам ціхае аксамітнае гаворкі і заўсёды з вытрыманым граматычна пабудаваным сказам, падсьведама сугэравалі прыклад папраўнае літаратурна-беларускае мовы»[45].

---

[43] А. Сідарэвіч, *Да гісторыі першага выданьня Новага Запавету і Псальмаў на сучаснай беларускай мове (1931 год)*, „Arche" 2012, № 1–2, с. 112–113.

[44] *Ibidem*, с. 121.

[45] Я. Пятроўскі, *Антон Луцкевіч – арыстакрат беларускае думкі* [у:] *Пратэстанцкая царква і беларускі нацыянальны рух на пачатку XX стагодзьдзя: артыкулы і ўспаміны,* Мінск 2006, с. 59.

Выхад «Новага Запавету і Псальмаў» быў значнай падзеяй у жыцці Заходняй Беларусі, як успамінаў Я. Пятроўскі: «Калі ў першай палове трыццатых гадоў выйшаў з друку на беларускай мове Новы Запавет з Псальмамі, на восі Вільня – Варшава імя Антона Луцкевіча было на вуснах і ў друку ў колах праваслаўных, каталіцкіх як і пратэстанцкіх, няверуючых людзей як і веруючых, і асабліва сярод мэтадыстых, каторыя сваім замежным прадстаўніцтвам заўсёды знаходзіліся ў добрых суадносінах зь Лідарам беларускага Рэнэсансу»[46].

Для Л. Дзекуць-Малея супрацоўніцтва з А. Луцкевічам было вельмі важнае, як у прафесійных адносінах (веданне А. Луцкевічам грэчаскай мовы), так і ў плане вялізнага аўтарытэту А. Луцкевіча ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі. Відавочна, што гэтыя два чалавекі ставіліся адзін да аднаго з павагай і разумелі важнасць справы перакладу Бібліі на беларускую мову.

Польскія ўлады канстатавалі, што ў Брэсце ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гадоў было 500 вернікаў-баптыстаў беларусаў *«з дамешкам палякаў»*, а ў вёсках Брэсцкага павета абсалютную большасць баптыстаў складалі беларусы. І гэта нягледзячы на тое, што беларусы ў Брэсце, згодна з польскай статыстыкай, складалі абсалютную меншасць[47]. У тым, што брэсцкія вернікі запісваліся беларусамі, відаць, была пэўная заслуга Л. Дзекуць-Малея.

Ян Пятроўскі

Я. Пятроўскі нарадзіўся ў Слуцку. У 1919 годзе трапіў у Вільню, дзе далучыўся да беларускага руху. Наведваючы богаслужэнні віленскіх метадыстаў у канцы 1920-х гадоў, упадабаў там беларускія спевы.

Ва ўспамінах Я. Пятроўскага кідаецца ў вочы, што ён часта разважаў пра ролю царквы ў жыцці народа, яе місію і прызначэнне

[46] *Ibidem.*

[47] ДАБВ, ф. 2, воп. 1, спр. 1123, арк. 100.

пастараў. Праўдападобна, гэтыя развагі і падштурхнулі яго далучыцца да метадыстаў, якія многімі беларускімі дзеячамі ў другой палове 1920-х галоў разглядаліся як магчымая альтэрнатыва «польскаму» касцёлу і «рускай» царкве.

Я. Пятроўскі згадваў, што на першым метадысцкім набажэнстве яму запомніліся беларускія спевы з невялічкага беларускага спеўніка, выдадзенага кірыліцай і лацінкай, а таксама казань пастара Стэфана Барткевіча, які простымі словамі тлумачыў, што Біблія «зьяўляецца асноваю для ўсіх хрысьціян у галіне веры, этыкі і маралі»[48].

Далейшае знаёмства з дзейнасцю метадыстаў і выкарыстанне імі беларускай мовы прывялі Я. Пятроўскага да далучэння да гэтай царквы. Ён бярэ актыўны ўдзел у сустрэчах метадысцкай маладзёжнай лігі «Эпфарт», на адной з якіх 20 студзеня 1929 года ім быў прачытаны па-беларуску рэферат «Аб рэфармацкім руху на Беларусі»[49].

Пасля кароткага навучання ў Польшчы – у Біблейскай школе метадыстаў у Клярысэве ў 1930–1931 гадах і працы пры метадысцкай місіі ў Варшаве Я. Пятроўскі стаў пастарам у Дзярэчыне. На той момант ён быў ужо вельмі добра знаёмы з Г. Леўчыкам.

Я. Пятроўскі акрамя беларускіх казаняў «шукаў падпісчыкаў на беларускія пэрыёдыкі, стварыў у мястэчку суполку Таварыства Беларускае Школы»[50], «утрымліваў блізкія стасункі з вучнямі беларускай гімназіі ў Вільні, цалкам салідарызуючыся з рухам, які праводзіўся праз былую Грамаду, якой ён зьяўляўся гарачым прыхільнікам»[51].

Я. Пятроўскі наладзіў выданне першай беларускамоўнай пратэстанцкай газеты «Сьветач Хрыстовае Навукі». Паводле рэ-

[48] Я. Пятроўскі, *Мэмуары. Стагодзьдзе ў рэтраспэкце (1905–1945)*. Кн. 1, Слуцк, Gainesville [б.г.], с. 100.

[49] LCVA, f. 53, ap. 23. b. 812, l. 178.

[50] С. Чыгрын, *Любіў Беларусь і антычную філасофію* [у:] *Пакліканыя на родны парог. Гісторыка-краязнаўчыя артыкулы*, Мінск 2005, с. 30.

[51] LCVA, f. 51, ap. 7, b. 746, l. 10.

гістрацыйных дакументаў яна мела рэлігійна-літаратурны характар, хоць, на думку польскіх улад, фактычна выконвала рэлігійна-грамадскую функцыю. З першых нумароў газеты праяўляецца і яе евангелізацыйны характар. Першы нумар пачынаўся са слоў з верша Уладзіслава Берняковіча «Пагляд на крыж скіруй». Газета друкавалася ў Вільні тыражом 500 экзэмпляраў, яе заснавальнікам, выдаўцом і рэдактарам быў Я. Пятроўскі. Дзейсную дапамогу аказваў У. Берняковіч, нататкі і беларускія патрыятычна-хрысціянскія вершы якога часта з'яўляліся на старонках выдання. Літаратурны характар газеце надавалі таксама вершы Г. Леўчыка, Яна Парфенчыка і Серафіма Дамброўскага. Апошні вельмі цёпла адгукаўся пра «Сьветач Хрыстовае Навукі», лічачы яго «першым часопісам у эвангельскім духу ў беларускай мове»[52].

На старонках «Сьветача Хрыстовае Навукі» (выходзіў у 1935–1938 гадах) было надрукавана мноства цікавых артыкулаў, якія раскрываюць канцэптуальнае бачанне рэчаіснасці беларускімі евангельскімі дзеячамі. Друкуючы шэраг гістарычных матэрыялаў пра Рэфармацыю на беларускіх землях, яны злучалі сучаснасць евангельскай царквы з мінулым, паказвалі ўплывы пратэстантызму ў Вялікім Княстве Літоўскім і ў свеце. Асвятлялася дзейнасць Францыска Скарыны, якога выдаўцы лічылі адным з першых беларускіх пратэстантаў. Пішучы пра спадчыну Ф. Скарыны, Я. Пятроўскі некалькі разоў звяртаў увагу чытача на тое, што ён не імкнуўся стаць «першадрукаром», а быў перакладчыкам і выдаўцом Бібліі для свайго народа на роднай мове, бо «жаданьне Скарыны было, каб Біблія знайшлася пад кожнай беларускай стрэхай»[53].

Аўтары газеты крытыкавалі цэрквы, якія «нічога супольнага ня маюць з народам», бо не разумеюць яго імкненьняў «у галіне нацы-

[52] *Да нас пішуць,* «Сьветач Хрыстовае Навукі» 1936, № 1, с. 4.

[53] *Францішак Скарына (у 450-я угодкі нараджэньня)*, «Сьветач Хрыстовае Навукі» 1936, № 7, с. 2.

янальнай, культурнай, соцыяльнай»[54]. Яны лічылі, што «да душы народу Эвангельле Хрыста можа прамовіць толькі ў роднай мове. Усякая іншая мова зьяўляецца толькі той перашкодай, якая не дазваляе народу ўвайсьці ў Царства Божае»[55]. Дбаючы аб выхаванні маладога пакалення Я. Пятроўскі друкаваў у газеце адпаведныя матэрыялы, якія ў 1937 годзе выйшлі асобнай брашурай «Нядзельная школа, яе сутнасьць і гісторыя».

У верасні 1937 года польскія ўлады арыштавалі № 23–24 «Сьветача Хрыстовае Навукі», Я. Пятроўскі трапіў у поле зроку паліцыі. Цэнзары заўважылі крытыку каталіцкай царквы і прыкметы «блюзнерства» ў некаторых публікацыях[56]. Неўзабаве выданне газеты было спынена.

У Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады з'яўляліся беларускія пратэстанцкія пастары, цэрквы, выданні. Адначасова наладжваліся кантакты паміж імі і беларускай інтэлігенцыяй. З іншага боку, было шмат пастараў, якія не цікавіліся беларускай справай. Разам з тым многія прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі непрыхільна ставіліся да пратэстантызму, а нярэдка і да хрысціянства.

Далейшае даследаванне беларускага хрысціянскага руху ў Заходняй Беларусі дазволіць паўней прадставіць грамадска-культурнае і палітычнае жыццё ў гэтым рэгіёне падчас яго ўваходжання ў склад Рэспублікі Польшча.

Архіўныя крыніцы

Lietuvos centrinis valstybės archyvas, f. 51, ap. 7, b. 746, l. 2, 10; f. 53, ap. 23. b. 812, l. 178; f. 281, ap. 2, b. 32, l. 25.

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, ф. 3, воп. 1, спр. 126, арк. 118–119.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці, ф. 1, воп. 2, спр. 2310, арк. 23адв.; ф. 2, воп. 1, спр. 1123, арк. 100.

---

[54] Б. і П., *Хрыстовая Царква,* «Сьветач Хрыстовае Навукі» 1935, № 2, с. 2–3.
[55] *Да нас пішуць,* с. 4.
[56] LCVA, f. 51, ap. 7, b. 746, l. 2.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 1430, воп. 1, спр. 47850, арк. 1–6, 18адв.

Літаратура

Hałoŭnyja asnowy metadyzmu, Waršawa, Wilnia 1925.

Reformacki ruch na Biełarusi [у:] *Biełaruski Kalendar „Swajak" na 1919 hod*, Wilnia 1919.

Ruch reformacki na Białorusi, „Pielgrzym Polski" 1926, № 6.

Б. і П., *Хрыстовая Царква,* «Сьветач Хрыстовае Навукі» 1935, № 2.

Бачышча Ю., *Дзейнасьць царквы мэтадыстаў на ніве беларускага адраджэньня ў 20–30-я гг. XX ст.* [у:] *Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Зборнік матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі*, Мінск 2014.

Бачышча Ю., *Царква і нацыя* [у:] *Лукаш Дзекуць-Малей і беларускія пераклады Біблії: зборнік матэрыялаў, артыкулаў і дакументаў*, Брэст 2011.

Беларуская балонка, «Маяк» 1927, № 6.

Да нас пішуць, «Сьветач Хрыстовае Навукі» 1936, № 1.

Друзья белорусского народа, «Маяк» 1928, № 8.

«Дух і Праўда» 1927, № 1, 2–3.

Катэхізм для Сяброў Царквы Мэтадыстаў зьмяшчаючы збор хрысьцьянскіх доктрынаў і гісторыю Сьвятога Пісьма, Вільня 1928.

Курс нядзельнае школы. Кн. 1 (абыймае 28 лекцыяў), Вільня 1930.

Латышонак А., *Беларускія палітыкі і пратэстанты. Ад «Гомона» да Грамады,* «Спадчына» 2003, № 1.

Лісоўская Т., *Пратэстантызм у кантэксце этнаканфесійных працэсаў у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)* [у:] *Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць.* Вып. 2. *Зборнік матэрыялаў II міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі*, Мінск 2016.

Лукаш Дзекуць-Малей і беларускія пераклады Біблії: зборнік матэрыялаў, артыкулаў і дакументаў, Брэст 2011.

Ляхоўскі У., Чарнякевіч А., *Гарадзенскі «эпізод» жыцьця пастара Лукаша Дзекуць-Малея* [у:] *Лукаш Дзекуць-Малей і беларускія пераклады Біблії: зборнік матэрыялаў, артыкулаў і дакументаў*, Брэст 2011.

«Новы шлях. Незалежна-культурна-рэлігійная часопісь» 1929, № 1.

Пашкевіч А., *Пратэстантызм і беларускі нацыяналізм у міжваеннай Польшчы,* „Arche" 2007, № 5.

Пратэстанцкая царква і беларускі нацыянальны рух на пачатку XX ст.: артыкулы і ўспаміны, Мінск 2006.

Пятроўскі Я., *Антон Луцкевіч – арыстакрат беларускае думкі* [у:] *Пратэстанцкая царква і беларускі нацыянальны рух на пачатку XX стагодзьдзя: артыкулы і ўспаміны,* Мінск 2006.

Пятроўскі Я., *Мэмуары. Стагодзьдзе ў рэтраспэкце (1905–1945).* Кн. 1, Слуцак, Gainesville [б.г.].

Русецкі У., *Пастар Станіслаў Нядзьвецкі і евангельскае прабуджэнне на паўночным захадзе Беларусі*, Мінск 2017.

Сідарэвіч А., *Да гісторыі першага выданьня Новага Запавету і Псальмаў на сучаснай беларускай мове (1931 год)*, „Arche" 2012, № 1–2.

Туронак Ю., *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Vilnius 2006.

Францішак Скарына (у 450-я угодкі нараджэньня), «Сьветач Хрыстовае Навукі» 1936, № 7.

Хрысьціянскія духоўныя песьні «Божая Ліра». Мэтадыстычны сьпеўнік беларускі з нотамі. Зборнік рэлігійных гымнаў і песьняў для мэтодыстычных эвангельлічных зграмаджэньняў на Беларусі, Вільня 1930.

Хрысьціянскія Мэтодыстычныя Абходы (абрадны парадак або рытуал), Вільня 1930.

Чыгрын С., *Любіў Беларусь і антычную філасофію* [у:] *Пакліканыя на родны парог. Гісторыка-краязнаўчыя артыкулы*, Мінск 2005.

The protestant church and belarusian national movement in Western Belarus (1918–1939)

Many Belarusian activists in Poland in the interwar period treated Protestantism as a "Belarusian national church." This article tells about the linguistic and national situation inside the Protestant church. Protestant publications in the Belarusian language are analyzed. The article also deals with important figures of the Belarusian evangelical movement, which contributed to the national and spiritual revival of the Belarusians. They are shepherds, Lukaš Dziekuć-Maliej and Jan Piatroŭski. The authors came to the conclusion that during the interwar period national and evangelical processes took place simultaneously in the territories of Western Belarus. Some representatives of the Protestant movement sought to make Protestantism the national church of the Belarusians. The Belarusian language was used in pastoral activities, and evangelical activity was identified with activities in favor of Belarusian culture and language. Some of the Belarusian intelligentsia treated Protestantism as a church that does not divide

the Belarusians into "Poles" and "Russians", as was often the case with Catholicism and the Orthodox Church. In the end, these plans were not implemented. Among the believers of the Protestant movement, there were not enough people who sympathized with the Belarusian cause. In addition, a significant part of the Belarusian intelligentsia adhered to atheistic views. The links between Protestantism and the Belarusian movement are still poorly understood.

K e y w o r d s : Belarus, Protestantism, Nation, National Movement, Church

Wojna i okupacja

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.185-239

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190409

Data przesłania: 30.11.2017
Data akceptacji: 23.05.2018

Юры Грыбоўскі
Uniwersytet Warszawski
jgrzybowski@uw.edu.pl
ORCiD: 0000-0002-7359-487X

Стварэнне і дзейнасць Беларускага аб'яднання ў Генеральнай акрузе «Латвія» (1941–1944)

Utworzenie i działalność Zrzeszenia Białoruskiego w Okręgu Generalnym Łotwa (1941–1944)

W wyniku ofensywy wojsk niemieckich latem 1941 r. Łotwa dostała się pod okupację III Rzeszy. Struktura narodowościowa Łotwy cechowała się różnorodnością. Wśród najliczniejszych grup mniejszościowych znajdowali się Białorusini. Niemieckie władze okupacyjne, stosując zasadę „dziel i rządź", były skłonne przyznać Białorusinom pewną autonomię kulturalno-oświatową. Miejscowa inteligencja białoruska upatrywała w tym szansę na umocnienie własnych wpływów w Łatgalii, którą traktowano jako część tzw. białoruskiego obszaru etnograficznego. W związku z tym, kierując się zimną polityczną kalkulacją, podjęto współpracę z okupantem. W 1941 r. w Rydze i Dyneburgu utworzono Białoruski Komitet Narodowy (od wiosny 1942 r. Zrzeszenie Białoruskie) w Okręgu Generalnym Łotwa. Głównym kierunkiem działalności tej organizacji była działalność społeczna i kulturalno-oświatowa wśród mieszkańców Łatgalii. Prowadzono chóry i zespoły artystyczne, działalność wydawniczą i kulturalno-oświatową. Ponadto podejmowano próby wprowadzenia języka białoruskiego do świątyń katolickich i prawosławnych. Dążono do obsadzenia administracji cywilnej i samorządów na szczeblu niższym i średnim w niektórych gminach Łatgalii osobami narodowości białoruskiej. Za priorytet w działalności Białorusinów należy jednak uznać organizację szkolnictwa w języku ojczystym. Aktywność białoruska wywołała zaniepokojenie wielu Łotyszy, ponieważ przywódcy łotewskich Białorusinów liczyli się z możliwością przyłączenia w przyszłości Łatgalii do Białorusi. Z wielu powodów „akcja białoruska" na Łotwie pod okupacją niemiecką nie odniosła większego sukcesu.

Słowa kluczowe: Łotwa, Białorusini, II wojna światowa, okupacja, kolaboracja

Праблематыка беларускай меншасці ў Латвіі ў гады Другой сусветнай вайны працяглы час знаходзілася па-за ўвагай даследчыкаў. У савецкі перыяд гэтая праблема не закраналася ў навуковай літаратуры па прычынах ідэалагізаванасці гістарычнай навукі. Але нават пасля 1991 года стан ведаў пра беларусаў Латвіі ў перыяд Другой сусветнай вайны па-ранейшаму застаецца сціплым. Нягледзячы на з'яўленне навуковых распрацовак[1] гэта пытанне па-ранейшаму патрабуе грунтоўнага даследавання.

У выніку маланкавага наступлення нямецкіх войск ужо ў пачатку ліпеня 1941 года ўся тэрыторыя Латвіі была занята вермахтам. У краіне ўсталяваўся нямецкі акупацыйны рэжым. Да жніўня 1941 года Латвія знаходзілася пад кіраваннем вайсковай адміністрацыі, а потым была перададзена пад грамадзянскае кіраванне (*Zivilverwaltung*). 17 ліпеня 1941 года Гітлер стварыў Рэйхскамісарыят «Остланд» (*Reichskommissariat Ostland*), кіраванне якім даручыў Гайнрыху Лёзэ. Кіраўніцтва гэтай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкі знаходзілася ў Рызе. Рэйхскамісарыят «Остланд» складаўся з чатырох генеральных акруг (*Generalbezirk*): Эстонія, Латвія, Літва і Беларусь. На пасаду генеральнага камісара Латвіі быў прызначаны Ота-Гайнрых Дрэхслер, які 1 верасня прыступіў да выканання сваіх абавязкаў. У склад Генеральнай акругі «Латвія» (*Generalbezirk Lettland*) з цэнтрам у Рызе ўвайшлі шэсць акруг (*Kreisgebiet*): Рыга (*Riga-Land*), горад Рыга (*Riga-Stadt*), Даўгаўпілс (*Dünaburg*), Елгава (*Mitau*), Ліепая (*Libau*), Валміера (*Wolmar*). Мясцовая цывільная адміністрацыя і паліцыя сярэдняга і ніжэйшага ўзроўню (бурмістры, старасты і г. д.) складалася з латышоў. У большасці гэта былі даваенныя работнікі дзяржапарата і органаў самакіравання. Латвійскія нацыянальныя дзеячы, якія супрацоўнічалі з немцамі, разлічвалі атрымаць згоду Берліна на адраджэнне дзяржаўнай незалежнасці краіны. У сакавіку 1942 года была створана Генеральная дырэкторыя на чале

[1] Гл.: Э. Екабсонс, *Беларусы ў Латвіі ў часы савецкай і нямецка-фашысцкай акупацыі (1940–1945)*, «Беларускі гістарычны агляд» 2006, т. 13, сш. 2.

з адстаўным генералам Оскарсам Данкерсам як орган мясцовага самакіравання на акупіраванай тэрыторыі Латвіі (без Рыгі). Гэты орган складаўся з латышоў, але быў цалкам падначалены немцам і ўяўляў сабой своеасаблівы дапаможны дадатак да нямецкай грамадзянскай адміністрацыі, які павінен быў аблягчыць акупантам кіраванне захопленымі тэрыторыямі[2].

Нямецкія акупацыйныя ўлады мусілі лічыцца са шматнацыянальным складам насельніцтва Латвіі. Адносіны акупантаў да асобных нацыянальных груп абумоўлівалі як ідэалагічныя, гэтак і палітычныя і ваенна-эканамічныя мэты кіраўнікоў Германіі. Захопнікі разглядалі краіны Балтыі як абшар, які з цягам часу належала ператварыць у частку нямецкай «жыццёвай прасторы» (*Lebensraum*). Лічылася, што рэгіён па прычыне шматвяковых гістарычных сувязей з нямецкай культурай пасля вайны павінен стаць часткай рэйха. Пры гэтым мясцовыя «расава прыдатныя элементы» падлягалі германізацыі, а іншых чакала вынішчэнне або дэпартацыя за Урал. Асіміляцыйныя планы ахоплівалі эстонцаў і частку латышоў. Тым часам найбольш «малавартаснымі ў расавым сэнсе» лічыліся славянскія меншасці, якім адмаўлялася права быць «арыйскімі» народамі. Невыпадкова ў якасці найменш прыдатнага да германізацыі рэгіёна Латвіі разглядалася Латгалія, дзе быў найвышэйшы працэс славянамоўнага насельніцтва[3]. Лічылася, што латгальцы ў расавым сэнсе вельмі падобныя да беларусаў і рускіх[4]. Вышэйзгаданыя планы адносна германізацыі павінны былі ажыццяўляцца пасля канчатковай перамогі Германіі. Але пакуль ішла вайна нямецкія акупацыйныя ўлады мусілі рыхтаваць спрыяльную глебу для рэалізацыі будучых планаў. У Берліне лічылі неабходным абмежаваць «змешванне крыві» паміж асобнымі нацы-

[2] Cz. Madajczyk, *Faszyzm i okupacja 1938–1945. Wykonywanie okupacji przez państwa Osi w Europie*, t. 1, Poznań 1983, s. 613–614, 617.

[3] *Ibidem*, s. 613.

[4] Bundesarchiv, Berlin–Lichterfelde Ost (BA), R 6/160, s. 82.

янальнымі групамі, паколькі гэта магло ўскладніць ці сапсаваць будучы працэс каланізацыі і германізацыі. У дэкрэце рэйхскамісара Альфрэда Розенберга ад 27 ліпеня 1942 года, які тычыўся нацыянальных спраў у Балтыі, чытаем: «нельга асіміляваць рускіх і беларусаў, бо 1) сапсуецца кроў народаў, якія будуць уключаны ў склад рэйха, 2) трэба лічыцца з тым, што беларусы з Прыбалтыкі будуць пераселены ў сапраўдную Беларусь. […] Існуе небяспека, што праз асіміляцыю рускіх і беларусаў малакаштоўныя расавыя элементы потым трапяць у нямецкі народ»[5].

Іншы фактар, які ўплываў на кірунак і змест акупацыйнай нацыянальнай палітыкі ў Латвіі, меў ваенна-эканамічны характар. У перыяд, калі нямецкія войскі вялі цяжкія баі на фронце, улады рэйха намагаліся максімальна выкарыстаць гаспадарчыя і людскія рэсурсы занятых тэрыторый. З мэтай аблягчэння кіравання захопленым абшарам акупанты карысталіся старажытным прынцыпам «падзяляй і пануй». Акупацыйная палітыка мела на мэце недапушчэнне стварэння буйных аднародных у нацыянальным сэнсе груп. Замест гэтага бачылася карыснай для Германіі наяўнасць на акупіраваным абшары як мага больш дробных груп, якія не стваралі б пагрозы нямецкім інтарэсам. У практыцы гэта азначала стварэнне больш спрыяльных умоў для адных нацыянальных груп за кошт другіх. У Латвіі немцы былі схільныя рабіць пэўныя саступкі на карысць мясцовых беларусаў і рускіх, што тлумачылася жаданнем аслабіць мясцовы польскі элемент і супрацьдзейнічаць празмернай актыўнасці латышоў. Лічылася, што адпаведнае стаўленне да беларусаў і рускіх прычыніцца да ўзмацнення сярод іх пранямецкіх настрояў, тым часам як магчымая дыскрымінацыя з боку тытульнай нацыі зробіць іх падатлівымі на бальшавіцкую прапаганду. Лічылася, што нямецкая «ахова» мясцовых беларусаў і рускіх ад асіміляцыйных захадаў латышоў будзе гарантам іх лаяльнасці ў адносінах да акупацыйных улад і зробіць непазбежным

[5] Archiwum Akt Nowych (AAN), sygn.: T-454, 88/001057–58.

іх супрацоўніцтва з немцамі. Каб утрымаць гэтую лінію немцы не мелі намеру перадаваць нацыянальную палітыку на акупіраваных абшарах мясцовым прыбалтыйскім адміністрацыям, а моцна трымаць у сваіх руках[6]. Дырэктывы Міністэрства акупіраваных усходніх тэрыторый (*Reichministerium für die Besetzten Ostgebiete*) загадвалі ахоўваць тутэйшых беларусаў і рускіх ад асіміляцыйных тэндэнцый з боку латышоў, якія маглі адбывацца праз школу, урадавыя ўстановы і царкву. Адным з галоўных сродкаў захавання этнічнай адметнасці мясцовага нелатышскага насельніцтва была школьная і моўная аўтаномія беларусаў і рускіх, якая дапускала магчымасць грамадска-культурнай і выдавецкай дзейнасці. Больш за тое, з мэтай прадухілення асіміляцыі латышамі славянскіх меншасцей у валасцях з колькаснай перавагай беларусаў і рускіх дазвалялася выкарыстанне роднай мовы (побач з нямецкай і латышскай) у зносінах з мясцовай адміністрацыяй. Аднак ні ў якім выпадку саступкі на карысць нелатышоў не азначалі палітычнай падтрымкі для вышэйзгаданых нацыянальных груп, а разглядаліся выключна як сродак «выяўлення і ізаляцыі на тэрыторыі Остланда расава непажаданых элементаў»[7]. На думку берлінскіх чыноўнікаў такая палітыка не павінна была крыўдзіць латышоў, якім з міжваеннага часу была добра вядома традыцыя існавання ў іх краіне культурна-асветнай аўтаноміі беларусаў і рускіх[8].

Рэалізуючы вышэйзгаданую палітыку было вырашана дазволіць існаванне органаў даверу беларускай меншасці. Рэйхскамісар Г. Лёзэ адзначаў, што стаўленне да беларусаў Балтыі павінна быць як у Беларусі, гэта значыць, належала іх выкарыстоўваць у нямецкіх інтарэсах. Яго погляд падзяляў міністр А. Розенберг, які пасля кансультацыі з генеральным камісарам Беларусі Вільгельмам Кубэ лічыў неабходным стварэнне сярод латвійскіх беларусаў арганіза-

[6] AAN, sygn.: T-454, 88/001057–58; BA. R 6/159, s. 45–46.
[7] BA. R 6/173, s. 14, 19–20.
[8] *Ibidem*. R 92/159, s. 59–60.

цыі, пры ўмове, што яна будзе дзейнічаць пад пільным наглядам немцаў і мець на мэце забеспячэнне правоў беларускай меншасці[9]. Пры гэтым, на думку нямецкіх палітыкаў, беларусы належалі да найменш актыўных і неарганізаваных у палітычным і нацыянальным сэнсе народаў, якія пражывалі на захад ад Урала. Лічылася, што нацыянальная самасвядомасць большасці беларусаў знаходзіцца на надта нізкім узроўні, а прадстаўнікі інтэлігенцыі гэтай нацыянальнасці вельмі нешматлікія. Трэба было, аднак, па магчымасці ізаляваць беларусаў ад рускіх уплываў[10].

Стварэнне і дзейнасць Беларускага нацыянальнага камітэта ў Латвіі (ліпень 1941 – сакавік 1942 года)

Безумоўна, мясцовыя беларускія дзеячы не маглі не выкарыстаць бягучую палітычную сітуацыю. Нягледзячы на тое, што ў другой палове 1930-х гадоў беларуская актыўнасць у Латвіі значна аслабла, адплыў беларускай інтэлігенцыі з краіны не назіраўся. Акрамя таго, савецкія рэпрэсіі ў 1940–1941 гадах толькі часткова закранулі беларускую меншасць. Усё гэта спрыяла таму, што ва ўмовах нямецкай акупацыі ўдалося без вялікіх цяжкасцей стварыць арганізацыйныя структуры. У сваёй аўтабіяграфіі Канстанцін Езавітаў сведчыў, што Беларускі нацыянальны камітэт у Латвіі быў арганізаваны 15 ліпеня 1941 года[11]. Аднак іншыя крыніцы не пацвярджаюць гэтых звестак. Праўдападобна, што самаарганізацыі латвійскіх беларусаў паспрыяў візіт у Рыгу ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага, прадстаўніка Беларускага камітэта самапомачы ў Германіі. З яго ўдзелам 10 жніўня 1941 года ў Рызе адбыўся ініцыятыўны сход мясцовых беларускіх актывістаў і некаторых настаўнікаў. В. Гадлеўскі агучыў прысутным ідэю аб арганізацыі беларускай работы ў розных краінах. На гэтым сходзе быў

[9] Э. Екабсонс, *op.cit.*, с. 206–207.

[10] BA. R6/159, s. 4.

[11] К. Езавітаў, *Кароткі жыццяпіс і праходжаньне службы* [у:] Л. Юрэвіч, *Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі*, Мінск 2005, с. 192.

створаны Беларускі нацыянальны камітэт (БНК). Кіраўніцтва арганізацыі складалася з наступных асоб: Пятро Мірановіч (старшыня), Якуб Кастылюк (сакратар), Сцяпан Сіцько, Люцыя Тэтар і Язэп Камаржынскі. Рэальную працу БНК змог, аднак, пачаць праз месяц, пасля пераходу ўлады ў Латвіі да нямецкай грамадзянскай адміністрацыі[12]. Стварэнне БНК у Рызе ініцыраваў В. Гадлеўскі, але далейшая праца арганізацыі залежала выключна ад мясцовых беларусаў. Важнай падзеяй стала далучэнне да арганізацыйнай работы К. Езавітава. Ён лічыў, што БНК павінен пачаць актыўную працу, у прыватнасці, звярнуцца да немцаў з просьбай вызваліць з лагераў ваеннапалонных чырвонаармейцаў-беларусаў[13]. К. Езавітаў лічыў, што камітэт не праяўляў ніякай дзейнасці па прычыне пасіўнасці яго кіраўніцтва, арганізацыйныя здольнасці якога ён ацэньваў вельмі крытычна. У лісце да Эдварда Будзькі (5 кастрычніка 1941 года) ён пісаў: «Быў у Рызе кс. Гадлеўскі, але да мяне не зайшоў чамусьці. Заклаў ён тутака Беларускі Камітэт, але з выдатных нашых людзей там прадстаўнікоў мала, а таму Камітэт аказаўся неруплівым і нерухлівым. Нічога не рабіў цэлы месяц і мне прыйшлося 3 тыдні збіраць іх і выказваць думкі мае аб сучасным становішчы і аб тым, якія крокі Нац. Камітэт павінен распачаць. Нарэшце, пры канцы 2-га месяца свайго існавання Камітэт прыняў напісаны мной мемарандум аб становішчы беларускае меншасці і аб нашых культурна-асветных і эканамічных патрэбах. Мемарандум асобная дэлегацыя перадала тутэйшаму камісару, адначасна просячы аб зацвярджэнні самога камітэту ў складзе, як яго напісаў кс. Гадлеўскі»[14].

Пад уплывам К. Езавітава БНК пачаў актыўную працу. У пачатку верасня 1941 года К. Езавітаў падрыхтаваў мемарандум ініцыятыўнай групы беларускай інтэлігенцыі да генеральнага камісара Латвіі. 26 верасня гэты дакумент быў перададзены Дрэхлеру.

---

[12] *Беларусы ў Латвіі,* «Раніца» 1941, 20 лістапада, с. 3.

[13] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 458, воп. 1, спр. 18, арк. 10.

[14] *Ibidem*, спр. 20, арк. 20.

Мемарандум падпісалі П. Мірановіч – былы старшыня Таварыства беларусаў Латвіі і кіраўнік 1-й беларускай школы ў Рызе, Я. Кастылюк – былы інспектар беларускіх школ, кіраўнік 2-й беларускай школы ў Рызе і старшыня культурна-асветнага таварыства «Прасвета», К. Езавітаў – кіраўнік беларускай школы ў Лудзе (Люцыне), Мікалай Краўчанка – праваслаўны свяшчэннік, Сяргей Сахараў – былы кіраўнік беларускага школьнага аддзела пры Міністэрстве асветы і кіраўнік беларускай гімназіі ў Даўгаўпілсе (Дзвінску), Я. Камаржынскі – настаўнік, былы дырэктар Беларускага тэатра ў Латвіі, Мікалай Дзямідаў – былы старшыня Беларускага таварыства настаўнікаў і кіраўнік настаўніцкіх курсаў, С. Сіцько – былы старшыня Пазыкова-ашчаднага таварыства і Аляксандр Родзька – дырэктар беларускай сярэдняй школы ў Рызе, а таксама два прадстаўнікі бацькоўскага камітэта гэтай школы. У пачатку дакумента змешчаны кароткі агляд сітуацыі беларускай меншасці ў міжваеннай Латвійскай Рэспубліцы з асаблівай увагай да рэпрэсіўных дзеянняў улад у дачыненні да беларусаў (працэс 1925 года, закрыццё школ і культурна-асветных устаноў пасля 1934 года). Потым гаварылася пра тое, што «сёння беларускае насельніцтва былой свабоднай Латвійскай дзяржавы верыць, што беларускія дзеці пад апекай нямецкага вермахта і яго правадыроў зноў будуць мець магчымасць вучыцца ва ўласных беларускіх школах, беларускія настаўнікі не будуць праследавацца за нацыянальную дзейнасць, а беларускія сяляне змогуць у новых умовах працягваць сваю сельскагаспадарчую працу ў імя супольнага дабрабыту»[15]. У дакуменце

[15] BA. R 92/101, s. 59–63. На падставе аналізу даступных архіўных крыніц можна зрабіць вывад, што праект мемарандума быў падрыхтаваны К. Езавітавым 3 верасня 1941 года. У канчатковай версіі антылатышская рыторыка крыху згладзілася. Напрыклад, была выкраслена фармулёўка пра тое, што «цяпер беларускае насельніцтва Латвіі цешыцца, што часы гвалтоўнай латышызацыі беларусаў беззваротна мінулі». Першая рэдакцыя дакумента змяшчала таксама просьбу дазволіць БНК правесці рэгістрацыю беларусаў у Латвіі і раздаць ім пасведчанні аб прыналежнасці да беларускай нацыянальнасці (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 59, арк. 1–5).

акрэсліваліся асноўныя патрэбы беларускай меншасці: 1) легалізацыя Беларускага нацыянальнага камітэта, створанага пры ўдзеле В. Гадлеўскага, 2) стварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта самапомачы як органа, які б прадстаўляў культурныя і матэрыяльныя інтарэсы беларусаў, 3) захаванне ўжо існуючага беларускага школьніцтва, а таксама адкрыццё новых школ у мясцовасцях з колькаснай перавагай беларускага насельніцтва, 4) адкрыццё беларускай сярэдняй школы ў Індры, 5) прызначэнне на пасаду беларускага школьнага інспектара Я. Камаржынскага, 6) дазвол на працу беларускіх настаўніцкіх курсаў у Рызе ці Даўгаўпілсе, 7) прызначэнне беларусаў на пасады пісараў і камендантаў самааховы ў «беларускіх валасцях»[16].

Па згаданых раней прычынах нямецкія ўлады здаволілі большасць беларускіх пастулатаў і далі дазвол на існаванне БНК. У пачатку 1942 года ў кіраўніцтва БНК уваходзілі К. Езавітаў (старшыня), П. Мірановіч (намеснік), Я. Кастылюк (сакратар), С. Сіцько (скарбнік), Л. Тэтар, С. Сахараў і П. Масальскі (сябры ўправы)[17]. Пасля таго, як камітэт пачаў працу ў Рызе, у правінцыі заняліся стварэннем мясцовых аддзелаў арганізацыі. Перш за ўсё гэта тычылася ваколіц Даўгаўпілса, Латгаліі – месца кампактнага пражывання беларусаў. Праца на месцах рухалася, аднак, вельмі павольна. Нягледзячы на тое, што ў Даўгаўпілсе пражывала група нацыянальна свядомай беларускай інтэлігенцыі, яе прадстаўнікі працяглы час не праяўлялі актыўнасці. Адной з прычын была няўпэўненасць у тым, якую палітыку будуць ажыццяўляць акупанты. Пра настроі тамтэйшых беларусаў можна меркаваць па лісце А. Махноўскага да К. Езавітава (18 жніўня 1941 года), у якім чытаем: «Альбо мы павінны атрымаць магчымасць працаваць хоць у больш-менш спрыяючых варунках, альбо кінуць гэтае балота

[16] BA. R 92/101, s. 59–63.

[17] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 22 лютага, с. 4.

і перайсці працаваць на Беларусь»[18]. Рухавіком, які падштурхнуў беларускую інтэлігенцыю ў Латгаліі да дзейнасці, быў К. Езавітаў. Гэты дзеяч заклікаў сваіх аднадумцаў працаваць, не звяртаючы ўвагі на перашкоды[19].

У кастрычніку 1941 года беларусы з Даўгаўпілса накіравалі запіску да мясцовага гебітскамісара. Гэты дакумент падрыхтаваў К. Езавітаў, які напісаў яго на падставе адпаведнай запіскі, адрасаванай да генеральнага камісара ў Рызе. 27 кастрычніка 1941 года К. Езавітаў у лісце да А. Махноўскага выказваў задавальненне тым, што «ўрэшце беларусы ў Дзвінску пайшлі да акруговага камісара»[20]. З мэтай арганізацыі аддзела БНК у канцы кастрычніка з Рыгі ў Даўгаўпілс выехалі С. Сахараў, С. Маціеўскі, М. Дзямідаў і Я. Камаржынскі. Арганізацыйная праца прынесла свае вынікі. На працягу першага года нямецкай акупацыі ўдалося стварыць аддзелы камітэта ў Даўгаўпілсе, Краславе (Краслаўцы), Пасіенэ, Індры і Зілупэ.

Стварэнне Беларускага аб'яднання ў Латвіі (сакавік 1942 года) і асноўныя кірункі яго дзейнасці

У сакавіку 1942 года БНК быў перайменаваны ў Беларускае аб'яднанне (БА)[21]. Архіўныя дакументы даюць пэўнае ўяўленне пра персанальны склад некаторых аддзелаў, а таксама працэс іх арганізацыі. Даўгаўпілскім аддзелам кіравала ўправа ў складзе: старшыня – М. Дзямідаў (з вясны 1942 года – А. Якубецкі), намеснік

[18] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 40, арк. 9.

[19] У лісце да настаўніка Язэпа Клагіша (3 кастрычніка 1941 года) К. Езавітаў падкрэсліваў: «Зразумейце, што патрэбны не адмовы і ад'езды, а змаганне, і што дзвінчукі і індраўцы павінны самі варушыцца, каб былі захады і ў Рызе і на мейсцах. […] Вы ж усе дарослыя людзі! Дакуль жа Вас вадзіць за ручку, як дзяцей?» (*Ibidem*, спр. 20, арк. 17–17 адв.).

[20] *Ibidem*, спр. 16, арк. 1.

[21] Э. Екабсонс, *op. cit*., с. 207.

– Я. Камаржынскі, сакратар – А. Махноўскі, сябры – ксёндз Язэп Гайлевіч, праваслаўны свяшчэннік Нікан Заліўскі і А. Якубецкі[22]. Па прапанове М. Дзямідава даўгаўпілскі аддзел разглядаў магчымасць стварэння ў Даўгаўпілскай акрузе БНК, незалежнага ад Рыгі, але гэтая ідэя не знайшла водгуку сярод іншых дзеячаў[23]. На чале аддзела ў Індры быў С. Сахараў (з 1943 года – А. Родзька), у Зілупэ – М. Дзямідаў (з канца 1942 года – С. Сахараў і Мечыслаў Мяжэцкі), у Пустыні – Антон Клагіш, у Краславе – Яўген Красневіч, у Пасіенэ (Посінь) – Браніслаў Юрэвіч. Беларускія актывісты намагаліся ахапіць сеткай рэгіянальных аддзелаў таксама ваколіцы Ілукстэ (Ілукшты). Адказнымі за працу ў гэтым рэгіёне былі прызначаны Уладзімір Гусарэвіч і Антон Зямец. Арганізацыйная праца тут ішла, аднак, вельмі павольна. У чэрвені 1943 года К. Езавітаў з жалем пісаў да А. Махноўскага пра тое, што ў Ілукстэ і ваколіцах не было створана ніводнага аддзела, а беларускія выданні, якія ён выслаў У. Гусарэвічу, вярнуліся назад у сувязі з незапатрабаванасцю[24]. Тым не менш, іншыя крыніцы сведчаць, што У. Гусарэвіч усё ж пачаў распаўсюджванне беларускіх выданняў і здолеў арганізаваць школу ў Варнавіцы (Варнавічах)[25].

БА ахоплівала ўсю тэрыторыю Генеральнай акругі «Латвія». Сядзіба арганізацыі знаходзілася ў Рызе (Katoļu iela 42). Найвышэйшым органам кіравання арганізацыі быў агульны гадавы сход, які склікаўся ў студзені і абіраў цэнтральны ўрад (цэнтральную ўправу), які складаўся з пяці сяброў. Рэгіянальныя аддзелы маглі стварацца ўсюды, дзе пражывала не менш за дзесяць сяброў арганізацыі. Сябрам арганізацыі мог стаць кожны беларус, які пражываў на тэрыторыі былой Латвійскай Рэспублікі і дасягнуў 16 гадоў. Падчас прыёму ад кандыдата патрабаваліся дзве рэка-

[22] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 22 лютага, с. 4.
[23] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 33, арк. 13 адв.
[24] Latvijas valsts vēstures arhīvs (LVVA), P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 20 lp.
[25] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 8.

мендацыі ад дзейных сяброў БА. Аддзелы склікалі гадавы сход, які абіраў ўправу і рэвізійную камісію. Згодна са статутам арганізацыя мела ўласны фонд, які складаўся з абавязковых месячных сяброўскіх узносаў (памер акрэслівала цэнтральная ўправа), ахвяраванняў, прыбытку ад продажу кніг і брашур, іншых сродкаў. Кожны аддзел меў абавязак раз на год перасылаць у цэнтральную ўправу 25% сумы сяброўскіх узносаў на арганізацыйныя мэты[26]. Дзейнасць БА падлягала пільнаму нагляду з боку нямецкіх акупацыйных улад. Арганізацыя непасрэдна кантралявалася намеснікам кіраўніка Рэйхскамісарыята «Остланд» доктарам Шмітам і шэфам СД оберштурмбанфюрэрам Рудольфам Ланге[27]. Сябры БА мелі права падчас сваіх урачыстасцей выкарыстоўваць нацыянальную сімволіку. У 1943 годзе К. Езавітаў дамагаўся ад немцаў дазволу на выкарыстанне значкоў з выявай нацыянальнага сцяга. У выніку, на заказ кіраўніка БА была выраблена партыя значкоў, якія знайшлі попыт сярод беларускай інтэлігенцыі[28].

Настроі, якія панавалі сярод кіраўнікоў арганізацыі, можна акрэсліць як пранямецкія. Некаторыя шчыра верылі ў магчымасць беларускага адраджэння пад нямецкай акупацыяй[29]. У адным з лістоў да сябра (27 студзеня 1943 года) К. Езавітаў выказваў думку, што адносіны немцаў да беларусаў не павінны змяніцца, тым больш, што «самі беларусы нічога не зрабілі гэткага, каб адносіны да іх маглі стацца горшымі. Зусім зразумела, што ў абставінах вайны не ўсё ідзе гэтак хутка, як нам можа быць хацелася бы»[30]. Пры гэтым лідар латвійскіх беларусаў шчыра верыў, што пры падтрымцы немцаў магчыма хуткае фарміраванне беларускай дзяржаўнасці. Пад-

[26] *Статут Беларускага аб'яднаньня (у ген. кам. Латвіі),* «Раніца» 1942, 14 чэрвеня, с. 2–3.

[27] А. Соловьев, *Белорусская центральная рада: создание, деятельность, крах,* Минск 1995, с. 155.

[28] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 5.

[29] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 206.

[30] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 23, арк. 7.

штурхоўваючы сваіх малодшых паплечнікаў да актыўнай працы, ён сцвярджаў, што «трэба гнаць, каб не толькі дзеткі, але і самі мы пабачылі сапраўды адроджаную Беларусь!»[31]. Адначасова ён разумеў, што спрыяльнай ваенна-палітычнай кан'юнктуры зусім недастаткова для таго, каб беларускія нацыянальныя імкненні сталі рэальнасцю. К. Езавітаў быў перакананы, што ўмовай ажыццяўлення гэтых мэт можа быць здольнасць беларусаў да самаарганізацыі. 17 студзеня 1943 года ён пісаў да сяброўкі: «Жывём у цяжкі і жудасны час, перажылі і перажываемо шмат цяжкіх падзеяў, але ў будучыне яшчэ іх будзе не менш і, відаць, не так хутка зажывём мірным жыццём, аб якім ужо горача пачынае летуцець усё чалавецтва. Паасобныя сямейкі, добрыя сябры і цэлыя народы павінны як мага цясней трымацца адзін за аднаго, каб не апынуцца толькі цацкамі ў руках мацнейшых і больш згуртаваных. На жаль, не ўсе беларусы яшчэ разумеюць гэтую простую ісціну! Нават птушкі аднае пароды і звяры трымаюцца сваімі стаямі і табунамі. Толькі дзеці народу нашага разбрыдаюцца ўсё яшчэ па чужых табарох, дзе іх эксплуатуюць і лічаць людзьмі другога сорту. Асабліва горка бачыць, калі ад свайго народу ўходзе на службу да другіх ягоная інтэлігенцыя»[32].

Стрыжань сяброў БА складалі прадстаўнікі інтэлігенцыі, перш за ўсё настаўнікі. Так, напрыклад, увесну 1942 года сярод 44 сяброў аддзела ў Даўгаўпілсе ажно 33 былі настаўнікамі[33]. У арганізацыю ўступілі многія былыя дзеячы і сябры беларускіх арганізацый, якія дзейнічалі ў міжваенны час. Па кан'юнктурных матывах у БНК запісваліся таксама людзі, якія раней ніякім чынам не праявілі сябе ў грамадскай працы, а нават тыя, хто раней не лічыў сябе беларусамі. Старшыня БА, аднак, лічыў, што нікога нельга адсоўваць ад адраджэнскай працы, і належыць прыцягваць у арганізацыю людзей, якія раней не ўдзельнічалі ў беларускім руху. Ён быў пе-

[31] LVVA, P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 10 lp.
[32] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 22, арк. 1.
[33] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 207.

ракананы, што нават «кан'юнктурныя беларусы» могуць быць карысныя нацыянальнай справе на цяперашнім этапе яе развіцця[34]. У лісце (сакавік 1942 года) да А. Якубецкага ў сувязі з яго абраннем старшынёй даўгаўпілскага аддзела БА К. Езавітаў раіў: «Паклапаціцеся, каб лічба сяброў Аб'яднання расла. Трэба правесці ўсведамляючую працу, каб да нас прыйшлі тыя беларусы, што стаялі вонку ад нас дзякуючы розным прычынам. Нікога не трэба адкідаць! Дзвінскі аддзел павінен з вялікім тактам прыцягнуць да нашага руху новыя сілы з шэрагаў маласвядомае і несвядомае беларускае масы і інтэлігенцыі. Прыцягнем жа мы іх не лаянінай за несвядомасць, а цярплівым выхаваннем і павелічэннем іх веды аб беларушчыне і беларускім руху. [...] Працу трэба пачынаць ад самага пачатку, гэтак, як яна была распачата ў 1921 годзе»[35].

Нягледзячы на спрыяльныя палітычныя абставіны і актыўнасць некаторых сяброў камітэта, большасць рэгіянальных аддзелаў на працягу ўсяго перыяду свайго існавання не выяўляла актыўнай дзейнасці. На думку кіраўніцтва арганізацыі, прычынай гэтага становішча была пасіўнасць мясцовага актыву. К. Езавітаў тлумачыў пасіўнасць латвійскіх беларусаў і цяжкасці ў арганізацыйнай працы працяглай адсутнасцю беларускіх школ у Латвіі[36]. На старонках даўгаўпілскай газеты «Наш шлях» К. Езавітаў змясціў вельмі крытычны артыкул «Дзвінскі аддзел БНА спіць», у якім наракаў на бяздзейнасць мясцовага беларускага асяродка[37].

Актыўная праца сярод беларусаў ускладнялася таксама ваеннымі ўмовамі, якія значна абмяжоўвалі магчымасці мясцовых актывістаў. У звароце кіраўніцтва аддзела ў Зілупэ (16 ліпеня 1943 года) чытаем: «У звязку з тым, што мы знаходзімся ў прыфрантавой зоне, дзе абставіны для грамадскай працы нашага аддзела Аб'яднання – ненармальныя – аддзел і не мог шырока разгарнуць сваю працу

[34] LVVA, P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 6 lp.
[35] *Ibidem*, 5 lieta, 9 lp.
[36] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 18, арк. 16.
[37] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 31 lp.

і апроч пашырэння літаратуры, нічога не мог зрабіць. Практыкавалась шмат чаго, так, напрыклад: арганізацыя драматычнага кружка, пастаноўка вечарын, былі нават пачаты рэпітыцыі п'ес, але калі ад нас адабралі для вайсковых патрэб усе памяшканні, прыйшлось усё гэта закінуць, бо не было мейсца ні дзе праводзіць рэпітыцыі, ні дзе ставіць самую вечарыну. Агульнага сходу сяброў рабіць не маглі, бо гэта забаронена. Былі зроблены толькі 3 паседжанні праўлення аддзелу, на якіх выносілісь тыя ці іншыя пастанаўленні, але правесці якія, іншы раз, тэарэтычна было немагчыма. А калі і было магчыма, то яны не давалі вынікаў. Так, калі вялась агульная перапісь насельніцтва, ад нашага аддзелу былі пасланы Пасінскай воласці і Розэнаўскай гар[адской] управы заявы з тым, каб назначылі шчотнымі беларусаў (бо большасць насельніцтва тут беларусы), якія мог даць наш аддзел. Таксама былі заявы, каб у шчотныя камісіі былі назначаны беларускія прадстаўнікі ад нашага аддзелу. Усе гэтыя заявы засталісь без адказу і нашыя дамаганні не былі задаволены. Зразумела, у такіх абставінах мы не маглі разгарнуць вялікай працы, тым больш, што нават не ведалі ўсіх сяброў свайго аддзелу, бо ад быўшага старшыні аддзелу М. Дзямідава не атрымалі ніякіх спіскаў і працу трэба было пачаць спачатку»[38].

Пасіўнасць некаторых сяброў і ваенныя абставіны не былі адзінымі перашкодамі ў разгортванні беларускага нацыянальна-культурнага руху. Як у кожным асяроддзі людзей, звязаных агульнай справай і інтарэсамі, сярод беларускага нацыянальнага актыву Латвіі ўзнікалі канфлікты, прычынай якіх найчасцей былі ўласныя амбіцыі асобных дзеячаў. Бясспрэчным лідарам заставаўся К. Езавітаў, які меў найбольшы вопыт і імпэт да працы. Разам з тым, іншыя ўдзельнікі беларускіх арганізацый, якія таксама прэтэндавалі на ролю кіраўнікоў беларускага жыцця ў Латвіі, бачылі ў ім канкурэнта. Аналіз перапіскі паміж дзеячамі беларускага руху ў Латвіі дазваляе зрабіць вывад, што сярод кіраўніцтва БА пана-

[38] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 51, арк. 51–51 адв.

вала досыць напружаная атмасфера і недавер. Сярод часткі сяброў арганізацыі існавала незадаволенасць старшынёй[39]. Некаторыя дзеячы абвінавачвалі К. Езавітава ў тым, што ён, знаходзячыся ў Рызе, мала цікавіўся справамі арганізацыі ў рэгіёнах. Апошні не трымаўся ўпарта сваёй пасады, але не збіраўся яе пакідаць, паколькі не бачыў сярод беларускага грамадства дастойнага кандыдата, які мог бы замест яго заняць месца старшыні арганізацыі. У лісце К. Езавітава да А. Якубецкага і А. Махноўскага (7 верасня 1942 года) чытаем: «З аднаго боку, я за старшынства не трымаюся, бо гэта мне, апроч непрыемнасцяў, страты часу і шалёнае стомы, – нічога не дае і дужа адмоўна адбіваецца на стане здароўя, бо я ўжо згубіў пуд з цвэрццю свае вагі за гэты год, а таму я з ахвотаю перадаў бы старшынства каму-колечы больш разумнаму, больш свядомаму, больш энергійнаму і больш адданаму ў працы, чым я сам. З другога боку, я хацеў бы ведаць і тыя мае загады і памылкі, якія выявіліся ў маёй працы, каб пабачыць іх і, перадаючы працу іншаму, дамагацца іх выпраўлення. Дзеля гэтага, зусім спакойна і без якога-колечы пачуцця незадавалення ці абразы звяртаюся да Вас з грамадскай прапазіцыяй: шчыра і адчынена выказаць мне прычыны Вашага незадавалення, бо, магчыма, што я дапусціўся ў працэсе шалёнае спешкі і перагрузкі сапраўды паважных памылак. Не памыляецца той, хто не працуе! [...] Апошнім часам рэпрэзентацыя нашых культурных спраў, віленскіх і менскіх, перад Рэйхскамісарыятам сапраўды адбірае ад мяне больш часу, чым нашы тутэйшыя справы, нагэтулькі, што я не змог нават пабываць ні ў Індры, ні ў Краслаўцы, ні ў Дзвінску, але я лічу, што ратаваць некаторыя нашы патрэбы тамака зараз найбольш важная справа, бо ў Латвіі мы ўжо больш-менш жывем стабілізаваным жыццём і шмат у чым

[39] У лісце да К. Езавітава (10 верасня 1942 года) С. Сахараў пісаў: «Старонкай чуў, што беларусы-рыжане чамусь то становяцца апазіцыйна супраць Вашага старшынства ў Беларускім аб'яднанні. Але хто можа Вас замяніць? […] Ствараецца становішча цяжкае, ставяць Вам у віну, што робіце ўсё самастойна, не лічуся з грамадой» (*ibidem*, спр. 35, арк. 16).

маемо большую практыку, чым віленчукі і менчукі. [...] Яшчэ адна просьба: падумайце таксама і аб тым, каго Вы змаглі-б высунуць на старшыню Аб'яднання, калі мая асоба Вам канчаткова абрыдла. Я разумею і гэткую ўстаноўку, якая выказваецца ўкраінскай народнай мудрасцю: „Хай гіршы, абы іншы!"»[40].

Нягледзячы на вышэйзгаданыя цяжкасці, да нацыянальна-культурнай працы далучыліся некаторыя маладыя латгальскія беларусы з ліку выхаванцаў міжваенных беларускіх гімназій. Сярод прадстаўнікоў малодшага пакалення латвійскіх беларускіх актывістаў варта згадаць Пятра Масальскага і Міколу Панькова. Апошні, працуючы на чыгунцы ў Даўгаўпілсе, вольны час прысвячаў культурна-асветнай дзейнасці і агітацыі сярод насельніцтва. У яго лісце (6 кастрычніка 1942 года) да старшыні БА чытаем: «Праца на хлеб, а па вечарах рэпетыцыі з іншымі ў школе па падрыхтоўцы драмы М. Машура „Лёгкі хлеб" да пастановак. Апрача таго ў мяне маюцца яшчэ слухачы ў Дзвінску на чыгунцы, дзе вяду працу таксама, нягледзячы на перашкоды з боку вышэйшага начальства (як майстар чыгункі – паляк і латыш – кіраўнік 6 вучастку)»[41].

На пасяджэнні зілупскага аддзела БА 30 студзеня 1943 года было вырашана арганізаваць у мястэчку платныя курсы нямецкай мовы (80 гадзін) і беларусазнаўства (40 гадзін). Курсы павінны былі адбыцца з 15 сакавіка да 15 красавіка 1943 года, а іх кіраўніком і адначасова выкладчыкам нямецкай мовы павінен быў стаць настаўнік мясцовай гімназіі Герман Лютэр. У якасці выкладчыкаў беларусазнаўства былі запрошаны Сяргей Сахараў і настаўнік Франц Клагіш[42].

Па ініцыятыве К. Езавітава БА рабіла спробы наладзіць навуковую дзейнасць. Асаблівая ўвага надавалася збору і апрацоўцы мясцовай беларускай народнай творчасці. У сакавіку 1942 года пры

[40] LVVA, P-712 f., 1 apr., 5 lieta, 4 lp.
[41] Hoover Institution. Калекцыя К. Езавітава (апрацоўваецца).
[42] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 104, арк. 15.

цэнтральнай управе БНК у Рызе пачала працу навуковая секцыя (кіраўнік К. Езавітаў, намеснік Баляслаў Брэжга). Акрамя таго, К. Езавітаў зрабіў няўдалую спробу стварыць адпаведную секцыю ў Даўгаўпілсе (кіраўнік Б. Брэжга)[43]. Па запрашэнні К. Езавітава ў склад секцыі ўвайшла Надзея Баркан. У 1942 годзе намаганнямі навуковай секцыі ў Рызе быў апрацаваны беларуска-нямецкі слоўнік, над якім працавалі П. Бруноўскі, К. Езавітаў і П. Масальскі[44]. Апошні пераклаў на беларускую мову 360 латышскіх дайн, тэксты якіх улетку 1942 года перадаў навуковай секцыі[45]. У гэты час К. Езавітаў падрыхтаваў нямецкамоўны тэкст «Гісторыя станаўлення і дзейнасці Беларускай акадэміі навук»[46]. Старшыня БА бачыў патрэбу працы над напісаннем гісторыі беларускага нацыянальнага руху. Яшчэ ў верасні 1941 года ён працаваў над кнігай «Беларускае нацыянальнае адраджэнне», якую спадзяваўся выдаць[47]. Адначасова ён заахвочваў Клаўдыюша Дуж-Душэўскага напісаць кароткі нарыс гісторыі беларускага нацыянальнага руху. У лісце да яго (14 красавіка 1943 года) К. Езавітаў наступным чынам тлумачыў неабходнасць выдання такой працы: «Старая адраджэнчая гвардзія беларуская вымірае. Тыя, што яшчэ жывуць, павінны парупіцца, каб нашчадкі мелі ўяўленне аб нашай працы»[48].

Згодна са статутам мэтай БА было «злучэнне ўсіх беларусаў, што жывуць на абшары б. латышскага гаспадарства дзеля супольнае працы і ўзаемнага падтрымання ў культурным і матар'яльным сэнсе»[49]. На практыцы гэта азначала вядзенне нацыянальна-культурнай агітацыі сярод насельніцтва, якая ажыццяўлялася даступнымі ва ўмовах акупацыі метадамі і сродкамі.

---

[43] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 209.
[44] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 26 ліпеня, с. 3.
[45] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 209.
[46] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 56, арк. 1–13.
[47] *Ibidem*, спр. 18, арк. 10.
[48] *Ibidem*, спр. 22, арк. 5.
[49] *Статут Беларускага…*, с. 2–3.

Прыярытэтам кіраўнікоў латвійскіх беларусаў была арганізацыя беларускай школьнай справы ў Латвіі. Але гэты аспект патрабуе асобнага разгляду.

Тэатральная і музычная дзейнасць

Адным з кірункам работы беларускага актыву ў Латвіі была арганізацыя канцэртаў, спектакляў. Гэтая форма актыўнасці разглядалася адначасова як сродак нацыянальнай агітацыі сярод насельніцтва і магчымасць паляпшэння матэрыяльнага становішча БА. Ужо ўлетку 1941 года пачалася праца па стварэнні беларускіх хораў. У гэты час быў створаны калектыў у Індры, якім кіраваў Мікалай Гаўбштэйн[50]. Пры дапамозе даўгаўпілскага аддзела БНК увесну 1942 года ў Даўгаўпілсе пачалася праца над стварэннем «беларускай драматычнай дружыны» пад кіраўніцтвам Я. Камаржынскага[51]. Дзякуючы Я. Камаржынскаму і М. Гаўбштэйну пры аддзелах БА ў Індры і Краславе былі створаны аматарскія драматычныя дружыны і хоры. Каб кіраваць драматычнымі гуркамі ў Даўгаўпілс прыехаў Аляксандр Новікаў, былы рэжысёр віцебскага 2-га Беларускага дзяржаўнага тэатра. Тым часам дырыжор М. Гаўбштэйн узначаліў працу хораў[52]. Выніку іх працы не давялося доўга чакаць. Восенню 1942 года пры аддзеле БА ў Даўгаўпілсе пачала працу аматарская трупа (кіраўнік А. Новікаў), якая раз-два ў месяц ставіла п'есы і канцэрты ў Даўгаўпілсе, Індры і Краславе[53].

У жніўні, верасні і кастрычніку 1942 года драматычныя гурткі арганізавалі некалькі паказаў у Латгаліі. Спачатку акцёры ігралі дзве п'есы – «Птушка шчасця» Францішка Аляхновіча і «Мікітаў лапаць» Міхася Чарота. Прыбытак з мерапрыемстваў прызначаўся

[50] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 40, арк. 9.

[51] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 29 сакавіка – 5 красавіка, с. 5.

[52] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 20 верасня, с. 3.

[53] Э. Екабсонс*, op. cit.*, с. 216.

на беларускія культурна-асветныя патрэбы. Архіўныя крыніцы дазваляюць досыць падрабязна прасачыць працу беларускіх калектываў. Так, напрыклад, 16 жніўня 1942 года ў Пустыні намаганнямі сяброў БА і ўдзельнікаў настаўніцкіх курсаў была пастаўлена п'еса «Птушка шчасця», у якой галоўныя ролі выканалі Ігнат Блажэвіч, Зміцер Юркевіч, Антон Пунін, Г. Дзяргач і інш. Выступіў таксама хор пад кіраўніцтвам М. Гаўбштэйна. Прысутнічала каля тысячы чалавек, у тым ліку нямецкі камендант Індры, прадстаўнікі латышскай адміністрацыі і паліцыі. Гэтая ж пастаноўка ў выкананні тых жа артыстаў адбылася 23 жніўня ў Краславе па ініцыятыве мясцовага аддзела Беларускага аб'ядання. Адным з пунктаў праграмы быў выступ Габрыелі Вікснэ-Апініс з Рыгі, якая выканала шэраг беларускіх («Скрыпка», «У садочку цвітучым» А. Туранкова, «Ай да ў нашым сяле» Зінчука), латышскіх і нямецкіх песень. 29 жніўня ў Краслаўцы рэжысёр Я. Камаржынскі паставіў п'есу «Мікітаў лапаць», у якой выступілі Мікалай Талерка, Барбара Эндсберг, І. Блажэвіч, В. Пурыньш, А. Пунін. Пасля спектакля адбылося выступленне балета ў складзе групы вучаніц мясцовай пачатковай школы пад кіраўніцтвам Элізы Казакевіч. 30 жніўня ў Даўгаўпілсе, у зале Дома яднання, драматычны калектыў сыграў п'есу «Мікітаў лапаць». Заслугоўвае ўвагі тое, што на паказ прыбыло шмат беларусаў з Друі. Гэта была адна з першых сустрэч землякоў, якія працяглы час жылі па абодва бакі былой дзяржаўнай граніцы. Намаганнямі аддзела БА ў Індры 13 верасня 1942 года ў Піедруі (Прыдруйску) адбыўся паказ вышэйзгаданай п'есы Ф. Аляхновіча. 29 верасня 1942 года падчас урачыстага ўручэння дыпломаў удзельнікам настаўніцкіх курсаў пры беларускай гімназіі ў Індры драматычны калектыў мясцовага аддзела БА пад кіраўніцтвам Я. Камаржынскага сыграў п'есу «Мікітаў лапаць», у якой выступілі акцёры Юзэфа Оруп-Васілеўская, Вольга Пурыньш-Мадзалеўская, Б. Эндсберг, М. Талерка, І. Блажэвіч[54]. 1 кастрычніка 1942 года драматычны

[54] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 20 верасня, с. 3.

гурток з Індры прыбыў у Друю па запрашэнні тамтэйшай беларускай школы. Індраўцы паставілі п'есу М. Чарота і арганізавалі выступленні двух квартэтаў спевакоў[55]. Вось як пісала пра гэтую падзею берлінская беларуская газета «Раніца»: «Вечарына прайшла з вялікім поспехам і паклала пачатак цеснаму супрацоўніцтву беларускіх культурных сіл, штучна падзеленых у свой час мурам польска-латышскай мяжы, якая 20 год праходзіла па жывому целу беларускага народу і разрывала яго на часткі, аддаючы гэтыя часткі пад панаванне чужынцаў»[56].

Кіраўніцтва БА планавала гастролі не толькі ў Латгаліі, але таксама у памежных з Латвіяй ваколіцах Браслава, Дрысы, Полацка і Себежа. Разлік рабіўся на тое, каб незалежна ад Даўгаўпілса ў правінцыі дзейнічалі драматычныя «дружыны», якія пад кіраўніцтвам мясцовых рэжысёраў маглі б самастойна ставіць п'есы ў вёсках. Аднак галоўным асяродкам тэатральнай працы заставаўся Даўгаўпілс. 8 лістапада 1942 года ў горадзе адбыўся вялікі канцэрт беларускіх песень, падчас якога выступілі квартэт БА ў Індры, Вольга Бароўская і Габрыеля Вікснэ. Аранжыраваў квартэту арганіст з Індры Язэп Станкевіч. 15 лістапада 1942 года драматычны гурток даўгаўпілскага аддзела БА пад кіраўніцтвам А. Новікава паставіў п'есу М. Машары «Лёгкі хлеб». На паказе, які адбыўся ў гімназіі Індры, прысутнічала больш за 500 гледачоў. Наступны спектакль паводле гэтай п'есы адбыўся 22 лістапада 1942 года ў Краславе. На ім прысутнічала каля 450 гледачоў. 29 лістапада 1942 года адбылася пастаноўка «Лёгкага хлеба» ў Даўгаўпілсе, на якую прыйшло каля 800 чалавек[57]. У наступным годзе артысты пашырылі свой рэпертуар. У студзені 1943 года ў Даўгаўпілсе быў арганізаваны вечар беларускіх вадэвіляў, падчас якога адбыліся ін-

[55] *Ibidem*; *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 18 кастрычніка, с. 3; НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 35, арк. 14 адв.

[56] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 18 кастрычніка, с. 3.

[57] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 25 снежня, с. 7.

сцэніроўкі твораў «Пярэстая красуля» А. Чужыніна, «Міхалка» Далецкіх і «Чорт і баба» Ф. Аляхновіча[58]. 14 лютага 1943 года ў вялікай зале даўгаўпілскага Дома афіцэраў мясцовы драматычны гурток БА пад кіраўніцтвам рэжысёра А. Новікава ўпершыню паставіў камедыю Ф. Аляхновіча «Шчаслівы муж»[59]. Поспехі даўгаўпілскіх беларускіх акцёраў настолькі ўразілі кіраўніцтва БА, што ўлетку 1943 года абмяркоўвалася магчымасць адкрыцця ў Даўгаўпілсе беларускага тэатра і оперы[60].

У той час працягвалі дзейнічаць драматычныя калектывы ў іншых мясцовасцях. 2 студзеня 1943 года па ініцыятыве БА ў 7-й беларускай пачатковай школе ў вёсцы Гаравая (воласць Скайста) адбыўся вечар з удзелам квартэта індраўскага БА (кіраўнікі М. Гаўбштэйн і Я. Станкевіч) і драматычнай «дружыны» гэтага ж аддзела, якая паставіла п'есу «Птушка шчасця» (рэжысёр З. Юркевіч). Паказ сабраў каля 600 гледачоў, сярод якіх былі вучні і бацькі беларускай школы, настаўнікі суседніх латышскіх школ, камендант Індры. Паводле сведчанняў прысутных, панаваў узнёслы і бадзёры настрой. 24 студзеня 1943 года драматычны гурток індраўскага аддзела БА ўпершыню паставіў п'есу «Боты». Пастаноўка была падрыхтавана Мікалаем Талеркам, а ігралі ў ёй Вольга Мадзялеўская-Пурыньш, Эдвард і Канстанцін Сушынскія. У Індры існаваў таксама балетны гурток (кіраўніца Эліза Казакевіч) і мужчынскі квартэт (кіраўнік

[58] Падсумоўваючы вынікі тэатральнай дзейнасці, А. Махноўскі з гонарам пісаў К. Езавітаву: «27. XII. 42 і 3. I. 43 ставілі „Чорт і баба", „Міколка" і „Пярэстая красуля". [...] 27. XII тэатр быў перапоўнены да апошняга. Шмат народу не змагло памесці на бел. спектакль і з жалем змушана была вярнуцца да хаты. Спектакль ушанаваў сваёй прысутнасцю Вікберг. Быў задаволены ігрой артыстаў і хадзіў разам са мной за кулісы прывітаць артыстаў з добрымі поспехамі. Быў праездам з Рыгі Ганько з Менску. [...] Былі прадстаўнікі латышскага рабежніцкага [Robežnieki, іншая назва Pustiņa (Pūstine) – населены пункт, цэнтр воласці на граніцы Латвіі з Беларуссю. – *Ю. Г.*] грамадзянства. […] Ігра артыстаў была яшчэ лепшай. Саля перапоўнена публікай» (НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 33, арк. 16).

[59] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 27 lp.

[60] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 216.

Язэп Станкевіч)[61]. Старшыня БА лічыў, што ў Індры варта таксама арганізаваць народны хор[62]. Улетку 1943 года аддзел БА ў Зілупэ выйшаў з ініцыятывай стварэння ўласнага хору. З гэтай мэтай 13 ліпеня 1943 года кіраўніцтва аддзела звярнулася да цэнтральнай управы з просьбай дапамагчы набыць матэрыял для пашыву народных строяў[63].

Выступленні драматычных калектываў і хораў карысталіся папулярнасцю гледачоў, але якасць пастановак жадала быць лепшай. Рэцэнзенты звярталі ўвагу на небеззаганны грым і ўборы акцёраў, што не заўсёды адпавядалі ролям, якія выконваліся. Больш за тое, акцёры-аматары не заўсёды былі здольныя на адпаведным узроўні выканаць свае ролі. Часамі кідалася ў вочы кепскае веданне беларускай мовы. Рэцэнзент дзяліўся крытычнымі заўвагамі пра спектакль «Шчаслівы муж»: «Г. Ліндэ гуляла на гэты раз у ролі старое дзяўчыны Уршулі, гуляла сярэдне. У яе гульні было трохі зашмат гістэрычнай нервовасці, што можа выліцца ў празмернасць. Пажадаемо нашай аматарцы больш увагі звярнуць на міміку ды адшуканне ў ад'ёмных баках сонечных месцаў, сэрца, што надае гульні больш веры. Прыяцельку Фельку гуляла Т. Мацвеева, і хаця адгуляла добра, аднак сэрца ў гульню не ўклала і яе Ганулька ў „Лёгкім хлебе" была больш вартаснай. Гаўдэнта Залепку слаўна падаў на сцэне А. Абалевіч, аднак вопратка, як для жагнага жонкай мужа паслужніка была забагатая. Трэба адзначыць гульню І. Жукоўскай у ролі Мар'яны. І. Ж. як і Н. Лама абяцаюць вырабіцца на значныя артыстычныя постаці нашага тэатру. Яе гульня – адбіткам сапраўднага жыцця на сцэне. […] Рэжысёр А. Новікаў гуляў мнімага графа – Ільдэфонса Мацальскага. Гуляў сярэдне, але тэксту не ведаў, ды і троху перасаліваў, чаму ў гледача з'яўляецца сумніў, як можна закахацца ў гэтакага грубага мужчыну. Вельмі дрэнна ў яго стаіць

[61] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1943, 28 лютага, с. 3.
[62] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 18.
[63] *Ibidem*, спр. 51, арк. 50.

справа з мовай, і беларускі глядач патрабуе дасканалага ведання беларускай мовы, як ад рэжысёра і артыстага. Асабліва дрэнна быў паложаны грым амаль ва ўсіх артыстаў, за вынікам двух-трох, і не адпавядаў тым ролям, якія гуляліся»[64].

Працу даўгаўпілскага драматычнага гуртка ўскладнялі непаразуменні паміж рэжысёрам А. Новікавым і некаторымі акцёрамі. Карэспандэнт газеты «Наш шлях» наступным чынам характарызаваў сутнасць спрэчкі: «Ці ўжо мы сапраўды нагэтулькі неграмадскія людзі, што аднойчы не скончым усе спрэчкі? Брыдка выносіць сваё смяццё на чужы падворак, але гэта ўжо адбылося, і таму спынімся на гэтым крыху шырэй. Што датычыцца непаладу сп. рэжысёра з некаторымі акцёрамі-аматарамі, дык віна тут абодвух бакоў. Сп. Новікаву, як рэжысёру, можна закінуць толькі часам кінутыя словы лаянкі ды магчыма абцяжаранасць працай у двох народаў. Але найбольш віны нашых актораў, якія ўжо бяруцца праводзіць рэжысюры, не маючы ні спецыяльнае асветы, ані вялікае практыкі. Тут, паважаныя спадары акторы, нам трэба яшчэ вучыцца, і таму адкінуць ганарлівыя мроі стацца Міровічам»[65]. З цягам часу атмасфера ў калектыве яшчэ больш пагоршылася. Сведчыць пра гэта ліст (1 чэрвеня 1943 года) А. Махноўскага да К. Езавітава, у якім чытаем: «З Новікавым надалей працаваць немагчыма. Патрэбен рэжысёр. А дзе яго шукаць? У тэатры старэнна адчуваецца недахоп белар. інтэлігентных сіл. Зарэзала і адсутнасць п'ес для тэатра на белар. мове»[66]. Аўтар гэтых радкоў прызнаваў, што рэпертуар даўгаўпілскага тэатра яшчэ недасканалы, але заклікаў трымацца ўласна беларускіх твораў, а не квапіцца адразу на чужыя пераклады, бо «ад маскоўшчыны ў нас яшчэ галава баліць ад часоў бальшавікоў»[67].

---

[64] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1943, 28 лютага, с. 3; LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 27 lp.

[65] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 31 lp.

[66] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 33, арк. 25 адв.–26.

[67] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 31 lp.

З мэтай паляпшэння якасці працы драматычнай «дружыны» даўгаўпілскія беларусы былі вымушаны звярнуцца па дапамогу ў Менскі гарадскі тэатр. У кастрычніку 1943 года сакратар даўгаўпілскага аддзела БА А. Махноўскі ў лісце да Язэпа Найдзюка прасіў прыслаць з Менска рэжысёра-артыста, які «здолеў бы наладзіць і паставіць на патрэбную вышыню наш тэатр, каб ён даваў пастаноўкі не горшыя, чым даюць латышскі і расійскі дзвінскія тэатры»[68]. Ён жа жаліўся на адсутнасць новых п'ес і прасіў, каб мянчане падзяліліся сваім рэпертуарам. З мэтай наладжвання супрацоўніцтва ў Менск выехала настаўніца Тамара Мацвеева[69]. Тым часам намаганнямі К. Езавітава рабіліся пераклады іншамоўных п'ес, перш за ўсё латышскіх[70]. Нягледзячы на вышэйзгаданыя цяжкасці аматарскі калектыў у Даўгаўпілсе не спыніў сваёй працы. У 1944 годзе драматычная «дружына» паставіла камедыю Маманцтавай «Ружовае павуцінне»[71].

Праявы беларускага культурнага жыцця назіраліся таксама ў Рызе. Галоўным ініцыятарам беларускіх урачыстасцей, якія звычайна адбываліся ў будынках беларускіх школ, быў К. Езавітаў[72]. На беларускіх вечарах спявалі арыі з опер і народныя песні[73]. Восенню 1942 года ў Рызе адбыўся канцэрт беларускай песні і музыкі. Выканаўцамі з'яўляліся беларускія педагогі і вучні, як, напрыклад, настаўніца 1-й рыжскай беларускай школы Вольга Бароўская-Пігулеўская[74]. У 1942 годзе кіраўніцтва БА атрымала згоду акупацыйных улад на вяшчанне ў Рызе радыёперадач з беларускімі народнымі спевамі. Адначасова кіраўніцтва БА звярнулася да спевакоў з просьбай аб падрыхтоўцы рэпертуару. На заклік адгукнуліся

[68] *Ibidem*, 5 lieta, 26 lp.
[69] *Ibidem*.
[70] *Ibidem*, 4 lieta, 37 lp.
[71] *Беларускае жыцьцё ў Лацьвіі,* «Раніца» 1944, 21 мая, с. 3.
[72] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 15 лютага, с. 3.
[73] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 29 сакавіка – 5 красавіка, с. 5.
[74] *Хроніка беларускага жыцьця ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 19 ліпеня, с. 3.

Анеля Латонас-Дзямідава, Ганна Бедарава, Габрыеля Вікснэ-Апініс і Эрыка Даніэльс[75]. Рыжскі кампазітар Дзмітрый Кулькоў напісаў фантазію для скрыпкі, у аснову якой лягла беларуская народная мелодыя[76]. К 20-годдзю творчай дзейнасці паэта П. Масальскага (творчы псеўданім Пятро Сокал) па прапанове БА кампазітар А. Туранкоў напісаў музыку да вершаў П. Масальскага «Прытулісь да мяне» і «Развітанне»[77]. Рыжская мастачка Аляксандра Бяльцова ў 1944 годзе падрыхтавала серыю малюнкаў-карыкатур па матывах беларускіх народных прыпевак. Вынікі працы мастачкі публікаваліся ў часопісе «Новы шлях»[78]. У гэтым жа годзе Ян Лея аддаў у друк 30 фотапаштовак з краявідамі Беларусі[79].

Беларускі актыў Латвіі рабіў спробы арганізаваць выступленні замежных тэатральных калектываў і асобных спевакоў. У лістападзе 1942 года старшыня БА звярнуўся да старшыні Беларускай народнай самапомачы (БНС) Івана Ермачэнкі з просьбай накіраваць у турнэ па Латвіі групу беларускіх спевакоў з менскай опернай трупы: кампазітара Міколу Шчаглова, Ніну Бандарыну, Наталлю Чамярэсаву, Варвару Пукст, Веру Купцэвіч, Стэфанію Ласкавец, Яна Лапаціна, Мікалая Вастокава і віяланчэліста Мікалая Арлова. Канцэрты павінны былі адбыцца з 25 снежня 1942 да 10 студзеня 1943 года ў Даўгаўпілсе, Індры, Рызе, Краславе і Зілупэ. Пры гэтым планавалася таксама выступленне ў памежнай з Латвіяй Друі[80].

---

[75] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 26 ліпеня, с. 3.

[76] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1944, 9 студзеня, с. 3.

[77] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 25 снежня, с. 7.

[78] *Biełaruskaje żyćcio ŭ Łatvii,* „Biełaruski Hołas" 1943, 24 vieraśnia, s. 4; *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1944, 2 красавіка, с. 3.

[79] *Ibidem*.

[80] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 26 lp.

Гастролі Міхала Забэйды-Суміцкага ўлетку – увосень 1943 года

Восенню 1942 года К. Езавітаў звярнуўся да старшыні берлінскага Беларускага камітэта самапомачы (БКС) Мікалая Абрамчыка з просьбай дапамагчы скантактавацца з вядомым спеваком Міхалам Забэйдам-Суміцкім[81]. Спявак пагадзіўся наведаць з канцэртамі Латвію, і ўлетку 1943 года адбыліся яго першыя гастролі ў гэтай краіне[82]. Агулам спявак даў сем канцэртаў у Латгаліі: Даўгаўпілсе (9 і 11 ліпеня), Краславе (4 ліпеня), Індры (18 ліпеня), Лудзе (22 ліпеня), Зілупэ (24 ліпеня) і Пасіенэ (25 ліпеня)[83]. Рэпертуар спевака складаўся з твораў беларускіх і замежных аўтараў (з перавагай першых). Падчас канцэрта маэстра акампаніравала мясцовая спявачка В. Бароўская, якая таксама выканала некалькі твораў[84]. Сярод запрошаных на канцэрты былі прадстаўнікі беларускай грамадскасці і настаўніцтва, нямецкіх грамадзянскіх і вайсковых улад, латышскага самакіравання, вайскоўцы ўкраінскага шума-батальёна, які кватараваў у Латгаліі[85]. Актыў даўгаўпілскага аддзела БА вельмі станоўча ацэньваў вынікі турнэ, і ў сувязі з гэтым плануваўся яго працяг у другой палове 1943 года. У лісце кіраўніцтва даўгаўпілскага аддзела да цэнтральнай управы ад 31 жніўня 1943 года чытаем: «Усе канцэрты прайшлі надзвычай добра і з вялікім мастацкім і матар'яльным поспехам. Беларускай песняй у выкананні нашага спевака Забэйды-Суміцкага цешыліся, прызналі прыгожасць мелодыяў і высокае мастацкае выкананне не толькі беларусы, але і прадстаўнікі іншых народаў. Канцэрты Забэй-

[81] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 12, арк. 3.

[82] Першапачаткова прыезд М. Забэйды-Суміцкага ў Латвію планаваўся ў ліпені і расклад яго канцэртаў выглядаў наступным чынам: Краслава (4-га), Даўгаўпілс (9-га і 11-га), Індра (17-га), Гаравая (18-га), Лудза (23-га), Зілупэ (24-га) і Пасіенэ (25-га) (*Беларускае жыццё ў Латвіі,* «Раніца» 1943, 25 ліпеня, с. 3).

[83] LVVA, P-712 f., 1 apr., 5 lieta, 30 lp.; 4 lieta, 37 lp.

[84] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 104, арк. 18.

[85] LVVA, P-712 f., 1 apr., 2 lieta, 28 lp.

ды-Суміцкага з'яўляліся заменай беларускага нацыянальнага свята спеваў, якое не ўдалося па незалежным ад нас прычынам наладзіць разам з латышамі»[86]. Даўгаўпілскія беларусы звярнуліся з прапановай да цэнтральнай управы, каб апублікаваць беларускамоўны рэпертуар спевака[87]. Пасля завяршэння канцэртаў у Латгаліі М. Забэйда-Суміцкі некалькі тыдняў адпачываў у адным з фальваркаў у ваколіцах Лудзы[88].

Падчас знаходжання ў Латвіі тэнар атрымаў ад кіраўніцтва БА прапанову заняць пасаду рэжысёра і дырэктара беларускага тэатра і оперы ў Даўгаўпілсе. Старшыня БА спадзяваўся, што згода тэнара дазволіць у будучыні стварыць музычную школу і кансерваторыю[89]. Спявак не выказаў, аднак, зацікаўленасці. На думку К. Езавітава, неабходна было арганізаваць канцэрты ў ваколіцах Рэзэкнэ і Ілуксты, а таксама ў Рызе. Задум не ўдалося, аднак, ажыццявіць[90]. Па запрашэнні БА восенню 1943 года М. Забэйда-Суміцкі зноў наведаў Латвію, дзе даў канцэрт у Рызе (28 верасня) і Ліепаі (4 кастрычніка)[91]. У студзені 1944 года былі запланаваны чарговыя канцэрты тэнара ў Рызе і Даўгаўпілсе, якія, аднак, не адбыліся[92].

Праблема ўвядзення беларускай мовы ў жыццё праваслаўнай і каталіцкай цэркваў

Адначасова беларускія дзеячы стараліся не губляць з вачэй рэлігійных спраў. Кіраўнікі беларускага руху ўсведамлялі важнасць уплыву слова з амбона на традыцыйна кансерватыўнае сялянства.

---

[86] *Ibidem*, 4 lieta, 37 lp.

[87] *Ibidem*.

[88] *Biełaruskaje życcio ŭ Łatvii,* „Biełaruski Hołas" 1943, 24 vieraśnia, s. 4.

[89] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 22, арк. 11.

[90] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 23 lp.

[91] *Biełaruskaje życcio ŭ Łatvii,* „Biełaruski Hołas" 1943, 24 vieraśnia, s. 4; *У Латвіі*, «Новая Дарога» 1943, 19 верасня, с. 4.

[92] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 33 lp.

У сувязі з гэтым рабіліся спробы ўвядзення беларускай мовы ў каталіцкія і праваслаўныя храмы. Восенню 1941 года кіраўніцтва БНК звярнулася да біскупа Баляслава Слосканса з просьбай прызначыць у парафіі ў беларускіх валасцях ксяндзоў беларускай нацыянальнасці, якія маглі б чытаць казані па-беларуску. Іерарх паабяцаў здаволіць жаданні беларусаў[93]. Праўдападобна, аднак, што за словамі не стаялі дзеянні, бо 20 верасня 1942 года на пасяджэнні пашыранага складу цэнтральнай управы БА было вырашана зноў звярнуцца да ўлад рымска-каталіцкага касцёла з аналагічным патрабаваннем[94]. Вядома, што некаторыя ксяндзы супрацоўнічалі з БА. Беларускай лініі ў сваёй душпастырскай дзейнасці паслядоўна трымаўся пробашч парафіі ў Даўгаўпілсе Язэп Гайлевіч, які быў сябрам управы мясцовага аддзела БНК. У працы беларускага актыву ў Рызе браў удзел ксёндз Антон Альшэўскі[95]. Абодва былі настаўнікамі рэлігіі ў беларускіх школах. За свой удзел у нацыянальнай дзейнасці яны трапілі ў лік 45 ксяндзоў, якіх разведка Арміі Краёвай лічыла «беларускімі паслугачамі»[96]. Паводле сведчання С. Сахарава, да беларускай справы станоўча ставіўся пробашч парафіі ў Зілупэ Уладзіслаў Янкоўскі, які абяцаў падтрымаць арганізацыю беларускіх школ у сваёй мясцовасці[97]. Тым не менш, пэўная частка каталіцкага духавенства дэманстравала адмоўнае стаўленне да беларускай працы. У пачатку 1943 года А. Махноўскі інфармаваў К. Езавітава аб антыбеларускім інцыдэнце з удзелам ксяндзоў у Краславе. Старшыня БА раіў праінфармаваць аб здарэнні біскупа[98].

---

[93] *Беларусы ў Латвіі,* «Раніца» 1941, 20 лістапада, с. 3.

[94] *Беларускае жыццё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 18 кастрычніка, с. 3.

[95] *Беларускае жыццё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 15 лютага, с. 3.

[96] J. Garbiński, J. Turonek, *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny,* Warszawa 2003, s. 112, 289.

[97] *Крывіцкія руны*. Вып. 2. *Беларускі культурны мацярык у Латвіі,* укл. М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Мінск 2017, с. 217.

[98] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 5.

У сваю чаргу, адносіны некаторых беларускіх дзеячаў да служыцеляў культу былі неадназначныя. Старшыня даўгаўпілскага БНК А. Якубецкі абвінавачваў ксяндза Я. Гайлевіча ў тым, што ён не выкарыстоўвае беларускую мову ў катэхізацыі моладзі. Ксяндза бараніў праваслаўны свяшчэннік А. Махноўскі, які лічыў прэтэнзіі беспадстаўнымі. К. Езавітаў меў неадназначнае стаўленне да духоўных асоб. З аднаго боку, ён хваліў працу і паводзіны некаторых з іх[99]. З іншага, з недаверам ставіўся да ўдзелу духавенства ў грамадска-палітычным руху, лічыў, што канфесійны фактар перашкаджае вядзенню нацыянальнай работы. У адным з лістоў да сябра ён так характарызаваў дзейнасць ксяндзоў: «Для ксяндза заўсёды на першым мейсцу быў загад папы, а ўжо потым інтарэсы веры, а на самым апошнім мейсцу інтарэсы [...] народу, бо хоць яны і лаяць бальшавікоў, але самі прапаведуюць інтэрнацыяналізм, але з папай на чале!»[100]. Сваё стаўленне да ксяндзоў лідар латвійскіх беларусаў яшчэ раз падкрэсліў у лісце да М. Абрамчыка (28 мая 1943 года), з якім дзяліўся сваімі крытычнымі заўвагамі адносна беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху, які, на яго думку, «беларускую справу разглядае як справу падсобную для сваёй каталіцкай акцыі». У гэтым жа лісце далей чытаем: «У вочы мне гаварылі заўсёды кампліменты (іншы раз двухсэнсоўныя), а за спіною і ў прэсе выліваўся ўсялякі бруд. Я ж лічыў і лічу, што не народ для рэлігіі, а рэлігія для патрэб тае часткі нашага народу, якая жадае быць рэлігійнаю. І што духаўнікі нашыя на гвалт лезуць у палітычную працу, а не робяць шырокай нацыянальна-культурна-ўсведамляючай працы, гэта ёсць вялікім заганам нашых духаўнікоў. І я быў дужа ўсцешаны, калі генералкамісар сп. Кубэ выдаў загад аб тым, што духаўнікам забараняецца „рабіць палітыку”»[101]. З мэтай хутчэйшага ўвядзення беларускай мовы ў царкоўнае жыццё латгальскіх каталікоў дзеячы БА

[99] *Ibidem*, спр. 20, арк. 16.
[100] LVVA, P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 8 lp.
[101] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 12, арк. 4.

звярнуліся па дапамогу да віленскіх беларусаў. 16 лістапада 1943 года А. Махноўскі і ксёндз Я. Гайлевіч накіравалі ліст да ксяндза Адама Станкевіча, у якім прасілі даслаць у Латвію тры-чатыры тысячы экзэмпляраў беларускамоўнага малітоўніка. Аўтары ліста прасілі таксама згоды на перавыданне даваеннага малітоўніка «Голас душы»[102]. Захады беларускага боку па ўвядзенні роднай мовы ў касцёлы Латгаліі не прынеслі значнага плёну. Яскрава сведчыць пра гэта паведамленне генеральнага дырэктара па пытаннях асветы Генеральнай акругі «Латвія», які падкрэсліваў, што ў ваколіцах Даўгаўпілса беларусы моляцца ў касцёлах выключна па-польску, а 99% вучняў беларускіх школ не разумее беларускіх малітваў, а толькі польскія[103].

Беларускі актыў Латвіі рупіўся таксама пра беларусізацыю праваслаўных беларусаў. К. Езавітаў асцерагаўся, што ўлады Рускай праваслаўнай царквы будуць пасылаць на беларускія абшары місіянераў з ліку прыхільнікаў расійскай дзяржаўнасці. У сувязі з гэтым у верасні 1941 года пяціасабовая беларуская дэлегацыя на чале з С. Сахаравым наведала мітрапаліта Сергія (Васкрасенскага), патрыяршага экзарха Прыбалтыкі. Беларускі бок дамагаўся вызначэння свяшчэннікаў-беларусаў у прыходы, якія складаліся з вернікаў гэтай нацыянальнасці. Вось якім чынам перагаворы з мітрапалітам Сергіем прадстаўляў К. Езавітаў у лісце да Эдварда Будзькі (5 кастрычніка 1941 года): «Прыняў прыхільна, выслухаў уважліва, адразу ж выканаў першую просьбу аб прызначэнні ў Дзвінск свяш[чэнніка]-беларуса Мікалая Краўчанкі, абяцаў у беларускія прыходы прызначыць беларусаў і прасіў, каб далі яму хоць маленькі нарыс аб становішчы праваслаўя на Беларусі і аб беларускіх патрэбах. Звярнуліся да мяне, каб я напісаў гэты нарыс. Я накідаў кароткі канспект, з якім дэлегацыя зноў пойдзе заўтра да мітрапаліта, бо дужа важна ўжо ў Рызе змусіць яго лічыцца з белару-

[102] LVVA, P-712 f., 1 apr., 3 lieta, 47 lp.
[103] BA, R 92/102, s. 78.

самі»[104]. У адказ на жаданні беларусаў царкоўныя ўлады прызначылі М. Краўчанку пробашчам Успенскага прыхода ў Даўгаўпілсе. Гэты свяшчэннік быў сябрам БА і настаўнікам рэлігіі ў 1-й рыжскай беларускай школе[105]. Апрача таго, вядомы прозвішчы яшчэ некалькі свяшчэннікаў, якія належалі да беларускай арганізацыі. Айцец Нікан Заліўскі засядаў ва ўправе аддзела БА ў Даўгаўпілсе. З беларусамі быў звязаны Іван Малаток, настаяцель у Рызе, сябар рэдакцыі часопіса «Новы шлях»[106]. У ліпені 1942 года да К. Езавітава звярнуўся Сымон Цвірка, пробашч праваслаўнай парафіі Святога Мікалая ў Піедруі. Ён прасіў даслаць яму беларускую прэсу і выказваў жаданне быць сябрам БА. Сваю просьбу матываваў тым, што сам быў па паходжанні беларусам, а пераважную большасць яго прыхаджан складалі прадстаўнікі гэтай нацыянальнасці[107]. У красавіку 1943 года К. Езавітаў прапанаваў С. Сахараву пашукаць сярод латгальскіх беларусаў праваслаўнага веравызнання кандыдатаў у беларускую секцыю Варшаўскай духоўнай семінарыі, а таксама падрыхтаваць для берлінскай газеты «Раніца» некалькі артыкулаў пра беларускія праваслаўныя цэрквы ў Латгаліі[108]. Вынікі працы, накіраванай на беларусізацыю царкоўнага жыцця, былі, аднак, нязначныя. Некаторыя свяшчэннікі былі сябрамі БА, але не праяўлялі сябе ў актыўнай дзейнасці.

Выданне і распаўсюджванне беларускай прэсы і кніг

Кіраўнікі БА ўсведамлялі неабходнасць выдання ўласнай прэсы. Ініцыятыва належала даўгаўпілскаму аддзелу, па прапанове якога ў лістападзе 1941 года пытанне аб выданні мясцовай газеты аб-

[104] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 20, арк. 20 адв.

[105] *Беларусы ў Латвіі,* «Раніца» 1941, 20 лістапада, с. 3.

[106] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 26 ліпеня, с. 3; *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 20 верасня, с. 3.

[107] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 37, арк. 2.

[108] *Ibidem*, спр. 17, арк. 20.

мяркоўвалася на пасяджэнні цэнтральнай управы БНК. Тады было вырашана ўхваліць ідэю, а справу выдання даручыць А. Якубецкаму[109]. Старшыня БНК заахвочваў паплечнікаў з Даўгаўпілса да падрыхтоўкі выдання. У лістападзе 1941 года ён пісаў да А. Махноўскага: «Газету выпускайце ў спакойных тонах і ў „хроніцы" не раскрывайце ўсіх планаў і ўсіх картаў. Адзначаючы толькі тое, што ўжо замацавана, але не тое, што спадзяемся дастаць, ці думаема распачынаць. Ад паспяшання апавяшчэння могуць быць зрывы ў працы, бо ворагі будуць устаўляць палкі»[110]. К. Езавітаў раіў выдаваць газету тры разы на месяц (1-га, 20-га і 30-га дня) і быў перакананы, што матэрыялаў для выдання будзе досыць[111]. Справа выдання не выйшла, аднак, па-за межы задум і планаў. У архіве БА ўдалося адшукаць рукапіс першага і апошняга нумара газеты «Наш шлях», які быў датаваны студзенем 1943 года. У якасці месца выдання быў пазначаны Даўгаўпілс. Газета мела дзве старонкі, не змяшчала ілюстрацый і выглядала вельмі сціпла[112]. Нягледзячы на тое, што справа выдання газеты працягвала абмяркоўвацца беларускім актывам да канца 1943 года, латвійскім беларусам не ўдалося надрукаваць аніводнага нумара. З карэспандэнцыі паміж С. Сахаравым і К. Езавітавым вынікае, што апошні прапаноўваў наладзіць выданне беларускай газеты ў Індры. Аднак С. Сахараў не бачыў такой патрэбы, паколькі, на яго думку, мясцовае жыхарства атрымлівала беларускія газеты[113].

Адсутнасць уласнай прэсы часткова кампенсаваў факт, што ў Латвію даходзіла беларуская прэса, якая выдавалася па-за яе межамі. Адбывалася гэта дзякуючы старшыні БНК К. Езавітаву, які з першых дзён нямецкай акупацыі арганізаваў распаўсюджванне сярод беларускай інтэлігенцыі беларускіх газет, якія выходзілі

[109] LVVA, P-712 f., 1 apr., 3 lieta, 3 lp.
[110] *Ibidem*, 6 lieta, 6 lp.
[111] *Ibidem*, 8 lp.
[112] *Ibidem*, 4 lieta, 31 lp.
[113] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 35, арк. 10 адв.

ў Менску, Рызе, Вільні, Беластоку і Берліне. З гэтай мэтай ён скантактаваўся з беларускімі асяродкамі ў гэтых гарадах[114]. Першапачаткова ён дасылаў (за грошы) частку атрыманага тыражу зацікаўленым асобам, а потым па лініі арганізацыі імкнуўся наладзіць у Латгаліі падпіску на гэтыя выданні. Лідар латвійскіх беларусаў лічыў неабходным распаўсюджванне беларускай перыёдыкі не толькі сярод інтэлігенцыі, але і сярод шырокіх слаёў грамадства[115]. У адным з лістоў да сябра (11 ліпеня 1942 года) К. Езавітаў пісаў: «Наогул трэба, каб нашы сяляне пачалі, нарэшце, чытаць і выпісываць беларускія часопісы ў кождую хату. Гэта найлепшая адзнака нацыянальнае свядомасці і найлепшы спосаб умацаваць наш рух, умацоўваючы нашу прэсу»[116]. З мэтай інфармавання беларускай грамадскасці пра жыццё беларусаў Латвіі К. Езавітаў дасылаў весткі і матэрыялы пра мясцовыя падзеі ў рэдакцыі менскай «Беларускай газэты», беластоцкай «Новай дарогі», віленскага «Беларускага голасу»[117]. Асабліва плённым было супрацоўніцтва старшыні БА з берлінскай «Раніцай». На старонках апошняй прысутнічала сталая рубрыка «Беларускае жыццё ў Латвіі», якую вёў старшыня БА.

У ліпені 1942 года ў Рызе пачаў выходзіць ілюстраваны часопіс «Новы шлях», які быў адпаведнікам рускамоўнага «Новый путь» (выходзіў з канца 1941 года). Паводле аўтараў працы «Беларусь учора й сяньня», рэдактар-латыш Алэксандрс Анцэнс надаваў гэтаму выданню рускі кірунак, ігнаруючы беларускую тэматыку. Але дзякуючы захадам старшыні БА ўдалося дамагчыся змены выдання на беларускі лад[118]. Усяго ў 1942-1944 гадах пабачыла свет 46 нумароў «Новага шляху», на старонках якога друкаваліся артыкулы пра беларускую гісторыю і культуру, а таксама прапагандысцкія

[114] *Ibidem*, спр. 20, арк. 20.
[115] *Ibidem*, спр. 14, арк. 2.
[116] *Ibidem*, спр. 16, арк. 17.
[117] LVVA, P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 17 lp.
[118] Я. Найдзюк, І. Касяк, *Беларусь учора й сяньня*, Мінск 1993, с. 284.

матэрыялы. Галоўным рэдактарам быў Уладзімір Сядура, які прыехаў з Менска. Пасаду намесніка рэдактара з восені 1942 года займаў Алесь Салавей. Тэхнічнай працай займалася Ганна Бедарова[119]. У якасці карэктара-перакладчыка ў рэдакцыі працаваў Пятро Масальскі. У апошнія месяцы існавання часопіса працу карэктара выконваў таксама Уладзімір Брылеўскі[120]. З выданнем актыўна супрацоўнічаў К. Езавітаў, які быў аўтарам шэрагу артыкулаў. Ён жа распаўсюджваў часопіс сярод беларускай інтэлігенцыі ў Латвіі[121]. У жніўні 1942 годзе кіраўнік БА прасіў А. Махноўскага ініцыіраваць збор подпісаў ахвотных павялічыць колькасць беларускіх матэрыялаў на старонках выдання[122].

Варта адзначыць, што непасрэднае дачыненне да Латвіі мела таксама газета «Беларускае слова», якая афіцыйна выходзіла ў Віцебску, але друкавалася ў Даўгаўпілсе. Старшыня БА падтрымліваў шчыльныя сувязі з яе рэдактарам Пятром Шырокавым (творчы псеўданім Тодар Лебяда). Апошні прасіў К. Езавітава пра тэхнічную падтрымку выдання. На старонках газеты лідар латвійскіх беларусаў апублікаваў шэраг артыкулаў прысвечаных гісторыі беларускай і латышскай культур. Становішча газеты было незайздроснае, бо яна выходзіла ў зоне вайсковай адміністрацыі, а нямецкія армейскія колы не надавалі ёй вялікай увагі. Вось якім чынам тлумачыў сваю сітуацыю галоўны рэдактар у лісце да К. Езавітава (9 студзеня

---

[119] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 20 верасня, с. 3.

[120] Вось якім чынам пра ўмовы працы ў рэдакцыі часопіса прыгадвала Лёнгіна Брылеўская, якая падчас вайны апынулася ў Рызе і працавала ў друкарні, якая знаходзілася ў адным будынку з «Новым шляхам»: «Рэдакцыя „Новага шляху" месцілася ў адным з пакояў у гэтай самай друкарні „Рота". Пры адным стале сядзелі Салавей і Брылеўскі, побач – машыністка Брыкава з вельмі старой, як яна казала, машынай. Паміж ёю і дзвярыма ўціснуўся Масальскі. Сядура, хоць і быў галоўным рэдактарам, свайго стала не меў. Прыходзіў у рэдакцыю рэдка і псаваў усім кроў» (Л. Брылеўская, *Сьцежкі жыцьця* [у:] В. Адзінец, *Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў. Зборнік успамінаў*, Мінск 2007, с. 186).

[121] LVVA, P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 17 lp.

[122] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 12-13.

1944 года): «Да 1943 году, нягледзячы на тое, што Віцебск з'яўляецца горадам беларускім, за апошнія часы насколькі апанавала ў ім расейшчына, што газета „Беларускае слова", як бы з ласкі расейцаў, выходзіла два разы на месяц як дадатак да расейскай газеты „Новый путь" і мела фармат усяго на дзве балонкі. „Беларускае слова" не з'яўляецца такой самастойнай адзінкай, якая б была гаспадаром ва ўсіх сваіх справах. Мы ва ўсіх адносінах падпарадкоўваемся расейскаму выдавецтву „Новый путь", якім у сваю чаргу кіруе нямецкая вайсковая частка *Panzerfaust*, і трэба сказаць проста, што Panzerfaust цікавіцца толькі расейскім выданнем, а „Беларускае слова" ў іх на апошнім плане. Большага мы пакуль што патрабаваць не можам, а адказацца ад яе выдання тым больш не можна, бо гэтая справа лягчэй за ўсё. Пагэтаму прыходзіцца ў большай частцы шмат аб чым маўчаць, але затое – больш рабіць, з тым, каб усётакі людзі бачылі, што мы, беларусы, у канцы чаго-небудзь ды значым. […] Вас цікавіць пытанне – калі выйдзе першы нумар „Беларускага слова" ў Дзвінску. Адказваю, што, магчыма – ніколі, нягледзячы на тое, што мы яе друкуем ў Дзвінску з 22(42) нумару, але падпісваем і будзем падпісваць віцебскім выданнем. Гэта проста так робіцца з мэтаю чыста вайскова-прапагандоваю. Тут, мне здаецца, ні ў якім разе не павінна ўдарыць па амбіцыях тутэйшых беларусаў. Гэтая газета нашая ў першую чаргу таму, што яна – беларуская»[123].

Кіраўніцтва БА вяло ўласную выдавецкую работу. Перш за ўсё трэба было забяспечыць мясцовыя беларускія школы навучальнай літаратурай. К. Езавітаў цудоўна ўсведамляў важнасць друкаванага слова ў распаўсюджванні нацыянальнай культуры сярод насельніцтва. Па камерцыйных прычынах ён вырашыў надаць перавагу музычнай прадукцыі. З лістапада 1942 да мая 1943 года К. Езавітаву ўдалося выдаць ў Рызе 12 беларускіх народных песень і рамансаў з нотамі і два зборнікі. Тыраж выданняў вагаўся паміж адной-дзвюма

[123] *Ibidem,* спр. 37, арк. 20–20 адв.

тысячамі экзэмпляраў[124]. Плённым было супрацоўніцтва К. Езавітава з менскімі кампазітарамі Аляксеем Туранковым, Аляксандрам Спаскім, Рыгорам Самохіным, М. Зінчуком[125]. Выданнем музычнай літаратуры К. Езавітаў разлічваў дасягнуць некалькі мэт: пашырыць сярод насельніцтва веды пра беларускую музычную творчасць, а таксама грашыма падтрымаць яе стваральнікаў. Неабходна адзначыць, што за кожнае выданне К. Езавітаў выплачваў кампазітару ганарар у памеры 70 марак. У красавіку 1943 года ў лісце да А. Махноўскага ён пісаў: «Дужа прашу праціснуць у продаж беларускія рамансы, бо маю намер выдрукаваць зборнік нотаў, а для гэтага патрэбна, каб рамансы разышліся. Патрэбна і нашых кампазітараў падтрымліваць і заахвоціць да далейшай працы, бо ўсе яны ў дужа цяжкім матэр'яльным стане. Калі мы не будзем друкаваць іхніх рамансаў і іхных твораў, дык яны не будуць працаваць над беларускай песняй і музыкай. А гэта знача, што ніколі не зможам развіваць сваю музыкальную культуру. Трэба вучыць нотаў і вучняў старэйшых класаў і гімназістаў, каб яны ўмелі спяваць беларускія рамансы. Бо для каго ж тады кампазітарам пісаць, калі беларуская інтэлігенцыя не будзе ні нотаў купляць, ні спяваць сваіх рамансаў»[126].

Нягледзячы, аднак, на станоўчыя водгукі рэцэнзентаў і насуперак спадзяванням выдаўца попыт на музычную прадукцыю быў нязначны, што потым абумовіла спыненне яе далейшага выдання. Прадукцыя не карысталася попытам сярод сялянства, якое складала асноўную частку беларускага грамадства. Такім чынам, друкаванай прадукцыяй магла зацікавіцца перш за ўсё беларуская інтэлігенцыя, якая была вельмі нешматлікая. Цяжкасці, звязаныя з распаўсюджваннем нот і рамансаў, яскрава адлюстроўвае перапіска паміж К. Езавітавым і беларускімі дзеячамі ў Латвіі. У ад-

[124] Ю. Туронак, *Беларуская кніга пад нямецкім кантролем* [у:] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі,* Vilnius 2006, с. 343.

[125] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 18.

[126] LVVA, P-712 f., 1 apr., 4 lieta, 36 lp.

ным з лістоў (14 студзеня 1943 года) С. Сахараў пісаў: «З нотамі – справа няважная. Ніхто не купляе. Возьме толькі вучыцельства. А гэта мала. Усе кажуць, каб быў выпушчан „Беларускі народны спеўнік", дык была-бы лепш. А то рамансы, асабліва на вёску, мала падыходзюць. І праўда, папулярны спеўнік быў бы многа карысней для справы»[127]. У іншым лісце С. Сахарава чытаем: «З рамансамі – хужэй справа. На вёсцы ніхто не бярэ. Я Вам ужо паслаў назад ноты і грошы за праданыя экзэмпляры»[128].

Выдавецкая праца не належала да лёгкіх. На працягу ўсёй сваёй выдавецкай працы К. Езавітаў адчуваў брак не толькі сродкаў, але і адпаведных матэрыялаў, неабходных для друку[129]. Каб вырашыць тэхнічныя праблемы, выдавец быў вымушаны шукаць ратунку за межамі Латвіі. Вядома, што на дапамогу К. Езавітаву прыйшоў М. Абрамчык, які ўвесну 1943 года выслаў у Рыгу пэўную колькасць літаграфічнай паперы[130]. Нягледзячы на вышэйзгаданыя складанасці, выдавецкая праца не спынілася ажно да канца нямецкай акупацыі. У сярэдзіне 1943 года выйшаў «Статут Беларускага аб'яднаньня ў Латвіі». У маі 1944 года пабачыла свет кніга для дзяцей «Камарочак» (з ілюстрацыямі Аляксандры Бяльцовай). Аднак многім выдавецкім праектам не было наканавана ажыццявіцца. Не выйшаў беларуска-нямецкі слоўнік, які ўлетку 1942 года апрацаваў К. Езавітаў разам з П. Бруноўскім і П. Масальскім. Не быў выдадзены зборнік народнай творчасці пад рэдакцыяй С. Сахарава[131]. У планах старшыні БА было выданне альбома слуцкіх паясоў. З гэтай мэтай выдавец нават звяртаўся да Усевалада Боева і Клаўдыюша Дуж-Душэўскага з просьбай намаляваць слуцкія паясы, якія знаходзіліся ў гарадскім музеі ў Каўнасе[132]. У маі 1942 года

[127] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 35, арк. 20.
[128] *Ibidem*, арк. 32 адв.
[129] *Ibidem*, спр. 18, арк. 8.
[130] *Ibidem*, спр. 22, арк. 14.
[131] Ю. Туронак, *op. cit.*, с. 342–344.
[132] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 13, арк. 1–2; спр. 14, арк. 9.

С. Сахараў прапаноўваў К. Езавітаву падрыхтаваць беларускі літаратурны альманах з папулярнымі народнымі песнямі. Беларускі дзеяч бачыў таксама патрэбу выдання «Беларускага календара на 1943 год», паколькі «ў Індраўскім раёне пашыраўся і пашыраецца расейскі каляндар „Новая Европа"»[133]. Аднак рэалізацыя гэтых праектаў таксама аказалася не пад сілу латвійскім беларусам. Асноўнай прычынай сціплых вынікаў кнігавыдавецкай працы была адсутнасць адпаведных сродкаў[134].

Беларуска-латышскія, беларуска-польскія і беларуска-рускія адносіны

Кіраўніцтва БА рабіла захады ў кірунку перадачы беларусам мясцовага самакіравання ў валасцях, дзе яны складалі большасць насельніцтва. Перш за ўсё гаворка ішла пра Піедруйскую, Пасіенскую, Пустынскую і Скайнецкую воласці[135]. 30 студзеня 1943 года зілупскі аддзел БА прыняў рашэнне хадайнічаць перад немцамі аб прызначэнні селяніна Язэпа Мяжыцкага на пасаду кіраўніка Пасіенскай воласці, дзе беларусы складалі 93% жыхароў. Вышэйзгаданы кандыдат быў сябрам валасной управы і старшынёй Зілупскага судова-ашчаднага таварыства[136]. У звароце да даўгаўпілскага гебітскамісара падчас урачыстага закрыцця настаўніцкіх курсаў у Індры 23 жніўня 1943 года С. Сахараў адзначаў: «Апроч нацыянальна-культурнай працы па выхаванню і навучанню маладога пакалення ў духу Новай Еўропы беларускае жыхарства Латвіі жадае таксама прыняць актыўны ўдзел у грамадскай працы – у мясцовых валасных самаўрадах, дзяржаўных мясцовых установах і кааператывах там, дзе яно з'яўляецца ў роўным і большым ліку. Беларускае

[133] *Ibidem*, спр. 35, арк. 10 адв.
[134] Ю. Туронак, *op. cit.*, с. 342–344.
[135] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 129, арк. 23.
[136] *Ibidem*, спр. 104, арк. 16.

жыхарства спадзяецца, што і гэта яго справядлівае паданне будзе Вамі падтрымана і праведзена ў жыццё. Беларусы Латгаліі, жывучы бок о бок з латышскім жыхарствам, пераняслі тут шмат крыўдаў, перацярпелі многа ўціскаў, увесь час былі пад тымі ці іншымі чужацкімі ўплывамі. І нягледзячы на ўсе гэтыя многавяковыя ўдары латгальскі беларус збярог свой нацыянальны твар, свой быт і сваю мову. Аб гэтым яскрава сведчыць багацце народнай творчасці латгальскага беларуса. Беларусы ў мінулым многа перацярпелі, многа перажылі ўціску, але самі нікога і ніколі не ўціскалі. […] І цяпер, калі пад кіраўніцтвам нямецкага народу будуецца Новая Еўропа на началах права, справядлівасці і цеснага супрацоўніцтва ўсіх народаў, беларусы з асабліваю радасцю і натхненнем прыймаюць удзел у гэтай гіганцкай працы, як зарукі агульнага чалавечага шчасця»[137].

Уключэнне сваіх прадстаўнікоў у органы мясцовага самакіравання для беларусаў аказалася справай вельмі цяжкай. Беларускі бок вінаваціў у гэтым латышскую грамадзянскую адміністрацыю. У рэчаіснасці сярод беларусаў не хапала кандыдатаў, здольных да працы ў самакіраванні. Акрамя гэтага, існавала канкурэнцыя з боку рускіх дзеячаў, якія былі значна лепш падрыхтаваны да барацьбы за месцы ў самакіраванні. 25 лютага 1944 года С. Сахараў пісаў К. Езавітаву, што даўгаўпілскі гебітскамісар не лічыцца з правамі беларусаў, таму даручыў абарону інтарэсаў беларускага насельніцтва рускім прадстаўнікам. Беларускі дзеяч наракаў, што гебітскамісар правёў нараду з рускімі, на якую нават не запрасіў беларусаў. Адначасова С. Сахараў адзначаў, што «наша беларуская грамада інертная. Зараз да агульна-грамадскіх спраў у звязку з вайсковымі абставінамі і дзейнасці ніякай не праяўляе. […] Цяпер жа расейскія прадстаўнікі складаюць спіскі кандыдатаў у валасныя самаўрады. Таксама ад беларускага жыхарства нікога не запрашаюць. Самая ж галоўная бяда, што ў нас німа ў Зілупскім раёне дзейнай асобы сярод беларусаў. Адзіны чалавек – гэта Бр. Юрэвіч, якога і патрэбна

[137] *Ibidem*, спр. 35, арк. 13 адв.–14.

зацвердзіць цераз гебіткамісара, як афіцыйнага прадстаўніка ад беларускага жыхарства па Люцынскаму пав.»[138]. 25 лютага 1944 года зілупскі аддзел БА звярнуўся ў цэнтральную ўправу з просьбай аб зацвярджэнні кандыдатуры Браніслава Юрэвіча як прадстаўніка беларусаў з-пад Лудзы пры даўгаўпілскім гебітскамісары[139].

Адной з галоўных праблем, з якой мусілі змагацца мясцовыя беларускія дзеячы, быў нізкі ўзровень нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларускамоўнага латгальскага насельніцтва. Па-ранейшаму нацыянальная самасвядомасць значнай часткі мясцовага сялянства вагалася паміж беларускасцю, польскасцю, латышскасцю/латгальскасцю, рускасцю і тутэйшасцю. У залежнасці ад знешніх фактараў малаадукаваныя сяляне нярэдка змянялі сваю нацыянальнасць. Палітычная кан'юнктура ў гады нямецкай акупацыі ў значнай ступені спрыяла дэкларованню сябе беларусамі. Гэта было магчыма перш за ўсё за кошт тых, хто раней лічыў сябе палякамі. Справа ў тым, што палякаў, у адрозненне ад беларусаў, акупанты пазбавілі магчымасці культурна-асветнай аўтаноміі. Гэта акалічнасць у пэўнай ступені паўплывала на выбар нацыянальнасці беларускамоўнымі каталікамі. Начальнік павятовай паліцыі Ілукстэ Пэтэрыс Пупуоліс прыгадваў, што ў ваколіцах Грывы, якая ў даваенны час адзначалася прысутнасцю вялікай колькасці польскага насельніцтва, з пачаткам нямецкай акупацыі палякі зніклі, бо ўсе запісаліся беларусамі. Праз адсутнасць польскіх школ здаралася, што нават свядомыя бацькі-палякі былі вымушаны пасылаць сваіх дзяцей у беларускія школы[140]. Вось якім чынам ацэньваў настроі мясцовага насельніцтва Яўген Красневіч, кіраўнік аддзела БНК у Краславе: «Частка беларусаў, якая да гэтага часу лічылася палякамі, у рэшце рэшт апамятавалася і пачала пераконвацца, што яны запраўды ёсць беларусамі і што да гэтага часу пад рознымі ўплы-

[138] *Ibidem*, арк. 35–35 адв.
[139] *Ibidem*, спр. 51, арк. 55–55 адв.
[140] Э. Екабсонс*, op. cit.*, с. 204–205.

вамі былі ў няведанні сваёй сапраўднай нацыянальнасці. Штодня лік вучняў прыбывае, што з'яўляецца вынікам беларускага руху ў агульнай арганізацыяй беларускіх школ»[141].

Падчас працы сярод мясцовага насельніцтва беларускія дзеячы мусілі лічыцца з канкурэнцыяй з боку рускага руху. Як вядома, у міжваеннай Латвіі рускія былі найбольш шматлікай нацыянальнай меншасцю. З надыходам немцаў мясцовыя рускія дзеячы апынуліся ў такой жа сітуацыі, як і беларускія. Сярод прадстаўнікоў рускіх інтэлектуалаў Латвіі назіраліся антысавецкія настроі, якія ў сваіх палітычных мэтах спрабавала выкарыстаць Германія. У Генеральнай акрузе «Латвія» пачаў дзейнасць Рускі камітэт, які праводзіў арганізацыйную і культурна-асветную працу сярод мясцовага насельніцтва. Адносіны беларускіх дзеячаў з прадстаўнікамі мясцовай рускай супольнасці па-ранейшаму былі напружаныя. Праявы непаразуменняў і канфліктных сітуацый назіраліся падчас стварэння і дзейнасці беларускіх і рускіх школ. У найбольшай ступені беларуска-рускае саперніцтва «за сэрцы і душы» мясцовых жыхароў праявілася ў Латгаліі. Справа тычылася як праваслаўных, так і каталікоў, якія ва ўмовах дыскрымінацыі палякаў маглі выбіраць паміж беларусамі і рускімі. Акрамя таго, К. Езавітаў зрабіў спробу перацягнуць на свой бок частку латгальскіх стараверaў, якія дасюль лічыліся нязломным апірышчам мясцовага рускага руху. Выкарыстоўваючы асабістыя знаёмствы з некаторымі лідарамі стараверaў, беларускі дзеяч разлічваў зацікавіць іх удзелам у беларускім жыцці[142]. У лістападзе 1941 года ён звярнуўся да адной з кіраўніц стараверaў Марыі Фаміной з прапановай гуртавацца вакол беларускай нацыянальнай ідэі. Беларускі дзеяч схіляў стараверaў да прызнання сябе беларусамі і далучэння да беларускай работы. Ён сцвярджаў, што ва ўмовах вайны стараверы павінны далучыцца да беларусаў, бо ў адваротным выпадку іх чакае пе-

[141] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 32, арк. 13 адв.–14.
[142] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 205.

расяленне ў Расію[143]. Сваімі думкамі старшыня БНК падзяліўся з А. Махноўскім, якога заахвочваў да пошуку супрацоўніцтва з кіраўнікамі стараверaў: «Калі-б прыцягнуць яе (Фаміну. – *Ю. Г.*) ды Васільева, ды Баложных на наш бок, дык Ваша становішча адразу ўмацавалася б на многа разоў, то аб'яднанне каля беларусаў нашых праваслаўных, каталікоў і стараабрадцаў адразу адчыніла б перад нашым адраджэнскім рухам у Латгаліі надзвычайна шырокія перспектывы. […] Зара мы маемо большасць у шэрагах валасцей, а калі б нашы ўсе каталікі, нашы стараабрадцы былі б усвядомлены, дык лічба гэтых валасцей патроілася бы! А гэта надзвычай важна для нашага руху!»[144].

Няма падстаў сцвярджаць, што заклік К. Езавітава знайшоў разуменне сярод шырокіх мас стараверaў, але ўсё ж здараліся адзінкавыя выпадкі далучэння стараверaў да беларускай грамады.

---

[143] У лісце да М. Фаміной К. Езавітаў пісаў: «Хотя нашему латгальскому старообядчеству некоторые его деятели усиленно внушали последних 25–30 лет о том, что латгальские старообрядцы являются будто бы великороссами – это неверно, по крайней мере неверно по отношению к четырем пятым старообрядчества Латгалии. […] О том, что старообрядцы являются белорусами, ярко свидетельствует их язык, сохранивший все белорусские особенности, а также, еще в большой мере, обычаи, песни и танцы. […] Теперь, когда перекраивается карта Европы и когда латгальские белорусы-православные и белорусы-католики объединяются (не религиозно, а только национально), надо и белорусам-старообрядцам наконец стать ближе к своему родному белорусскому народу и вместе взяться за строительство своей культуры, экономики и вообще национальной жизни. Хочу предупредить и обратить внимание на то, что теперь будет проводиться, через известное, конечно, время, принцип населения известных территорий только народонаселения одной национальности. А это может означать для тех старообрядцев, что пожелают перейти к великороссам, переселение в Великороссию. […] Немцы к белорусам относятся хорошо и идут навстречу белорусским национальным начинаниям. Давайте же, дорогие кривичи, начнем новую жизнь и приступим к совместной дружной работе» (LVVA, P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 1–2 lp.).

[144] Цыт. паводле: Ю. Грыбоўскі, *З гісторыі беларускага руху ў Латвіі ў міжваенны й ваенны пэрыяд,* «Запісы Беларускага інстытуту навукі й мастацтва» 2016, т. 38, с. 479.

У даўгаўпілскі аддзел БНК звярнуўся настаўнік-старавер Купалаў, які цікавіўся беларускай працай. К. Езавітаў раіў А. Махноўскаму не пакідаць яго па-за ўвагай. 10 лістапада 1941 года старшыня БНК пісаў да А. Махноўскага: «Зараз жа выклічце яго і вазьміце ад яго заяву ў Рыжскі камітэт, а таксама заяву аб тым, што ён лічыць сябе крывічом-беларусам і жадае прымаць удзел у беларускай нацыянальна-адраджэнскай працы. […] Сяляне павінны падаць заявы, што лічаць сябе беларусамі і жадаюць дзяцей сваіх вучыць у беларускай школе на роднай беларускай мове. У школу тую трэба даць выкладчыка беларускай мовы, і сам Купалаў павінен зараз жа пачаць яе вучыць. Лягчэй будзе і вучням, і вучыцялём вучыць мову беларускую, чым латышскую! Гэта ўсім ясна»[145]. Беларуска-рускія супярэчнасці не страцілі сваёй актуальнасці ажно да канца нямецкай акупацыі. У чэрвені 1943 года К. Езавітаў заклікаў А. Махноўскага актывізаваць беларускую працу на месцах у сувязі з узмацненнем рускай актыўнасці[146]. У 1944 годзе ў Латвіі быў створаны Рускі камітэт, які дзякуючы рэйхскамісару пачаў праводзіць сярод латгальскага беларускага насельніцтва прапагандысцкую работу[147].

Падзея, якой дзеячы БА надавалі значную ўвагу, быў усеагульны перапіс насельніцтва ў Генеральнай акрузе «Латвія», які адбыўся 24 лютага 1943 года. Беларускі актыў рыхтаваўся да гэтага мерапрыемства і намагаўся мабілізаваць свае сілы на месцах, каб вынікі былі як мага больш карысныя для беларусаў. З мэтай заахвочвання насельніцтва да дэкларавання беларускай нацыянальнасці БА планавала выкарыстаць культурную дзейнасць. Так, К. Езавітаў прапанаваў арганізаваць напярэдадні перапісу гастролі па латгальскіх мясцовасцях М. Забэйды-Суміцкага[148]. Тым часам С. Сахараў у лісце (21 студзеня 1943 года) да К. Езавітава інфармаваў, што

[145] LVVA, P-712 f., 1 apr., 6 lieta, 4 lp.
[146] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 9.
[147] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 222.
[148] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 12, арк. 3.

зілупскі аддзел БА рыхтуецца арганізаваць для насельніцтва два спектаклі – у Зілупэ (14 лютага) і Пасіенэ (21 лютага). Акрамя таго, кіраўнік аддзела ў Зілупэ прапанаваў, каб цэнтральная ўправа БА выдала адмысловую адозву да латвійскіх беларусаў з заклікам запісвацца падчас перапісу беларусамі[149]. К. Езавітаў апублікаваў на старонках берлінскай газеты «Раніца» артыкул, прысвечаны перапісу, у якім заклікаў беларускае насельніцтва не цурацца сваёй нацыянальнасці: «Дзеля таго, што падчас шэрагу папярэдніх перапісаў былі ў некаторых перапішчыкаў спробы няправільна запісваць беларусаў у лік іншых нацыянальнасцяў, дык зараз кажны беларус павінен рашуча дамагацца, каб ён быў бы абавязкова запісаны беларусам, бо гэта мае надзвычайна важнае значэнне для нашага народу наагул, а таксама і для кажнага паасобнага беларускага грамадзяніна ў Латвіі»[150].

Беларускія дзеячы асцерагаліся, што вынікі перапісу могуць быць сфальсіфікаваны латышамі, таму рупіліся пра ўключэнне беларусаў у склад падліковых камісій[151]. Насцярожанасць беларускага дзеяча была небеспадстаўная. У многіх мясцовасцях прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі сапраўды не трапілі ў склад падліковых камісій. Кіраўнік аддзела БА ў Краславе ў лісце да кіраўніцтва даўгаўпілскага аддзела ў лютым 1943 года жаліўся на дзейнасць валасных упраў, якія насуперак загаду нямецкіх улад свядома не ўключылі ніводнага беларуса ў склад перапісчыкаў і сяброў валасной падліковай камісіі. Падобная сітуацыя склалася ў воласці Скайста. Кіраўнік беларускай школы ў Калніешы ў лісце да кіраўніцтва БА пісаў: «Беларуская інтэлігенцыя воласці заўсёды актыўна ўдзельнічала ў новай дзяржаўнай аднаўленчай працы – зборы ахвяраванняў і прамысловай сыравіны, у падліку скаціны і г. д. Відаць, што праца нашага невялікага беларускага народу, што жыве ў Латвійскай гене-

[149] *Ibidem*, спр. 35, арк. 27.

[150] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1943, 31 студзеня, с. 3.

[151] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 33, арк. 19.

ральнай акрузе, была святой і неабходнай для дабрабыту радзімы. Цяпер, калі набліжаецца важны момант для кожнага народу, мы, беларусы, застаёмся адхіленымі ад народных і ўсеагульных інтарэсаў. Дзеянні валаснога праўлення закранаюць нацыянальныя правы беларускага народа, што не вядзе да агульнай мэты, а стварае разлом і ўзаемную нянавісць народаў»[152]. Тым часам настаўнік І. Блажэвіч пісаў наступнае: «Усенародная перапісь у нас прайшла зусім ціха: не кранаючы беларускай інтэлігенцыі. Беларусамі запісалася шмат, але ці ўсе яны выйдуць з рук камісіяў, то гэта невядома, бо ні адзін беларус у камісіі не быў»[153]. У пачатку 1943 года К. Езавітаў і А. Махноўскі падрыхтавалі памятную запіску да генеральнага камісара ў Рызе і даўгаўпілскага гебітскамісара, у якой прасілі нямецкіх чыноўнікаў, каб яны не разглядалі вынікі перапісу як канчатковыя, «калі зноў „не будзе беларусаў”»[154].

Нягледзячы на ўсе перасцярогі беларусаў, агульны вынік перапісу не выглядаў для іх кепска. З перапісу вынікала, што ў Генеральнай акрузе «Латвія» пражываў 48 601 беларус (2,76% ад усяго насельніцтва). З гэтага ліку ў Рызе жылі 6 669 чалавек, а рэшта пераважна ў Латгаліі. Сярод тых, хто запісаўся беларусам, былі як аўтахтоны з Латгаліі, так і ваенныя ўцекачы з Беларусі і даваенныя польскія грамадзяне, якія прыехалі ў Латвію ў якасці сельскагаспадарчых сезонных рабочых. Больш за 21 тысячу жыхароў, якія дэкларавалі прыналежнасць да беларускай нацыянальнасці, у штодзённым жыцці карысталіся рускай мовай[155]. Перапіс паказаў, што колькасць латвійскіх беларусаў істотна не змянілася ў параўнанні з даваенным перыядам і больш-менш адпавядала іх колькаснаму складу ў другой палове 1920-х гадоў. Праз адсутнасць больш падрабязных звестак цяжка цяпер адказаць на пытанне пра тое, колькі

[152] Э. Екабсонс, *op. cit*., с. 220–222.
[153] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 29, арк. 30.
[154] *Ibidem*, спр. 16, арк. 5.
[155] Э. Екабсонс*, op. cit.,* с. 204.

перапісаных адчувалі сябе беларусамі, а колькі заявілі пра беларускую нацыянальнасць кіруючыся практычнымі матывамі.

Да пытання пра ўдзел беларусаў у нямецкіх і латышскіх вайсковых фарміраваннях

У навуковай літаратуры можна сустрэць меркаванне, што БА выконвала задачы нямецкіх улад па стварэнні з беларускага насельніцтва ахоўных і карных батальёнаў для барацьбы з партызанамі[156]. Гэтае пытанне патрабуе больш дэталёвага разгляду. Вядома, што на абшары акупіраванай Латвіі адбывалася фарміраванне вайскова-паліцэйскіх часцей, якія складаліся з мясцовага насельніцтва. Галоўным чынам гаворка ідзе пра мясцовую дапаможную паліцыю (шума-батальёны). У сувязі з гэтым варта звярнуць увагу на стаўленне беларускіх дзеячаў да ўдзелу беларусаў у латышскіх вайскова-паліцэйскіх фарміраваннях пад нямецкім камандаваннем. Кіраўніцтва БА імкнулася прадухіліць запіс беларускіх юнакоў у адзінкі, якія складаліся з латышоў. У 1942–1944 гадах кіраўніцтва БА неаднаразова спрабавала атрымаць дазвол ад нямецкіх улад на фарміраванне беларускіх узброеных часцей[157]. 27 мая 1943 года К. Езавітаў прапанаваў кіраўнікам усіх аддзелаў БА абмеркаваць магчымасць стварэння беларускіх ахоўных рот і батальёнаў, каб беларуская моладзь не прызывалася ў латышскія вайсковыя і вайскова-паліцэйскія фарміраванні[158]. Старшыня БА лічыў, што адсутнасць беларускай самааховы робіць безабаронным беларускае насельніцтва перад нападамі савецкіх партызан[159].

---

[156] С. Раўнейка, *Канстанцін Езавітаў: дзейнасць у гады вайны* [у:] *Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца). Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 25–27 красавіка 2002 г.,* рэд. К. Козак, А. Літвін, У. Сідарцоў, Мінск 2003, с. 135.

[157] А. Соловьев, *op. cit.*, с. 155.

[158] Э. Екабсонс, *op. cit.*, с. 217–218.

[159] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 16, арк. 7.

Аднак планам кіраўніка БА не было наканавана ажыццявіцца, а замест гэтага працягваўся прызыў і мабілізацыя беларускіх юнакоў у склад латышскіх фарміраванняў. Гэты працэс узмацніўся асабліва ў 1943 годзе, калі немцам спатрэбілася больш салдат на савецкім фронце. У пачатку 1943 года пачалося стварэнне Латышскага легіёна СС, куды трапіла нямала беларусаў. Вядомыя прозвішчы некаторых легіянераў-беларусаў, якія бралі ўдзел у баях з Чырвонай Арміяй. Некаторыя з іх загінулі на фронце[160]. Частка латгальскіх беларусаў трапіла ў пагранічную варту і дапаможныя аддзелы люфтвафэ[161].

Апека Беларускага аб'яднання над бежанцамі і остарбайтарамі

Пачынаючы з 1943 года кіраўніцтва БА сутыкнулася з яшчэ адной праблемай. У гэты час шалі вайны цалкам схіліліся на карысць антыгітлераўскай кааліцыі, а нямецка-савецкі фронт няўхільна рухаўся на захад. На тэрыторыю Латвіі была эвакуіравана частка

[160] Э. Екабсонс, *op. cit*., с. 217–218.

[161] Цікавае сведчанне пра службу латгальскіх беларусаў у латышскіх фарміраваннях пад нямецкім камандаваннем захавалася ва ўспамінах Юрыя Туронка, які тады вучыўся ў гімназіі ў Вільні, але летнія канікулы бавіў у родных Дукштах. З беларускімі легіянерамі ён сутыкнуўся ўлетку 1944 года: «У Дукштах пакуль што ўсё выглядала па-старому. Адзінай заўважнай навіной была *Flugwache* – авіяцыйны пост, які месціўся ў занятай палове нашага дома. […] Авіяцыйны пост абслугоўвалі два немцы і чатыры латышы. Сценкі паміж пакоямі ў нашым доме былі тонкія, і я чуў і здзіўляўся, чаму гэтыя „латышы" гавораць паміж сабой і спяваюць па-беларуску. Хутка аказалася, што гэта былі беларусы з Латвіі, Пецька Кузьміцкі і Камароўскі. 29 чэрвеня Пецька Кузьміцкі і сапраўдны латыш Паўль Сляўцітайс спраўлялі свае імяніны і, відаць, добра выпілі. Было цёплае, прыемнае надвор'е, мы сядзелі на падворку і бачылі, як Пецька Кузьміцкі ва ўніформе Люфтвафэ, з вінтоўкай ішоў п'яны на варту і спяваў: „С нами Сталин родной, он железной рукой" і г. д. (словы з папулярнай тады песні „Если завтра война"). Уражанне было надзвычайнае, незабыўнае» (Ю. Туронак, *За кардонам Бацькаўшчыны. Успаміны,* Мінск 2010, с. 60–62).

жыхароў усходняй Беларусі. БА павінна было заняцца апекай над бежанцамі. У 1943 годзе ў Рыгу прыбыла група дзяцей з усходняй Беларусі, для якіх дзеячы БА спрабавалі стварыць прытулкі ў Латгаліі (Даўгаўпілс, Лудза)[162]. Таксама на тэрыторыі Латвіі знаходзіліся жыхары Беларусі, якіх немцы вывезлі ў працоўныя лагеры. У гэты час кіраўнік БА разглядаў шматлікія заявы ад сваякоў беларусаў, якіх у 1943 годзе немцы вывезлі ў Эстонію і Ленінградскую вобласць, а потым яны апынуліся ў Латвіі. Гэтыя людзі прасілі дапамагчы іх родным вярнуцца дахаты. Заяў было настолькі шмат, што на старонках віленскай газеты «Беларускі голас» К. Езавітаў мусіў нават змясціць нататку пра тое, каб беларусы звярталіся перш за ўсё ў мясцовыя аддзелы БА, а не ў цэнтральную ўправу[163].

6 мая 1944 года жыхарка Дунілавіч Алена Вяжбіцкая звярнулася да кіраўніцтва БА з наступнай просьбай: «Вельмі прашу Беларускае Народнае Прадстаўніцтва аб хадатаянні перад нямецкімі ўладамі, штобы таковыя асвабадзілі маяго мужа Антона Вежбіцкага, якій был узяты на работу дня 1.X.1943 г. у Дунілавічах. Цяпер ён находзіцца на робоце ў Дундаге-Латвія, в рабочым лагеры № 00386/a. Дома я засталася адна з 2 маленькімі рабятамі, маю 5 га зямлі і маленькую гаспадарку, надышла вясна і нада рабіць на зямлі, у мяне нікога няма да помачы у працы на ролі. Пагэтаму вельмі прашу Вас не адказаць у маёй просьбе і пастарацца ў кіраўніцтва рабочага лагера аб звальненні маяго мужа дамой на польныя работы, без яго ў нас цяпер гаспадарка прападзець і зямля астанецца без абработкі, што пацянець за сабой голад усей сям'і. Пры гэтым далучаю пасведчанне раёну Варапаева аб маём муже, што ён ёсць парадачны чалавек і не з'яўляецца ані бандытам, ані якім благім чалавекам»[164].

У гэтых абставінах беларускі актыў быў вымушаны неяк рэагаваць. 30 мая 1944 года цэнтральная ўправа БА звярнулася да

[162] *Дзеці з Усходняй Беларусі ў Рызе,* «Раніца» 1943, 13 чэрвеня, с. 3.
[163] *Biełaruskaje życcio ŭ Łatvii,* „Biełaruski Hołas" 1943, 24 vieraśnia, s. 4.
[164] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 105, арк. 6.

прэзідэнта Беларускай цэнтральнай рады Радаслава Астроўскага, каб ён дапамог у вяртанні беларусаў з Латвіі на бацькаўшчыну або ў залічэнні іх у склад Беларускай краёвай абароны[165].

Адначасова кіраўніцтва БА цікавілася лёсам беларусаў з Латвіі, якія былі вывезены на прымусовую працу ў Германію. К. Езавітаў у лісце (18 чэрвеня 1943 года) да старшыні Беларускага камітэта самапомачы ў Берліне М. Абрамчыка інфармаваў, што ў Гамбургу і іншых нямецкіх гарадах знаходзіцца пэўная колькасць латвійскіх беларусаў. У сувязі з гэтым ён прасіў кіраўніка БКС паклапаціцца пра гэтых людзей і звяртаў увагу на тое, што сярод іх былі свядомыя беларусы, якія бралі ўдзел у нацыянальнай працы[166].

Кантакты з беларускімі асяродкамі ў іншых краінах

Беларускі рух у Латвіі ў 1941–1944 гадах не існаваў у ізаляцыі ад агульнабеларускага жыцця. Яго кіраўнікі падтрымлівалі кантакты з беларускімі асяродкамі ў іншых краінах акупіраванай немцамі Еўропы. У асноўным гэта адбывалася дзякуючы асабістаму знаёмству К. Езавітава з іншымі дзеячамі нацыянальнага руху, якія жылі ў Менску, Вільні, Каўнасе, Берліне, Празе і інш. Ён перапісваўся з Іванам Ермачэнкам, Янкам Станкевічам, Мікалаем Абрамчыкам, Мікалаем Шкялёнкам, Ларысай Геніюш, Эдвардам Будзькам, Язэпам Малецкім, Францішкам Аляхновічам, Аляксандрам Ружанцовым, Усеваладам Боевым і многімі іншымі. Лідар латвійскіх беларусаў неаднойчы наведваў Менск і Вільню. Паміж Рыгай, Вільняй і Менскам адбываўся абмен літаратурай[167]. Вільня была найбліжэйшым да Рыгі цэнтрам беларускага руху. Акрамя таго, Літва і Латвія былі часткамі адной акупацыйнай адміністрацыйнай адзінкі. З 1941 года дзейнічаў Беларускі нацыянальны камітэт у Генераль-

[165] Э. Екабсонс, *op. cit.,* с. 208–209.
[166] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 12, арк. 7.
[167] *Ibidem*, спр. 104, арк. 13–14.

най акрузе «Літва». Кіраўніцтва БА ў Рызе цікавілася справамі суайчыннікаў у Вільні, вопыт арганізацыйнай працы якіх быў запатрабаваны ў Латвіі[168]. Улетку 1942 года Рыгу наведалі ад імя віленскіх беларусаў Іван Анцукевіч, Часлаў Кукель і Эдвард Будзька[169].

Асаблівае значэнне мелі кантакты з менскім беларускім асяродкам. Як пісаў К. Езавітаў да І. Ермачэнкі, «мы ўсе тутака дужа цікавімся менскім жыццём і ўсе больш адчуваем з ім сувязь, хаця ж брак пачтовых зносін дае сябе адчуваць»[170]. Кіраўнік латвійскіх беларусаў атрымліваў прапановы пераезду ў Менск з мэтай заняцця там адказнай пасады. Так, у чэрвені 1942 года Язэп Найдзюк заахвочваў К. Езавітава да пераезду ў Менск, бо лічыў, што «трэба ўзмацняць цэнтр»[171]. Улетку 1942 года К. Езавітаў быў запрошаны старшынёй БНС Іванам Ермачэнкам да ўдзелу ў арганізацыі камандзірскай школы Беларускай самааховы. К. Езавітаў з энтузіязмам паставіўся да гэтай прапановы і нават пачаў шукаць адпаведныя вайсковыя кадры[172]. Нягледзячы, аднак, на спакусы выезду з Латвіі К. Езавітаў усё ж вырашыў застацца ў Рызе па прычыне таго, што латвійскія беларусы прасілі іх «не пакідаць»[173]. У снежні 1942 года Рыгу наведалі рэферэнт культуры БНС Іван Касяк і кіраўнік БНС Менскай акругі Юльян Саковіч, а таксама кіраўнік БНС у Глыбоцкай акрузе Іван Гінько[174]. Актыўнымі былі таксама кантакты з беларусамі Браслаўшчыны і Глыбоччыны. Галоўным чынам яны падтрымліваліся дзякуючы асабістаму знаёмству К. Езавітава з Аўгустам Дварэцкім, школьным інспектарам Браслаўскай акругі, і Сяргеем Кажаном, старшынёй БНС у Браслаўскай акрузе. У 1943 годзе старшыня БА выслаў у Браслаў частку тыражу падручніка

[168] *Ibidem*, спр. 15, арк. 22.
[169] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1942, 20 верасня, с. 3.
[170] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 14, арк. 11.
[171] *Ibidem*, спр. 34, арк. 14 адв.
[172] *Ibidem*, спр. 14, арк. 12; спр. 34, арк. 26; спр. 21, арк. 11–11 адв.
[173] Э. Екабсонс*, op. cit.,* с. 208.
[174] *Беларускае жыцьцё ў Латвіі,* «Раніца» 1943, 17 студзеня, с. 3.

«Беларуская школа» і іншую літаратуру. З Рыгі на Браслаўшчыну пры пасрэдніцтве аддзела БА ў Краславе дастаўлялі часопіс «Новы шлях», газеты «Раніца», «Новая дарога»[175]. У 1943 годзе А. Дварэцкі звярнуўся да кіраўніка БА з просьбай надрукаваць на патрэбы школ Браслаўшчыны падручнікі «Беларуская школа» (3 тыс. экз.) і «Задачнік» для першага і другога класаў (па 2 тыс. экз. кожнага)[176]. 25 чэрвеня 1942 года старшыня БА атрымаў ліст ад Л. Шантыра, настаўніка беларускай школы і кіраўніка аддзела БНС у Браслаўскай акрузе, у якім той прасіў К. Езавітава зрабіць адпаведныя захады, каб абмежаваць польскі ўплыў у гэтым рэгіёне (палякі панавалі ў мясцовай адміністрацыі)[177].

Апошнім акордам у гісторыі беларускага актыву ў Латвіі ў гады нямецкай акупацыі быў удзел чатырохасабовай дэлегацыі латвійскіх беларусаў у працы г.зв. II Усебеларускага кангрэса, які адбыўся ў Менску у чэрвені 1944 года.

***

Заняцце Чырвонай Арміяй большай часткі Латвіі летам – восенню 1944 года спыніла працу БА. Найбольш актыўныя дзеячы (К. Езавітаў, А. Махноўскі, П. Мірановіч) эмігрыравалі на захад. Далейшы лёс латвійскіх беларусаў заслугоўвае асобнага даследавання.

Падсумоўваючы, належыць адзначыць, што пад нямецкай акупацыяй у Латвіі адбылося ажыўленне мясцовага беларускага руху. Галоўным фактарам, які гэтаму спрыяў, была нацыянальная палітыка акупантаў. Кіруючыся халодным палітычным разлікам і жаданнем падначаліць сабе захопленыя землі, улады нацысцкай Германіі дазволілі пэўную культурна-асветную аўтаномію беларусаў. Галоўным ядром беларускага руху ў гэты час было Беларускае аб'яднанне

[175] НАРБ, ф. 458, воп. 1, спр. 14, арк. 4–5; спр. 15, арк. 1–3, 12; спр. 39, арк. 16, 20; спр. 41, арк. 4.

[176] *Ibidem*, спр. 31, арк. 16.

[177] *Ibidem*, спр. 37, арк. 12–12 адв.

ў Генеральнай акрузе «Латвія». Супрацоўніцтва беларускіх дзеячаў з нямецкімі акупантамі, з аднаго боку, абумоўлівалася агульнай сітуацыяй, у якой тады апынуўся беларускі нацыянальны рух, а з другога, было вынікам нацыянальнай палітыкі латвійскіх улад пасля 1934 года. Маштаб беларускай дзейнасці ў 1941–1944 гадах нічым не саступаў беларускай нацыянальнай актыўнасці ў Латвіі ў міжваенны час, а ў дачыненні да перыяду знаходжання краіны пад панаваннем аўтарытарнага рэжыму Улманіса, а потым пад савецкай акупацыяй быў значна большы. Бясспрэчна, што дасягненне гэтага было немагчыма без самаахвярнай і самаадданай працы мясцовага беларускага актыву. Асабліва належыць адзначыць ролю К. Езавітава. Цяжка, аднак, адназначна ацаніць вынікі і эфектыўнасць працы БА. Большасць беларускамоўнага насельніцтва Латгаліі, якое было адрасатам нацыянальнай агітацыі, захоўвала абыякавасць да актыўнай грамадскай дзейнасці. Ва ўмовах вайны і акупацыі беларускія дзеячы маглі ажыццяўляць «беларусізацыю» латгальскай вёскі з дазволу і пры падтрымцы акупантаў. У такіх абставінах цяжка было дасягнуць пажаданых вынікаў.

Архіўныя крыніцы

Archiwum Akt Nowych, sygn. T-454, 88.

Bundesarchiv Berlin–Lichterfelde-Ost. R6/159; R6/160; R 6/173; R 92/101.

Hoover Institution. Калекцыя К. Езавітава (апрацоўваецца).

Latvijas valsts vēstures arhīvs, P-712 f., 1 apr., 2-6 lieta.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 458, воп. 1, спр. 12–14, 16, 18, 20, 22–23, 29, 32–33, 35, 51, 56, 59, 104–105, 129.

Літаратура

Biełaruskaje życcio ŭ Łatvii, „Biełaruski Hołas" 1943, 24 vieraśnia.

Garbiński J., Turonek J., *Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słownik biograficzno-bibliograficzny,* Warszawa 2003.

Madajczyk Cz., *Faszyzm i okupacja 1938–1945. Wykonywanie okupacji przez państwa Osi w Europie*, t. 1, Poznań 1983.

Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1942, 15 лютага.

Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1942, 18 кастрычніка.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1942, 20 верасня.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1942, 25 снежня.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1942, 26 ліпеня.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1942, 29 сакавіка – 5 красавіка.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1943, 17 студзеня.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1943, 22 лютага.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1943, 25 ліпеня.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1943, 28 лютага.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1943, 31 студзеня.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1944, 2 красавіка.
Беларускае жыцьцё ў Латвіі, «Раніца» 1944, 9 студзеня.
Беларускае жыцьцё ў Лацьвіі, «Раніца» 1944, 21 мая.
Беларусы ў Латвіі, «Раніца» 1941, 20 лістапада.
Брылеўская Л., *Сьцежкі жыцьця* [у:] В. Адзінец, *Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў. Зборнік успамінаў*, Мінск 2007.
Грыбоўскі Ю., *З гісторыі беларускага руху ў Латвіі ў міжваенны й ваенны пэрыяд,* «Запісы Беларускага інстытуту навукі й мастацтва» 2016, т. 38.
Дзеці з Усходняй Беларусі ў Рызе, «Раніца» 1943, 13 чэрвеня.
Езавітаў К., *Кароткі жыцьцяпіс і праходжаньне службы* [у:] Л. Юрэвіч, *Беларуская мемуарыстыка на эміграцыі*, Мінск 2005.
Екабсонс Э., *Беларусы ў Латвіі ў часы савецкай і нямецка-фашысцкай акупацыі (1940–1945)*, «Беларускі гістарычны агляд» 2006, т. 13, сш. 2.
Крывіцкія руны. Вып. 2. *Беларускі культурны мацярык у Латвіі,* укл. М. Казлоўскі, С. Панізьнік, Мінск 2017.
Найдзюк Я., Касяк І., *Беларусь учора й сяньня*, Мінск 1993.
Раўнейка С., *Канстанцін Езавітаў: дзейнасць у гады вайны* [у:] *Генацыд у Другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца). Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 25–27 красавіка 2002 г.,* рэд. К. Козак, А. Літвін, У. Сідарцоў, Мінск 2003.
Соловьев А., *Белорусская центральная рада: создание, деятельность, крах,* Минск 1995.
Статут Беларускага аб'яднаньня (у ген. кам. Латвіі), «Раніца» 1942, 14 чэрвеня.
Туронак Ю., *Беларуская кніга пад нямецкім кантролем* [у:] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі,* Vilnius 2006.
Туронак Ю., *За кардонам Бацькаўшчыны. Успаміны,* Мінск 2010.
У Латвіі, «Новая Дарога» 1943, 19 верасня.

Establishment and activity of the Belarusian Association in the General District of Latvia (1941–1944)

As a result of the German army's offensive in the summer of 1941, Latvia was occupied by the Third Reich. The national structure of Latvia was characterized by diversity. Belarusians were among the most numerous minority groups. The German authorities, using the principle of „divide and rule", were willing to give Belarusians a certain cultural and educational autonomy. The local Belarusian intelligentsia saw in this a chance to strengthen their influence in Latgale, which was treated as part of the so-called Belarusian ethnographic area. In 1941, the Belarusian National Committee was established in Riga and Daugavpils (from the spring of 1942 – the Belarusian Association). The main activity of this organization was social and cultural-educational activity among the residents of Latvia. There were choirs and artistic groups, publishing and cultural-educational activities. In addition, attempts were made to introduce the Belarusian language to Catholic and Orthodox churches. The aim was to fill the civil administration and local governments at the lower and middle level in Latgale with people of Belarusian nationality. The organization of education in the mother language was started. Belarusian activism has caused concern among many Latvians, because the leaders of the Latvian Belarusians counted on the possibility of joining Latgale in the future to Belarus. For a number of reasons, the „Belarusian action" in Latvia under German occupation was not a major success.

K e y w o r d s : Latvia, Belarusians, World War II, occupation, collaboration

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.241-261

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190410

Data przesłania: 02.04.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

Андрей Зинкевич
Universität Wien
andrej.zinkevich@univie.ac.at
ORCiD: 0000-0001-7677-4828

Языковая идентичность фольксдойче в оккупированных Польше, Белоруссии и на Украине

Językowa tożsamość volksdeutschy w okupowanych Polsce, na Białorusi i Ukrainie

Volksdeutsche, czyli Niemcy mieszkający poza Rzeszą, zajmowali kluczowe miejsce w planach narodowosocjalistycznych przywódców w zakresie organizacji zarządzania okupowanymi obszarami na Wschodzie. Stanowili oni główną ludzką rezerwę dla germanizacji Polski i niektórych obszarów ZSRR. Podstawowym zadaniem władz III Rzeszy było uczynienie z wielokulturowego i wielojęzycznego kontyngentu volksdeutschów jednolitej językowo i ideologicznie ludzkiej masy spełniającej standardy właściwe ludności „starej" Rzeszy. Poziom znajomości języka niemieckiego odegrał ważną rolę w określeniu statusu volksdeutschy w nowej sytuacji społecznej, a ich dwujęzyczność uczyniła z nich ważne ogniwo w pośrednictwie między władzami okupacyjnymi a lokalną ludnością na okupowanych terenach.

Słowa kluczowe: polityka językowa, okupacja, volksdeutsche, Trzecia Rzesza

Среди литературы о фольксдойче совсем немного источников, посвященных языковой проблематике немцев, живших на оккупированных территориях во время Второй мировой войны. Как известно, определение «немцы» в отношении фольксдойче несколько

условно. Этим термином мог обозначаться широкий круг лиц, имеющих какое-либо отношение к немецкому населению вне границ рейха: от собственно немцев, очутившихся за пределами Германии после Первой мировой войны, до потомков «екатерининских» немцев, потерявших связь с исторической родиной еще в XVIII веке; от немцев, сохранивших свой язык в качестве родного, до таких, которые не знали ни слова по-немецки. В статье мы попытаемся показать, как работа новых властей по языковой адаптации фольксдойче на территории оккупированных Польши, Украины и Белоруссии представлена в прессе и документах того времени, а также в научных исследованиях, посвященных периоду оккупации.

Философия стратификации населения по национальному признаку, характерная для национал-социалистической идеологии, применялась оккупационными властями и для немцев вне рейха. Как известно, внутри этой группы было выделено четыре категории фольксдойче, находившихся между собой в иерархических отношениях: от самой «ценной» первой категории (собственно фольксдойче – активисты немецкого движения за границами рейха) до «проблемной» четвертой (т. н. *Rückgedeutsche* – ассимилированные немцы, представители властей своих стран).

Кроме критерия политической активности, важную роль в отнесении к той или иной категории фольксдойче играл немецкий язык. Так, для первой категории (собственно фольксдойче) знание немецкого языка подразумевалось само собой. Ко второй категории (т. н. лица немецкого происхождения, *Deutschstämmige*) относились политически пассивные немецкоязычные граждане Польши (позднее и других стран), т. е. наряду с национальностью главным критерием было владение немецким языком. Следующая, третья категория фольксдойче предполагала незнание немецкого языка: к ней относилось ассимилированное население немецкого происхождения (в т. ч. кашубы, силезцы и мазуры), а также способные к онемечиванию члены семей первых двух категорий фольксдойче, не принадлежавшие к этническим немцам. В эту

группу допускались и «группы населения со славянским языком общения в семейном кругу»[1]. И, наконец, четвертая, низшая ступень среди фольксдойче – это «полукровки», имеющие хотя бы одного родителя-немца, полностью или частично ассимилированные «чуждыми» народами, или немцы, активно работавшие во враждебных Германии организациях. Их предполагалось «вернуть в лоно немецкости» через перевоспитание: привить идеологию национал-социализма, а также вернуть немецкий язык и культуру. Как видно, немецкий язык по понятным причинам был одной из ключевых составляющих в системе расовых ценностей, в политике по отношению к немцам зарубежья, претендующим на «расовую полноценность».

Однако не следует преувеличивать важность владения немецким языком в идеологии национал-социализма. Первоочередную и принципиальную роль для отнесения к фольксдойче играло происхождение, «немецкая кровь». Даже человек прекрасно владеющий немецким языком, активно проявивший себя в национальном движении не мог претендовать на статус фольксдойче. Такое отношение к языку восходит к доктрине германизации Гитлера. По его мнению, германизация не связана напрямую с языком и невозможна через освоение немецкого языка другими народами: «германизация может быть осуществлена только на некоторой территории, но не с народом, не с людьми», а «преодоление отчетливых ранее границ между разными народами и, наконец, их стирание из-за единого языка […] означает […] уничтожение германского элемента»[2].

По Гитлеру, национальный характер связан не столько с языком, сколько находится «в крови» народа. И если народ-завоеватель смешивается с завоеванным народом, то при этом он теряет «культур-

[1] I. Fleischhauer, *Das Dritte Reich und die Deutschen in der Sowjetunion*, München 1983, s. 70.

[2] A. Hitler, *Mein Kampf*, München 1936, s. 428.

ные силы», пусть даже полученный «смешанный» продукт-народ «тысячу раз говорит на языке бывшей высшей расы»[3].

Языковая политика по отношению к населению немецкого происхождения на оккупированной территории, проводимая на местах новыми властями, нашла свое отражение в прессе и документах 1939–1945 годов, которые сохранились в архивах Польши, Беларуси, Германии и ряда других стран, а также в немецкой прессе того времени.

Фольксдойче на территориях Польши, включенных в рейх

Как известно, часть оккупированной польской территории была аннексирована, включена на правах административных единиц в состав рейха: т. н. Вартеланд (Wartheland), Данциг – Западная Пруссия (Danzig – Westpreußen) и Восточная Пруссия вместе с Белостокским округом (Ostpreußen u. Bezirk Bialystok).

Так как аннексированные территории Польши должны были соответствовать общенемецким стандартам, в том числе и в области языковой политики, то особые надежды новые власти возлагали на переселенных в западную Польшу фольксдойче, которые должны были хоть в какой-то мере изменить состав населения в пользу «германского элемента». Из примерно полумиллиона немецкоязычных граждан СССР около 100 тысяч очутились в зоне оккупации вермахта и гражданской администрации. Многие из них были переселены в западную Польшу, в новую провинцию рейха – Вартеланд[4]. Кроме «советских» немцев, сюда могли попасть и «словацкие» фольксдойче Прикарпатской Руси, более половины которых (около 8000 человек) уехали после аннексии этой территории Венгрией.

[3] *Ibidem*, s. 429.

[4] D. Scholten, *Sprachverbreitungspolitik des nationalsozialistischen Deutschlands*, Frankfurt am Main, Wien [u. a.] 2000, s. 291.

Многих из этих фольксдойче-переселенцев предстояло ассимилировать как в языковом, так и в идеологическо-культурном плане[5].

В письме от 29 апреля 1941 года рейхсминистра по науке, воспитанию и народному образованию по поводу школьного образования для детей-фольксдойче, переселившихся в рейх из Волыни, Бессарабии и других восточных областей, отмечается, что большая часть этих детей «немецким языком не владеет вообще или владеет им только в недостаточной степени в рамках школьной программы. Неотложный национальный интерес состоит в том, чтобы детям этих переселенцев, которые останутся в рейхе, обеспечить регулярные школьные занятия по основам чтения и письма, и тем самым использовать то время, пока они находятся во временном лагере»[6]. Это письмо предназначалось для всех новых территорий рейха, в которых предполагалось расселить прибывших из бывших советских территорий фольксдойче: среди адресатов этого письма – школьные службы и руководители Судетской области, региона Данциг – Западная Пруссия, Саарпфальца, Вартеланда, Пруссии, т. е. тех оккупированных областей, куда переселяли восточных фольксдойче. Система мер по возвращению фольксдойче в сферу немецкой цивилизации получила особое название в языке немецкой номенклатуры – *Rückdeutschungsarbeit* («работа по возвращению немецкости»).

Даже в январе 1945 года языковая проблема у части молодых фольксдойче не была решена. В служебном письме от 10 января 1945 года был представлен план работы «по возвращению немецкого духа среди молодежи в 1945 г.» в Вартеланде. Одна из сотрудниц оккупационной администрации Марго Фроверк (Margot Frohwerk) предлагает устроить лагеря для подростков 10–14 лет и разделить их на две группы: «парней и девушек, которые по [немецкому. – *А. З.*] языку так плохи, что должны быть повторно на-

[5] *Ibidem*.

[6] G. Hansen, *Schulpolitik als Volkstumspolitik*, Münster, New York 1994, s. 29.

правлены в летний лагерь для повторения», и тех, кто «может быть приравнен к нашим юношам и девушкам или как минимум в этой среде может быстро дорасти до их уровня»[7].

Были ли предусмотрены меры воздействия на тех фольксдойче, кто не прикладывает достаточно усилий в овладении немецким языком? В этой связи заслуживает внимания письмо отделения Национал-социалистической немецкой рабочей партии в Вартеланде, разосланное в середине 1943 года всем окружным руководителям и посвященное языковому обучению взрослых. В нем говорится о применении принудительных мер в случае злостного неучастия в мероприятиях по языковому обучению. Приведу выдержки из письма, в котором оговариваются штрафные меры при нежелании фольксдойче изучать немецкий язык: «Круг лиц, которым необходимо языковое обучение, был определен окружной администрацией по вопросам национальностей... Как я уже упоминал в своей записке от 20.5.43 г., изучение [немецкого. – *А. З.*] языка должно принципиально строиться на добровольной основе. Воспитание всех немцев, живущих в округе, в духе безукоризненного владения немецким языком […] это срочное дело, которое в рамках нашей воспитательной работы должно быть привито немецкому народу *всеми* [здесь и далее выделено в документе. – *А. З.*] имеющимися средствами. Для этого в случае, если языковое обучение не может проводиться на основе добровольности, могут применяться также принудительные меры. Я приказываю настоящим, чтобы в случае *злостного* неучастия в мероприятиях по языковому обучению применялись следующие принудительные меры:

1. Лицам, принадлежащим к пункту 3 фольксписте [*Deutsche Volksliste*, см. выше. – *А. З.*], может быть отказано в немецком гражданстве.

2. У лиц, принадлежащих к пункту 3 фольксписте, изымается удостоверение принадлежности к фольксписте.

[7] *Ibidem*, s. 62–63.

Дзяржынскага пр. 7 лістапада 2013 года на пагорку ў раёне злучэння вул. Чыгуначнай з пр. Дзяржынскага быў адкрыты мемарыяльны комплекс на ўшанаванне салдат Чырвонай Арміі, пахаваных у брацкай магіле. Цэнтральная частка кампазіцыі – жанчына ў жалобе, якая сціскае ў руках пілотку чырвонаармейца. Першы памятны знак тут быў пастаўлены ў 1981 годзе.

Залатая Горка вул., 18, к. 2. У 1941–1944 гадах у былой школе знаходзіўся нямецкі вайсковы шпіталь.

Захарава вул., 59. Паводле П. Растоўцава, на нямецкім плане 1942 года дом пазначаны як месца размяшчэння дапаможнай вайсковай часці (Landesschützen).

Індустрыяльная вул. У 1941–1944 гадах гарадская электрастанцыя № 2 была пашкоджана, к канцу 1945 года адноўлена[32]. У жніўні 1941 – маі 1942 года на ГЭС дзейнічала падпольная група з 20 чалавек на чале з М. Яраслаўцавым (загінуў). У студзені 1942 года падпольшчыкі ўзарвалі вадапомпавую станцыю, у лютым – адзін з катлоў, у сакавіку вывелі са строю галоўны пульт кіравання ГЭС. У маі, перад пагрозаю раскрыцця групы акупантамі, боль-

[29] В. Кірычэнка, *Мінск. Гісторыя пасляваеннага аднаўлення. 1944–1952 гг.*, Мінск 2004, с. 12.

[30] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 29.

[31] В. Кірычэнка, *op. cit.,* с. 12.

[32] *Минская ТЭЦ-2* [online], http://operby.com/minskaya-tec-2.html [доступ: 8.01.2017].

шая частка падпольшчыкаў сышла ў партызаны. З верасня 1941 да 3 ліпеня 1944 года на прадпрыемстве дзейнічала падпольная група на чале з Дз. Гняўко. Яна аб'ядноўвала 18 слесараў, электраманцёраў і інш. Падпольшчыкі сабатавалі падачу электраэнергіі на нямецкія аб'екты, выводзілі са строю генератары і іншае абсталяванне. У пачатку лютага 1944 года ўзарвалі трансфарматарны пункт, пакінулі без электраэнергіі вайсковыя казармы і склады, было перапынена забеспячэнне электрычнасцю многіх устаноў горада. Падпольшчыкі не дапусцілі падрыву ГЭС перад адступленнем немцаў з Менска[33].

Казлова вул. Залатагорскія могілкі дзейнічалі ў 1796–1893 гадах, пазней дазвалялася хаваць нябожчыкаў толькі ў сямейных скляпах, па спецыяльным дазволе[34]. Захаваўся фотаздымак мая 1943 года, на якім адлюстраваны генеральны камісар Беларусі В. Кубэ, які наведвае могілкі.

Казлова вул. Вайсковыя могілкі існуюць з 1840-х гадоў[35]. Сярод пахаваных: апошні даваенны галоўны архітэктар Мінска Г. Якушка (1942 год), грамадска-палітычны дзеяч Ф. Акінчыц (сакавік 1943 года), сябры Саюза беларускай моладзі. Сябры СБМ загінулі падчас тэракта ў Менскім гарадскім тэатры 22 чэрвеня 1943 года[36]. На могілкі 25 чэрвеня быў арганізаваны «вялікі жалобны паход, рушачы галоўнай вуліцаю»: «Кажная дамавіна пакрытая бел-чырвона-белым сьцягам і засыпаная краскамі й вянкамі. […] Разам у жалобным паходзе плылі аўтамабілі розных урадавых нямецкіх установаў. […] Сьвятар а. Кушнер, адправіўшы адпаведныя

[33] *Збор помнікаў*…, с. 45.

[34] *Nasze Kościoły. Djecezja Mińska*. T. 2. Zesz. 11. Red. J. Żyskar, Warszawa 1913, s. 13.

[35] *Церкви и приходы Минска. История и современность*, Минск 1996, с. 42; Г. Шэйкін, *Храм-помнік на Вайсковых могілках у Мінску*, «Беларускі гістарычны часопіс» 1998, № 2, с. 49.

[36] В. Кубэ, *Новы бальшавіцкі тэрарыстычны акт на мірнае жыхарства Менску*, «Беларуская Газэта» 1943, № 47.

малітвы, сказаў прамову царкоўна-нацыянальнага зьместу. У канцы над магілаю прамовіў старшыня сталічнага гораду праф. Д-р. Іваноўскі. „– Дарагія нашыя нябожчыкі: Андрэй Братко, Яраслаў Кушаль, Кастусь Мокат, Тамара Насеньнік, Марыя Негіна, Марыя Сабалеўская, Леанід Слаўнін і Вы, трое непазнаных". […] Пасыпалася беларуская зямліца, каб закрыць навекі ахвяры бальшавіцкага злачынства»[37]. Аляксандр Станюта ўспамінаў: «Пахавалі ўсіх загінуўшых […] у брацкай магіле...»[38]. 20 мая 1945 года пісьменнік Г. Смоляр пісаў: «Марыя Канстанцінаўна Хайноўская наведваннем магілы Эдуарда Самуйлёнка ў часы нямецкай няволі як бы вяртала сабе кавалак шчасця тых дзён, калі яна, супрацоўніца Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі, была сведкай буйнага росквіту талента гэтага выдатнага пісьменніка»[39].

Казлова вул., 11. Падчас бамбардзіравання Мінска 24 чэрвеня 1941 года адна з фугасных бомб прабіла дах царквы Святога благавернага князя Аляксандра Неўскага, упала перад алтаром насупраць абраза святога Мікалая, але не ўзарвалася. Аднак выбуховай хваляй ад бомб, што падалі побач, быў сарваны галоўны купал храма, загарэўся дах, але неўзабаве полымя само згасла[40]. 28 чэрвеня 1941 года вернікі сарвалі замок і ўвайшлі ў храм – гэта была першая царква ў Менску, адкрытая пасля акупацыі горада немцамі. 5 ліпеня (паводле іншых звестак, 6-га) храм асвяціў протаіерэй У. Фінькоўскі, была адслужана першая літургія[41]. У царкве служыў а. І. Кушнер, які ў 1942 або 1943 годзе падарваўся на міне[42]. Пасля аднаўлення савецкай улады царква не была закрыта[43].

---

[37] М. Бакун, *Паховіны ахвяраў бальшавіцкага тэрору*, «Беларуская Газэта» 1943, 30 чырвеня.

[38] А. Станюта, *op. cit.*, с. 104.

[39] «Літаратура і мастацтва» 1945, 20 мая.

[40] *Церкви и приходы…*, с. 42; Г. Шэйкін, *op. cit.,* с. 47–50.

[41] *Церкви и приходы*…, с. 25, 42; Г. Шэйкін, *op. cit.*, с. 49.

[42] З. Пазьняк, *Гутаркі з Антонам Шукелойцем*, Warszawa, Vilnius 2003, с. 105.

[43] *Церкви и приходы*…, с. 26.

Казлова вул., 15. У 1941–1944 гадах у гэтым жылым доме знаходзілася аддзяленне Einsatzstab Reichsleiter Rosenberg – арганізацыі, якая займалася вывазам гісторыка-культурных каштоўнасцей з акупіраваных Германіяй тэрыторый[44].

Кальварыйская вул., 3а. На доме ўстаноўлена памятная дошка з надпісам: «У гэтым будынку ў 1941–1943 гадах знаходзілася бальніца, у якой дзейнічалі падпольныя антыфашысцкія групы Мінскага гета».

Кальварыйскі праезд, 1. Касцёл Узвышэння Святога Крыжа на Кальварыі перад Другой сусветнай вайной быў закрыты. Набажэнствы аднавіліся, паводле некаторых звестак, у 1942 годзе. Паводле У. Дзянісава, пасля 1944 года тут знаходзіліся майстэрні скульптараў.

Кальварыйскі праезд. Сярод пахаваных на Кальварыйскіх могілках – бурмістр Менска, старшыня Беларускай рады даверу пры генеральным камісары Беларусі В. Іваноўскі (загінуў 6 снежня 1943 года). 16 снежня 2006 года адбылося ўрачыстае адкрыццё надмагільнага помніка.

Камсамольская вул., 25. Чатырохпавярховы жылы будынак адлюстраваны на фотаздымку канца чэрвеня 1944 года як не атынкаваны, магчыма, пасля пажару. Як сведчыць фотаздымак 1948 года, у гэты час дом ужо быў заселены.

Камсамольская, вул. 31 / Карла Маркса, 16. Будынак быў узведзены ў 1936–1938 гадах[45] для Народнага камісарыята лясной прамысловасці БССР[46]. У 1941–1944 гадах, як сведчыў зафіксаваны на фотаздымках надпіс Der Stadtkomissar Minsk на рагу другога паверха, тут знаходзіўся Менскі гарадскі камісарыят.

---

[44] *Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/63821.html [доступ: 15.01.2016].

[45] В. Денисов, О. Кукуня, *Улица Лошицкая – Базарная – Подгорная – Карла Маркса* [online], https://ais.by/story/1445 [доступ: 6.01.2017].

[46] *Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности* [online], http://bellesbumprom.by/ru/o-kontserne/istoriya [доступ: 7.01.2017].

Караля вул., 16а. Паводле П. Растоўцава, ёсць звесткі, што ў гэтым будынку знаходзіліся яўрэі з Гамбурга, якіх нацысты прывезлі ў Менск на знішчэнне ўвосень 1941 года.

Караткевіча вул., 9а. 7 лістапада 1933 года з Лошыцкага аэрадрома вылецеў першы самалёт[47]. Раніцай 23 чэрвеня 1941 года першыя нямецкія самалёты-знішчальнікі, якія прарваліся да Мінска, абстралялі аэрадром[48]. У другой палове дня яго бамбардзіравалі 11 разоў. Там стаялі два знішчальныя палкі, якія прыбылі ў Мінск 22 чэрвеня з Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Замаскіраваць самалёты не паспелі, і немцы ліквідавалі большасць машын проста на зямлі[49]. На зробленым пасля 25 чэрвеня 1941 года фота відаць, што будынак аэравакзала цэлы. Але на здымку 25 ліпеня дом адлюстраваны напаўразбураны. Падчас акупацыі аэрапорт меў назву Minsk-Süd. Пасля 1944 года будынак аэравакзала быў адноўлены і выконваў свае функцыі да 1957 года[50].

Карла Маркса вул., 29. У 1939–1941 гадах – Дзяржаўная карцінная галерэя БССР. 26 чэрвеня 1941 года дырэктар галерэі М. Міхалап сышоў з Мінска, замкнуўшы памяшканне на ключ. Экспазіцыя была разрабавана салдатамі вермахта і мясцовымі жыхарамі[51]. Паводле А. Шукелойця, «з надыходам акупацыі ў першыя ж дні лепшыя абразы, слуцкія паясы й мастацкія вырабы былі вывезеныя ў Кёнігсбэрг»[52]. Паводле А. Станюты, з галерэі «прапала ў гады акупацыі» калекцыя твораў яго дзеда мастака М. Станюты[53]. Дачка мастака артыстка С. Станюта ўдакладняла: «„Партрэт дачкі" адшукала пасля вайны ў Германіі, куды яго вы-

[47] *Минск-1 (аэропорт)* [online], https://ru.wikipedia.org/wiki/Минск-1_(аэропорт), [доступ: 8.01.2017].

[48] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 146.

[49] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні*…, с. 299.

[50] Idem, *Дома, хранящие историю*, «Советская Белоруссия» 2014, 3 сентября.

[51] Idem, *Минск. Лучший вид на этот город*, Минск 2013, с. 187.

[52] А. Шукелойць, *Менск пад немцамі*, «Наша ніва» 1992, № 9.

[53] А. Станюта, *op. cit.*, с. 117.

везлі, і вярнула ў Мінск дырэктар нашага мастацкага музея Алена Васільеўна Аладава»[54].

Карла Маркса вул., 31. Паводле А. Шукелойця, паміж 1941 і 1944 гадамі ў выніку «налётаў савецкай авіяцыі» аднойчы «быў цалкам разьбіты будынак КІЖу (камуністычнага інстытуту журналістыкі) па вуліцы Карла Маркса – адзін з найпрыгажэйшых школьных будынкаў гораду»[55]. Паводле І. Варанковай, якая спасылаецца на сведчанне аднаго з партызанскіх разведчыкаў, бомба з савецкага самалёта пашкодзіла будынак у 1943 годзе[56]. Паводле справаздачы камісара партызанскага атрада «Правда» Кузняцова, што захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, дом быў часткова разбураны падчас налёту савецкай авіяцыі 2 мая 1943 года. У 1947 годзе будынак быў адноўлены.

Карла Маркса вул., 38. 14 кастрычніка 1939 года члены Бюро ЦК КП(б)Б звярнуліся з просьбаю да «ЦК ВКП(б) пересмотреть решение от 19.IV.–1938 г. о […] переносе строительства дома ЦК КП(б)Б […] из г. Могилева в г. Минск»[57]. Планавалася, што «ў 1941 г. будзе скончана будаўніцтва Дома ЦК КП(б)Б і сумежнай да яго плошчы»[58]. Паводле пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 17 лютага 1941 года, у будынку збіраліся размясціць камандны пункт супрацьпаветранай абароны. Падземныя ўзроўні дома праектаваў маскоўскі інстытут «Метропроект». Але бракавала інжынераў і праходчыкаў, якія б мелі вопыт падземных работ. К пачатку красавіка 1941 года з Масквы прыбыў толькі адзін спецыяліст[59]. Паводле сакратара ЦК КП(б)Б па кадрах М. Аўхімовіча, 24 чэрвеня 1941 года супрацоўнікі ЦК спрабавалі ўладкавацца ў падвалах недабудаванага будынка, аднак працаваць там было цяжка, бо ў той час усё памяшканне было аддадзена

[54] *Ibidem*, с. 119.
[55] А. Шукелойць, *op. cit.*
[56] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 289.
[57] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні*..., с. 200.
[58] Д. Ескевіч, О. Батоева, *op. cit.*, с. 8.
[59] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 110.

пад сховішча сем'ям работнікаў ЦК. Паводле карэспандэнта газеты «Правда» П. Лідава, у падвалах размяшчаўся аператыўны штаб ЦК КП(б)Б[60]. Паводле некаторых звестак, к 1 мая 1943 года будынак мусіў быць гатовы да пераезду сюды Генеральнага камісарыята Беларусі. Будаўнічыя работы вяла арганізацыя Тодта. У красавіку савецкі бамбардзіроўшчык скінуў побач некалькі авіябомб, у выніку, у будынку з'явіліся расколіны і спатрэбіўся больш сур'ёзны рамонт. Сюды былі накіраваны работнікі з яўрэйскага гета. Пярэбары Генеральнага камісарыята адбыліся ў чэрвені 1943 года. Кабінет В. Кубэ знаходзіўся на другім паверсе, яго вокны выходзілі на сучасны Аляксандраўскі сквер[61]. Як сведчаць фотаздымкі, над другім паверхам дома знаходзілася шыльда з надпісам Generalkomissar für Weissruthenien. Захавалася фотахроніка, на якой відаць В. Кубэ, які прымаў тут дэлегацыі. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі ў будынку нямецкія выбуховыя прыстасаванні[62].

Кастрычніцкая вул., 14. У 1921–1922 гадах у будынку пачаў дзейнічаць драждавы завод «Чырвоная зорка»[63]. У 1976 годзе на фасадзе была ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам: «Здесь 26 октября 1941 года фашисты казнили советских патриотов К. И. Труса, В. И. Щербацевича и М. Б. Брускину» (прозвішча М. Брускінай дададзена ў 2008 годзе). Пералічаныя асобы былі павешаны на браме драждавога завода[64]. Гл. вышэй.

Кастрычніцкая вул., 16. У 1941–1944 гадах на былым Менскім машынабудаўнічым і ліцейным заводзе імя К. Я. Варашылава рамантавалі нямецкія танкі. У канцы чэрвеня 1942 года ў выніку налёту савецкай авіяцыі быў знішчаны механічны цэх. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі выбуховыя прыстасаванні, якія павінны былі прывесці

[60] *Ibidem*, с. 175.

[61] О. Усачев, *Явные и тайные резиденции Кубе* [online], http://minsk-old-new.com/life/war1941-1945/yavnye-i-tajnye-rezidencii-kube [доступ: 22.01.2018].

[62] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 319.

[63] *Мінск незнаёмы. 1920–1940*, аўтар-укл. І. Куркоў, Мінск 2002, с. 13.

[64] *Збор помнікаў*…, с. 94.

да ўзрыву прадпрыемства[65]. На будынку ў 1967 годзе ўстанавілі мемарыяльную дошку ў гонар 45 удзельнікаў падпольнай арганізацыі, якая дзейнічала на прадпрыемстве ў 1941–1944 гадах[66]. Падполле актывізавалася з ліпеня 1942 года, калі акупанты арганізавалі на заводзе рамонт танкаў і самаходных гармат. Увосень 1942 года падпольшчыкі падпалілі цэх акумулятараў, у пачатку 1943-га вывелі са строю каларыфер, які даваў цяпло ў цэхі. Улетку 1943 года здабылі і перадалі партызанам звесткі пра тэхнічныя і баявыя характарыстыкі танкаў «тыгр» і «пантэра». У лістападзе-снежні 1943 і лютым-маі 1944 года большасць падпольшчыкаў была арыштавана[67].

Кастрычніцкая вул., 25. На гарбарні «Бальшавік» упершыню ў СССР у 1938 годзе пачалі выраблять высакаякасную хромавую скуру са свіных шкур[68]. У 1941–1944 гадах выраблялі скуру і аўчыну для кажухоў[69]. На будынку змешчана мемарыяльная дошка з надпісам: «На этом заводе в годы Великой Отечественной войны бесстрашно боролись против фашистских захватчиков советские патриоты-подпольщики». Падпольная група дзейнічала ў жніўні 1941 – ліпені 1944 года. У маі 1943 года сернай кіслатой была сапсавана вялікая колькасць скураных вырабаў, падрыхтаваных да адпраўкі ў Германію. Скуры з завода перапраўляліся ў партызанскія атрады[70].

Кірава вул., 13 / Валадарскага, 23. 16 чэрвеня 1941 года ў Мінск прыбылі з першымі гастролямі акцёры Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра імя М. Горкага (МХАТ) і размясціліся ў гасцініцы «Беларусь». Як занатаваў 23 чэрвеня карэспандэнт газеты «Правда» П. Лідаў, «у нас в гостинице посмеиваются над артистами МХАТ, которые по тревоге спускаются в подвал. Кроме них, пожалуй, никто не верит в действительную возможность воздушной

[65] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 28, 289, 319.
[66] *Збор помнікаў*…, с. 94.
[67] *Ibidem*, с. 94.
[68] *Мінск незнаёмы*…, с. 13.
[69] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 29.
[70] *Збор помнікаў*…, с. 94–95.

бомбардировки». 24 чэрвеня артысты выехалі ў Маскву, пакінуўшы асабістыя рэчы ў адным з гасцінічных нумароў, у тым ліку «парадны» пінжак народнага артыста СССР І. Масквіна з ордэнам Леніна на лацкане[71]. У 1941–1944 гадах будынак гарэў.

Кірыла і Мяфодзія вул., 3. Будынак быў узведзены ў XVII стагоддзі як касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі. У Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі захаваўся бланк канца 1920-х гадоў з шапкай: «Б.С.С.Р. Ц.В.К. Цэнтральнае архіўнае кіраўніцтва. Менск, вул. Бакуніна, д. № 3». Паводле А. Шукелойця, да нямецкай акупацыі тут знаходзіўся «архіў рэвалюцыі», якім апекавалася сп-ня Дзяржынская, а пасля яго «давялося звальняць для праваслаўнай царквы». Будынак перадала вернікам Менская гарадская ўправа[72]. У 1943 годзе царкву асвяціў архіепіскап Ф. Нарко. Быў пастаўлены новы трох'ярусны іканастас. З таго часу храм дзейнічае, цяпер гэта Свята-Духаў кафедральны сабор – галоўны храм Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы (Беларускай праваслаўнай царквы).

Кірыла і Мяфодзія вул., 4. У Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі, які цяпер знаходзіцца ў гэтым будынку (першапачаткова касцёл Святога Юзафа Абранніка Найсвяцейшай Панны Марыі), захаваўся бланк канца 1920-х гадоў з шапкай «Б.С.С.Р. Ц.В.К. Цэнтральнае архіўнае кіраўніцтва. Менскі гістарычны архіў. Гор. Менск. Бакуніна 4». Паводле А. Шукелойця, у 1941 годзе «ў Гістарычным архіве (у былым касьцёле бэрнардынцаў) засталася адна маладая прафэсійная працаўніца, сп-ня Дзяржынская, якая адважна бараніла фонды ад розных валацугаў і зарганізавала нармальную дзейнасьць гэтае ўстановы. Архіў камплектаваў па тры асобнікі ўсіх выдаваных кніжак, газэт, лятучак, легальных і нелегальных»[73].

---

[71] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 88, 147, 232.

[72] А. Шукелойць, *op. cit.*

[73] *Ibidem*.

Кірыла і Мяфодзія вул., 5. У 1943 годзе ў будынку былога кляштара бернардзінак XVII–XIX стагоддзяў адкрыўся Свята-Духаў мужчынскі манастыр, у якім жылі тры насельнікі[74]. Памяшканні перадала рэлігійнай грамадзе Менская гарадская ўправа[75].

Кісялёва вул., 30. У перыяд нямецкай акупацыі заснаваны яшчэ ў другой палове XIX стагоддзя бровар працягваў выпускаць прадукцыю. У 1941 годзе тут была створана падпольная арганізацыя, якая распаўсюджвала газету «Звязда». 6 кастрычніка 1942 года падпольшчыкаў арыштавалі[76]. Увесну 2003 года на фасадзе будынка быў раскрыты, а пасля зафарбаваны надпіс 1941–1944 гадоў Brauerei Minsk («Менскі бровар»)[77].

Кісялёва вул., 42. 22 ліпеня (4 жніўня) 1941 года, у дзень памяці святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны, царква Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдаліны была зноў адкрыта і асвячона. Вёўся рамонт. Настаяцель протаіерэй К. Шашко, які служыў у храме падчас нямецкай акупацыі, пасля аднаўлення савецкай улады быў арыштаваны і асуджаны да дзесяці гадоў зняволення. У кастрычніку 1949 года царкву закрылі[78].

Кульман вул. Ля будынка на вул. Кульман, 14 у 1983 годзе быў устаноўлены мемарыяльны знак на месцы дома, дзе ў 1942 годзе знаходзілася падпольная друкарня Менскага гаркама ЦК КП(б)Б, у якой выйшлі другі (у жніўні) і трэці (у верасні) нумары падпольнай газеты «Звязда»[79].

Леніна вул. Паводле некаторых звестак, помнік У. Леніну каля цяперашняй 3-й гарадской клінічнай бальніцы імя Я. У. Клумава

---

[74] *Церкви и приходы*…, с. 25.

[75] А. Шукелойць, *op. cit.*

[76] Т. Степанова, *Один из минских трудяг-старожилов*, «Минский курьер» 2002, № 29.

[77] Д. Шаровар, *Привидение из 1942 года*, «Советская Белоруссия» 2003, 8 апреля.

[78] В. Корбут, Д. Ласько, *Мінск. Спадчына старога*…, с. 162.

[79] *Збор помнікаў*…, с. 104.

быў пастаўлены ў 1936 годзе[80]. Паводле іншых звестак, у скверы з боку вул. Ленінскай (цяпер Леніна) да 1941 года стаялі два бюсты – У. Леніна і І. Сталіна. Е. Мірановіч, старшая сястра першага вочнага аддзялення, заслужаны работнік аховы здароўя БССР, якая працавала ў бальніцы з 1954 года, расказвала ў 2005-м, што супрацоўнікі бальніцы муж і жонка П. і З. Мурашкі ў пачатку нямецкай акупацыі схавалі бюсты Сталіна і Леніна. Пасля вызвалення горада ад немцаў бюст Леніна знайшлі. Галаву ад яго злучылі з выраблена новай фігурай і паставілі ў двары з боку стадыёна «Дынама». На помніку змешчана памятная дошка з надпісам: «Памятник Владимиру Ильичу Ленину в годы оккупации города Минска немецко-фашистскими захватчиками (1941–1944 гг.) спасен, сохранен сотрудниками больницы – семьей Мурашко. Восстановлен в 1945 г.»[81]. Паводле некаторых звестак, П. Мурашка у 1942 годзе быў зняволены ў канцлагеры «Трасцянец», у 1944 годзе вызвалены. Затым знайшоў схаваныя бюсты і змясціў іх на ранейшым месцы[82].

Ленінградская вул., 3, 5. У ліпені 1943 года ў менскай газеце „Minsker Zeitung" інжынер М. Бэкер апублікаваў крытычны агляд савецкай архітэктуры Менска, у якім дом на вул. Ленінградскай, 3 прыводзіў як прыклад «прымітывізму» („Primitivität")[83]. 24 ліпеня 1941 года на вул. Ленінградскай, 5 размясцілася нямецкае намесніцтва Менскай акругі, якое з верасня ўзначальваў Р. Астроўскі[84]. Паводле Ю. Туронка, В. Іваноўскі з лістапада 1941 да восені 1942 года жыў у доме на вул. Ленінградскай (нумар будынка не называецца) «на адной кватэры з сваім сакратаром зь віленскага БНК Язэпам Найдзюком». Паводле Я. Найдзюка, ён жыў «разам з прафэ-

[80] *Ibidem*, с. 110.

[81] В. Корбут, *Минск*…, с. 212–214.

[82] Ю. Воронков, *Памятники В. И. Ленину в Белоруссии*, Минск 1976, с. 22.

[83] M. Becker, *Sowjet-Architektur. Wohnungsbau und Wohnungsfürsorge der Bolschewisten in Minsk*, „Minsker Zeitung" 1943, 11.Juli.

[84] *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 4*, Мінск 2005, с. 51.

сарам Іваноўскім на агульнай кватэры па вуліцы Ленінградзкай. […] У Менску мы жылі вельмі сьціпла». Л. Галяк, які таксама жыў у доме на вул. Ленінградскай, прыгадваў пра «спатканьне Новага 1942 году ў В. Іваноўскага»: «Калі заціхла страляніна вітаньня Новага Году немцамі, прыйшоў павіншаваць з Новым годам немец, адміністратар дому»[85].

Магілёўская вул., 68. У кв. 2 у лістападзе 1941 – лістападзе 1943 года знаходзілася канспіратыўная кватэра падпольнай камсамольскай арганізацыі «Андрюша». Члены арганізацыі псавалі абсталяванне на хлебазаводзе «Аўтамат», гарадской электрастанцыі № 1, мініравалі цягнікі і чыгуначныя вагоны, ажыццявілі агулам каля 40 дыверсій. У ноч на 7 лістапада 1943 года былі арыштаваны гаспадары кватэры маці і сын А. і В. Аўчаровы. 7 лістапада сюды таксама прыйшла група падпольшчыкаў на чале з М. Кедышкам, які ў выніку перастрэлкі з немцамі быў забіты, іншым удалося ўцячы. У 1967 годзе на доме была ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар падпольшчыкаў[86].

Максіма Багдановіча вул., 23 / Старажоўская, 2. У выніку бамбардзіроўкі Мінска немцамі 24 чэрвеня 1941 года, паводле сведчання намесніка Старшыні СНК БССР І. Крупені, «в 3-м Доме Советов женщины и дети решили укрыться в подвале. Взорвавшаяся рядом бомба вызвала пожар. Огонь перекрыл все подъезды и подходы. Там погибло более 100 человек». На аэрафотаздымку 24 чэрвеня 1941 года відаць, што а 19.06 дом яшчэ гарэў. 25 чэрвеня а 5.30 фатограф зафіксаваў цэлы дах дома з боку сучаснай вул. Максіма Багдановіча і правал даху над крылом будынка з боку сучаснай вул. Старажоўскай[87]. У 1947 годзе будынак аднавілі.

Максіма Багдановіча вул., 29. У 1941–1944 гадах, паводле некаторых звестак, тут знаходзіліся школа і курсы Службы бяспекі

[85] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Vilnius 2006, с. 232–233.

[86] *Збор помнікаў*…, с. 148.

[87] С. Крапивин, *Дом у Троицкого предместья* [online], http://minsk-old-new.com/minsk-3289-ru.htm [доступ: 15.01.2017].

рэйхсфюрэра СС (Sicherheitsdienst des Reichsführers SS), атрады літоўскіх і ўкраінскіх вайскоўцаў, авіячасць[88].

Маскоўская шаша. На 7-м і 9-м км аўтадарогі Мінск – Масква ў 1960 годзе былі пастаўлены абеліскі. На 7-м км – на магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 годзе. На 9-м км – на месцы пахавання 30 тысяч савецкіх ваеннапалонных, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў 1941–1944 гадах[89].

Машэрава пр., 24, 26, 28. У 1941–1944 гадах у будынках размяшчаўся нямецкі гарнізон – дзве тысячы чалавек[90].

Мельнікайтэ вул. У скверы на рагу вул. Ракаўскай і Мельнікайтэ стаіць стэла з надпісам, які сведчыць, што «на гэтым месцы ў 1941–1943 гг. нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі гета для яўрэяў Мінска і яго ваколіц. У ім знаходзілася звыш 100 000 чалавек, у тым ліку яўрэі з многіх краін Еўропы. Амаль усе яны загінулі ў час пагромаў, былі расстраляны, спалены ў лагеры смерці Малы Трасцянец». Гета займала тэрыторыю паміж сучаснымі пр. Пераможцаў, вул. Мельнікайтэ, Сухой, Калектарнай, Рымарскай, Нямігай. У 1947 годзе у г. зв. Яме (на рагу з вул. Заслаўскай) быў пастаўлены абеліск з надпісамі на ідышы і рускай мове: «Светлая память на вечные времена пяти тысячам евреев, погибших от рук лютых врагов человечества – фашистско-немецких злодеев. 2 марта 1942 г.».

Незалежнасці пр. У 1941–1943 гадах, мяркуючы па здымках таго часу, паміж 1-м клінічным гарадком і будынкам АН БССР былі створаны нямецкія вайсковыя могілкі. Паводле І. Варанковай, у клінічным гарадку дзейнічаў нямецкі вайсковы шпіталь. У 1943 годзе пахаванні перанеслі на г. зв. Могілкі герояў. Могілкі салдат і афіцэраў вермахта ў 1941–1944 гадах знаходзіліся ў лесапарку ля сучаснай станцыі метро «Барысаўскі тракт» і былі вядомы пад назвамі «Могілкі герояў» (Heldenfriedhof), «Ганаровыя могілкі»

[88] *Памяць*..., с. 61.
[89] *Збор помнікаў*..., с. 157.
[90] *Памяць*..., с. 61.

(Ehrenfriedhof), «Салдацкія могілкі» (Soldatenfriedhof). У 2014 годзе Народны саюз Германіі па доглядзе за воінскімі пахаваннямі разам з Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь пачаў перапахаванне астанкаў салдат вермахта, а таксама армій саюзнікаў Германіі на зборныя могілкі ў іншых раёнах Беларусі. Да пачатку кастрычніка 2015 года рэшткі пахаванняў, якія знаходзіліся бліжэй да мікрараёна Маяк Мінска, вывезлі і перапахавалі на могілках ля г. Бярозы (Брэсцкая вобл.)[91]. Паводле некаторых звестак, на «Ганаровых могілках» быў пахаваны Г. Вёльке, чэмпіён Алімпійскіх гульняў 1936 года па штурханні ядра (заходні бок, рад 22, магіла 28)[92]. Падчас Другой сусветнай вайны Г. Вёльке служыў гаўптманам 118-га ахоўнага паліцэйскага батальёна вермахта. Быў забіты ў перастрэлцы з партызанамі недалёка ад вёскі Хатынь (цяпер у Лагойскім раёне). Гэта стала прычынай праведзенай у той жа дзень карнай аперацыі, падчас якой былі спалены жыўцом 149 мірных жыхароў Хатыні, многія з якіх – дзеці.

Незалежнасці пр., 26. У 1941–1944 гадах будынак займаў Менскі краёвы гістарычны музей (Landesmuseum Minsk), якім у верасні 1941 – чэрвені 1944 года кіраваў А. Шукелойць[93]. У пачатку нямецкай акупацыі музей застаўся без нагляду, быў разрабаваны, а да прыходу А. Шукелойця яго вартаваў даваенны супрацоўнік мастак Г. Віер. Таксама тут, паводле сведчання А. Шукелойця, знаходзіўся «багаты архіў», які пасля «ягоны загадчык мастак Габрыель Віер перадаў часткова духоўным уладам»[94]. У канцы жніўня 1941 года з музея ў Кёнігсберг былі вывезены «каменныя бабы», 19 гармат (16 з іх – з нясвіжскага збору Радзівілаў). У Вену была адпраўлена

[91] *Нямецкія вайсковыя могілкі 1941–1944 гг. пад Мінскам* [online], https://be.wikipedia.org/wiki/Нямецкія_вайсковыя_могілкі_1941-1944_гг._пад_Мінскам [доступ: 7.02.2017].

[92] *Hans Woellke* [online], https://de.wikipedia.org/wiki/Hans_Woellke [доступ: 7.02.2017].

[93] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні*…, с. 310–312.

[94] А. Шукелойць, *op. cit.*

калекцыя яўрэйскага мастацтва. 9 лістапада 1943 года музей перадаў менскім праваслаўным цэрквам культавыя рэчы, сярод якіх восем кніг XVIII–XIX стагоддзяў. 11 лістапада ў цэрквы былі аддадзены 33 прадметы: кнігі XVII–XIX стагоддзяў, абразы[95]. Музей, паводле А. Шукелойця, праводзіў «прыпадковыя розныя выстаўкі», напрыклад, прысвечаную пісьменніку К. Каганцу, выстаўляліся абразы XVI–XVII стагоддзяў віцебскай і магілёўскай школ. 1 красавіка 1944 года зборы музея ўжо накіроўваліся ў «эвакуацыю» ў горад Інстэрбург (цяпер Чарняхоўск у Калінінградскай вобласці Расіі), а 24 красавіка вагоны з каштоўнасцямі прыбылі ў замак у горадзе Гёхштэт-на-Дунаі (Баварыя)[96].

Незалежнасці пр., 27. Чатырохпавярховы П-падобны ў плане дом з цокальным паверхам у правай частцы быў пастаўлены ў 1940 годзе[97]. Паводле І. Варанковай, тут знаходзіўся штаб ваенна-паветраных сіл Беларускай (з 11 ліпеня 1940 года – Заходняй) асобай ваеннай акругі. У 1941–1944 гадах у будынку знаходзіўся штаб нямецкай авіяцыі[98].

Незалежнасці пр., 43. Да нямецкай акупацыі – жылы «дом гарсавета»[99]. Малюнак будынка быў апублікаваны ў ліпені 1943 года ў менскай нямецкай газеце „Minsker Zeitung“ як прыклад «узорнага» („vorbildliche”) «блочнага жылога дома» („Wohnhausblock”)[100].

Незалежнасці пр., 44а. Касцёл Найсвяцейшай Тройцы на Залатой Горцы ў 1930-я гады закрылі. Са святыні вынеслі ўсе аздобы, знішчылі арган[101]. Храм пацярпеў у час захопу Мінска немцамі ў чэрвені 1941 года, што адлюстравана на тагачасных фотаздым-

[95] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні*…, с. 310.

[96] *Ibidem*, с. 311–312.

[97] *Збор помнікаў*…, с. 128.

[98] *Памяць*…, с. 60.

[99] В. Корбут, *Минск*…, с. 56; *Збор помнікаў*…, с. 30.

[100] M. Becker, *op. cit.*

[101] *Каталіцкія святыні. Мінска-магілёўская архідыяцэзія. Ч. 1. Будслаўскі, Вілейскі і Мінскі дэканаты*, тэкст і фота А. Яроменкі, уводзіны У. Трацэўскага, Мінск 2003, с. 194.

ках. «Але, – як сведчыў А. Шукелойць, – сьцены засталіся, трымаліся, і перазімавалі зіму [1941/1942 года. – *В. К.*], ягоная столь не звалілася, а страха згарэла. Дзеля гэтага мы пайшлі агледзець гэты касьцёл з мастакамі [А. Тычынам, М. Дучыцам, М. Керзіным. – *В. К.*] і вырашылі яго закансэрваваць. Гэта значыць, зьвярнуліся адразу да прафэсара Вацлава Іваноўскага (ён тады ўжо быў старшынёй горада, гэта 1942 год), каб ён даў нам матэр'ял пакрыць касьцёл і забіць вокны, што і было зроблена. І такім парадкам касьцёл гэты закансэрвавалі. (Не аднаўлялі яго, там ніякіх службаў не было, попел у сярэдзіне ляжаў.)»[102]. Пасля 1944 года храм прыстасавалі пад кнігасховішча Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна.

Незалежнасці пр., 49. Будынак «Інстытута фізічнай культуры ў Мінску» быў пастаўлены ў 1939 годзе[103]. У лістападзе 1943 года тут знаходзіўся нямецкі вайсковы шпіталь[104].

Незалежнасці пр., 56, 58. Мінскі радыёзавод імя В. М. Молатава пачаў працу 6 лістапада 1940 года[105]. Захаваліся карпусы на пр. Незалежнасці, 56, 58 з датай на фасадзе «1940». Як прыгадваў былы супрацоўнік прадпрыемства В. Пумпянскі, «в июне сорок первого Минск очень сильно бомбили, но на завод не упало ни одной бомбы. Мы дежурили в цехах, но потом нам сказали: „Ребята, идите домой, к семьям. Правительства в Минске уже нет. Говорить не с кем". Обладая определенным опытом, мы могли бы за три дня вывезти весь завод: к цехам подходила железнодорожная ветка. […] Предложили этот вариант директору Давиду Львовичу Юделевичу. […] Тот сел за телефон, но никого нигде из руководства найти не смог. И мы

[102] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 65.

[103] *Усебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва «Ленін і Сталін арганізатары БССР». Жывапіс. Графіка. Скульптура. Архітэктура*, Мінск 1940, с. 181; *Збор помнікаў*…, с. 30.

[104] *Памяць*…, с. 228.

[105] В. Корбут, *Ламповые скелеты в шкафу*, «Советская Белоруссия» 2016, 9 января.

уехали, оставив этот прекрасный завод немцам»[106]. У 1941–1944 гадах радыёапараты выпускалі пад маркай Radiofabrik Minsk. На прадпрыемстве было створана гета (многія працаўнікі завода былі яўрэямі)[107]. Адступаючы з Менска, немцы 1 ліпеня 1944 года ўзарвалі значную частку прадпрыемства[108]. Аднак у ліпені прадпрыемства аднавіла працу[109].

Незалежнасці пр., 66, 68. Галоўны карпус Акадэміі навук БССР, як сведчаць фотаздымкі пачатку нямецкай акупацыі, быў у той час у рыштаваннях. Паводле А. Шукелойця, «у будынках Акадэміі навук БССР знаходзіліся, апрача сваіх багатых архіваў, два архівы, прывезеныя з Заходняй Беларусі: Віленскі гістарычны архіў і Радзівілаўскі архіў зь Нясьвіжу»[110]. (19 снежня 1939 года СНК БССР прыняў пастанову «Аб размяшчэнні архіва, якія прыбыў з г. Вільня», паводле якой дакументы мусілі захоўвацца ў будынку АН БССР. 16 ліпеня 1940 года на пасяджэнні ЦК КП(б)Б канстатавалася, што архіў знаходзіўся ў хаатычным стане.) Немцы, вызваляючы патрэбныя ім памяшканні ў правым крыле галоўнага корпуса АН БССР, выкінулі частку дакументаў на двор. Увесну 1942 года з Вільні прыехалі архівісты, якія разам з менскімі калегамі разабралі архіў, што праз некалькі месяцаў быў вернуты ў Вільню[111]. Нясвіжскі архіў з будынка АН БССР быў перавезены ў падвал кафедральнага касцёла, а потым – у Германію[112] (пазней вернуты ў Мінск). На 1 мая 1943 года ў будынку АН БССР размяшчаліся нямецкія штаб фронту і шпіталь[113].

---

[106] *«Еврейская» история одного белорусского завода* [online], https://jewishfreedom.jimdo.com/вениамин-пумпянский/ [доступ: 14.01.2017].

[107] В. Корбут, *Ламповые скелеты*…

[108] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 311.

[109] В. Корбут, *Ламповые скелеты*…

[110] А. Шукелойць, *op. cit.*

[111] *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 3*, Мінск 2004, с. 221–223.

[112] А. Шукелойць, *op. cit.*

[113] *Памяць… Кн. 4*, с. 60.

Незалежнасці пр., 79 / Сурганава вул., 19. У маі 1942 года ў Доме друку быў набраны першы нумар падпольнай газеты «Звязда», пра што сведчыць мемарыяльная дошка (устаноўлена ў 1972 годзе, абноўлена ў 1986-м)[114]. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі ў будынку выбуховыя прыстасаванні[115].

Нямігa вул., 30. Будынак клуба Менскай абутковай фабрыкі імя Л. М. Кагановіча быў пастаўлены ў 1930-я гады. На галоўным фасадзе змешчана мемарыяльная дошка з надпісам: «На этой фабрике в годы Великой Отечественной войны бесстрашно боролись против фашистских захватчиков советские патриоты-подпольщики».

Парк імя Чалюскінцаў. У паўночна-ўсходняй частцы парку імя Чалюскінцаў пахавана больш за 10 тысяч ваеннапалонных, якіх у студзені 1942 года расстралялі нямецкія захопнікі. Сярод пахаваных мірныя жыхары, падпольшчыкі, якіх акупанты загубілі ў 1941–1944 гадах. У 1945 года на магіле быў пастаўлены помнік – скульптура жанчыны ў жалобе[116].

Парыжскай Камуны пл., 1. У былым Беларускім дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета ўвосень 1942 года аддзел мастацтваў Беларускай народнай самапомачы арганізаваў Другую мастацкую выстаўку. Былі вылучаны шэсць секцый: жывапісу, графікі, скульптуры, народнай мастацкай творчасці, мастацкага фота, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва[117]. Адкрыццё выстаўкі было прызначана на 11 кастрычніка. 22 прафесійныя мастакі, тры аматары, сем вышывальшчыц з Менска і тры мастакі з іншых гарадоў прадставілі 292 творы[118]. Будынак па-святочнаму ўбралі беларускімі і нямецкімі сцягамі. На ўрачыстасць прыбылі генеральны камісар Беларусі В. Кубэ, камісар Менска Янэцке, камісар Менскай акругі Кайзер, іншыя

[114] *Збор помнікаў*…, с. 121, 138.

[115] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 319.

[116] *Збор помнікаў*…, с. 143.

[117] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 370, воп. 1, спр. 423, а. 31.

[118] М. Б., *Другая мастацкая выстаўка*, «Беларуская Газэта» 1942, 11 кастрычніка.

цывільныя і вайсковыя чыноўнікі[119]. Выстаўка размясцілася ў пяці пакоях. Эцюды, у якіх выявілася «вялікае замілаваньне мастака да абразкоў беларускае прыроды, дасканальнае майстроўства адлюстроўваць на палатне настроі гэтае прыроды», прадставіў М. Дучыц («Гарадскі сад увесну», «Вечар», «Хвоі», «Ля рэчкі»). Выстаўляліся творы І. Гембіцкага («Разбуджаны мэтлік», «Елачкі», «Сцежка», «Пахмурны дзень»). Палатно, прысвечанае Менску, стварыў А. Каржанеўскі. «Лепшы наш партрэтысты» В. Волкаў прадставіў на палатне постаць Кастуся Каліноўскага. Удалымі ў тагачаснай прэсе называліся работы А. Волкава, М. Гусева. «Моцнае ўражаньне» пакінулі пейзажы Я. Ціхановіча («Возера ў Клінку», «Лясы ў Волме», «Зіма», «Раніца ў лесе»), яго ж графічная работа «Партрэт старога». Г. Віер адзначыўся карцінай «Гістарычны музей». Сярод іншагародніх у выстаўцы ўдзельнічалі М. Сеўрук («Партрэт старога», «Кудзельніца»), А. Шымановіч (эцюд «Стары»), Кірышчэня (эцюд «Кветкі»). Мастак-аматар Лубнеўскі выставіў замалёўку «Касцёл і вежа»[120]. У 1941–1944 гадах інтэр'ер тэатра быў пашкоджаны, прадметы рэквізіту, дэкарацыі, карціны, мэбля знішчаны або вывезены ў Германію. Пры адступленні з горада немцы замініравалі будынак. Сапёры выявілі 200 авіябомб па 100 кг кожная, 1 «сюрпрыз», 50 запальных бомб[121]. Падчас размініравання знайшлі шмат фугасаў. Немцы разлічвалі на выбух ад пажару: сапёры знайшлі схаваны ў сцяне шнур ад дэтанатара, які быў прымацаваны да духавога інструмента[122]. Аднаўленне тэатра працягвалася да 1948 года[123].

Ракаўская вул., 24. У 1941–1944 гадах у будынку знаходзіўся Soldatenheim der Wehrmachtortskommandatur Minsk (салдацкі

---

[119] Ул. К., *Мастацтва народу (на адкрыцьці 2-ое мастацкае выстаўкі ў Менску)*, «Беларуская Газэта» 1942, 15 кастрычніка.

[120] М. Б., *Перамога мастацтва*, «Беларуская Газэта» 1942, 6 лістапада.

[121] Г. Шостак, *Театр оперы и балета «...зерно будущего и плевелы настоящего»* [online], https://ais.by/story/2292 [доступ: 15.02.2017] .

[122] В. Кірычэнка, *op. cit.*, с. 6.

[123] *Ibidem*, с. 21.

дом Менскай гарнізоннай камендатуры вермахта) з кінатэатрам. У снежні 1944 – 1961 годзе тут знаходзіўся кінатэатр «Беларусь»[124].

Ракаўская вул., 4. У 1933 годзе тагачасны Кацярынінскі сабор быў закрыты, прыстасаваны пад склад, унутраная прастора падзелена на тры паверхі[125]. 7 снежня 1941 года аднавіліся богаслужэнні. У адкрыцці храма ўдзельнічаў вікарый Менскай епархіі Ф. Нарко: галоўны прастол быў асвячоны ў гонар святых апосталаў Пятра і Паўла. Службы працягваліся да канца 1944 года[126]. Падчас нямецкай акупацыі тут знаходзіўся абраз Маці Божай Менскай, адрэстаўрыраваны ў 1941–1942 гадах мастаком Г. Віерам[127]. Г. Віер стварыў новы іканастас[128]. У царкве ў гэты час служыў І. Балай: паводле А. Шукелойця, «вельмі стары чалавек, йшчэ з царскай школы, вельмі добры прамоўца», у якога сакратаром быў святар В. Баравы[129]. Пасля 3 студзеня 1945 года, калі быў арыштаваны настаяцель храма протаіерэй А. Вернікоўскі, богаслужэнні тут спыніліся[130].

Савецкая вул. Са жніўня 1941 года член Камароўскай падпольнай групы КП(б)Б У. Амельянюк распаўсюджваў лістоўкі супраць нямецкіх акупантаў. З пачатку мая 1942 года з'яўляўся загадчыкам аддзела агітацыі і прапаганды Менскага падпольнага гаркама КП(б)Б, рэдактарам першага нумара падпольнай газеты «Звязда». Загінуў 26 мая 1942 года. У 1980 годзе на месцы гібелі, каля касцёла Святых Сымона і Алены, быў устаноўлены мемарыяльны знак з граніту і бронзы[131].

---

[124] А. Лычавко, *Снесенные, сгоревшие, перестроенные и сохранившиеся. Все кинотеатры Минска с 1900 года до наших дней* [online], https://news.tut.by/culture/387029.html [доступ: 24.02.2017].

[125] *Церкви и приходы…*, с. 36.

[126] *Ibidem*, с. 25, 36–37.

[127] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 61; *Церкви и приходы…*, с. 37.

[128] А. Шукелойць, *op. cit.*

[129] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 105.

[130] *Церкви и приходы…*, с. 37.

[131] *Збор помнікаў…*, с. 116–117.

Савецкая вул. / Незалежнасці пл. 7 лістапада 1933 года перад Домам Урада быў адкрыты помнік У. Леніну і плошча перад ім атрымала імя Леніна. Не пазней за 14–16 жніўня 1941 года фігура Леніна была скінута з пастамента[132]. Пастамент захаваўся. У кастрычніку 1944 – красавіку 1945 года фігура Леніна была адноўлена на ленінградскім заводзе мастацкага ліцця «Монумент-скульптура»[133]. Фігуру У. Леніна ўстанавілі на пастаменце к 1 мая 1945 года[134].

Савецкая вул., 11. Раніцай 24 чэрвеня 1941 года нямецкая бомба трапіла ў левае крыло Дома Урада, пасля чаго адсюль сышлі супрацоўнікі Савета Народных Камісараў, Вярхоўнага Савета БССР. А 23.30 са Сляпянкі, дзе ў той час размясціўся СНК, у Дом Урада выехалі, атрымаўшы загад эвакуіраваць архівы, намеснікі Старшыні СНК І. Крупеня, В. Гайсін, А. Шаўроў і сакратар СНК па абарончых пытаннях І. Куцейнікаў, аднак яны не здолелі вывезці дакументы, якія трапілі ў рукі немцаў[135]. У 1941–1944 гадах немцы называлі будынак Hochhaus («Высокі дом»). Як сведчаць надпісы, зафіксаваныя на фотаздымках над уваходам у левае крыло будынка, у нямецкую акупацыю тут знаходзіліся Галоўная дырэкцыя чыгункі – Цэнтр (Haupteisenbahndirektion – Mitte), менскае аддзяленне Дырэкцыі транспарту Рэйха (Reichsverkehrsdirektion – Minsk). На іншым здымку над галоўным уваходам відаць шыльда з надпісам Deutsche Dienstpost. Ostland. Dienstpostamt Minsk («Нямецкая паштовая служба. Остланд. Менскі службовы паштамт»). 3 ліпеня 1944 года а 3.00 раніцы заданне размініраваць Дом Урада атрымаў сапёр А. Кузняцоў. Кароткімі перабежкамі з ускраіны горада байцы дасягнулі будынка. Не кранаючы рукамі дзвярэй, цягнучы

---

[132] *Визит Генриха Гиммлера в Минск глазами личного фотографа Адольфа Гитлера* [online], https://news.tut.by/society/397482.html [доступ: 24.02.2017].

[133] С. Крапивин, *Дом правительства: люди, легенды, годы. 80 лет назад в Минске были открыты Дом правительства и памятник Ленину* [online], http://news.tut.by/society/373719.html [доступ: 8.11.2016].

[134] В. Кірычэнка, *ор. cit.*, с. 179.

[135] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 175, 184–186.

іх вяроўкамі, каб не нарвацца на «сюрпрызы» (падрыўныя прыстасаванні, якія мацаваліся тонкімі непрыкметнымі правадкамі да клямак, фортак), сапёры ўвайшлі ў вестыбюль і пачалі абследаваць будынак. Апоўдні праца была скончана. У падвалах і вестыбюлі было выяўлена да 200 авіябомб вагою па 250 кг кожная[136], больш за 50 фугасаў вагой ад 200 да 500 кг[137]. З будынка вынеслі 1950 кг выбухоўкі, 184 бомбы вагою па 100 кг, 14 скрынь ручных гранат[138]. Паводле А. Кузняцова, 3 ліпеня пасля 12.00 адзін з салдат збіў з фасада Дома Урада свастыку, «якая закрывала герб Беларусі»[139].

Савецкая вул., 15. У касцёле Святых Сымона і Алены ў 1941–1942 гадах служыў ксёндз С. Глякоўскі, у 1942–1944-м З. Ігнатавічус[140]. С. Глякоўскі запрасіў у 1941 годзе з Вільні мастака П. Сергіевіча для аздаблення інтэр'ераў (у 1942-м ён аднавіў вялікі абраз Божай Маці). Над рэстаўрацыяй будынка таксама працавалі мастакі А. Тычына, М. Дучыц, М. Керзін пад кіраўніцтвам А. Шукелойця[141]. 22 чэрвеня 1943 года ў Менскім гарадскім тэатры падчас тэракта загінулі некалькі сяброў Саюза беларускай моладзі, сярод якіх Яраслаў Кушаль – сын паэтэсы Наталлі Арсенневай і вайскоўца Францішка Кушаля[142]. Як успамінаў Аляксандр Станюта, яго «стрыечная сястра з сяброўкамі была на адпяванні Яраслава ў „чырвоным" цагляным касцёле, – яны добра яго ведалі, вадзілі з ім адну кампанію»[143].

Савецкая вул., 18. Галоўны корпус Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў узведзены ў 1931 годзе[144]. Паводле прапановы СНК БССР на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б 14 кастрычніка 1939

[136] *Ibidem*, с. 318–319.

[137] В. Кірычэнка, *op. cit.*, с. 6.

[138] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні*…, с. 302.

[139] *Памяць… Кн. 4*, с. 283.

[140] *Касцёл Святога Сымона і Святой Алены* [online], http://chyrvony.by/historyja/parafija/49-kasciol [доступ: 27.07.2016].

[141] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 61, 63–64.

[142] М. Бакун, *op. cit.*

[143] А. Станюта, *op. cit.*, с. 104.

[144] *Збор помнікаў*…, с. 115.

года было вырашана ў будынку размясціць штаб Беларускага фронту Беларускай асобай ваеннай акругі. 11 ліпеня 1940 года ваенная акруга была перайменавана ў Заходнюю. 24 чэрвеня 1941 года ў будынак папала нямецкая бомба. Адсюль не былі вывезены справы каманднага і начальніцкага саставу Заходняй асобай ваеннай акругі, многія з якіх трапілі ў рукі немцаў[145].

Сацыялістычная вул. Паводле І. Варанковай, у 1942 годзе немцы пабудавалі аўтарамонтны завод[146]. Паводле некаторых звестак, прадпрыемства вырасла на базе 17 рамонтных павільёнаў 26-й танкавай дывізіі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Прадпрыемства належала фірме Daimler-Benz і абслугоўвала вермахт. Сумесна з Арганізацыяй Тодта было ўзведзена больш за 30 рамонтных павільёнаў. Падчас будаўніцтва выкарыстоўвалася прымусовая праца ваеннапалонных і мясцовых жыхароў. Тут працавалі больш за пяць тысяч рабочых[147]. Прадпрыемства лічылася найбуйнейшым на тэрыторыі Рэйхскамісарыята Остланд. Адступаючы з Менска ў канцы чэрвеня 1944 года, немцы не здолелі эвакуіраваць абсталяванне завода, бо бракавала вагонаў[148]. Карпусы ваеннага часу дагэтуль захаваліся на тэрыторыі Мінскага аўтамабільнага завода з боку вул. Сацыялістычнай. Пасля 1944 года тут быў створаны Мінскі аўтамабільны завод[149].

Свабоды пл., 23. У верасні 1941 – улетку 1943 года будынак з'яўляўся рэзідэнцыяй генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ, як сведчаць фотаздымкі таго часу з выявай шыльды на галоўным фасадзе дома з надпісам Generalkomissar für Weissruthenien. Генеральны камісарыят знаходзіўся на трэцім паверсе. На другім размяшчаліся дапаможныя службы, кухня, рэстаран для старшых

---

[145] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 176, 187.

[146] *Ibidem*, с. 29.

[147] *Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/94953.html [доступ: 15.01.2016].

[148] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 306.

[149] *Bacian.livejournal.com* [online], http://bacian.livejournal.com/94953.html [доступ: 15.01.2016].

афіцэраў і гасцей, на першым – гаспадарчыя службы, кухня і рэстаран для малодшых афіцэраў і іншых наведвальнікаў[150]. Паводле А. Шукелойця, у 1941 годзе сюды з былой Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР было перавезена шмат твораў мастацтва, якія «яшчэ доўга былі складзеныя ў калідоры генэральнага камісарыяту на пляцы Волі. Урэшце й яны былі вывезеныя ў мястэка Гэгштат над Дунаем у Баварыі»[151].

Свабоды пл., 9. Кафедральны касцёл Імя Найсвяцейшай Панны Марыі ў 1934 годзе, пасля арышту ксяндза А. Пучкара-Хмялеўскага, быў закрыты. Пасля 1939 года будынак, паводле некаторых звестак, часам адкрывалі для набажэнстваў і правядзення абрадаў шлюбу і хрышчэння[152]. У пачатку нямецкай акупацыі храм быў вернуты вернікам[153]. Паводле ўспамінаў жыхаркі Мінска Зоф'і Сакалоўскай, запісаных у 2001 годзе, у 1941 годзе касцёл асвяціў ксёндз В. Гадлеўскі. На цырымоніі прысутнічаў бурмістр Менска В. Іваноўскі[154]. Паводле А. Шукелойця, «першую каталіцкую службу ў акупаваным Менску ў Катэдральным касьцёле адслужыў нямецкі капэлян з вэрмахту. За бальшавікамі ў гэтым касьцёле быў гараж, і нямецкія жаўнеры разам з тутэйшымі каталікамі мусілі цяжка папрацаваць, каб прывесьці сьвятыню да годнага выгляду. Алтарная сьцяна складалася з прынесенага з тэатру вялікага кавалку дэкарацыйнага палатна з узорамі народнай дзяружкі чорна-жоўтага колеру ды расьпяцьця з музэйнага складу»[155]. Камісія на чале з А. Шукелойцем (сябры камісіі мастакі А. Тычына, М. Дучыц, скульптар М. Керзін) абследавала храм. Паводле А. Шукелойця, «там вельмі цікавы росьпіс быў, з ранейшых часоў. Там, напрыклад, былі розныя абразы, такія

[150] О. Усачев, *op. cit.*

[151] А. Шукелойць, *op. cit.*

[152] С. Адамовіч, *Цуд адраджэння*, «Наша вера» 1998, № 1, с. 16.

[153] *Ibidem*, с. 16–17.

[154] *Святло Чырвонага касцёла. Да стагоддзя Касцёла Святога Сымона і Святой Алены*, укл. У. Завальнюк, А. Сакалоўская, Мінск 2015, с. 128.

[155] А. Шукелойць, *op. cit.*

калёны намаляваныя, што яны не супадалі з калёнамі касьцёлу. […] Мы сабраліся ў гэтым касьцёле, агледзелі яго. Трэба было касьцёл аднаўляць, але мастакі тады парадзілі, што няхай усё застаецца так, як ёсьць. Скончыцца вайна, тады прыедуць сюды і сьвятары, і будуць мастакі-спэцыялісты, якія вырашаць, што з гэтым росьпісам рабіць. А пакуль што – мы ўстрымаемся нешта рабіць. Айцец Гляко̆ўскі даў Сергіевічу ў гэтым Катэдральным саборы расьпісаць зь левага боку аўтар левай навы»[156]. 29 чэрвеня 1944 года ў Менск прыехаў ксёндз В. Шутовіч, які стаў пробашчам кафедральнага касцёла, але пасля яго арышту 26 студзеня 1945 года[157] храм быў закрыты.

Свярдлова вул., 15. Паводле ўспамінаў Рагнеды (Ірыны) Раманоўскай, дачкі Кузьмы Чорнага, «у панядзелак, 23 чэрвеня, бацькі паслалі мяне па хлеб. Магазін быў побач з маёй школай [№ 20, на сучаснай вул. Свярдлова, 17. – *В. К.*] […]. І раптам завылі сірэны: паветраная трывога»[158].

Свярдлова вул., 17. Паводле І. Варанковай і Р. Раманоўскай, да 1941 года тут знаходзілася беларуская «сталінская школа» № 20[159]. Гл. вышэй. Паводле Р. Раманоўскай, «у школьным двары побач з нейкімі дзядзькамі я пераседзела тую трывогу. Пасля адбою пабегла дадому»[160].

Свярдлова вул., 2. Як сведчаць фотаздымкі 1941–1944 гадоў, у той час будынак фабрыкі-кухні быў прыстасаваны пад гатэль «Нямецкі дом»: надпіс Hotel Deutsches Haus быў змешчаны наверсе барабана ўваходнай групы, пад гэтай жа назвай дом фігуруе на карце 1943 года.

Слясарная вул., 41. Хлебазавод-аўтамат быў уведзены ў эксплуатацыю ў 1940 годзе[161]. У 1941–1944 гадах (Brotfabrik Automat)

---

[156] З. Пазьняк, *op. cit.*, с. 64–65.

[157] Л. Маракоў, *Галоўная вуліца Мінска (1880–1940 гг.). Кн. 1*, Мінск 2012, с. 59.

[158] *Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет: успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы*, уклад. Г. Шаблінская, Мінск 2016, с. 40.

[159] *Ibidem*, с. 44.

[160] *Ibidem*, с. 40.

[161] *Хлебозавод «Автомат»* [online], http://www.minskhleb.com/enterprise/factories/avtomat/ [доступ: 14.01.2017].

дзейнічаў. 3 ліпеня 1944 года сапёры выявілі ў будынку выбуховыя прыстасаванні[162]. Прадпрыемства аднаўлялі да 1947 года[163]. На будынку змешчана мемарыяльная дошка пра дзейнасць на заводзе ў 1942–1944 гадах падпольнай групы пад кіраўніцтвам Менскага падпольнага гаркама КП(б)Б.

Сухая вул. На тэрыторыі былых яўрэйскіх могілак цяпер знаходзіцца мемарыяльны сквер, дзе сабраны ацалелыя надмагільныя помнікі як з гэтых могілак, так і з месцаў пахаванняў яўрэяў у іншых раёнах Мінска. Побач усталяваны стэлы ў памяць пра знішчаных у Менскім гета яўрэяў з нямецкіх гарадоў Бона, Брэмена, Гамбурга, Дзюсельдорфа, Кёльна, чэшскіх гарадоў Брно і Тэрэзін. Увосень 2008 года, у 65-ю гадавіну знішчэння Менскага гета, тут была пастаўлена скульптурная кампазіцыя «Разбіты ачаг» з надпісам: «На гэтым месцы ў 1941–1943 гг. фашыстамі і іх пасобнікамі было знішчана звыш 5000 яўрэяў. Вечная памяць бязвінным ахвярам нацызму».

Сяліцкага вул. 22 чэрвеня 2015 года адбылося адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Трасцянец», увянчанага кампазіцыяй «Брама памяці». Назва «Трасцянец» аб'ядноўвае некалькі месцаў масавага знішчэння людзей пад Менскам у 1941–1944 гадах: урочышча Благаўшчына – месца масавых расстрэлаў, уласна лагер побач з вёскай Малы Трасцянец (цяпер у межах Мінска ўздоўж вул. Сяліцкага), урочышча Шашкоўка – месца масавага спальвання людзей. Да 1941 года на гэтай тэрыторыі існаваў калгас імя Карла Маркса. У пачатку 1942 года ў ваколіцах вёскі Малы Трасцянец на 200 га ўгоддзяў былога калгаса немцы стварылі працоўны лагер, агароджаны калючым дротам пад электрычным токам[164]. Восенню 1941 года ўрочышча Благаўшчына на 11-м кіламетры Магілёўскай шашы, за паўтара кіламетра ад вёскі Малы Трасцянец, было абрана акупан-

[162] И. Воронкова, *Минск: лето 1941*…, с. 319.
[163] *Хлебозавод «Автомат»*.
[164] В. Корбут, *Ад Мінска да Вільні*…, с. 317, 323.

[43] *В пути. Белорусское кино сегодня*, «Искусство кино» 1978, № 6, с. 15–46.
[44] И. Кукулин, *op. cit*.
[45] А. Шпагин, *op. cit*.

Smirnow), *Adres waszego domu* («Адрес вашего дома», 1972, reż. Jewgienij Chriniuk), *Mieszczanie* («Горожане», 1975, reż. Władimir Rogowoj). Podobną tendencję obserwowano w kinematografii białoruskiej: weteran wojny był ukazywany jako człowiek z zasadami, o nienagannej reputacji. Taka jest nieugięta i wymagająca sekretarz redakcji gazety obwodowej Anna Gubariewa w filmie *Spotkanie pod koniec zimy* («Встреча в конце зимы», 1978, reż. Iosif Szulman). Wierny swoim ideałom i towarzyszom bojowym pozostaje też były czołgista, który poszukuje przyjaciela wojennego w filmie *Nieznana piosenka* («Незнакомая песня», 1983, reż. Anatolij Kudriawcew). Przykładem do naśladowania dla młodego pokolenia obywateli sowieckich przez swój heroizm wykazany zarówno na wojnie, jak i w pokojowym życiu powojennym była również postać partyzantki w filmie *Sprawdzian z zawodu* («Контрольная по специальности», 1981, reż. Boris Szadurski). Filmy, jak *Sprawdzian z zawodu*, w których weterani w konfrontacji z młodym pokoleniem ukazani są jako przykład godny naśladowania, odpowiadał dyrektywnemu żądaniu reżimu sowieckiego „przybliżenia bohaterstwa przeszłości czasom współczesnym”[46]. Reprezentowane przez weteranów wartości miały być wskazówką dla młodego pokolenia obywateli sowieckich.

Dążenie władzy do wspierania i umacniania mitu zwycięstwa zachęcało do poszukiwania mechanizmu aktualizacji pamięci o wojnie. W latach siedemdziesiątych w kinematografii sowieckiej pamięć o wojnie zaczęto aktualizować poprzez współczesne świadectwa bohaterów wojennych. Wspomnienia żywych świadków wojny stały się narzędziem, zapewniającym zachowanie pamięci o wojnie, której nie da się i nie można zapomnieć. W filmach obok współczesnego protagonisty z traumatycznym doświadczeniem pojawił się antagonista z przeszłością nazistowską. Obraz *Wezmę twój ból* («Возьму твою боль», 1980, reż. Michail Ptašuk) opowiada historię o tym, jak do rodzinnej wsi po długim uwięzieniu wraca były pomocnik nazistów Szyszkowicz. Brał

[46] Д. Андреев, Г. Бордюгов, *op. cit.*, s. 26.

on udział w mordowaniu mieszkańców tej miejscowości. Zetknięcie się antagonisty z bohaterem, którego bliskich zamordował, nie tylko obnaża traumatyczne doświadczenia, ale też staje się dowodem na to (antagonista dokonuje zamachu na życie bohatera), że wobec przestępców wojennych nie obowiązuje termin przedawnienia. W filmie *Świadek* («Свидетель», 1985, reż. Walerij Rybariew) wspomnienia mieszkającego w domu dziecka Kolki Leteczki z nazistowskiego obozu koncentracyjnego dla dzieci ożywia proces sądowy nad pomocnikami nazistów. Kwintesencją owej tendencji w białoruskiej kinematografii może być fraza z filmu *Ogród* («Сад», 1983, reż. Witalij Czietwierikow): wojna skończy się dopiero wówczas, gdy kara spotka wszystkich nazistów i ich pomocników. Powstały w 1984 r. film *Radunica* («Радуница», 1984, reż. Jurij Maruchin), którego akcja rozgrywa się podczas tradycyjnego święta zmarłych, można oceniać dwojako: zarówno jako świadectwo filmowe tego, że traumatyczne doświadczenie wojenne dotknęło wszystkie rodziny białoruskie, jak i potwierdzenie sądu, iż obrazy wspomnień wojennych stały się organiczną częścią białoruskiej kultury pamięci.

W 1985 r. na ekranach kin w Związku Radzieckim pokazano powstałe w studiu filmowym *Belarusfilm* dzieło E. Klimowa *Idź i patrz* («Иди и смотри»), które stało się świadectwem zakończenia okresu *zastoju* politycznego i głosiło nowy kurs polityczny – *pieriestrojkę*. Ten film nie stanowił zamachu na sowiecki mit zwycięstwa, co więcej, akumulował wszystkie dotychczasowe wątki i obrazy narracji o wojnie. Są w nim obecne najwyraźniejsze symbole białoruskiej wojennej opowieści – to partyzantka i spalona przez faszystów wieś, którą symbolizowała Chatyń. Jednak ze względu na szokujące hiperrealistyczne wojenne obrazy, powstałe na motywach prozy A. Adamowiča oraz zwycięstwo po siedmioletniej walce reżysera z cenzurą[47] film ten stał się symbolem nowej polityki *głastnosti*.

[47] М. Мурзина, *«Иди и смотри»: съемки превратились для Элема Климова в борьбу с цензурой*, «Аргументы и факты» 2010, 20 октября.

Podsumowując, można stwierdzić, że powstałe w studiu filmowym *Belarusfilm* w latach 1946–1985 filmy fabularne o II wojnie światowej stały się odbiciem oficjalnej polityki historycznej reżimu sowieckiego. Ta polityka sprawiła, że bardziej otwarcie o wojnie zaczęto mówić w filmach powstałych w okresie odwilży, za panowania Chruszczowa (1953–1964), gdyż reżim polityczny dostrzegał korzyści w bardziej otwartym opowiadaniu o wojnie, które mogło przyczynić się do obalenia kultu Stalina. Film białoruski wyraźnie odzwierciedla zapoczątkowaną w ZSRR, poczynając od połowy lat sześćdziesiątych XX w. aktualizację pamięci o wojnie – obrazy zwycięstwa nad nazizmem szeroko wykorzystywano zarówno do legitymacji reżimu politycznego, jak i konstruowania tożsamości sowieckiego człowieka. Wówczas w studiu *Belarusfilm* powstało wiele filmów o tematyce wojennej, które swoją treścią odzwierciedlały podstawowe tendencje sowieckiej narracji o wojnie. Wyjątkową cechą białoruskiej opowieści o wojnie była szczególna uwaga poświęcana walkom białoruskich partyzantów.

Bibliografia

Авдеев И., Зайцева Л., *Все белорусские фильмы: каталог-справочник.* Т. 1. *Игровое кино (1926–1970)*, Минск 1996.

Акудовіч В., *Код адсутнасці (асновы беларускай ментальнасці)*, Мінск 2007.

Андреев Д., Бордюгов Г., *Пространство памяти: Великая Победа и власть*, Москва 2005.

Беларусы. Т. 12. *Экраннае мастацтва*, рэд. А. Красінскі, Мінск 2009.

Быкаў В., *Поўны збор твораў у 14 т.* Т. 9, Мінск 2012.

Быкаў В., *Доўгая дарога дадому*, Мінск 2003.

В пути. Белорусское кино сегодня, «Искусство кино» 1978, № 6.

Воронов А., *Проблема правдоподобия и правды в советских и российских художественных фильмах, посвященных Великой Отечественной войне*, «Вестник Ленинградского государственного университета им. А. С. Пушкина» 2010, № 2, с. 225.

Горных А., *Медиа и общество*, Vilnius 2013.

Земцов А., *Фильм о патриотическом подвиге*, «Правда» 1949, 12 сентября.

Зоркая Н., *История отечественного кино. XX век*, Москва 2014.

История отечественного кино, ред. Л. М. Будяк, Москва 2005.

Караганов А., *Война и люди*, «Правда» 1975, 6 мая.

Климов Э., *Лариса: книга о Ларисе Шепитько*, Москва 1987.

Кокосов Н., *Память строгого режима. История и политика в России*, Москва 2011.

Красинский А., *Художественная кинолетопись героизма*, «Коммунист Белоруссии» 1975, № 7.

Кукулин И., *Регулирование боли (предварительные заметки о трансформации травматического опыта Великой Отечественной / Второй мировой войны в русской литературе 1940–1970-х годов)*, «Неприкосновенный запас» 2005, № 2–3 [online], http://magazines.russ.ru/nz/2005/2/ku37-pr.html [dostęp: 13.03.2018].

Лазарев Л., *Записки пожилого человека. Книга воспоминаний*, Москва 2005.

Ливенцов В., *Патриотический фильм*, «Известия» 1949, 13 сентября.

Ліндэнэр Р., *Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст.*, Санкт-Петербург 2005.

Мурзина М., *«Иди и смотри»: съемки превратились для Элема Климова в борьбу с цензурой*, «Аргументы и факты» 2010, 20 октября.

Новиков И., *Снимается «Пламя»*, «Правда» 1974, 28 апреля.

Орлова А., *Способы воплощения «образа врага» в советском киноискусстве 1940-х годов (на материале художественных фульмов о Великой Отечественной войне)*, «Вестник Костромского государственного университета им. Н. А. Некрасова» 2015, № 4.

Радлінг П., *Вялікая Айчынная вайна ў сьвядомасьці беларусаў*, „Arche" 2008, № 5.

Суменов Н., *В тылу врага*, «Правда» 1975, 21 октября.

Урбан М., *Беларуская савецкая эліта (1966–1986): алгебра ўлады*, Vilnius 2010.

Федоров А., *Структурный анализ медиатекста: стереотипы советского кинематографического образ войны и фильм В. Виноградова «Восточный коридор» (1966)*, «Вопросы культурологии» 2011, № 6.

Хеслер И., *Что означает «проработка прошлого»?* [в:] *Память о войне 60 лет спустя. Россия, Германия, Европа*, Москва 2005.

Шпагин А., *Религия войны. Субъективные заметки о богоискательстве в кинематографе о войне*, «Искусство кино» 2005, № 6.

Шыбека З., *Нарыс гісторыі Беларусі. 1795–2002*, Мінск 2003.

Экран и культурное наследие Беларуси, ред. А. Карпилова [и др.], Минск 2011.

Элем Климов. Неснятое кино, Москва 2008.

How Belarusian films in Soviet times narrated history of the World War II

Image of the World War II was expressive in the Soviet Belarusian culture of remembrance, this was predetermined by not only the political regime historic policy, but also due to the fact that the war really left a deep footprint in the Belarusians' collective memory. In the Soviet Belarus film studio *Belarusfilm* («Беларусьфільм») was created about 70 artistic movies, which subject was history of the World War II. This paper analyzes how film studio *Belarusfilm* in 1946–1985 created films was told history of the World War II. It is tried to answer the question of how the feature films about the war reflected the official policy of Soviet regime history and develop Belarusian cinema narrative about the feature of the war. This article show that in film studio *Belarusfilm* 1946–1985 created artistic films about the World War II became official Soviet regime reflection of political history. Politic of political rezime history determined that about war was openly speak just in Khrushchev's thaw (1953–1964) time created films, because for political regime was useful openly narrative about war, which could serve to Stalin's identity cult destruction. Belarusian film reflect from the mid-sixties of the 20th century an active memory of the war actualization in the Soviet Union started: began widely exploit images of the victory over Nazism both for its political regime legitimation and Soviet human identity construction. *Belarusfilm* studio increased number of the movies on the war theme which content reflected the main trends of Soviet narrative about the war. It is argued that exclusive belarusian film narrative feature about the war was special attention for Soviet Belarusians partisans fighting representation.

K e y w o r d s : the World War II, policy of history, Belarus, cinema

Diaspora białoruska

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.431-448

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190415

Data przesłania: 07.03.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

Наталля Гардзіенка
Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва
nhardzijenka@gmail.com
ORCiD: 0000-0002-1349-5474

Дакументы Юрыя Туронка ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва

Dokumenty Jerzego Turonka w zbiorach Białoruskiego Państwowego Archiwum Muzeum Literatury i Sztuki

Tekst dotyczy archiwum Jerzego Turonka zdeponowanego w zbiorach Białoruskiego Państwowego Archiwum Muzeum Literatury i Sztuki w Mińsku (BDAMLiM). Na zespół Turonka składa się wiele dokumentów biograficznych, rękopisów i maszynopisów prac autora, zdjęcia i korespondencja z dziesiątkami osób z różnych krajów. Ogromną część zespołu archiwalnego stanowią dokumenty zebrane przez historyka w trakcie badań. Są to m.in. materiały ze zbiorów Mariana Pieciukiewicza, Viery Muraški i innych. Pierwsza część tego archiwum trafiła do Mińska na początku lat 90. XX wieku, pozostałe zaś zostały przekazane niedawno. Proces przekazania trwa do dziś. Dzięki J. Turonkowi do zbiorów BDAMLiM trafiło wiele rzadkich książek i czasopism.

Słowa kluczowe: Jerzy Turonek, zespół archiwalny, dokumenty, korespondencja, kolekcja

Кантактуючы з беларускімі дзеячамі розных краін, Юры Туронак часта разам з лістамі атрымліваў ад сваіх адрасатаў і часткі іх архіваў або кнігазбораў. Гэта прывяло гісторыка да думкі пра неабходнасць упарадкавання атрыманых рарытэтаў, а таксама і ўласных дакументаў, і перадачы іх на сталае захоўванне ў нейкае сховішча.

З пачатку 1990-х гадоў Ю. Туронак наладзіў кантакт з тады яшчэ Цэнтральным дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва БССР у Мінску, куды паступова стаў перадаваць розныя дакументы і выданні. Ужо 20 красавіка 1990 года Ю. Туронак напісаў заяву аб перадачы ў архіў-музей рукапісаў сваёй кнігі «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», нарысаў, дакладаў, а таксама некаторых кніг і перыядычных выданняў. І надалей на працягу некалькіх гадоў з Варшавы ў Мінск ён накіроўваў дакументы, друкаваныя выданні і іншыя прадметы. Нешта прывозіў асабіста, наведваючы навуковыя мерапрыемствы ў Мінску, рэшту перадаваў праз знаёмых. Працэс перадачы каштоўнасцей з прыватных збораў гісторыка ў архіў-музей адлюстраваўся ў перапісцы з дырэктарам Ганнай Сурмач. У лістах і паштоўках гісторык дакладна пазначаў, што перадае ў архіў.

Ніжэй публікуюцца некаторыя пісьмы Ю. Туронка да Г. Сурмач (з захаваннем лексічных і сінтаксічных асаблівасцей арыгінальных дакументаў).

Дакумент № 1

Варшава, 3.10.1990 г.

Добры дзень, спадарыня Ганна!

На жаль, не змог пазваніць Вам перад ад'ездам з Менска. Недзе прапала картачка з Вашым тэлефонам, знайшлася толькі тут, у Варшаве. Прабачце. Іншай страты не было: кніжку Сачанкі атрымаў літаральна ў апошнюю гадзіну, так што з гэтым праблемы няма.

Толькі пад канец верасня атрымаў Ваш ліст ад 2 жніўня, разам з некалькімі ліпеньскімі «Нёманамі». За ўсё дзякую.

Прыемна было з Вамі пазнаёміцца асабіста. Шкадую толькі, што так мала часу было на размовы. Гэтаму не спрыяў «арганізацыйны канвеер» па дарозе ў Полацк і назад. Спадзяюся на наступны раз. А калі будзеце ў Варшаве, не мінайце нашай хаты. […]

На днях, здаецца, будзе нагода паслаць у Ваш архіў крыху старыны. Падрыхтаваў два невялікія пакеты – можа добрыя людзі захочуць узяць. Змест падаю на аддзельных картачках. Буду ўдзячны за некалькі слоў аб атрыманым (як заўсёды).

Увогуле, гэтага дабра можа быць крыху болей. Буду пасылаць часткамі пры нагодзе. Вядома, аб вартасці матэрыялу будзеце рашаць пасля азнаямлення.

Жадаю Вам усяго найлепшага!

З прывітаннем, Юры Туронак.

Дакумент № 2

Белавежа, 6.10.1990 г.

Дзякую за перадачу, якую тут атрымаў ад С. Шупы, асабліва за здымак з Полацка.

Юр.

1 пакет

В. Ярмалковіч. Крывы горад. Вільня.

Літ.-маст. зборнік. 1970. № 1 і 2.

Ю. Жывіца (сапр. прозв. Юры Попка):

- Пушча шуміць, 1963;
- Праз слёзы, 1951;
- Носьбіт ідэі, 1964.

«Беларус» 8/90 – «Кантакт» №4.

2 пакет

«Баявая ўскалось» – 11 сшыткаў.

Кавыль. Пад зорамі белымі. 1954.

Ruža.

Szkice. № 8/1988.

Program rozwoju kultury w woj. białostockim (ні слова пра нашу).

Wystawa sztuki ludowej.

Setna rocznica Kupały i Kołasa.

Byelorussian Folk Festival. 1977.

Дакумент № 3

Варшава, 19.12.1990 г.

Шаноўная Ганна!

Карыстаючыся нагодай шлю:

1. Міркулевіча (старога мінчаніна) „Refleksje białoruskie” (машынапіс);

2. Ярмалковіча – пра БХД і БСС;

3. «Весткі беларусаведы» – тры (там жа працы Ярмалковіча).

Адначасова прыміце мае найлепшыя калядныя і навагоднія віншаванні.

Прабачце, пішу амаль на калене.

З прывітаннем, Ю. Туронак.

Дакумент № 4 (паштоўка)

Варшава, 4.02.1991 г.

Добры дзень, спадарыня Ганна!

16–17 лютага спадзяюся выступіць на Браслаўскіх чытаннях з дакладам пра друйскі марыянскі манастыр. Калі Вас не сустрэну, перадам камусь часопісы і іншае для Вашага архіва.

З прывітаннем, Юр. Туронак.

Дакумент № 5

Варшава, 14 лютага 1991 г.

Шаноўная спадарыня Ганна!

Карыстаючыся нагодай, шлю Вам чарговыя матэрыялы.

1. Раней выслаў Вам некалькі тэкстаў Віктара Ярмалковіча, а сёння шлю ягоную біяграфію, якую прапаную далучыць да камплекта. Прынамсі, будзе менш-больш вядома, які быў лёс гэтага чалавека.

2. Маю архіўную папку «Матэрыялы дзядзькі Антона». Артыкул быў апублікаваны, магчыма, ён у Вас ёсць, а калі не, то будзе. Увогуле, хацеў бы, каб у Вашым архіве былі ўсе мае найважнейшыя апублікаваныя працы. Спадзяюся іх прывезці ў Мінск 24 мая г. г. (у сувязі з устаноўчым сходам Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў).

3. «Летапіс беларускай эміграцыі», № 73 і 74. І на мой ліст Панькоў не адказаў. Пачакаем цярпліва – можа чалавек хворы, яму ўжо бадай каля 84–85 гадоў. Гэтую справу абмяркуем пры сустрэчы. Калісь перадаваў некалькі экзэмпляраў «Летапісу» Валі Трыгубовіч і адзін-два яшчэ камусь, але не памятаю каму (Шупу ці Янушкевічу Язэпу?). Можа, яны былі б згодны іх перадаць у Ваш архіў?

4. Мой даклад пра друйскі манастыр «ва ўсім творчым працэсе», г. зн. чарнавікі, скарочаная версія для бюлетэня «Браслаўскіх чытанняў» і (пакуль што) апошняя версія + тры здымкі. Усё непатрэбнае выкідайце.

16 лістапада 1990 г. звяртаўся да Вас з запытаннем, ці патрэбныя Вам пераклады Пятроўскага і Веры Рыч. Напішыце пры нагодзе.

Як заўсёды, буду ўдзячны за вестку аб атрыманні пасылкі, як заўсёды, шлю найлепшыя пажаданні і прывітанні.

5. «Конадні» № 1–7 (камплект) [дапісана ад рукі. – *Н. Г.*].
Ю.Туронак

Дакумент № 6

Варшава, 28.02.1991 г.

Шаноўная спадарыня Ганна!

Спадзяюся, што Вы ўжо атрымалі матэрыялы, якія згадзілася перадаць сп-ня Таццяна Святловіч. Сёння, дзякуючы новай нагодзе, шлю ў Ваш архіў наступныя выданні, якія з'явіліся ў першыя пасляваенныя гады на чужыне:

Сяднёў.
На край святла. 1947.
Спадзяванні. 1947.
У акіяне ночы. 1947.
Ля ціхай брамы. 1955.
Салавей.
Звіняць званы святой Сафіі. 1946.
Сіла гневу. 1946.
Крушына.
Лебедзь чорная. 1947.
Кавыль.
Пад зорамі белымі. 1954.
Цяжкія думы. 1961.
Юхнавец.
Шорах моўкнасці. 1956.
Калумбы. 1967.
Клішэвіч.
Далячынь. 1964.
Шакун.
След пяра. 1964.
Ніна Змагарка.
Памятай бацькаўшчыну! 1950.
Е. Кіпель.
Аснова маралі. 1953.
К. Вітан.
Лявон Вітан-Дубейкаўскі. 1954.
Я. Станкевіч. Маленькі маскоўска-беларускі слоўнічак. 1953.

Национальность и происхождение Ивана Федорова. 1966 (магчыма, выдадзеная Янкам Станкевічам).

Пішыце хоць некалькі слоў, ці атрымоўваеце пасылкі.

З прывітаннем, Ю.Туронак.

Дакумент № 7

Варшава, 17.03.1991 г.

Шаноўная спадарыня Ганна!

Дзякую за ліст ад 6 сакавіка. Добра ведаць, што часта незнаёмыя і выпадковыя людзі акуратна перадаюць Вам пасылкі. Дзякую таксама за «Старажытную Беларусь» Ермаловіча, якую вельмі хацеў мець.

У суботу, 24 сакавіка, паедзе ў Менск мой малады прыяцель Мікола Ваўранюк, аднак сёння, пішучы гэты ліст, не ведаю, што ён з сабой зможа ўзяць. Маю дзве пасылкі, з якіх, спадзяюся, адна паедзе ў суботу:

1. «Летапіс», камплект, які на Вашу і маю просьбы да Панькова прыслаў яго супрацоўнік Пеляса. Ад яго таксама розныя старыя выданні, якіх пераважную частку Вы атрымалі. «Летапіс» лічу важным здабыткам. Гэта т. зв. новая серыя. Раней Леанід Галяк выпусціў у Нямеччыне і ЗША 14 нумароў, з якіх магу Вам прыслаць № 12. Іншых пакуль што няма. Калісь Панькоў абяцаў зрабіць ксераксы, аднак, відаць, не меў такой магчымасці. Дарэчы, здаецца, старая серыя мела іншы характар. Аб пачатках «Летапісаў» гл. «Паказьнік беларускіх выданьняў на чужыне», 1952, с. 36. Мы ўжо падзякавалі, лічу, што з увагі на паліткарэктнасць справы пакуль што гэтага не рабіце.

2. Ля чужых берагоў (альманах). 1955.

Брага (Тумаш). Пытанне імя Скарыны. 1967.

Палягошка. Успаміны. 1968.

Юстапчык. Каханы горад. 1948.

Жылка. Творы (частка кнігі). 1953.

Косараў. Англа-беларускі слоўнік. 1982.

Засецкі. Міністэрства беларускіх спраў. 1919.

Богогласник. 1912.

Беларускі царкоўны спеўнік. 1979.

Ёсць яшчэ і іншыя матэрыялы, якія буду пакрысе высылаць пры нагодзе або сам прывязу ў Менск, калі атрымаю запрашэнне на з'езд Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, праектаваны на канец мая. За копію пра Івана Фёдарава дзякую, гэтым займацца не буду.

З прывітаннямі і найлепшымі пажаданнямі, Ю.Туронак.

Дакумент № 8

Варшава, 17.10.1991 г.

Шаноўная спадарыня Ганна! […]

Спадзяюся, што Валерыя перадала Вам мае матэрыялы. З іх найважнейшыя – часопіс «Беларуская моладзь», чарговы летапіс. У «БМ» цікавыя ўспаміны «Падрэзаныя крылы» (№ 22-23). Пры нагодзе прашу паведаміць новы адрас і тэлефон ЦДАЛіМ.

З прывітаннем, Юры Туронак.

Відавочна, што кантакты і далей працягваліся, аднак лістоў пазнейшага часу не захавалася.

У архіве-музеі быў створаны асабісты фонд Ю. Туронка, а першы вопіс быў прыняты экспертна-метадычнай камісіяй 8 верасня 1993 года: 292 дакументы, а таксама друкаваныя выданні і музейныя прадметы. Праўда, са спадзяваннем на далейшае паступленне дакументаў навукова-тэхнічную апрацоўку фонда тады вырашылі не рабіць.

Цяперашняя кіраўніца БДАМЛіМ Ганна Запартыка таксама добра знаёма з Ю. Туронкам, сустракалася з ім на розных мерапрыемствах.

У канцы 2014 года БДАМЛіМ звярнуўся да Ю. Туронка з прапановай працягнуць фарміраванне яго фонда. Гісторык з радасцю адгукнуўся. Ужо ў красавіку 2015 года з Варшавы была перададзена новая вялікая група дакументаў, і на працягу наступных гадоў архіў-музей атрымаў значнае папаўненне згаданага фонда. У выніку, быў складзены другі здатачны вопіс амаль на 2000 дакументаў.

Усё перададзенае Ю. Туронкам у архіў-музей было сістэматызавана паводле традыцыйнай для фондаў асабістага паходжання схеме, але перш, чым падаць больш дакладнае апісанне фонда, варта вылучыць некалькі асобных набораў дакументаў, каментарыі да якіх напісаў сам фондаўтваральнік.

Дакументы Веры Маслоўскай

І ў перададзеных у пачатку 1990-х гадоў дакументах, і ў атрыманых на працягу апошніх гадоў важнае месца займаюць матэрыялы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю грамадскай дзяячкі і паэтэсы Веры Маслоўскай. Да першага камплекта яе дакументаў, перададзеных у БДАМЛіМ, Ю. Туронак дадаў адмысловую нататку, якую тут публікуем.

Дакумент № 9

Варшава, 27.10.1990 г.

Нататка для архіва літаратуры і мастацтва

З паловы 60-х гадоў пачаў я вывучаць гісторыю беларускіх школ на Беласточчыне. Між інш., цікавіўся становішчам у вёсцы Агароднічкі, што каля Супраслі – якая там была школа «за саветаў» (1939–1941) і ў час нямецкай акупацыі, хто вучыў і г. д. Мне рэкамендавалі пагаварыць са старой настаўніцай, Верай Карчэўскай, якая тады вучыла і зараз жыла ў Супраслі.

У ліпені 1967 г. адведаў Веру. Прыняла мяне стрымана, насцярожана, на пытанні адказвала неахвотна, спасылаючыся на не найлепшую памяць. Між інш., сказала, што за немцаў яна вучыла ў Агароднічках, але толькі да Каляд 1941 г., потым школу закрылі і вучыла тайна, што пагражала рознымі рэпрэсіямі. Гэтая яе інфармацыя была выкарыстана мною ў артыкуле «Акупацыйная школьная палітыка III рэйха ў Беластоцкай акрузе» („Przegląd historyczno-oświatowy" 1976, № 63, s. 310), які выслаў ёй з падзякай.

Праз дзесяць гадоў зноў давялося адведаць Веру. Калі зайшоў у яе кватэрку і яшчэ не паспеў прывітацца, як трэба, угледзеў на сцяне вялікую фатаграфію «Беларускія вучыцельскія курсы» (Вільня, 1919 г.). Запытаў яе неяк недарэчна: «Чаму гэтая фатаграфія ў Вас?» Тады Вера запытала: «А чаму гэта Вас цікавіць?» Тады я: «А таму, што і ў мяне ёсць такая ж, мой бацька быў там на гэтых курсах. Во яго здымак».

Вера крыху задумалася, памаўчала і раптам клікнула: «Сыночку! Даруйце мне старой, я тады Вас абманула з гэтай школай… Была яна ў Агароднічках і пазней, у 1943/44 годзе, працавала афіцыйна, і я з мужам тады працавалі. Ды вось потым адбыліся рэпрэсіі, палякі мужа выдалі саветам, яго вывезлі… Таму баялася. А не ведала, што Вы сын Браніслава, які на тых курсах нават крыху заляцаўся да мяне».

З гэтага часу мы ўжо гаварылі спакойна і свабодна. У выніку, 5 сакавіка 1978 г. у беластоцкай «Ніве» з'явілася мая публікацыя «Забытая ліра Веры Мурашкі». Усё ж, відаць, Вера не пераставала баяцца, прасіла абмежавацца псеўданімам, не падаваць яе прозвішча.

Хутка, аднак, пачаў «эксплуатаваць» Веру журналіст «Нівы» Мікола Гайдук. Відаць, згадзілася на «дэканспірацыю» (гл. артыкул Гайдука).

Вера баялася не толькі нямецкай акупацыі, але і сваёй эсэраўскай прошласці. Аднак колішняя слаўная Маслоўская ў 1939–1941 гг. была Карчэўская, што пакуль што яе ратавала. Несумненна, імкнулася здабыць прыхільнасць новай савецкай улады, аб чым можна меркаваць па перапрацоўцы верша «Беларускім партызанам», які цяпер прысвячаўся «вызвольнікам-чырвонаармейцам» (гл. ксераксы вершаў). Магчыма, таму «не прызнавала» эсэраўскімі дзеячамі ні Ластоўскага, ні Бадунову, якую, дарэчы, велічала і якая мела вялікі ўплыў на Веру.

Пра ўдзел Веры ў Пражскай канферэнцыі нямала пісалася ў тагачаснай польскай прэсе, а пра яе ўдзел у падполлі на Беласточыне – у зборніку «Працэс 45-ці беларусаў» (Вільня, 1923 г.).

Пасля турмы выйшла замуж за Уладзіміра Карчэўскага, які працаваў псаломшчыкам ва ўніяцкіх цэрквах над Бугам. Пасля Другой [сусветнай. – *Н. Г.*] вайны лічыла сябе праваслаўнай, спявала ў царкоўным хоры ў Супраслі, была ў добрых адносінах з мясцовым праваслаўным святаром. Аднак, відаць, нешта засталося з той уніі: пераглядаючы яе паперы, заўважыў не без здзіўлення, што на пытанне аб сваім веравызнанні адказала – «грэка-каталіцкае».

Вера мела толькі адно дзіця – Валянціну, якая жыла толькі некалькі гадзін.

Мясцовыя палякі ненавідзелі Веру за арганізацыю беларускай НСШ у 1939/40 школьным годзе і навучанне па-беларуску падчас нямецкай акупацыі і непасрэдна пасля вайны. Пакідалі пагрозлівыя лістоўкі, пагражалі крывавай расправай. Па гэтай прычыне Вера з сястрой Жэняй была вымушана выехаць у Сілезію.

Вера мела некалькі беларускіх кніжак, выдадзеных у 1919–1920 гг., бадай усе перадала мне.

Сшытак вершаў недзе загінуў пасля яе смерці, засталася зробленая мной ксеракопія. Некаторыя яе вершы я прапанаваў крыху паправіць, галоўным чынам, з боку мовы, але яна не вельмі з гэтым пагадзілася.

У папцы, між інш., нашая перапіска, амаль усе здымкі, якія перадала мне, лісты жонкі ўкраінскага дзеяча Махно, Галіны, дасыланыя з Па-

рыжа ў беластоцкую турму (арыгіналы), калекцыя пражскіх паштовак – на памяць ад удзельніка Пражскай канферэнцыі і іншыя матэрыялы. Там жа ксеракс сшытка вершаў.

Юры Туронак.

Так, дзякуючы рупнасці Юрыя Туронка, у БДАМЛіМ трапілі надзвычай каштоўныя дакументы, сярод якіх яшчэ раз варта адзначыць копію сшытка з вершамі В. Маслоўскай (54 старонкі), машынапісы і рукапісы вершаў 1944 года, а таксама машынапісныя копіі іншых вершаў, зробленыя самім гісторыкам. Таксама перададзена копія аўтабіяграфіі В. Маслоўскай (напісана па-польску недзе ў канцы 1950-х гадоў), копія выпіскі з яе працоўнай кніжкі, ліст з рэдакцыі газеты «Наш сьцяг» ад 12 ліпеня 1923 года да маці В. Маслоўскай з просьбай даслаць яе фотаздымак і кароткі жыццяпіс, набор паштовак з выявамі Прагі, падораны на памяць В. Анісковічам у 1921 годзе. Асаблівую цікавасць выклікаюць шэсць арыгінальных пісьмаў-паштовак за 1925-1928 гады з Парыжа ад жонкі Нестара Махно Галіны да В. Маслоўскай у беластоцкую турму. Да лістоў дадаюцца фотаздымкі Галіны і яе дачкі.

Большую частку дакументаў з архіва В. Маслоўскай, перададзеных Ю. Туронкам, складаюць арыгінальныя фотаздымкі. Гэта індывідуальныя здымкі і самой Веры рознага ўзросту, і іншых дзеячаў міжваеннай Заходняй Беларусі: Янкі Станкевіча, Клаўдыюша Дуж-Душэўскага, Янкі Трахімовіча, Адама Станкевіча, Палуты Бадуновай і інш. Ёсць таксама ў гэтым зборы фатаграфіі настаўніц беларускіх школ у Бельску і Беластоку Вольгі Гофман і Вольгі Скаўронскай (1918 год) і самой Веры з вучнямі (1917–1918 гады), групавыя здымкі ўдзельнікаў настаўніцкіх курсаў у Вільні, Пражскай канферэнцыі 1921 года, настаўніцкай канферэнцыі беларускіх школ у Беластоку (1943/1944 год), беларускіх пісьменнікаў 1920 года і інш.

Разам з гэтым захоўваецца перапіска В. Маслоўскай з Ю. Туронкам: 26 лістоў і паштовак ад яе за 1967-1980 гады і сем лістоў ад яго за 1977–1978 гады.

Дакументы Надзеі Артымовіч

Яшчэ адзін адмысловы комплекс дакументаў у фондзе Ю. Туронка звязаны з пісьменніцай Надзеяй Артымовіч. Разам з ім таксама быў перададзены каментарый ад гісторыка, які ніжэй публікуецца.

Дакумент № 10

Варшава, 20.04.1991 г.

Інфармацыя для Архіва ЛіМ, Мінск

З Надзеяй Артымовіч пазнаёміўся восенню 1976 г. Прыйшла да мяне ў пошуках «Нівы», хацела перапісаць усе свае вершы, якія да гэтага часу былі надрукаваныя ў гэтым штотыднёвіку. Я ёй запрапанаваў, што сам зраблю тыя выпісы. Перапісваючы, зацікавіўся яе паэзіяй, захацеў яе падтрымаць. Паколькі Надзея была хаатычная, разгубленая, прасіў яе даваць мне прынамсі копію кожнага новага верша. Яна рабіла тое ахвотна, была ўпэўнена, што ў мяне яе вершы не прападуць, што раней нярэдка бывала. Так пачалося супрацоўніцтва, у якім я займаўся яе паэтычнай бухгалтэрыяй: аналізаваў, сістэматызаваў, высылаў у «Ніву» і беластоцкія «Беларускія календары», заахвочваў яе высылаць нешта ў «Маладосць», пісаў нешта пра яе творчасць у «Ніве», арганізаваў аўтарскія вечары.

У сакавіку 1977 г. зрабіў машынапіснае выданне «Розумаў» тыражом… 5 паасобнікаў. Гэта зрабіла на яе адпаведнае ўражанне. Пісала шмат больш. Бадай на кожным вершы была дата напісання, аднак прасіла не друкаваць гэтых дат. Усё знаходзіцца ў архіўных папках.

Вясной 1979 г. Надзея выехала з Варшавы ў Бельск у сувязі з хваробай маці. З гэтага часу пачалася карэспандэнцыя, супрацоўніцтва не спынялася. Летам 1981 г. з'явіўся зборнічак «Роздумаў», а яшчэ ў 1979 г. пераклад вершаў на польскую мову. Вершы, якія былі ў мяне, паступова публікаваліся і бадай усё было надрукавана.

Са снежня 1981 г. нашае супрацоўніцтва абарвалася, па сутнасці таксама і карэспандэнцыя. Здаецца, што за мінулае 10-годдзе напісала ўсяго некалькі новых вершаў. Не выключаю, што перашкаджалі асабістыя справы. У 1990 г. выйшаў трэці зборнічак Надзеі Артымовіч – «Сезон у белых пейзажах», у якім надрукаваныя вершы, напісаныя да 1981 г.

Далучаю ўсе тры зборнічкі з аўтарскімі аўтографамі.

Юры Туронак.

Дзякуючы Ю. Туронку у БДАМЛіМ захоўваюцца лісты і паштоўкі Н. Артымовіч за 1979–1985 гады (42 дакументы), спісы вершаў паэтэсы, складзеныя гісторыкам, выразкі публікацый яе вершаў і тэкстаў пра яе, машынапісы і аўтографы вершаў, якія дасылаліся ў беластоцкую газету «Ніва» і іншыя выданні, а таксама фатаграфіі Н. Артымовіч.

Дакументы да біяграфіі Юрыя Туронка

Важную частку фонду Ю. Туронка ў БДАМЛіМ складаюць дакументы, звязаныя з яго біяграфіяй. Тут сабраны як разнастайныя пасведчанні аб адукацыі – спачатку хіміка, а потым гісторыка, якую ён атрымліваў у Вільні, Беластоку, Шчэціне, Варшаве. Значны комплекс дакументаў датычыць працы Ю. Туронка ва ўстанове Centrala Importowo-Eksportowa Chemikaliów i Aparatury Chemicznej (Ciech) і на пасадзе рэдактара газеты „Rynki Zagraniczne". Важныя таксама матэрыялы з навуковай і грамадскай дзейнасці Ю. Туронка як сябра Беларускага грамадска-культурнага таварыства, Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і інш. Цікавасць уяўляюць дакументы, звязаныя з абаронай доктарскай дысертацыі і публікацыяй працы «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», матэрыялы пра ўдзел Ю. Туронка ў міжнародных канферэнцыях і іншых мерапрыемствах, як у часе знаходжання на пасадзе рэдактара газеты „Rynki Zagraniczne", гэтак і ў сувязі з беларусазнаўчай навуковай дзейнасцю. Дастаткова поўна прадстаўлены і дакументы аб дзяржаўных узнагародах Ю. Туронка. Увагу звяртае таксама той факт, што гісторык даволі даўно стаў клапаціцца пра перадачу назбіраных ім кніжных і дакументальных каштоўнасцей. Таму ў фондзе ёсць дакументы аб перадачы гісторыкам Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і інш. у дар беларускіх кніг з асабістага збору.

Своеасаблівым дадаткам да біяграфічных дакументаў выступаюць матэрыялы пра Ю. Туронка. Гэта вялікая колькасць рэцэнзій і водгукаў на розныя кнігі гісторыка, а таксама публікацыі Аляк-

сея Каўкі, Лены Глагоўскай, Язэпа Янушкевіча і інш., прысвечаных фондаўтваральніку. Асаблівую цікавасць выклікае копія спецыяльнага данясення агента Камітэта дзяржаўнай бяспекі БССР «Бурана» пра кантакты з Ю. Туронкам у канцы 1950-х гадоў і каментарыі гісторыка з высвятленнем рэальнай асобы згаданага агента, якім аказаўся пісьменнік Алесь Бажко.

Дакументы пра навуковую дзейнасць Ю. Туронка

Яшчэ ў пачатку 1990-х гадоў у БДАМЛіМ трапілі аўтографы і машынапісы прац Ю. Туронка «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», «Памяці Браніслава Туронка», «Да гісторыі друйскага марыянскага манастыра ў 1923–1938 гадах», машынапіс даследавання па сямейнай гісторыі „Reszecie. Zarys genealogii rodziny", прысвечанай продкам па мацярынскай лініі Рэшацям і зробленай пераважна для сямейнага карыстання ў 2000 годзе, матэрыялы да артыкулаў і варыянты тэкстаў «Дзядзька Антон», «Непакорная Вера» і інш. Ёсць таксама некалькі артыкулаў Ю. Туронка ў газеце „Rynki Zagraniczne" і шэраг інтэрв'ю з гісторыкам, звязаных з яго навукова-даследчай дзейнасцю.

Фонд Ю. Туронка ўтрымлівае таксама вельмі разнастайныя па характары дакументы, сабраныя ім у працэсе падрыхтоўкі сваіх публікацый. Яны адлюстроўваюць шырокае кола інтарэсаў гісторыка. Тут ёсць матэрыялы, звязаныя з выданнем кнігі даследчыцы Ціны Клыкоўскай пра Саюз беларускай моладзі, гісторыяй якога займаўся і Ю. Туронак. Праца над падрыхтоўкай выдання кнігі стала штуршком як для перапіскі, напрыклад, з колішнім сябрам СБМ Міколам Латушкіным, так і, магчыма, для падрыхтоўкі ўласнай працы Ю. Туронка «Людзі СБМ».

У фондзе таксама можна знайсці дакументы да біяграфій Аляксандра Каўша, Юркі Геніюша, Аляксея Грыцука, Міколы Грэбня, Лявона Луцкевіча, Уладзіміра Тарасевіча, Віктара Ярмалковіча і інш., асабліва тых, з кім гісторык перапісваўся. Тут жа звярта-

юць на сябе ўвагу машынапісы прац В. Ярмалковіча пра Беларускі студэнцкі саюз у Вільні і Беларускую хрысціянскую дэмакратыю, аўтабіяграфічныя тэксты Марыяна Пецюкевіча, артыкулы Пятра Ластаўкі і інш. пра беларускае жыццё ў даваеннай Варшаве, дакументы пра дзейнасць беларусаў на Беласточчыне і шмат іншых публікацый і выпісак, зробленых Ю. Туронкам па розных тэмах.

Асаблівай увагі патрабуе невядомае раней падпольнае выданне «Новая наша ніва» (1979 год), камплект якога некалі перадаў Ю. Туронку польскі даследчык Мікалай Іваноў. Магчыма, выпускі гэтага выдання, што захоўваюцца цяпер у БДАМЛіМ, існуюць цяпер у адзіным экзэмпляры.

Перапіска Ю. Туронка

Сярод перададзенага Ю. Туронкам у БДАМЛіМ найбольшы аб'ём мае перапіска. Усю карэспандэнцыю гісторыка можна падзяліць на некалькі груп.

Так, Ю. Туронак часта пакідаў сабе аўтарызаваныя копіі лістоў да іншых асоб, у выніку, асобную групу складаюць уласныя лісты Ю. Туронка. Сярод яго адрасатаў можна знайсці даследчыкаў, грамадскіх дзеячаў з розных краін: Сцяпана Александровіча, Міколу Грэбня, Аляксея Каўку, Святаслава Каўша, Міколу Латушкіна, Лявона Луцкевіча, Аляксандра Надсана, Міколу Панькова, Марыяна Пецюкевіча і дзясяткаў іншых. Арыгіналы некаторых уласных лістоў, напрыклад, да Юзафа Александровіча (Язэпа Найдзюка) або Марыяна Пецюкевіча Ю. Туронак атрымаў пасля смерці адрасатаў.

Яшчэ лепш прадстаўлены лісты, дасланыя Ю. Туронку. Паводле аб'ёму перапісцы можна вылучыць асноўных карэспандэнтаў гісторыка: Міколу Грэбня (ЗША), Аляксея Каўку (Расія), Святаслава Каўша (ЗША), Аляксандра Надсана (Вялікабрытанія), Марыяна Пецюкевіча (Польшча), Здзіслава Сямашку (Польшча), Міхаліну Татарыновіч (Польшча), Віктара Ярмалковіча (Польшча). Пера-

піска Ю. Туронка каштоўная тым, што змяшчае многа факталагічнай інфармацыі па гісторыі беларускага руху міжваеннага і ваеннага часу, матэрыялы да біяграфій тых або іншых яго ўдзельнікаў. Гэтыя звесткі даследчык збіраў для сваіх прац, але, відавочна, скарыстаў далёка не цалкам. Шмат якія лісты суправаджаюцца фатаграфіямі або артыкуламі, іншымі матэрыяламі. Сярод карэспандэнтаў Ю. Туронка гісторыкі, грамадскія дзеячы, сябры з Беласточчыны і іншых рэгіёнаў Польшчы, з Беларусі, калегі-даследчыкі з Германіі, Літвы, Швейцарыі, а таксама значная колькасць дзеячаў беларускай пасляваеннай эміграцыі. Шырокая геаграфія прадвызначыла і моўную разнастайнасць дакументаў: тут прадстаўлены беларуская, польская, руская, англійская, нямецкая, літоўская мовы.

Асобную невялікую групу складае перапіска Ю. Туронка адносна біяграфіі яго бацькі Браніслава. Даследчык актыўна збіраў звесткі з сямейнай гісторыі наогул і пра жыццё і дзейнасць Б. Туронка, якому была прысвечана адна з яго кніг. Гісторык распрацаваў адмысловы апытальнік для сваякоў, прыклады адказаў на які можна знайсці ў згаданых пісьмах.

У яшчэ адну невялікую групу можна вылучыць карэспандэнцыю Ю. Туронка ў справе спадчыны Марыяна Пецюкевіча. Пасля смерці гэтага дзеяча, з якім гісторыка звязвалі доўгія прыяцельскія адносіны, Ю. Туронак клапаціўся пра належнае забеспячэнне захаванасці яго архіва і бібліятэкі ў Акруговым музеі ў Беластоку (цяпер Падляшскі музей у Беластоку), у аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа АН БССР (цяпер Нацыянальная акадэмія навук Беларусі).

Выяўленчыя матэрыялы ў фондзе Ю. Туронка

Багатая на каштоўныя дакументы выяўленчая частка фонда гісторыка. Акрамя прыгаданых вышэй здымкаў з архіваў В. Маслоўскай і Н. Артымовіч, іншыя фатаграфіі можна падзяліць на некалькі груп. Першую складаюць здымкі самога Ю. Туронка, як

індывідуальныя, гэтак і ў групах з бацькамі, жонкай, дзецьмі, а таксама з калегамі і сябрамі з Беларусі, Польшчы, Францыі і інш.

Да другой групы можна аднесці фатаграфіі па гісторыі беларускага нацыянальнага руху, сабраныя Ю. Туронкам. Тут аб'ядналы здымкі са збораў Аўгена Аніські, Міколы Латушкіна і інш., што датычаць як саміх згаданых асоб, гэтак і гістарычных падзей, у якіх яны ўдзельнічалі. Вялікая група здымкаў паходзіць з архіваў М. Пецюкевіча. Гэта арыгінальныя фатаграфіі вучняў Радашковіцкай і Віленскай беларускіх гімназій, удзельнікаў Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні, урада Таварыства прыяцеляў беларусаведы і групы беларускіх гуманітарыяў віленскага Універсітэта Стэфана Баторыя і інш. Асобна варта адзначыць вялікую колькасць здымкаў, звязаных з адкрыццём помніка на магіле Алеся Гаруна на Ракавіцкіх могілках у Кракаве 24 верасня 1987 года.

Арыгінальныя фатаграфіі са збору М. Пецюкевіча, дапоўненыя вынікамі ўласных пошукаў Ю. Туронка, склалі асобную тэматычную групу «Выявы беларускіх рэлігійных дзеячаў і падзей, сабраныя Юрыем Туронкам». Тут можна ўбачыць арыгіналы і копіі індывідуальных здымкаў ксяндзоў Станіслава Глякоўскага, Яна Семашкевіча (Янкі Быліны), Адама Станкевіча, Віктара Шутовіча і інш., а таксама праваслаўных і каталіцкіх дзеячаў беларускай пасляваеннай эміграцыі. Каштоўнасць уяўляюць арыгінальныя здымкі груп беларускіх рэлігійных дзеячаў, фатаграфіі ўдзельнікаў хору касцёла Святога Мікалая ў Вільні ў суправаджэнні Антона Грыневіча, Адама Станкевіча, Альбіна Стаповіча і інш. Важна адзначыць, што здымкі максімальна анатаваны Ю. Туронкам, што асабліва важна і для архівістаў, і для даследчыкаў.

Дакументы Браніслава Туронка

Асобную частку фонда Ю. Туронка складаюць сабраныя ім дакументы з дзейнасці яго бацькі Браніслава. Сярод іх арыгіналы і копіі біяграфічных дакументаў Б. Туронка і яго жонкі Марыі, рэдкія дру-

каваныя выданні, як брашура Б. Туронка „Hygijena uzhadawańnia dziciaci", часопіс «Мой шлях» (1922 год), які ён рэдагаваў. Захаваўся і аўтограф аднаго пісьма Б. Туронка. Таксама ў гэтай частцы фонда сабраны публікацыі пра Б. Туронка, яго фатаграфіі ў групах з сям'ёй, сябрамі і калегамі і схема сядзібы Туронкаў у Дукштах.

Друкаваныя выданні і музейныя прадметы

Як відаць са змешчаных вышэй лістоў Ю. Туронка, разам з дакументамі ён перадаваў у архіў-музей і разнастайныя друкаваныя выданні, пераважна з міжваеннай Заходняй Беларусі або пасляваеннай беларускай эміграцыі. Самыя раннія з перададзеных: «Богогласник. Сборник церковных песнопений и духовных песен» (Санкт-Пецярбург, 1912), «Колас беларускай нівы» (Гродна, 1913), «Міністэрства беларускіх спраў за 10 месяцаў істнаваньня» М. Засецкага (Каўнас, 1919). Былі перададзены ў архіў-музей розныя віленскія выданні 1930-х гадоў і амаль усе нумары беларускага літаратурна-навуковага часопіса «Калосьсе», які выдаваўся ў Вільні ў 1935–1939 гадах (экзэмпляры паходзяць з бібліятэкі Пётры Ластаўкі).

Дзякуючы Ю. Туронку ў БДАМЛіМ ёсць выданні большасці эміграцыйных паэтаў і пісьменнікаў: Антона Адамовіча, Льва Гарошкі, Міхася Кавыля, Рыгора Крушыны, Яна Пятроўскага, Алеся Салаўя, Масея Сяднёва, Уладзіміра Сядуры-Глыбіннага, Янкі Шакуна, Янкі Юхнаўца і інш. Таксама ў спісе перададзенага гісторыкам – дзясяткі назваў эміграцыйных перыядычных выданняў, сярод якіх асобныя нумары і нават цэлыя камплекты газет «Беларус», «Беларускі час» (1975–1987), часопісаў «Сакавік» (1947–1948), «Шыпшына» (1947–1950), «Веда» (1951–1954), «Летапіс беларускай эміграцыі» (1978–1991), «Конадні» (1954–1963), «Баявая ўскалось» (1962–1981), «Весткі Інстытуту беларусаведы» (1983–1984), «Зважай» (1989–1991) і інш. Асабліва варта звярнуць увагу на поўны камплект рэдкага выдання беларусаў Мельбурна «Праваслаўным шляхам» (1964–1970).

Ад Ю. Туронка архіў-музей атрымаў таксама два паясы, сатканыя Нінай Абрамчык, і дзве пласцінкі з запісамі беларускіх песень у выкананні Барбары Вержбаловіч і Вячаслава Селях-Качанскага.

Прадстаўлены тут агляд фонда Ю. Туронка ў БДАМЛМ мае агульны характар. Больш дакладнае яго апісанне будзе дадзена ў вопісе, калі будзе зроблена навукова-тэхнічная апрацоўка дакументаў. Варта дадаць, што фонд гісторыка дагэтуль мае перспектыву папаўнення.

Jerzy Turonek's documents in Belarusian State Archives-Museum of Literature and Arts

The text is about historian Jerzy Turonek's archival fond in Belarusian State Archives-Museum of Literature and Art in Minsk. There are a lot of biographical documents, manuscripts and typescripts of Jerzy Turonek works, photos and correspondence with tens people in different countries. The great part of this archival fond are documents collected by historian to his works from personal collections of Marian Pieciukiewicz, Viera Muraška and others. First parts of these documents were moved in Minsk in early 1990s and last ones are transferring until nowadays. Also thanks to Jerzy Turonek a lot of rare books and periodicals were kept by BSAMLA.

K e y w o r d s : Jerzy Turonek, archival fond, documents, correspondence, collection

This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.449-478

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190416

Data przesłania: 11.05.2018
Data akceptacji: 23.05.2018

Андрэй Буча
Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут
buchaandrei@yandex.by
ORCiD: 0000-0002-2638-4909

Дзейнасць беларускіх прасавецкіх арганізацый у Чэхаславакіі ў 1920-я гады

Działalność prosowieckich organizacji białoruskich w Czechosłowacji w latach 20. XX wieku

W 1920 roku Praga została politycznym, intelektualnym, akademickim, naukowym i badawczym centrum Białorusinów za granicą. Kilkaset młodych Białorusinów pobierało naukę na czechosłowackich uczelniach wyższych, tu też żyli i pracowali politycy białoruscy. W latach 20. XX wieku dużą popularność wśród praskich Białorusinów zyskały idee *smienowiechowstwa*. W tym okresie w Pradze działało wiele prosowieckich organizacji białoruskich. Komunistyczna partia (bolszewików) Białorusi i przedstawiciel Związku Radzieckiego w Republice Czechosłowackiej skutecznie podtrzymywali nastroje prosowieckie wśród emigrantów białoruskich. Po ukończeniu studiów w Republice Czechosłowackiej większość członków stowarzyszeń białoruskich o orientacji sowieckiej przeniosła się do Białoruskiej SRR.

Słowa kluczowe: Czechosłowacja, diaspora białoruska, okres międzywojenny

Вывучэннем дзейнасці беларускіх прасавецкіх арганізацый у Чэхаславацкай Рэспубліцы (ЧСР) займаўся літаратуразнавец У. Калеснік[1]. Апошнюю сваю работу па гэтай праблематыцы ён апублікаваў у 1993 годзе. Пасля 1993 года новыя даследаванні,

[1] У. Калеснік, *Ветразі Адысея*, Мінск 1978; У. Калеснік, *Пражскі эпісталярый* [у:] *Усё чалавечае: літаратурныя партрэты,* Мінск 1993, с. 244–357.

прысвечаныя дзейнасці беларускіх саветафільскіх арганізацый у Празе, больш не выходзілі. М. Чмарава, У. Ляхоўскі, А. Баршчэўскі, Д. Каляноўская, разглядаючы розныя аспекты жыцця беларускай дыяспары ў ЧСР, толькі часткова закраналі феномен пражскага беларускага зменавехаўства[2].

У гэтым артыкуле на аснове шырокага кола крыніц (непублікаваных раней архіўных матэрыялаў, перыядычных выданняў міжваеннага часу, прыватнай перапіскі і мемуараў), а таксама з улікам усіх папярэдніх гістарыяграфічных напрацовак зроблена спроба ахарактарызаваць дзейнасць беларускіх прасавецкіх арганізацый у ЧСР; высветліць, чаму зменавехаўскія ідэі заваявалі вялікую папулярнасць сярод беларусаў у ЧСР; паказаць ролю афіцыйнага Менска па развіцці руху прасавецкай арыентацыі сярод пражскіх беларусаў; прасачыць лёсы лідараў саветафільскіх арганізацый пасля іх вяртання на бацькаўшчыну.

1921–1924 гады: на шляху да інстытуцыяналізацыі прасавецкага руху

Масавы прыезд беларусаў у Прагу трэба звязваць з пачаткам правядзення «Рускай акцыі»[3] і выдзяленнем летам 1921 года 20 стыпендый для навучання беларусаў у вышэйшых школах ЧСР[4].

---

[2] М. Чмарава, *Шляхі ўзаемнага пазнання: беларуская літаратура ў Чэхаславакіі (1920–1945 гг.)*, Магілёў 2004; У. Ляхоўскі, *Грамадска-культурная чыннасць беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг.* [у:] *Ёсць на карце месца... Грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі. 1921–1938. Каталог*, укл. Т. Воранава, Мінск 2002, с. 21–31; У. Ляхоўскі, *Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г.*, Białystok, Vilnius 2012; А. Баршчэўскі, *Беларуская эміграцыйная пісьмовасць*, Warszawa 2004; D. Kolenovská, *Běloruská emigrace v Československu (1918–1939)*, „Soudobé dějiny" 2007, nr 1, s. 78–93.

[3] Праграма ўрада ЧСР па падтрымцы эміграцыі з былой Расійскай імперыі.

[4] Archiv Ministerstva zahraničních věcí České Republiky (AMZV), II Sekce politická, karton 241, č. 106650.

Сярод тых, хто ў ліку першых па «беларускіх» стыпендыях прыехаў у ЧСР, былі Пётр Цветкаў і Ян Казімір Бабровіч. Менавіта гэтыя студэнты пачалі сярод беларускага зямляцтва папулярызацыю ідэй марксізму. Таму варта спыніцца на некаторых фактах з іх біяграфій.

П. Цветкаў[5] скарэй за ўсё трапіў у лік беларускіх стыпендыятаў па рэкамендацыі ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі. У Прагу прыехаў у верасні 1921 года для ўдзелу ў I Усебеларускай канферэнцыі. Восенню 1921 года стаў студэнтам хімічнага аддзялення Пражскай політэхнікі. Паводле ўспамінаў В. Грышкевіча, П. Цветкаў быў *«адумыслова прысланым палітруком з заданьнем наварачваньня на камунізм беларускіх студэнтаў у Празе»*[6].

Я. Бабровіч[7] апынуўся ў Празе ў лютым 1922 года. Праўдападобна, Я. Бабровіч на вучобу быў накіраваны віленскім Таварыствам беларускай школы (ТБШ). Вясной 1922 года ён стаў студэнтам медыцынскага факультэта Карлавага ўніверсітэта.

Марксісты П. Цветкаў і Я. Бабровіч былі значна маладзейшыя за іншых беларускіх студэнцкіх лідараў. Так, у 1922 годзе П. Цветкаву было 23 гады, Я. Бабровічу – 20, Т. Грыбу і І. Дварчаніну – па 27, І. Ермачэнку – 28, Я. Станкевічу – 31.

Першыя беларускія стыпендыяты[8] (тыя, хто трапіў у Прагу ў 1921 годзе) з'яўляліся пераважна навучэнцамі яшчэ дарэвалюцыйных расійскіх універсітэтаў, былі выхаваны ў рускай культурнай традыцыі. Таму гэтыя студэнты індыферэнтна ставіліся да беларускага нацыянальнага руху, адчувалі сябе «рускімі», былі інтэграваны ў жыццё рускай эміграцыі ў Празе. З канца 1921 года

[5] Пётр Цветкаў (2 лютага 1899 – ?), адзін з кіраўнікоў беларускага прасавецкага руху ў ЧСР. Нарадзіўся ў Дзвінску (цяпер Даўгаўпілс). У 1926 г. скончыў Пражскую політэхніку. У 1927 ці 1928 годзе выехаў з ЧСР у Польшчу. Далейшы лёс невядомы.

[6] Р. Жук-Грышкевіч, *Жыцьцё Вінцэнта Жук-Грышкевіча*, Toronto 1993, с. 48.

[7] Ян Казімір Бабровіч (2 чэрвеня 1902 – 8 студзеня 1943), адзін з кіраўнікоў беларускага прасавецкага руху ў ЧСР, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі.

[8] У. Ляхоўскі назваў іх студэнтамі-касмапалітамі.

ў Прагу па накіраванні ТБШ сталі масава прыязджаць нацыянальна свядомыя юнакі і дзяўчаты з Заходняй Беларусі (у асноўным выпускнікі заходнебеларускіх гімназій).

Летам 1922 года паміж нацыянальна-свядомымі студэнтамі, якія к таму часу складалі большасць, і студэнтамі-касмапалітамі пачаліся спрэчкі. Не жадаючы падпарадкоўвацца пастановам большасці, сем студэнтаў-касмапалітаў (у тым ліку П. Цветкаў і Я. Бабровіч), якія вучыліся на «беларускіх» стыпендыях і знаходзіліся пад апекай Чэшска-ўкраінскага камітэта па аказанні дапамогі ўкраінскім і беларускім студэнтам (ЧУК), у чэрвені 1922 года перайшлі ў Камітэт па забеспячэнні адукацыі рускіх студэнтаў у ЧСР (КЗАРС). Такім чынам, беларуская грамада ў выніку гэтага канфлікту страціла такія важныя для беларусаў стыпендыі.

Марксісты П. Цветкаў і Я. Бабровіч, якія справакавалі канфлікт сярод беларускіх стыпендыятаў, нягледзячы на пераход у КЗАРС, і надалей заставаліся ангажаванымі ў грамадска-палітычнае жыццё беларускай дыяспары, бо ад членства ў Беларускай грамадзе ў Празе яны не адмовіліся.

Але актыўнасць П. Цветкава і Я. Бабровіча ў 1921–1923 гадах амаль не ўплывала на расстаноўку палітычных сіл у беларускай дыяспары. У гэты час прыхільнікі камуністычнай ідэалогіі заставаліся абсалютнай меншасцю і знаходзіліся на ўзбочыне грамадска-палітычнага жыцця беларускай дыяспары, а асноўныя ідэалагічныя разыходжанні паміж пражскімі беларусамі тычыліся выбару шляхоў і метадаў дасягнення незалежнасці ў форме БНР. Беларуская грамада была падзелена на прыхільнікаў левасацыялістычных і ліберальна-дэмакратычных поглядаў[9].

У сакавіку 1923 года левасацыялістычная моладзь на чале з Т. Грыбам выйшла са студэнцкай секцыі пры Беларускай гра-

[9] Студэнты правых поглядаў на чале з Я. Станкевічам у канцы 1922 года стварылі Беларускі сялянскі саюз у Празе.

мадзе (ССБГ)[10] у Празе і ўтварыла сваю самастойную арганізацыю – Аб'яднанне беларускіх паступовых студэнтаў (АБПС). АБПС уяўляла сабой не цэласную і маналітную структуру, а скарэй было дэмакратычнай платформай левых сіл, вакол якой аб'ядноўваліся эсэры, нацыянал-камуністы, марксісты.

